**Андрэй Федарэнка**

# Афганская шкатулка

Мінск
Юнацтва

## **Афганская шкатулка**

Аповесць

Пралог

*Герой першы. — Чаканне прафесара Пятроўскага. — Магнітафон «Вясна» як важны элемент аповесці. — Сябар-зямляк. — Споведзь «афганца».*

Перад «ціхай гадзінай» дзверы ў палату нумар пятнаццаць расчыніліся і на парозе ўзнік малайцаваты доктар — у белай шапачцы і ў белым халаце, з-пад якога выглядвалі ваенныя галіфэ і наваксаваныя боты.

Пры яго з'яўленні хворыя паўскаквалі з ложкаў, але доктар не звярнуў на іх увагі. Заклапочана агледзеўся, заўважыў, што каля сцяны, пры самых дзвярах ёсць незаняты ложак, павярнуўся і скамандаваў у калідор:

— Сюды давайце!

Двое санітараў укацілі ў палату насілкі. Чалавек на іх увесь закрыты быў прасцінаю. Збоку трэці санітар нёс у руцэ кропельніцу.

Прасціну сцягнулі і асцярожна пачалі перакладаць на ложак тое, што пад ёй знаходзілася... Гэта быў увесь у бінтах і ў гіпсе абрубак. У яго не было адной нагі і па плечы абедзвюх рук. Круглая, як шар, галава была цалкам забінтаваная — з бінтоў выглядаў толькі нос, каб дыхаць, і рот, каб есці.

Калі санітары, уладкаваўшы сяк-так няшчаснага, выйшлі, доктар звярнуўся да хворых:

— Ну што, хлопцы (хлопцы як паўскаквалі, так стаялі каля ложкаў, рукі па швах), — вось вам новенькі. Самі бачыце, які ён. Да ўсяго яшчэ і без вачэй, зусім сляпы. І асколкамі ўвесь нашпігаваны. Так што глядзіце тут яго, не крыўдзіце... Тым больш гэта мой зямляк. З Беларусі, як і я.

Доктар — Пратасевіч было яго прозвішча — ніколі не прамінаў лішні раз нагадаць, што ён беларус. Увесь шпіталь ужо ведаў аб гэтым. З Мінска прыслалі яго сюды на «курсы падвышэння кваліфікацыі» — аб гэтым ён таксама расказваў, ужываючы менавіта такое словаспалучэнне. Як і для большасці таленавітых дактароў, хворыя былі для яго ўсяго толькі чалавечым матэрыялам, а ў працы з матэрыялам і сапраўды трэба ж неяк «падвышаць кваліфікацыю».

— А што з ім, з вашым земляком? — спыталіся ад вакна.

— Афганістан, — коратка адказаў доктар.

— Як... Афганістан?

— Ізноў? — зашумелі здзіўленыя хворыя салдаты.

Справа ў тым, што ўсё гэта адбывалася вясной 1990 года. Калі верыць газетам і тэлевізару, вывад войскаў з «Аўгана» даўно закончыўся, баявыя дзеянні там ужо не вяліся... Прынамсі сюды, у славуты на ўвесь Саюз Падольскі ваенны шпіталь параненыя перасталі паступаць са студзеня месяца. Толькі «старыя» ляжаць, іх яшчэ цэлы корпус у правым крыле шпіталя.

Так што зразумела было здзіўленне салдат.

— Апошняя партыя, — патлумачыў доктар. — Не пашэнціла беднаму. Дэмабілізаваўся, ехаў дамоў... Ну, каля Кандагара іх і накрылі. «Уазік» у ашмёткі разнеслі з гранатамётаў. Як ён увогуле ацалеў — незразумела!

— А чаму да нас яго?

Таксама заканамернае пытанне. Палата нумар пятнаццаць лічылася лёгкай, рэабілітацыйнай і памяшчалі сюды толькі тых, каму неўзабаве на выпіску.

— Часова. Прафесар Пятроўскі павінен яго агледзець. Потым перавядзем у асобную палату. Так што тут ён не залежыцца...

Нарэшце гаваркі доктар пажадаў усім хуткай папраўкі і выйшаў. Як толькі за ім зачыніліся дзверы, хлопцы пападалі ў ложкі — рукі пад галаву, вочы ў столь — і загаманілі хто пра што, толькі не пра знявечанага «афганца». На двары стаяла падмаскоўная вясна. Яна ўрывалася ў расчыненае вакно радасна-трывожнымі сваімі пахамі і гукамі. Шпітальны корпус патанаў у зеляніне. П'яна пахла чаромха. Заліваліся — нават цяпер, удзень — салаўі. На спартыўнай пляцоўцы гулялі ў валейбол...

Наперадзе ў гэтых маладых салдатаў, якім пашэнціла, якіх абмінулі калецтвы і смерць, была выпіска. Былі «дэмбель», вяртанне да сяброў і блізкіх, да каханай. Наперадзе ў іх былі вёсны і зімы, світанкі і заходы, сінія нябёсы і свежыя вятры... Каму тут якая справа да няшчаснага калекі?

Лішні раз пацвердзілася — няма нічога больш пастаяннага, чым часовае. Салдат-«афганец» заляжаўся ў палаце нумар пятнаццаць. Прафесар Пятроўскі, пра якога ў шпіталі хадзілі цэлыя легенды, які мог вярнуць чалавека нават з таго свету, усё не прыязджаў. Цягнуліся дні. Набірала сілу вясна. Адны салдаты выпісваліся, іншыя паступалі на іх месцы, каб неўзабаве таксама пакінуць палату.

З «афганцам» ніхто не сябраваў. Больш за тое, яго нават цураліся. Дзеля справядлівасці скажам, што вінаваты ў гэтым трохі быў і ён сам. Бяда азлобіла яго. Калі спрабавалі з ім загаварыць, ён толькі агрызаўся, ці проста нічога не адказваў. І ні разу нікога ні аб чым не прасіў.

Зрэдку наведваўся да яго доктар Пратасевіч.

— Як жыў, зямляк? — пытаў бадзёра.

Салдат маўчаў.

— Ну, нічога. Вось-вось прыедзе Пятроўскі...

Аднойчы доктар прынёс земляку свой старэнькі касетны магнітафон, прыладкаваў на тумбачцы побач з ложкам. «Афганец» узрадваўся падарунку, як малое дзіця. Канечне, нудотнае існаванне яго з гэтага часу крыху змянілася. Цяпер яму ўжо міжволі даводзілася ўступаць у сякія-такія кантакты з суседзямі па палаце: прасіць, каб хто ўключыў ці выключыў магнітафон, памяняў касету... У гэты самы час і адшукаўся яму сябрук. Таксама беларус, таксама паранены ў Афганістане, толькі яшчэ зімою. Аднак і цяпер у яго была забінтаваная галава.

Ляжаў ён у суседнім «афганскім» корпусе, а сюды, да таварыша па няшчасці, пачаў наведвацца кожны вечар. Відаць, там яму таксама было адзінока. Быў ён высокага росту, хударлявы, маўклівы, характар меў спакойны, падатлівы. У цёмных зеленаватых вачах яго ўгадвалася ранняя сталасць і чытаўся зноў-такі не па гадах розум.

Ён карміў сябра з лыжкі. Прыбіраў за ім. Прыносіў купленыя ў шпітальным буфеце гасцінцы: яблыкі, пячэнне, малако. Гаварылі яны з «афганцам» мала, неахвотна, да таго ж па-беларуску, і хворыя ў палаце, прыслухоўваючыся, са здзіўленнем адкрывалі, што гэта, аказваецца, амаль незразумелая мова!

Часцей зямляк падсядаў да сябра на ложак, нягучна ўключаў магнітафон і яны моўчкі слухалі песні такога далёкага цяпер свайго юнацтва.

Усё, аднак, канчаецца — скончыўся і гэты перыяд чакання. Неяк з раніцы зайшоў доктар. Радасна паціраючы рукі, аб'явіў голасам больш бадзёрым, чым звычайна:

— Прафесар Пятроўскі прыехаў! Рыхтуйся, зямляк. Заўтра ў цябе пункцыя спіннага мозгу.

— А потым? — ціха спытаў «афганец».

— Гм, потым... Потым будзем глядзець. Цэлы цыкл аперацыяў цябе чакае!

У той дзень «афганец» быў зусім маўклівы, разгублены. Як заўсёды, увечары прыйшоў зямляк, падзяліўся радасцю: заўтра яго выпісваюць. У палаце былі толькі яны ўдвух. Зямляк хацеў уключыць магнітафон, «афганец» папрасіў:

— Не трэба. Я хачу табе нешта сказаць. Я ведаю, што не выжыву... Не суцяшай! — павысіў ён голас, угадаўшы, які рух зрабіў і якія словы збіраецца зараз сказаць зямляк. — Неяк у рэанімацыі, яшчэ ў Ташкенце, я падслухаў, урачы сказалі — гэты доўга не працягне... Дык вось, будзь уважлівы! І запамінай. Калі мяне не стане, толькі ты адзін будзеш аб гэтым ведаць. Нагніся...

І ён зашаптаў, ды так ціха, нібы баяўся, каб нават сцены не падслухалі ягонай тайны. Зямляк слухаў моўчкі. Падчас усяго расказу ён нават не зварухнуўся...

Вось тут перапыняецца наша гісторыя. Усплыве яна аж праз пятнаццаць гадоў і на гэты раз месцам дзеяння выбярэ не далёкі Афганістан, і не падмаскоўны Падольск, а беларускую вёску Вялікая Паляна; менавіта тут з'явяцца перад намі, як на экране тэлевізара, і старыя знаёмыя героі, і зусім новыя; менавіта тут наша таямнічая заблытаная гісторыя паступова раскруціцца, разблытаецца, праяснее і пад канец ператворыцца проста ў гісторыю.

Аднак не будзем забягаць наперад!

## Раздзел I

*Лёдавае пабоішча. — Галоўны недахоп сяла Вялікая Паляна. — Цім і Валік. — Овер-тайм. — Не забіваеш ты — забіваюць табе. — Варатар Дзірка з каманды «Рэшата». — Барадач з сабакам.*

Бітва сяльчан з зарэчанцамі вялася ўжо трэцюю гадзіну, а ўсё не відаць было канца ёй.

Мужна сыходзіліся між сабою байцы. Грудзьмі адзін на аднаго налятаді, касцьмі кдаліся, сцяна на сцяну пёрлі — аж патрэскваў пад іх цяжарам тонкі лёд. Штораз выбухала наваколле то крыкамі радасці, то енкамі адчаю... Але ніхто не хацеў здавацца. Пераломy ў бойцы ўсё не наступала. Да канца намерыліся стаяць воіны, — дарма што самаму малодшаму з іх было ўсяго дзесяць гадоў, а самаму старэйшаму — пятнаццаць, і што бітва паміж імі ішла бяскроўная, бяскрыўдная, тая, што завецца замежным, але на дзіва лёгкім для беларускага вуха і языка словам — хакей.

Канаў пакрысе кароткі зімовы дзень. Палавіна сляпучага чырвонага сонца ўжо схавалася ў цёмным бары, які шчыльнай сцяною з усіх чатырох бакоў акружаў пляцоўку. Апошнія промні яго яшчэ прабіваліся праз зубчатыя вяршаліны хвояў і залатымі палосамі клаліся на лёд, зіхацілі яго і расквечвалі ўзорамі.

Малады месяц не стаў чакаць, пакуль сонца схаваецца ўсё. Выскачыў раней часу, застыў на другім баку неба. Так яны і віселі: палова чырвонага сонца на захадзе і бледны, ад уласнай смеласці разгублены кружок месяца на ўсходзе. Дзівіліся то адзін з аднога, то пазіралі ўніз, на гэтых няўрымслівых, зусім маленькіх, калі глядзець на іх зверху, людзей, якія невядома чаму сабраліся сярод глухога лесу, расчысцілі ад снегу пляцоўку , паздзяліліся на дзве каманды і вось носяцца адзін за адным, мітусяцца без толку без ладу, не баючыся ні марозу, ні ветру, забыўшыся на дзень і на хуткую ноч.

Вось аб усім гэтым і будзе напісана заўтра ў школьнай сценгазеце. Ды яшчэ не прозай напісана, а вершамі! Сценгазету вывесяць з самай раніцы, перад

урокамі. Відаць, ноч не спаў, шчыруючы, невядомы аўтар. Пачнецца «паэма» так:

Знайшлі яны між лесу поле —
Ёсць разгулядца дзе на волі!

І далей, па традыцыі ўдзяліўшы крыху месца апісанням прыроды, ананім ваўсю пачне здзекавацца з пераможаных — зарэчанцаў, і спяваць падхалімскія гімны пераможцам — сяльчанам.

Зарэчанцы, канечне, вершык гэты ў пух і пер’е раскрытыкуюць — за здзеклівасць, за пафасныя нацяжкі ды і проста за няпраўду, якая адшукалася ўжо ў першым радку. Так вось лёгка яны прыйшлі і «знайшлі між лесу поле»!.. Гэта толькі ў паэтаў усё гладка. А ў рэальнасці адшукаць гэтую пляцоўку было справай самай цяжкай. Па-першае, амаль увесь снежань стаяла адліга. Калі ж нарэшце прыцісну марозік, дастатковы, каб скаваць лёд, аказалася, што вялікага, прыдатнага для такой баталіі поля і няма. І шукалі яго ніяк не менш за тыдзень.

А баталія паміж імі даўно чакалася! З самай восені прагнулі памерацца сіламі гарачыя хлопцы і з таго, і з другога канца Вялікай Паляны. Сяло было «разрэзана» папалам маленькай безыменнай рачулкаю. З давён-даўна яна з’яўлялася для людзей мяжою, дзелячы Вялікую Паляну на Сяло і Зарэчча. І колькі стаяла вёска, столькі ж жыла ў людзях гэтая дурная варажнеча паміж двума канцамі, у спадчыну перадавалася з пакалення ў пакаленне. І далёкія прадзеды цяперашніх супернікаў, і дзяды, і нават бацькі іхнія як мінімум раз на год збіраліся ў загадзя прызначаным месцы, каб даказаць сваю правату. Прычым спосабам самым прымітыўным — кулакамі. Але ўжо старэйшыя браты, а цяпер вось і яны, падлеткі, вучні чацвёртых — шостых класаў ганебны звычай гэты перапынілі, разумна разважыўшы, што існуюць куды больш сімпатычныя, куды цікавейшыя

разборкі, раз ужо без іх зусім нельга. Футбол і валейбол улетку, шахматы і хакей — зімою.

Дык вось. Што да лета, тут асаблівых праблемаў ніколі не ўзнікала. Улетку што трэба? Тугі, звонкі мяч, добры настрой ды каб з неба не капала. Зусім не тое зімою. Сапраўднай бядой іхняга сяла былі бязводныя ваколіцы. Усяго хапала: лесу, палёў, ўрадлівай зямлі, садоў, а вось на ваду паскупілася прырода. Ды і людзі прыклалі рукі. Балоты даўно паасушвалі, а разам з балотамі пазнікалі і азярыны, якіх раней было процьма... Гэтай зімой высветлілася, што і на іхняй адзінай рачулцы, дзе паядынкі адбываліся раней, больш не пагуляеш. І без таго маленькая, вузкая — у сухое лета яе можна было пераскочыць з месца — з кожным годам яна усё больш мялела, а гэтай восенню не разлілася зусім, хоць дажджы лілі ўвесь кастрычнік.

Можна ўявіць хлопцаў адчай. Усё было да гэтай сустрэчы падрыхтавана. Пашыты накаленнікі і шчыткі, навостраны былі напільнікамі канькі — так, каб «іскры з лёду выбіваць!»...Накуплена ў горадзе запасных шайбаў. У кожнага па дзве-тры безадказныя, адданыя, у баях правераныя клюшкі — зручныя, гладкія, лёгенькія, з перамотанымі сіняй ізаляцыйнай стужкай кручкамі; здаецца, самі прырастаюць да рук... На ўтаптаным да цвёрдага насту снезе праведзены трэніроўкі — праўда, без канькоў і замест шайбы — мячык... Вымуштраваныя варатары-брамнікі кідаюцца на мячык, як коршакі на вераб'я, целам закрываць кожны сантыметр варот, бяруць нават «мёртвыя», стопрацэнтовыя галы... Усё гатова да змагання! Зіма прыйшла — снег, мароз! І такая крыўдная, банальная прычына — лёду няма.

Так што мелі рацыю зарэчанцы, крытыкуючы паэму. Зусім не проста было «знайсці між лесу поле».

Памог, як звычайна, выпадак. Бацька зарэчанскага варатара Цімоха — Ціма, ляснік па прафесіі, блукаючы па сваіх лясных справах, натыкнуўся на стары закінуты кар'ер, кіламетры за чатыры ад вёскі, і сказаў сыну, што там ёсць вада, а значыцца, і лёд. Пра кар'ер ведалі ўсе. Толькі ён заўсёды быў сухі. А гэтым годам, відаць, восеньскімі дажджамі намыла яму на дно гліны і вада затрымалася. Глыбіня была невялікая, але так нават лепш: значыць, нават у слабы мароз схопіцца лёд, дастатковы, каб трымаць людзей. А калі і праваліўся — «шухнеш», як у іх казалі, — не бяда, вады менш чым па калена. Затое шырыня, прастор, раздолле!

Грэх было губляць час. У той жа дзень, як пачулі, зляцеліся пасля ўрокаў на кар'ер. Такія адзін з адным ветлівыя, такія на дзіва дружныя — і зарэчанцы, і сяльчане... Размецілі пляц, расчысцілі ад снегу. Збілі з дошак «борцікі», увагналі ў лёд калы — вароты, абцягнулі іх нават старымі, ўдвая складзенымі валейбольнымі сеткамі... Словам, усё падрыхтавалі для заўтрашняй гульні.

І назаўтра зноў ажыў кар'ер. Глухі, сіратлівы да гэтага лес напоўніўся вясёлым галёканнем. Гарэлі здаровай чырванню маладыя шчокі. Шоргалі аб лёд канькі. Стукалася аб клюшкі і аб борцікі шайба... Музыка зімы, візітная картка зімы — гэты пошчак! І падабрэлі, пахарашэлі суровыя дасюль хвоі, яшчэ цясней стоўпіліся па краях кар'ера, як якія спартыўныя заўзятары; вось толькі не зразумець было, каторая за якую каманду перажывае.

А роўная йшла гульня! Гол у гол. Чатырнаццаць — чатырнаццаць. Не прапалі дарам трэніроўкі хлопцаў-малойцаў. Тым часам яшчэ ніжэй апусцілася сонца за лес. Лёд перастаў зіхацець. Хутка зусім сцямнее.

— Стоп! — скамандаваў капітан зарэчанцаў Віцька Швед. Швед была не мянушка, а сапраўднае прозвішча.

Спынілася гульня. З'ехаліся ў цэнтр абедзве каманды, пачалі раіцца, як быць далей. Разысціся на нічыёй, ці ўсё ж дагульваць?

— Дагульваць, канечне!

— Овер-тайм!

— Да першай шайбы!

Калі ласка. Так і вырашылі: аб'явіць овер-тайм, што значыць — дадатковы перыяд. Хто першы заб'е, той і выйграў. Інакш, па-іхняму, па-мясцоваму гэта яшчэ называецца — «чый апошні (гол), таго і ўсе!».

Падчас кароткага адпачынку перамяшаліся свае з чужымі. Хто смактаў кавалачкі лёду, хто проста прысеў на борцік, аддыхваючыся; старэйшыя хлопцы пакурвалі, пускаючы «бычок» па крузе... Нізенькі, круглы, тоўсты ад амуніцыі варатар зарэчанцаў Цім, той самы, дзякуючы бацьку-лесніку якога і стаўся магчымым гэты паядынак, сцягнуў з твару самаробную маску і размінаўся ў варотах, пастукваў шырокай клюшкай сабе па шчытках, зробленых з двух кавалкаў таўсценнага паралону. Шчыткі даставалі яму аж да пояса. Чалавек колькі з каманды сяльчанаў абступілі Цімавага сябра, Валіка. І там размова таксама вялася пра шчыткі, толькі не варатарскія, а «гульцовыя», для тых, хто ў полі. Сяльчане нагіналіся і, прыцмокваючы, з зайздрасцю разглядалі Валікавы шчыткі. І сапраўды, на выгляд былі яны дужа зграбныя і, відаць, зручныя.

— ...Бярэш старыя валёнкі, — з паблажлівай цярплівасцю тлумачыў нядаўнім ворагам форвард, — адразаеш ніз, усярэдзіну ўстаўляеш сухія палачкі, нарэзаны са старога арэшнікавага вудзільна, а яшчэ лепш з бамбукавага. Прышываеш ззаду матузкі — усё. Работы на паўгадзіны, а хапае на ўсю зіму. І лёгка, і ніякая шайба не праб'е!

У гэтым хлопцы-сяльчане і самі ўжо змаглі пераканацца.

— Усё, паехалі!

— Канчай перакур!

Разыгралі капітаны, каму якія вароты. Зноў раздзяліліся каманды на сваіх і чужых, раз’ехаліся на свае палавіны.

Капітан зарэчанцаў дужа любіў, каб усё было «як па тэлевізары». І цяпер паклікаў сваіх са змоўніцкім выглядам:

— Сюды давайце…

Наказы яго заўсёды былі самыя банальныя, адна агульшчына. Напрыклад: «Лягаем касцямі!», альбо «Гасіць іх, хлопцы, колькі зможам!»… Хоць смейся, хоць злуйся, хоць усур’ёз успрымай. Аднак з’ехаліся, сталі вакол Цімы-варатара, галовы панахілялі — каб не дай Бог хтосьці з чужакоў не ўчуў такога важнага сакрэту.

— Чуць што — на пасы, — азіраючыся, прашаптаў Віцька.

Вось гэта сказануў! І так заўсёды. Нібы без яго не ведалі, што трэба на пасы, нібы толькі ў крайніх выпадках так гуляюць!

Укідванне ў цэнтры. Сяльчане выйгралі, адпасавалі да сваіх варот… І раптам шустры іх абаронца, забыўшы асцярогу, падхапіў шайбу і сам панесся наперад.

— Прапусціць! Не чапаць! — пранеслася сярод зарэчанцаў. Усё правільна. Хай ляцяць у чужую зону, хай агаляюць тылы.

Віцька Швед справа, Валік злева застылі на цэнтральнай лініі. Валік быў як напятая струна, як бягун на старце, гатовы ў любы момант сарвацца з месца. Ён толькі нецярпліва пастукваў клюшкай аб лёд.

Хітрасць зарэчанцаў апраўдалася. Шустраму абаронцу далі прайсці амаль да самых варот.

Падманеныя яго ўдачай, заслізгалі яму на падмогу яшчэ двое... Дарма трывожна крычаў ззаду адзінокі варатар: «Чаго вы ўсе туды?!» Каля варот абаронцу акуратна прыціснулі з двух бакоў, узяўшы ў «караб», — так, што ён не мог зварухнуць ні рукой, ні нагой... Шайба марудна падкацілася да Цімы. Той з размаху шчоўкнуў па ёй — ды не абы адбіць, а прыцэльна, проста Валіку на клюшку. Форвард ірвануў з месца ракетай. Як поршні, замільгалі яго цыбатыя ногі. Паніка сярод сяльчанаў!

Абвесці нізкарослага абаронцу бамбізу-Валіку было раз плюнуць... Каронны фінт — клюшка з правай рукі перакідваецца ў левую, абаронца ззаду, а Валік адзін перад варотамі...

— Ну! Забівай!

Варатар, зразаючы вугал, адступаў і адначасова азіраўся, каб не «згубіць» варот. Левы верхні куток і правы ніжні былі зусім адкрытыя.

Доўга такое пасля ўспамінаецца... І крыўдна тады, і прыкра, і так ясна бачыш сваю памылку! І толькі аднаго прагнеш — вярнуць той міг! Ну, як-небудзь! І тады ўсё адбылося б інакш!..

Кідок. Варатар марудна zаваліўся на спіну. Шайба мёртва была заціснута ў яго між каленяў. Ніякая сіла не выб'е, не выкалупае цяпер яе з-пад яго.

Засвісталі, загалёкалі ад радасці сяльчане. Пад'язджалі, ляпалі па плячы мужнаму свайму брамніку, стукалі клюшкамі аб шчыткі... Пануры Валік, сплёўваючы на лёд, каціўся да сваіх. Віцька Швед зняў пальчатку і паказаў яму кулак:

— Мазіла!

Адзін Цім, верны сябар, не стаў сыпаць соль на раны, а яшчэ і падбадзёрыў:

— Усё нармалёва, малайчына! Цудоўны выхад!

Разыгралі ў зоне сяльчанаў — і ўсё адзін да аднаго паўтарылася. Той самы абаронца, якога

спярша і ўсур'ёз не ўспрынялі, ізноў распачаў да чужых варот паход. Толькі цяпер стала даходзіць, што не выхвальства гэта з яго боку, не самадзейнасць, а тактычныя хітрыкі. Так было задумана, так спланавана...

І апраўдала сябе! Не падрыхтаванымі аказаліся зарэчанцы. Прамаргалі на гэты раз, не паспелі заціснуць — выпусцілі... Абаронца, акурат як Валік хвіліну таму, выходзіў адзін на адзін.

Ну, Цімка, цяпер толькі на цябе надзея! Цяпер твой чарод даказваць, на што здатны! Выручай, дарагі! Успомні трэніроўкі...

Вось тут і здарылася страшнае для зарэчанцаў. Іхні варатар не прысеў, не выставіў перад сабою клюшку, не выкаціўся абаронцу насустрач. Наадварот, ён выпрастаўся і апусціў клюшку. Ён нават глядзеў не на абаронцу, а кудысьці паверх яго — туды, дзе на чырвоным захадзе дагаралі рэшкі сонца. Валік імгненна перахапіў яго пагляд і таксама ўперыўся ў той бок вачыма...

На стромкім беразе кар'ера стаяў, абапіраючыся на лыжныя палкі, высокі барадаты чалавек. З-за спіны ў яго выглядвала руля стрэльбы. Каля ног яго застыў вялікі кашлаты сабака. Чалавек, відаць, нямала ўжо часу стаяў вось так і сачыў за гульнёй. І толькі заўважыўшы, што глядзяць на яго, паспешліва адступіў назад, да цёмнай сцяны хвояў. Затым пружыніста адштурхнуўся палкамі і знік разам з сабакам у лесе. Валік страсянуў галавой. Усё адбылося да таго хутка, што, мабыць, толькі яны з Цімам і паспелі заўважыць барадача.

— Гол!!! — гарлапанілі, абдымаліся, пакідаўшы на лёд клюшкі, сяльчане.

Шайба ляжала ў варотах. Валік вярнуўся да рэальнасці. Злосць на сябра раптам ахапіла яго. Варатар! Разявіў рот на нейкага барадача! На роўным месцы, з-за нічога прапусціць такі гол...

— Дзірка! — гучна, пагардліва сказаў ён.

— З каманды «Рэшата»! — ахвотна падтрымаў яго хтосьці з сяльчан, які праязджаў побач.

Цім не абазваўся. Гледзячы сабе пад ногі, раскалупваў каньком трэшчыну ў лёдзе.

## Раздзел II

*Ноч. — Прымірэнне. — Цімава тайна. — Загадкавы барадач. — Утульныя агні хат. — Валік не разумее Ціма.*

Усё было скончана. Неяк раптоўна апусціліся прыцемкі, нібы таксама толькі і чакалі гэтага гола. І нібы толькі цяпер апамяталіся хлопцы. Успомнілі, як позна ўжо, адчулі якія яны натомленыя і галодныя. А яшчэ ж дадому колькі дабірацца, а яшчэ ж урокі вучыць... Гэта пасля, заўтра, будзе размоваў! І пра «мазілу» Валіка, і пра гэты апошні гол, прапушчаны «дзіркаю» Цімам... Будзе здзеклівая сценгазета. Будуць перажываць за іх, спачуваць ім, сваім хлопцам, зарэчанскія дзяўчаты. Будуць хадзіць ганарыстыя, з задзёртымі да неба насамі сяльчане, якім на калідоры дарогу трэба будзе даць, у гардэроб і ў буфет без чаргі пусціць... І нічога тут не папішаш. Такія законы. Слабейшы павінен зміръцца.

Вось яны, наступствы Цімавай правіннасці, вось які падарунак зрабіў ён свайму Зарэччу...

Дамоў вярталіся праз лес. Ад месяца, зорак і снегу было светла. Сяльчане ішлі наперадзе, вясёлай гаманкой кампаніяй. Панурыя зарэчанцы расцягнуліся па ўсёй дарозе. Валік дагнаў Ціму. Пайшлі побач. У абодвух на плячах былі клюшкі, на якіх — канькі і клункі з хакейнай амуніцыяй; у Цімы акрамя ўсяго яшчэ і груваскі скрутак паралону. Збоку, перпендыкулярна ім, рухаліся дзве цені, большая і меншая. На гэтых ценях, ды яшчэ са сваімі

клункамі за плячыма, хлопцы падобныя былі на колішніх пілігрымаў ці на Дон Кіхота з Санчам Пансам.

— Пакрыўдзіўся? — вінавата спытаў Валік.

Маўчанне. Канечне, пакрыўдзіўся. Валіку тым больш прыкра было, што яго, калі ён не забіў гол, сябар суцешыў, падбадзёрыў... А ён? І навошта вырвалася тое дурное слова? Які б ні быў важны гэты паядынак, ён усяго толькі гульня, забаўка, і не такія ўжо праблемы сусветнага маштабу вырашаліся яго вынікам, каб накідвацца на чалавека. Ды яшчэ на такога, як Цім.

— Не ведаеш, што па тэлевізары сёння?

Маўчанне.

— Ну хопіць табе... Досыць ужо. Чуеш?

Маўчанне. Нічога, хай. Раз маўчыць — ужо добра. Значыць, хутка адыдзе. Валік добра ведаў яго натуру. Цяпер проста трэба самому больш гаварыць, балбатаць абы пра што. І настане момант, калі сябар вымушаны будзе ўклініцца.

— Цім, паслухай... Дык табе што, сонца ў вочы бліснула? Ці ты... з-таго барадача?

Тут Цім рэзка спыніўся, Валік аж наляцеў на яго.

— Ты таксама яго бачыў?

— Бачыў.

— І пазнаў яго?

А што тут пазнаваць? Гэты барадаты мужчына, ці дзядзька, ці хлопец — хто ён там, ужо мо з паўгода жыве адзін у хатцы ў лесе. Купіў яе ў лясніцтва. Зрэдку заходзіць у краму, дзе Валікава маці прадаўшчыцай, купляе мала і самае неабходнае: хлеб, крупы, цыгарэты... Ніколі — віно ці гарэлку. Маўклівы, дзіўны, загадкавы... Не больш таго. Чужы тут — дык у іхняй Вялікай Паляне цяпер паўсяла чужых. То нейкія бежанцы, то з чарнобыльскай зоны перасяленцы, што таксама дзіўна — Чарнобыль

нібыта даўно прайшоў, скончыўся, а іх усё не менее. Гарадскія скупляюць кінутыя хаты пад дачы, будуюць новыя — палавіну поплава ўжо занялі, да лесу падбіраюцца. Лішні чужы чалавек сярод іх навіна невялікая.

Так і сказаў Валік сябру, толькі больш лаканічна.

— Ведаю. Ён жыве ў леснічоўцы. Дык і што? Мала ў нас тут чужакоў? Ідзеш па вуліцы, дык кожнага другога не ведаеш, што за ён.

Хлопцы зноў пайшлі памалу. Снег суха парыпваў у іх пад нагамі.

— Дай мне слова, што будзеш маўчаць, — сказаў раптам Цім. У голасе яго была загадкавасць.

— Само сабою!

— Дык вось, я і праўда з-за яго гол прапусціў. Як убачыў, так і забыўся пра ўсё, і пра гульню таксама.

— Але чаму?

— А таму, што ён не такі просты, як нам здаецца. Чаму ён не размаўляе ні з кім у сяле? Нават не вітаецца?

— Ну, хочацца так чалавеку. Прывык адзін…

— Ды ў тым і справа, што не адзін! — вырвалася ў Цімы, але адразу ж, нібы спалохаўшыся чагосьці, ён прыкусіў язычок. — Не адзін, а з сабакам, — перавёў усё на жарт. — А калі сур'ёзна, няўжо ты не адчуваеш тут тайны? Чаму ён адзін? Чаму усіх староніцца? Адкуль бярэ грошы? Што ён тут, у нас, увогуле робіць?

Валік паціснуў плячыма.

— Мне гэта зусім не цікава, калі шчыра, — прызнаўся ён.

— А табе не прыходзіць у галаву, што ён тут проста хаваецца? Ад некага ці ад нечага. У яго ўсе панадкі злачынцы. А лепшага месца, каб схавацца і

перасєдзець небяспеку, чым нашая глуш, і знайсці цяжка...

Валік, канечне, ведаў і раней, што сябра ў яго — выдумляльшчык хоць куды, і калі не стрымліваць яго, не спускаць час ад часу на зямлю, фантазіі яго могуць завесці далёка. Але цяпер нават ён быў уражаны.

— Гэта і ёсць твой сакрэт? І з-за гэтага... ты прапусціў гол?

— Ды што ты зноў са сваім голам?! — узлаваўся Цім. — Што мы, дзеці малыя?

— Канечне, канечне! Супакойся, гэта я так, проста...

Лес скончыўся і пачалася вясковая вуліца. Свяціліся вокны хат, брахалі сабакі і пахла дымам з комінаў. Цім жыў блізка, адразу ж тут, пад лесам.

— Ну, да заўтра?

— Да заўтра!

Сябры развіталіся. Цім звярнуў на прачышчаную ў снезе сцежку, а Валік бягом кінуўся па доўгай вуліцы. Вунь яго двухпавярховы домік. Якое ўтульнае святло ў вокнах! Бацькі глядзяць тэлевізар. На кухні чакае смачная, цёплая яшчэ вячэра. Невялікі, затое ўласны пакойчык чакае, дзе сцены ў шпалерах з такімі знаёмымі, роднымі ўзорамі, дзе драўляны ложак з чыстай пасцеллю, кніжная шафа з любімымі кнігамі, стол, на якім падручнікі і сшыткі... Усё гэта вечнае, яно было, ёсць і будзе. І якая чароўнасць у гэтым пастаянстве! Не, Валіку ніколі не зразумець сябра. Дужа яны розныя. Адзін любіць простае, будзённае, другі — толькі штосьці незвычайнае. Цім — гэта неба, а Валік — зямля.

## Раздзел III

*Урок геаграфіі. — Сценгазета. — Шыфроўка ад Цімы. — Ізноў пра барадача. — Валікаў рэалізм і Цімавы фантазіі. — Сорам. — Згода разам разгадваць таямніцу.*

За вокнамі яшчэ як след не развіднела. На двары — проста снежная кругаверць! Гуляе вецер, мяцеліца намятае сумёты ўздоўж вуліц, сыпле жменямі снег ва ўсе куткі, куды можа дапасці. Снег сыплецца нават на падконнікі ад двара — палавіна шыбаў знізу ўжо закрытыя.

А тут, у светлым, прасторным, цёплым ад батарэй класе так здорава. На падлозе каля сцяны, на шафах уверсе і на дзвюх падаконніках стаяць вазоны розных дэкаратыўных раслінаў. Нязвыкла бачыць, што яны такія зялёныя, поўныя жыцця, калі за вакном самы разгул снежня. Цвітуць чырвоныя і белыя герані, кактус, як скручаны ў клубок зялёны вожык, таксама набрыняе зверху тоўстай пупышкаю, з якой з’явіцца адзіная вялікая кветка, фікусы развалілі свае лакіраваныя тоўстыя лісты-лапухі і ані дбаюць пра зіму...

Сеецца са столі дзённае святло. Адна з лямпаў крыху падміргвае і гудзе манатонна, аднастайна, зліваючыся з голасам настаўніцы.

Эла Іванаўна прахаджваецца між радоў і дыктуе:

— Тэрыторыя нашай Беларусі займае плошчу, роўную дзвесце сем і шэсць дзесятых квадратных кіламетраў...

Ад яе роўнага голасу, ад цяпла, святла, ад зеляніны вазонаў пануе ў класе нейкі сонны настрой. Адчуванне такое, што поры года змяшаліся і тут, у класе, заблукала лета... Кавалачак лета, абмежаваны чатырма сценамі І ад гэтага таксама лёгка, радасна

на душы — бо і на самай справе будзе ж яно некалі, лета!

— ... Для таго, каб гэтыя лічбы ўявіць, — цячэ голас настаўніцы, — прыбегнем да самага распаўсюджанага спосабу — параўнання.

Нават сценгазета, што з'явілася ў вестыбюлі перад урокамі, і тая не псуе настрою.

Акрамя ўжо згаданай «паэмы» былі там яшчэ два карыкатурныя каляровыя малюнкі. На верхнім — Валік, з даўжэзнай, як у жырафы, шыяю стаіць перад пустымі варотамі і, зноў-такі як жырафа расставіўшы ногі, не ведае, што рабіць з шайбаю. На ніжнім — маленькі тоўсты Цім сядзіць на лёдзе і любуецца захадам сонца, у гэты момант за яго спіной забіваюць гол. Акурат пад гэтай ніжняй карыкатураю канчалася «паэма», словамі:

Ура, мы ломім,
Гнуцца Шведы!

Асабліва, канечне, крыўдна Віцьку. Той заўсёды ганарыўся сваім рэдкім прозвішчам, даказваў, што недзе аж у Польшчы, на Беласточчыне, жыве паэт, яго двайны цёзка, а аднойчы прынёс у школу газету «Ніва», якая выдаецца ў Польшчы на беларускай мове, і ўрачыста паказваў яе ўсім. Сапраўды, быў надрукаваны там вершык за подпісам Віктар Швед.

— ...З усіх краін Беларусь па плошчы бліжэй — да каго б вы думалі? — да Вялікабрытаніі. Наша рэспубліка меншая ўсяго на сорак квадратных кіламетраў...— настаўніца ўжо не ходзіць, а прысела за стол і абедзьве рукі паклала на глобус.

Таксама як добра, што першы ўрок — менавіта геаграфія. Усё адно палова класа, учарашнія хлопцы-байцы, не падрыхтаваліся. А геаграфія — самы лёгкі і цікавы прадмет. І вядзе яго любімая настаўніца. У яе свой метад навучання, гэтак званы

прынцып дабраахвотнасці. Яна ніколі не выклікае да дошкі сілком. «Ну, хто сёння хоча адказваць?» — заўсёды спытае. І калі няма ахвотных, а такое здараецца рэдка, як вось сёння, тады сама пачынае расказваць штосьці цікавае, хай нават не заўсёды і звязанае з геаграфіяй. Ніколі яна не апускаецца да гэтых садысцкіх эксперыментаў — як робіць, скажам, настаўніца англійскай мовы. «Т-э-э-к, — пачынае тая. Унурваецца ў журнал. Марудна паўзе зверху ўніз па прозвішчах кончык ручкі, не датыкаючыся да паперы. Мёртвая, аж да звону ў вушах, цішыня ў класе. «Сёння (паўза) да дошкі (паўза) пойдзе (доўгая паўза)... Пойдзе да дошкі...» — уверх папоўз кончык асадкі. І так некалькі разоў, пакуль не спыніцца нарэшце на чарговым небараку, які калі і помніў што, дык забыў падчас езуіцкага выпрабавання нерваў.

Таму так яны і ведаюць яе, гэтую мову. Акрамя, праўда, Ціма. Але ў яго здольнасці да моваў ад нараджэння.

Эле Іванаўне на давер адказваюць даверам. Яе прадмет любяць і вучаць. Калі ў тым годзе прыязджала камісія з Міністэрства адукацыі і праводзіліся адкрытыя ўрокі, дык геаграфію лепш за іншыя прадметы ведалі ўсе класы. Эла Іванаўна была ўрачыста прызнана лепшай настаўніцай школы, а яны, вучні, ганарыліся ёю.

— ... Няма ніводнай краіны-суседкі (гэтага можаце не запісваць), якая б не ўключала ў сябе нашых этнічных тэрыторыяў. Гэта памежныя раёны Смаленшчыны і Браншчыны ў Расіі, гэта вобласць Латгаліі ў Латвіі, гэта частка Віленшчыны ў Літве, частка Чарнігаўшчыны і Жытоміршчыны на Украіне і Беласточчына ў Польшчы...

Тут па радах прабег нейкі шумок, сярод вучняў пачаўся ледзь прыкметны рух і Валіку, які сядзеў, як

самы высокі, за апошняй партай перадалі запіску ад парты пярэдняй, дзе сядзеў Ціма.

Валік прыкрыў запіску далоняю. Нейкі час з самым нявінным выглядам слухаў настаўніцу. Затым асцярожна разгарнуў трохкутнічак. Там не было ні слова, а толькі слупкі лічбаў, падобныя на табліцу множання. Валік паморшчыўся. «Канспіратар», — незадаволена падумаў пра сябра. Справа ў тым, што, давучыўшыся да пятага класа на круглыя пяцёркі, Валік, як ні сорамна, не ведаў напамяць парадкавых нумароў размяшчэння літар у алфавіце. Лепш сказаць, не хацеў ведаць, лічачы гэта дурной тратай часу. Навошта тлуміць галаву, калі ў любы момант пры патрэбе можна заглянуць ў слоўнік?

Аднак акурат такі момант цяпер і быў. Запіска расшыфроўвалася праз алфавіт. Лічбы трэба было перавесці ў літары. Не спускаючы з Элы Іванаўны вачэй, Валік грудзьмі прылёг на парту. Доўгая рука яго шуснула ў сумку, што стаяла на падлозе. Навобмацак, па зашмальцаваным карэньчыку ён намацаў падручнік англійскай мовы, выцягнуў.

На першай старонцы надрукаваны былі побач два алфавіты. Валік узброіўся ручкай і знізу сябравага паслання, трохі памучыўшыся, запісаў нарэшце пераклад.

«Помніш учарашнюю размову? Я ўчора не сказаў табе самага галоўнага!» — было ў запісцы. Валік толькі ўздыхнуў. Зноў нейкія «тайны»! Чаго яму той барадач так уеўся?

Тут празвінеў званок. Ажыў клас, затым калідор, а затым і ўся школа, усе два паверхі напоўніліся галасамі і тупатам ног. Цім чакаў Валіка ў дзвярах.

— Прачытаў?

— Прачытаў.

— І што скажаш?

— Скажу, што ты ўжо робішся падобным на Віцьку Шведа. Чуць што — на пасы, — адказаў Валік. — Варта было цэлы пакет прысылаць, ды яшчэ кодам напісаны, калі пяць хвілін да званка!

—Гэта я так... Праверыць цябе хацеў, ці хутка расшыфруеш.

Цім азірнууся са змоўніцкім выглядам па баках. У класе , акрамя іх дваіх, нікога ўжо не было, настаўніца таксама выйшла.

— Так і быць. Зараз я табе ўсё раскажу. Ты проста ахнеш!

— Можа, на двор выйдзем? — прапанаваў Валік.

Цім замяўся:

— Там жа газета гэтая вісіць... Убачаць нас разам, пачнуць пальцамі тыцкаць, смяяцца...

— Сапраўды... Можа, спусціцца ўніз ды сарваць яе?

— Навошта? Пасядзім тут. Ціха, пуста.

Забягаючы наперад, скажам, што пакуты нашых сяброў, як і ўсіх астатніх зарэчанцаў, скончыліся адразу ж пасля гэтага першага перапынку. Віцька Швед прылюдна газету сарваў, скамечыў і кінуў у сметніцу. Яшчэ і ўтрамбаваў — са словамі: «Самім трэба пісаць вершы, а не чужыя здзіраць! А калі ўжо і здзіраць, дык у нашых беларускіх паэтаў, а не ў расейскіх!» І ўсё сышло Віцьку з рук. Ніхто нічога яму нават не сказаў. Адно сяльчане пабурчэлі крыху для блізіру, ды на тым і скончылася.

Цім прынёс сваё крэсла да Валікавай парты. Прыселі сябры.

— А цяпер слухай, — таямнічым голасам пачаў Цім. — Гэты барадач жыве не адзін! Ён кагосьці хавае ў сваёй хатцы. Прычым не дарослага чалавека, а некага нашых прыкладна гадоў. Я бачыў каля хаткі сляды. А аднойчы барадач пайшоў на паляванне, я

падкраўся да леснічоўкі, а на дзвярах — замок! Уяўляеш? Ён не хоча, каб пра існаванне таго чалавека ведалі! Ну, як табе?

Цім гаварыў гарачым шэпатам. Хваляваўся. Вочы яго гарэлі. Пальцы то раскручвалі, то закручвалі шарыкавую ручку. Валік з усмешкаю назіраў за ім.

— Ніяк, — адказаў Валік. — Ну, жыве ў яго нехта. Ну, не хоча з'яўляцца на людзях, як і барадач. У чым праблема? (Валік любіў замежныя фільмы і часта карыстаўся цытатамі з іх). У чым тайна?

— Як у чым? Ды я проста упэўнены, што барадач — лідэр якойсьці злачыннай групоўкі! І трымае ў сябе чалавека, падлетка, з якім яму лягчэй спраўляцца, з мэтай выкупу! Што тут незразумела?

Валік толькі ўздыхнуў. Адабраў у Цімы ручку, пераклаў на другі бок парты.

— Добра, — здаўся ён. — Я з табою згодзен. Дапусцім, усё так. Што ты прапаноўваеш? Ну, хадзем раскажам аб гэтам дырэктару школы. Або адразу заявім у міліцыю. Згодзен? Каб пасля і нас, і гэтага барадача зацягалі ў горад па выкліках і позвах. І ўрэшце акажацца, што ён — ні ў чым не вінаваты, што мы абгаварылі бяскрыўднага, самага звычайнага чалавека! Ты гэтага хочаш? Ты ўяўляеш, як нам пасля гэтага будзе прыйсці ў школу? Як нам увогуле тады з'яўляцца на вуліцы? Нам жа праходу не дадуць!

— Пры чым тут міліцыя з дырэктарам школы? — абарваў Цім. — Мы ж дамовіліся маўчаць! Гэта наша тайна, і больш нічыя! І мы самі павінны…

— Ды нічога мы не павінны!

— … Яе раскрыць, — не ўнімаўся Цім. — А потым, калі ўсё гэта будзе адбывацца, падпільнаваць…

— Ды што будзе адбывацца?!

— Абмен выкрадзенага чалавека на грошы, — адказаў Цім.

Валік аж адкінуўся на спінку крэсла. Нейкі час ён здзіўлена пазіраў на сябра, нібы ўпершыню яго бачыў.

— Так. Зразумела. Ты проста наглядзеўся фільмаў і міліцэйскай хронікі па тэлевізары. Ці газет начытаўся.

— У тым і справа! Усе такія выпадкі, як абмен закладнікаў, адбываюцца аднолькава, па шаблоне. Пішацца пісьмо, ці робіцца званок: прынясіце кейс з грашыма і пакіньце ў такім і такім месцы, і не ўздумайце паведаміць у міліцыю... Прыносяць кейс, пакідаюць — а мы тут як тут! Уяўляеш? І грошы нашыя...

Вось яно што. Во ў якім , аказваецца накірунку рухаюцца яго фантазіі, во ў якія далячыні яны сягаюць!

— Цім, паслухай. Ты ж яшчэ анічога не ведаеш. А-ні-чо-га! Які выкуп? Які кейс? Ды проста сын прыехаў да чалавека ў госці! Пляменнік, сваяк! Аб гэтым ты падумаў? Можа такое быць?

— Можа, — згадзіўся Цім, аднак неахвотна згадзіўся; відаць, цяжка было расставацца са сваёй, такой заманлівай, легендаю. — А калі не? Я ж і прапаную гэта праверыць...

— Якім чынам? Зрабіць шалаш каля яго хаткі і жыць у лесе? Каб увесь час цікаваць за ім? — насмешліва спытаў Валік.

— Навошта? Гэты барадач — паляўнічы. Мой бацька гаварыў з ім, у яго ёсць дазвол на стрэльбу. Кожны дзень ён на лыжах цягаецца па лесе, з сабакам. Часта з раніцы і аж да цямна. Бацька не раз сустракаў яго далёка ад вёскі. Дык вось — выберам момант, калі яго не будзе, залезам у хатку і пра ўсё даведаемся ад самой ахвяры...

— Э, зноў панесла цябе! Якой «ахвяры»? Чаму твая «ахвяра» сама не выбера момант і не ўцячэ?

— Кажу ж, ён замыкае дзверы. А па-другое, хутчэй за ўсё ён таго чалавека звязвае па руках і нагах. Магчыма, нават у падполле закідвае. Ведаеш, ёсць такія ў некаторых хатах? Кольца ляжыць на падлозе, да дошкі прыбітае. Пацягнеш за яго і лаз адкрываецца — лепшай схованкі не прыдумаць.

— Добра. Згодзен, — Валік усё не губляў надзеі пераканаць гарачага сябра логікай. — Выбіраем момант, залазім у хатку. І бачым, як сядзіць за сталом хлапчук і як ні ў чым не бывала ўпісвае сала з хлебам. І пазірае на нас як на дурняў у лепшым выпадку: чаго вам тут трэба? — а ў горшым — як на злодзеяў… Пачакай, не перабівай! Другі варыянт. Дапускаем, што твая праўда. Залазім у хатку, знаходзім кальцо на падлозе. Адкрываем тайнік. Там — звязаны, скурчаны чалавек. Вызваляем яго. Прыязджае міліцыя, забірае барадача. Тыдзень мы ходзім героямі, потым аб'яўляюцца хаўруснікі яго і мы… проста не вяртаемся ў адзін цудоўны дзень са школы. Знікаем назаўсёды. Усё гэта вельмі проста! Так што давай забудзем, — рашуча падвёў вынік. — Выкінь з галавы і барадача, і яго госця. Асабіста я не збіраюся ні ў ва што ўмешвацца. І табе не раю. Таксама знайшоў праблему! Ну, жыве сабе чалавек, ну, жыве ў яго нехта — на здароўе. Яны нас не чапаюць, а мы іх.

Цім памаўчаў. Затым прамовіў сумна:

— Добра. Калі ты так усё ведаеш напярод, ці проста баішся, тады я сам усё расследую.

Валік хацеў сказаць, што ёсць тысячы цікавых спраў акрамя «расследаванняў». У тым жа лесе на лыжах пакатацца, з трампліна каля кар'ера паскакаць. Хакей, шахматы, хутка камп'ютэры ў школе паставяць — новая забаўка… А то проста тэлевізар паглядзець — хутка Новы год, зімовыя канікулы, столькі розных перадач цікавых, хоць ты з ранку да вечара глядзі…

Аднак нічога сказаць не паспеў, бо якраз скончыўся кароткі перапынак, у клас ужо заходзілі.

Цім забраў крэсла і паплёўся да сваёй першай парты. Настрой, канечне, быў сапсаваны. І на сябе, і на Валіка была крыўда — ад недаказанасці, ад незразумеласці... Усё гэта лёгка можна было б паправіць, не на гэтым, дык на наступным перыпынку, не сёння, дык заўтра... Але Цім быў усяго толькі хлапчуком, да таго ж хлапчуком вясковым, а гэта значыць сарамлівым. Тыя пачуцці і думкі, што перапаўнялі яго, здаваліся яму занадта «саладжавымі» і пафаснымі, каб дзяліцца імі нават з самым лепшым, самым блізкім сябрам. Да таго ж калі б нават ён перамог сябе і захацеў іх выказаць, у яго наўрад ці атрымалася б гэта. Бо і пачуцці, і думкі існавалі ў ім у выглядзе нейкага бесталковага сумбуру.

Паспрабуем мы гэта зрабіць за Ціма.

«Канечне, Валік! — мог бы сказаць Цім. — Твая праўда. Я з табою згодзен. Вядома, усё гэта несур'ёзна: нейкі «закладнік», выкуп і таму падобнае. Канечне, гэты барадач хутчэй за ўсё самы звычайны чалавек. Але ж як гэта нецікава — жыць без тайны! І чаму яе, тайны, не можа быць у нашых мясцінах? Мы глядзім фільмы і чытаем кнігі пра скарбы, піратаў, незаселеныя астравы, розныя экзатычныя далёкія заморскія краіны, джунглі, саванны і прэрыі — але чаму не дапускаем, што незвычайнае можа быць і ў нас пад бокам?

Вось ты, Валік, вучышся на выдатна. Гэта значыць, што ў Вялікай Паляне ты пасля школы не застанешся. Усе з'язджаюць, і ты паедзеш. Але я застануся тут! Я ніколі, ні на якія залатыя горы не прамяняю ўчарашняга нашага кар'ера, нашага лесу, нашай рэчкі. Некалі я замяню бацьку і стану гаспадаром тут. Усё гэта маё. Я люблю гэтую зямлю. Яна не здаецца мне бяднейшаю за землі заморскія.

Ты спытаеш, пры чым тут барадач? А пры тым, што мне не ўсё роўна, што за чужакі тут, на маёй зямлі, селяцца. З чым яны сюды прыходзяць. Што яны тут, у маім лесе, робяць. І я разбяруся — чаго б мне гэта ні каштавала!»

Вось прыкладна які б атрымаўся маналог, калі б Цімавы сумбурныя пачуцці перакласці на «дарослую» мову.

Аднак жа вялікая гэта рэч — сяброўства! Хай не адразу, а недзе на палавіне ўрока Валіку самым неверагодным чынам перадаліся сябравы думкі. Бы нейкія электрамагнітныя хвалі дайшлі ад першай парты да апошняй. Ён успомніў, як учора не забіў гол, а Цім суцяшаў яго — адзіны з усёй каманды. Прыгадалася, як у тым годзе ён хварэў, а Цім кожны дзень прыходзіў да яго ў адведкі, расказваў, што новенькага ў школе, увогуле ў вёсцы... І яшчэ многа рознага дабра ўспомнілася, якое сябар яму рабіў. Ніколі ні на што не крыўдзячыся. Усё даруючы. А, ён, Валік? Разныўся тут — «засмяюць», «па міліцыях зацягаюць»... Мужчына называецца. Будучы салдат, абаронца Беларусі, які баіцца ўвязвацца ў гісторыю; а гісторыя ж і сапраўды цікавая! Чаму б за гэтым барадачом і не прасачыць? Чаму б не разнюхаць, што за ён? Каго хавае ў леснічоўцы? Канечне, усё гэта акружана тайнай. І хутчэй за ўсё тайнай нядобраю, цёмнаю... Можа, сапраўды гэта які крымінальнік? Ці нават маньяк-забойца? Тады што — сёння хтосьці чужы ў яго ахвяраю, а заўтра нехта з аднакласнікаў? Заўтра — Цім? Або ён, Валік?

Аж мурашкі па скуры пабеглі ад такіх малюнкаў.

Валік ціхенька, па міліметры выдраў са сшытка аркушык. Разгарнуў слоўнік з алфавітам. Пасля доўгага старання нарэшце была ім зашыфравана і адпраўленая Ціму запіска такога зместу:

«Я згодзен на ўсё, што ты скажаш».

Зрабіўшы гэта, Валік адчуў палёгку. Нават крыху і прыемна было, што ён не прэтэндуе на ролю камандзіра, а згодзен быць падначаленым.

Адказ прыйшоў імгненна. На другім, чыстым баку запіскі без усялякага шыфру напісаны былі ўсяго дзве літары — «О. К!» Яшчэ адна загадка Цімавага характару: з тройкі на чацвёрку па ўсіх іншых прадметах пералазячы, ён выдатна ведаў мовы — і родную, і рускую, і англійскую, на здзіўленне і зайздрасць усяму класу.

## Раздзел IV

*Дык хто такі барадач? — Шчаслівыя чатыры месяцы. — Першы снег. — Паляванне на ліса. — Дварняк Барс здзіўляе Крушынскага. — Што лепш: ліс ці заяц?*

Аднак тут пакінем на некаторы час нашых юных сяброў, будучых нашых Холмсаў і Каломбаў. Канечне, яны яшчэ вернуцца, яшчэ прымуць у нашай гісторыі самы актыўны ўдзел.

А мы з вамі давайце зазірнем у таямнічую хатку-леснічоўку. Паглядзім, што там робіцца, і заадно пазнаёмімся з героем дарослым, які вось ужо два раздзелы нецярпліва прабіваецца на старонкі аповесці, патрабуючы і да сябе ўвагі.

Цім не памыліўся. З некаторага часу барадач жыў у сваёй «бярлозе», як называлі яго лясную хатку жыхары Вялікай Паляны, не адзін. Вось толькі клопат у яго быў крыху іншы, чым меркавалася Ціму. Барадач ламаў галаву не над тым, як абмяняць свайго «вязня» на выкуп, а як бы хутчэй… пазбавіцца ад яго. Няпрошаны госць гэты перамяшаў усе яго планы. Перабіў той размераны ход жыцця — спакойнага, непрыкметнага, адзінокага, ціхага

жыцця, якое барадаты чалавек вёў вось ужо чатыры месяцы.

Але па-парадку.

Пачнем з таго, што назавём імя і прозвішча дзіўнага чалавека —Барыс Крушынскі. Быў ён высокі і дужы. Веку меў гадоў трыццаці, аднак барада старыла яго. (Цім, напрыклад, сцвярджаў, што яму нават за сорак — дзецям чамусьці заўсёды ўласціва перабольшваць гады дарослых.) Упершыню аб'явіўся Крушынскі ў ваколіцах Вялікай Паляны ў верасні гэтага года. Купіў у лясніцтве закінутую маленькую хатку, сяк-так прывёў яе да ладу і пачаў жыць. Ніхто не ведаў хто ён, адкуль, чаму так упадабаў тутэйшыя мясціны, чаму пасяліўся не ў вёсцы, не на тых, пад дачы адведзеных участках, дзе сяліліся апошнімі гадамі чужакі, а ў глухім лесе... Загадка! Людзей Барыс Крушынскі ўпарта пазбягаў. Хіба што толькі ў вясковай краме, куды прыходзіў з лесу раз ці два на тыдзень, можна было пачуць ад яго пару слоў; тады ж высветлілася, што ён крышку шапялявіць. Але хіба гэта можна ставіць чалавеку ў віну? Абы жыў ціха, не чапаў нікога — ну і хай жыве сабе. Нябось зімою, калі марозы прыцiснуць, хуценька ўцячэ назад у горад!

Аднак прамінулі тры доўгія дажджлівыя месяцы восені. Крушынскі нікуды ўцякаць не збіраўся. Праўда, і зіма не спяшалася ў тым годзе. Як мы казалі ўжо, толькі за тыдзень перад славутай хакейнай баталіяй выпаў першы снег, але які снег! Як ён ішоў! Спачатку сярод белага дня пацямнела, потым аднекуль прысунулася чорна-фіялетавая хмара. Яна паўзла, пакуль не закрыла сабою ўсё неба. Затым пакрысе пачала апускацца на зямлю. Было вельмі ціха. І раптам сярод гэтай цішыні і цемнаты паваліў з хмары снег — менавіта паваліў, густымі пухнатымі камякамі... Пачаўся ён пад вечар, і йшоў усю ноч.

Толькі пад раніцу ўсё супакоілася, улеглася. У леснічоўцы было непрывычна светла. Крушынскі ляжаў з расплюшчанымі вачыма на сваім самаробным тапчане пад цёплай коўдрай. З двара шкробся ў дзверы, радасна і нецярпліва скуголіў Барс. Малады сабака яшчэ не разумеў, што гэта здарылася з наваколлем, чаму так змянілася ўсё, што не пазнаць? І як гаспадар можа вылежвацца такой парою? Калі самы час перахапіць што на зуб, які кавалак хлеба — і ў лес, на прастор! Усё абгледзець, абнюхаць, пераканацца — ці паўсюль такія змены, ці гэта толькі тут, каля хаткі?

Крушынскі ляжаў і глядзеў у столь. Яму было лёгка і радасна. Ён адчуваў сябе маладым, дужым, здаровым. Які ж ён малайчына, што адважыўся кінуць ўсё, і перабраўся сюды! Што так крута павярнуў сваё жыццё. Гэтыя чатыры месяцы і праўда былі самыя шчаслівыя за ўвесь яго хоць і не дужа вялікі, але няпросты, пакручасты век. Але досыць! Цяпер ён іншы. Цяпер усё ззаду — як дурны сон, як былая хвароба... Ён усё пачне «з чыстага ліста». Ранейшыя памылкі больш не паўторацца, сам лад цяперашняга яго жыцця не дапусціць іх паўтарэння. Тут, у лесе, ізаляванаму ад вялікага свету, адгароджанаму дрэвамі ад людзей, нішто больш не зможа яму пагражаць. Цяпер ён проста застрахаваны (наіўна думалася Крушынскаму) ад непрыемнасцяў і бедаў.

Больш таго — было ў ім цяпер адчуванне, што менавіта сёння павінна з ім здарыцца нешта важнае, радаснае. Нейкая ўдача чакае яго наперадзе. Падняўшыся, ён апрануўся і выйшаў на двор. Сонца, снег і марозік! Сабака танцаваў перад ім на задніх лапах. Зусім побач, каля самай леснічоўкі, на белым цаліку выразна адбіваўся ланцужок лісіных слядоў. Крушынскі нагнуўся над імі. Звер, а гэта быў лісавін, прабягаў зусім нядаўна. Сляды былі свежыя.

— Барс ты Барс, — з дакорам выгаварыў сабаку Крушынскі. — Барсік ты, а не Барс! Такога ліса не пачуць за дваццаць метраў! Хоць бы голас падаў. Ну, і на што ты пасля гэтага варты?

Сабака, паскульваючы, скакаў яму на грудзі. Праўда — на паляванні толку з яго не было аніякага. Але Крушынскі прывязаўся да яго і не хацеў мяняць на выжла. Як сябар чалавеку, дык дварнякі лепшыя за пародзістых.

Час, аднак, не цярпеў. Трэба было спяшацца, пакуль ліс не адышоў далёка. Зборы былі нядоўгія. Бушлат на плечы, хлеб, соль, курыва за пазуху, лыжы на ногі, стрэльбу за плечы — і наперад!..

Лёгка кажацца, цяжка робіцца. Не менш трыццаці кіламетраў адмахаў у той дзень Крушынскі. Ліс быў стары і разумны. Відаць, адразу ж зразумеўшы, што сабака нікудышны, ён нават не спрабаваў хітрыць. Бег строга па прамой, нідзе не зварочваючы. Ён не расходваў сілы на розныя «петлі», на «скідкі», не здвойваў следу — проста пёр сабе ўперад, і не збаўляючы ходу, і не паскараючы. Мяккі снег трымаў яго, а пад цяжкім чалавекам, хоць той і быў на лыжах, правальваўся. Гадзіны праз тры гэтага гону Крушынскі заўважыў, што апынуўся ў такой мясціне, дзе і не бываў ніколі... Ліс знік. Да ўсяго, пачало псавацца надвор'е. Прапала ў хмарах сонца, з нізкага неба пасыпаўся дробны сухі сняжок. У лесе адразу пацямнела. Вось ўжо і вецер падзьмуў, і мяцеліца закружыла снег, на вачах замятаючы сляды... А вось ужо і сапраўдная завіруха пачынае закручваць... Так, чаго добрага, і заблудзіцца можна!

Крушынскі свіснуў сабаку. Таго нідзе не было. Крушынскі развярнуўся і хутчэй пашоргаў лыжамі па сваім ледзь прыкметным следзе назад.

Сабака сустракаў яго каля хаткі радасным брэхам. Ён, стаміўшыся, проста вярнуўся дамоў. А завіруха між тым круціла ўжо на ўсю поўніцу. І мароз

мацнеў: нядобры гэта знак, да страшнай непагадзі — калі і снег ідзе, і мароз не адлягае...

— Ідзі, паляўнічы! — Крушынскі пашкадаваў сабаку і ўпусціў яго ў хату.

Сам запаліў лямпу і знясілена прысеў на табурэт. Барс, віляючы хвастом, падыйшоў і паклаў яму на калена лапу. Крушынскі раптам насцярожыўся.

— Пакажы, пакажы!...

Ён ухапіў гэтую лапу, потым другую, пільна іх агледзеў. На лапах быў жоўты жвірысты пясок; быў ён і ў адтулінах падушачак, і вакол кіпцюроў. Жоўты пясок зімою?! У такі снег? Вось табе і Барс!

— Ах ты малайчына! — пашкамутаў яго за вушы ўзрадваны Крушынскі.

Барс знайшоў нару і капаў яе. Лісу ўдалося падмануць чалавека, але сабаку ён недаацаніў. Цяпер трэба толькі вярнуцца на тое месца, дзе абарваўся след лісавіна, і яшчэ — цяпер трэба будзе больш давяраць сабаку.

А завіруха гуляла сабе на волі! Гуло ў лесе, трашчалі, рыпелі, плакалі, скардзіліся на нешта хвоі. Сыпала снегам ў шыбінку. Прыйшла сапраўдная зіма. І падобна, што такі рэжым усталюецца цяпер надоўга. Уночы будзе сыпаць снег, бушаваць завея, а раніцай — сонца, звонкая цішыня і велічныя дрэвы ў сваіх белых, іскрыста-сляпучых футрах...

Акурат так на наступны ранак усё і было. Толькі цяпер Крушынскі вырашыў адправіцца ў паход па ліса яшчэ раней, чым учора. На цаліку за ноч з'явіліся новыя сляды. У тым ліку і зайцавы, якія не ўгадаць проста немагчыма.

Крушынскі спыніўся ў нерашучасці. Як быць? Пастаяў, падумаў... Што ліс? Нікуды ён з нары не дзенецца. Ды і ці захоча сёння сабака шукаць яе, тую нару?.. А заяц — вось ён, побач. І здабыць яго прынамсі нашмат лягчэй, чым ліса... Ах, паплыў

перад носам пах тушанай зайчаціны, з цыбулькаю, якой поўна ў хатцы, з моркваю, якой поўна ў каморы!.. Крушынскі аж заплюшчыўся і заўсміхаўся, да таго прывабнай была карцінка. І — плюнуў на ліса, памяняў маршрут, паслізгаў па новых слядах. Ішоў асцярожна, што-раз нагінаўся, стараючыся разабрацца ў заечых хітрасплятаннях.

А сабака гойсаў сабе па лесе.

## Раздзел V

*Нядоўгі зайцаў пір. — Промах. — Удача. — Ізноў завіруха. — Барс у другі раз праяўляе кемлівасць. — Нечаканы «трафей».*

Вялікі, адкормлены заяц-бяляк прыпадняўся і застыў слупком. Шырокія пляскатыя ноздры яго разам з характэрнай губою варушыліся, уцягваючы ў сябе снежнае, мноствам лясных пахаў насычанае паветра.

Перад ім была чыстая, як лоб, палянка. Ніжнія лапы хвой, што акружалі яе, прагнуліся пад цяжарам снегу і ўмёрзлі ў яго. Адразу за палянкай пачыналася нізіна, дзе раслі салодкія дубцы лазы, маладога асінніку, дзе нават траплялiся дзікія яблынькі. Але, каб там апынуцца, трэба было перасекчы адкрытую палянку.

Заяц чмыхнуў і сярдзіта забарабаніў лапамі па снезе, падымаючы белы пыл.

Вакол было ціха, калі не лічыць дакучлівага стракатання сарокі. Але сарока — птушка дурная, яна і ад таго стракатаць можа, што ўбачыла зайца, ці проста так — горла прачышчае... Словам, ніякіх падазроных пахаў і гукаў беляку не ўнюхалася і не ўчулася. Аднак гэта быў стары, вопытны звер, загартаваны ў баях з іншымі зайцамі; паспеў ён пабываць і ў больш сур'ёзных сітуацыях. Аб гэтым

сведчыла адно яго вуха, правае, якое падымалася толькі напалову. Відаць, паспытаў касы альбо чыіхсьці зубоў, альбо паляўнічага шроту. Таму за свой нялёгкі, поўны небяспекі век заяц прывучыўся верыць не так органам пачуццяў, як інстынкту. Горкі вопыт падказваў яму, што падманлівая гэтая ціншыня, небяспечная... Але ж есці трэба!

Нарэшце заяц адважыўся. Падкінуўшы тоўсты, курдзюкаваты зад ён тым не менш за адзін скачок апынуўся на паляне. Адразу ж прысеў, зліўся са снегам, зрабіўся проста белай купінай, зусім непрыкметнаю. Усё было ціха. Смялей ужо, цяпер кароткімі скачкамі ён перасёк небяспечнае месца, пакуль не апынуўся-такі ў жаданай лагчынцы. Спакуслівa, перад самым носам вытыркалася з-пад снегу тонкая парасля.

Заяц абнюхаў бліжэйшы дубчык. Асцярожна, пярэднімі зубамі адкусіў — і вось ужо сківіцы яго варушацца хутка-хутка, пераціраючы халодную пругкую мякаць, а касыя вочы прыплюшчваюцца ад насалоды...

У гэты самы момант і ўдарыла. Стрэл прагучаў як гром з яснага неба. Дзесяткі вострых чмяліных джалаў пранізалі беляка. Ён, нібы разагнутая спружына, распластаўшыся ў паветры, з месца зрабіў неверагодны скачок. Затым, пятляючы, знік у лесе, як і не было яго ніколі.

На паляну выкаціўся Крушынскі. На хаду ён ўстаўляў у стрэльбу новы патрон. Пад'ехаў бліжэй...

— Міма! — ад прыкрасці нават салдацкую шапку-вушанку сарваў з галавы і з размаху кінуў пад ногі.

Потым падняў яе, абабіў снег. Ужо спакайней, ужо змiраны з няўдачай, агледзеўся больш пільна. І тут нейкае падабенства ўсмешкі рассунула яго бараду. Усё ж зачапіў! На месцы зайцавага піру засталася поўсць, некалькі карычневых шарыкаў

памёту, якія яшчэ дыміліся, і, самае галоўнае, плямкі крыві.

Крушынскі кінуўся ў той бок, дзе знік заяц. Там быў круты спуск у нізіну. Крушынскага ледзь не сцягнула, у апошні момант паспеў ухапіцца за хвойку. Выбраўся, бокам ставячы лыжы, наверх.

Сабака быў тут як тут. Ён абнюхаў заячы памёт, тады адданымі вачыма ўставіўся ў гаспадара.

— Ну што, — сказаў яму Крушынскі, — дзе наш абед падзеўся? Куды паскакаў? Што мы цяпер есці будзем?

Барс толькі малаціў хвастом па снезе. З усім ён быў згодны. Крушынскі скінуў з плячэй рукзак. Дастаў адтуль паўбохана хлеба, дзве цыбуліны і запалкавы карабок з соллю. Разламаў хлеб на дзве роўныя часткі.

— На!

Атрымаўшы долю, Барс адбегся, лёг пад хвою, заціснуў лапамі мёрзлы акраец і пачаў грызці з трэскам, як костку. Свой кавалак Крушынскі пасаліў, збольшага абцёр цыбуліну і таксама прыняўся за абед. І на яго твары, і на мордзе сабакі чыталася асалода — акурат як у таго зайца, што не так даўно жаваў на гэтым самым месцы дубец... Так, так, Крушынскі! Гэта табе не мінскія валютныя рэстараны, цяпер ты ведаеш кошт гэтаму нішчымнаму мерзламу акрайцу...

Ён схрумстаў цыбуліны, даеў хлеб, укінуў у рот крошкі, выцер вусны і бараду. Сабака даўно стаяў перад ім і, зазіраючы ў вочы, прасіў дабаўкі.

— Усё! — сказаў Крушынскі.

І гэты дзень прайшоў упустую. Змяркалася. Зноў, як і ўчора, вецярок, зноў сняжок... Крушынскі адзеў рукавіцы, ускінуў на плячо рукзак. І не было б і сёння яму ўдачы, каб не выпадак, каб шлях назад не супаў з маршрутам параненага зайца. Не паспеў ён, аб’ехаўшы кручыну, спусціцца ўніз, як сэрца яго

страпянулася ад радасці. Ён убачыў след. Мала таго: на снезе была кроў, ды не кропелькамі, а суцэльнай паласой!

Шлэпаючы лыжамі, Крушынскі пабег па гэтым следзе. Кроў гусцела. Зачапіў, добра зачапіў! Між тым паводзіны параненага зайца былі зусім незразумелымі. Скаціўшыся пасля смяротнага стрэлу з кручыны, цяпер ён, відаць, з апошніх сіл караскаўся... назад, наверх. Крушынскі адкінуў лыжы і, правальваючыся ў снег, ледзьве не на карачках таксама палез угару. Стрэльба і заплечнік толькі перашкаджалі.

Заяц ляжаў, крыху не дабраўшыся да вяршыны. Цяжкі пад'ём і рана знясілілі яго. Ён быў нежывы. У шкляных вачах адбіваліся заснежаныя хвоі, пад якімі ніколі больш не гуляць касому...

Крушынскаму, аднак, было не да рамантыкі і не да шкадавання. Дзелавіта ён схапіў беляка за заднія лапы, узважыў, затым анучкаю абцёр ад крыві і схаваў у рукзак.

Што значыць радасць здабытчыка! Зусім інакшай была дарога назад. Ноша ў заплечніку не цягнула, а наадварот, толькі надавала сілы. І ўжо не баяўся, як учора, Крушынскі заблудзіцца, хоць надвор'е было рыхтык учарашняму. Мяла завея, пачынаў заводзіць сваю пагрозлівую песню лес... Крушынскі апусціў вушы ў шапцы. Снег мітусіўся паміж дрэў, ім забівала вочы, ён ляпіўся да каўняра бушлата і барады. Трэба было прыбаўляць ходу, бо калі пачнецца ўчарашняя замець...

Раптам, сярод свісту завірухі і стогну дрэў, Крушынскаму пачуліся дзіўныя гукі. Ён не адразу зразумеў, што гэта голас ягонага Барса. Прычым цяўкае, як сапраўдны паляўнічы сабака, што высачыў звера! Крушынскі паспяшаўся туды. Рука механічна сашморгнула з пляча стрэльбу.

Барс, прыпадаючы да снегу грудзьмі, цяўкаў настойліва і жаласна. Перад ім быў пагорачак велічынёй з мурашнік. Спачатку Крушынскі так і падумаў — гаўкае, дурны сабака, на мурашнік! Усё ж падыйшоў бліжэй. Нагнуўся... і ўскрыкнуў.

— Што такое?!

У самаробным логаве, скурчаны, увесь засыпаны снегам ляжаў чалавек. Крушынскі разгублена азірнуўся. Вакол быў глухі лес. На міг слізганула думка — завярнуцца і ўцячы. Не ўблытвацца ні ўва што! Мала яму прыгод было на вяку! А рукі тым часам не слухаліся гэтых подленькіх довадаў мозга, а ўжо рабілі сваю работу. Ён скінуў лыжы, сцягнуў рукавіцы і хуценька абчысціў з чалавека снег. Затым прыпадняў яго.

Чалавек застагнаў. Божа мой, жывы! Ён быў жывы. Відаць, зусім нядаўна залёг тут, да таго ж знізу падаслаў хваёвых лапак, ды і апрануты быў у кажушок, а паверх шапкі абвязаны нейкім лахманом ці хусткаю... Ён быў на дзіва лёгкі і Крушынскі зразумеў, што гэта не дарослы, а падлетак, гадоў трынаццаці-чатырнаццаці.

— Уставай, малы! — патармусіў яго Крушынскі.

Аніякай рэакцыі. Трэба было хутчэй штосьці рабіць. Крушынскі прысеў, узваліў хлопчыка на спіну — рукі слаба ашчаперылі яго за шыю. Падняўся. Не такі хлопчык і цяжкі... Ззаду яго будзе падтрымліваць рукзак...

Крушынскі сціснуў зубы, на міг заплюшчыўся і падалося яму, што не лес гэта шуміць, а вухае мінамёт і трашчаць аўтаматныя чэргі, і што не снегам і хвоямі пахне, а порахам і крывёю...

## Раздзел VI

*У леснічоўцы. — Лекаванне. — Сюрпрыз. — Неспакойная ноч. — Выправа ў горад.*

Доўгай была Крушынскаму гэтая дарога да свайго жытла. А завея ўсё гуляла! Толькі лес, ды снег, ды ледзь не да зямлі прыгнутая постаць чалавека, які з жывой ношай за плячыма прабіраецца некуды праз завіруху...

Калі нарэшце паказалася леснічоўка, Крушынскі быў да таго зморany, што нават не адчуў радасці.

У цёмнай, выстуджанай за дзень хатцы ён зваліў сваю паклажу на тапчан. Сам апусціўся побач на халодную падлогу. Ён быў увесь мокры ад поту. Дрыжэлі намучаныя рукі і ногі. Прыхінуцца б вось так галавою да тапчана і заснуць... Хоць не надоўга — на паўгадзінкі... Нават не распранаючыся, седзячы...

— Устаць! — уголас скамандаваў сам сабе. Падхапіўся.

Намацаў пад столлю газавую лямпу (ні электрычнасці, ні радыё ў леснічоўцы не было), зняў з крука, паставіў на табурэтку, бліжэй да тапчана. Запаліў. Схіліўся над хлопчыкам. Той быў у непрытомнасці, але дыхаў даволі роўна.

Цяпер за справу. Перш за ўсё распаліць грубку, добра, што дровы прынесены загадзя... Неўзабаве пацягнула з грубкі дымам, смалістым, едкім і прыемным адначасова, потым затрашчалі, ўхапляючыся агнём, сухія дровы. Яшчэ больш асвятлілася хатка. Былі ў ёй, акрамя тапчана, стол, дзве табурэткі ды шафа — усё нязграбнае, самаробнае, з сасновых дошак.

Крушынскі прысеў перад грубкай на карачкі, ліхаманкава прадумваючы далейшую чарговасць

дзеянняў. Як часта бывае, у самы адказны момант лезла яму ў галаву што заўгодна, акрамя галоўнага — што робіцца пры абмаражэннях?!

Канечне, спачатку агледзець чалавека. Потым, здаецца, расцерці... Чым? Як на зло, няма ні спірту, ні гарэлкі, ні настойкі! Нічога. Снегу затое поўна. Чыгун дастаць... Таз ацынкаваны... Таз вываліўся з рук і загрымеў на ўсю хатку. Крушынскі наступіў на яго нагою і спалохана азірнуўся на тапчан. Потым зазлаваў на сябе — чалавек жа не спіць, а ў непрытомнасці, яго ратаваць хутчэй трэба, а не спакой берагчы!

Прабіў паленам лёд у вядры, што стаяла каля парога, напоўніў вялікі чыгун. У грубку яго. Сам схапіў парожняе вядро, і на двор. Вецер ледзь не вырваў ў яго з рук дзверы. Завіруха так і мерылася ўварвацца ўсярэдзіну жытла і напракудзіць там. Стараючыся выбіраць снег мякчэйшы, без крупінак, без ільдзінак, Крушынскі нагроб яго поўнае вядро, яшчэ і ўтрамбаваў. Барс увесь час лез пад рукі, раздражняючы. Ізноў барацьба з дзвярыма... Сабака-такі заскочыў у хатку, куляю прашмыгнуў у цёмны куток за грубкаю і затаіўся там.

Усё было гатова. Цяпер можна прыступаць да лекавання. Крушынскі высыпаў снег у таз. Ну, і з чаго пачынаць? З ног, рук — ці з твару?.. Але твар не падобна каб быў абмарожаны. Шчокі ружовыя, і не больш.

Крушынскі, асцярожна падсунуўшы пад хлопчыка рукі, паклаў яго ўпоперак тапчана. Паспрабаваў расшморгнуць маланкі на боціках — не паддаліся, замерзлыя былі, да таго ж старыя, паламаныя.

Тады ён, ціха лаючыся, проста павырываў іх «з мясам», зняў боты, сцягнуў шкарпэткі... Ногі ў хлопчыка былі халодныя, як снег, але не белыя, як бывае пры абмарожаннях, а звычайныя,

бледна-ружовыя. Падобна, ён быў проста моцна знясілены, а абмарозіцца не паспеў.

Усё адно расціраць трэба! Толькі не твар. Твар пажадана змазаць салам — на ўсялякі выпадак, каб перастрахавацца. Сала ёсць, праўда, салёнае, але гэта лепш, чым не было б ніякага... Далей што? Успомніў — ні ў якім разе нельга абмарожанага чалавека да цяпла! Зойдзецца «ў шпар», тады ад свербу можна проста загінуць.

Галава думала, ўспамінала, а рукі рабілі.

Крушынскі расшпіліў гузікі кажушка. Пад ім аказаўся світэр, а пад світэрам яшчэ і джэмпер — як след укручаны быў чалавек. Штаны спартыўныя, тоўстыя, байкавыя... Ён намацаў гумку на поясе, сцягнуў іх, шпурлянуў у кут; туды ж адправілася і ўсё астатняе.

Разматаў хустку — у кут яе! Матузкі чорнай злямчанай трусавай шапкі завязаны былі вузлом пад самай барадой. Каб доўга з імі не валэндацца, выцягнуў з кішэні паляўнічы нож і перарэзаў іх; зняў шапку — у кут... Падцягнуў яшчэ бліжэй да тапчана табурэт з лямпаю. Трапяткое святло падала хлопчыку на твар.

Толькі цяпер Крушынскі змог як след разгледзець свайго ўратаванца. Хлопчык быў каратка, амаль пад нуль падстрыжаны. Ад гэтага вушы і рот здаваліся ў яго завялікімі, затое нос быў маленькі і кірпаты. Доўгія пушыстыя вейкі. Поўныя вусны, паўраскрытыя ад дыхання. Белая палоска зубоў...

І чым пільней углядаўся Крушынскі, тым больш нядобрае нейкае прадчуванне ахоплівала яго. Незвычайны быў гэты твар, нейкі аж задужа прыгожы — нежывой, гіпсавай прыгажосцю... Ці гэта непрытомнасць рабіла яго такім? Паміма волі Крушынскі перавёў вочы ўніз.

Кашулю на грудзях адтапырвалі недвухсэнсоўныя бугаркі.

Усё яшчэ не верачы сваёй здагадцы, ён пацягнуўся рукой да кашулі, каб задраць яе. У гэты момант хлопчык расплюшчыў вочы.

Гук аплявухі аглушыў Крушынскага. Адно, што паспеў ён падумаць, адскочыўшы ад тапчана і пацiраючы шчаку — адкуль сілы ўзяліся?!

— Ты... што?! — ускрыкнуў ён. — Ты... дзяўчынка?!

У адказ яму толькі Барс загырчэў са свайго кутка.

Хлопчык... ды не, у тым і справа, што не хлопчык — дзяўчынка падхапілася і села на тапчане. Падабрала пад сябе ногі, стараючыся схаваць іх пад кашулю. З Крушынскага яна не спускала насцярожаных, цёмна-вішнёвых сваіх вачэй. Той таксама стаяў і не варушыўся. Выгляд у яго быў разгублены.

— Гэтага толькі не хапала!..

Потым, стараючыся гаварыць лагодна, каб не напалохаць яе, сказаў:

— Ну, галоўнае, што ажыла. Значыць, ёсць яшчэ сілы? Значыць, не так усё і кепска?

У грубцы даўно кіпеў чыгун. Вада ў ім паднялася пенаю і залівала вуголле. Крушынскі намацаў доле першае, што пад руку — здаецца, дзяўчынкавы штаны, выцягнуў чыгун. Адразу ж і бухнуў яго на падлогу. Гарачы! Добра яшчэ, што не разліў.

Ён пакасіўся на дзяўчынку. Яму здалося, што яна ледзь стрымлівае смех.

Гэта ўзбадзёрыла яго. Чаго яму зусім не хацелася, дык гэта палохаць яе.

— Так, — сказаў ён строга. — А цяпер паслухай сюды. Мне ўсё роўна, хлопчык ты ці дзяўчынка. Але трэба ведаць, ці не абмарозілася ты. Табе трэба

расцерці рукі, грудзі, спіну — чуеш? Так што здымай з сябе зараз жа ўсё.

Не паспеў ён зрабіць і кроку да тапчана, як дзяўчынка ўскрыкнула і закрыла твар рукамі.

— Ты што — во? — ён пакруціў каля скроні пальцам. — Зрэшты, рабі як хочаш! Тваё здароўе, а не маё. Мусіць, не так ты і абмарозілася, калі маеш столькі энергіі...

Яна маўчала, але рукі, праўда, ад твару адняла.

— Добра, давай тады так. Не хочаш расціраццa, дык хоць бы пераапраніся ў цёплае і сухое. Зараз усё дам.

Рашэнне было правільным. Не выганяць жа яе, раз выратаваў і прывалок сюды. Трэба проста менш думаць, а рабіць тое, што рабіў бы ў такім выпадку на яго месцы любы нармальны чалавек. Тады сумленне ў яго будзе чыстае. А ўжо як захоча паводзіцца яна — закапрызнічае, ці паслухае яго — яе справы!

Крушынскі пакорпаўся ў сваёй самаробнай «шафе». Таксама яшчэ праблема: што выбраць? Не свае ж кальсоны, у якіх яна схаваецца да плеч... Знайшоў сарочку — здаецца, тое што трэба... Чыстая, цёплая, доўгая, можа сысці за «піжаму». Памацаў, прыклаў яе да шчакі — халодная. Пагрэў перад грубкаю. Увесь час дзяўчынка пільна сачыла за ягонымі дзеяннямі.

— На, — Крушынскі, не рызыкуючы больш прыбліжацца, кінуў сарочку на тапчан. — сваё здымай зараз жа!

На двух табурэтках перад грубкаю, ад якой даўно ўжо хвалямі разыходзілася цяпло, сяк-так прыладкаваў свой стары кажух і яе кажушок. Выліў у таз ваду з чыгунка, пабоўтаў пальцам. Вада была гарачая.

— Яшчэ трэба снегу... Пайду набяру. А ты пакуль пераапранайся.

Свой мокры бушлат накінуў на плечы. Высунуўся на двор. Завея і не думала ўнімацца! Крушынскі адшукаў у двары зацішак. Закурыў. Ну, гісторыя! І шэнціць жа яму на такое!.. Добра — галоўнае, не нарабіць глупства. Хай пераначуе, а раніцай пабачым.

Ён вярнуўся ў хату. Дзяўчынка ў яго сарочцы сядзела на краі тапчана, апусціўшы ногі ў таз з вадою. Сарочка абвісла ў яе на плячах, а па даўжыні даставала ніжэй каленяў. Яе кашуля валялася каля грубкі сярод іншага хлам'я.

— Вось бачыш, якая ты разумніца! — пахваліў Крушынскі. — Ну, а цяпер, можа, разбярэмся? Хто ты? Як тваё імя? Як ты апынулася ў лесе?

Ніякай рэакцыі.

— Мяне завуць Барыс, ці дзядзька Барыс, ці проста дзядзька — як хочаш, так і заві. Тут я жыву. Да гэтага жыў у горадзе. Што яшчэ табе расказаць... Можаш мяне не баяцца — людзей я і сам баюся. Таму сюды і «пераехаў».

Дзяўчынка зноў толькі моўчкі зіркнула на яго. Аднак падалося яму, што ў яе вачах ужо няма ранейшага страху. Наадварот — цяпер была ў іх цікавасць.

— Слухай, — спахапіўся ён, — ты ж, мусіць, галодная!

А дужа і даць няма чаго. Заяц, праўда, дык яшчэ прыгатуй таго зайца... Крушынскі кінуўся ў «камору» — маленькую прыбудову без вакон, якая служыла яму і складам, і халадзільнікам, і псграбам. Адпаласаваў кавалак мёрзлага ружовага сала... Усё? Мала ж яму, аказваецца, трэба. На гасцей яўна не разлічаны яго прыпасы.

Вярнуўся ў хатку. Кажух з табурэткі прэч — на вешалку, пачастунак на табурэт... Сала, цыбуліна, часнычына, хлеба краец... Слоік малінавага варэння, які Крушынскі адкрыў зубамі і ўставіў туды лыжку.

Затым перанёс табурэт да тапчана. «Прама ў ложак, сервіс вышэйшага гатунку!» — падумаў іранічна.

Дзяўчынцы было, аднак, не да кулінарана-сэрвісных тонкасцяў. Яна адразу ж накінулася на ежу. Крушынскі назіраў за ёй ледзь не са страхам. Усяго, здаецца, набачыўся ён у жыцці, і што такое голад, ведаў таксама. Неяк у Афганістане, патрапіўшы ў засаду (заблудзіліся па ўласнай дурасці), яны, чацвёра разведчыкаў, аказаліся адрэзанымі ад сваіх. Трое сутак яны вымушаны былі пластом ляжаць на бахчавым полі, уціскаючыся тварамі ў гэтую чужую, пыльную зямлю. Калі цямнела, яны елі дыні. З таго часу Крушынскі проста ўзненавідзеў гэты плод, нават пах...

Але такога малюнка, як быў цяпер перад ім, яму яшчэ назіраць не даводзілася.

Дзяўчынка ела прагна і без разбору. Варэнне «закусвала» салам, хрумстала часнычынай, упівалася вострымі зубкамі ў чарствы хлеб... Затым цыбуліна — і зноў поўная лыжка варэння... Яна чвякала і прыцмоквала. На гэтыя гукі Барс не вытрымаў і вылез са свайго сховішча. Нясмела наблізіўся да тапчана, павільваючы хвастом. Дзяўчынка працягнула яму кавалак хлеба. Барс шчоўкнуў зубамі і імгненна праглынуў яго, ледзьве не разам з пальцамі.

— Ану, месца! Вечна галодны! — Крушынскі тупнуў нагою і сабака знік за грубкаю.

З такімі тэмпамі дзяўчынка, канечне, наелася вельмі хутка. Цяпер яна глядзела на Крушынскага ўдзячнымі соннымі вачыма. «Дзякуй Богу, — падумаў ён, — значыць, і праўда, не так яна не абмарозілася, як проста згаладалая была».

— Ну, а цяпер скажаш што-небудзь? Звычайна дзякуюць у такіх выпадках, — сказаў ён, прыбіраючы табурэт з недаедкамі.

Раптам ён убачыў, што дзяўчынка паказвае яму на свой рот. Ён так і застыў з табурэткаю ў руках.

— Ты што... нямая?!

Яна кіўнула галавой: так.

— Ну і ну! Час ад часу не лягчэй... Але ж ты чуеш? І ўсё разумееш?

Ківок галавою: так.

— Ужо нешта... Пачакай! У мяне ж недзе павінна быць...

Крушынскі палез у сваю «шафу», пакапаўшыся там, выцягнуў аднекуль з-пад бязлізны школьны сшытак ў клетку і агрызак хімічнага алоўка:

— Вось — я ж помню, што недзе быў! На, пішы.

Дзяўчынка толькі сумна ўсміхнулася і адвяла яго руку са сшыткам.

— Дык ты што ж... і пісаць не ўмееш?! — ад усяго гэтага Крушынскі сам ледзь не анямеў. — Колькі табе гадоў?

Яна растапырыла пальцы, спачатку дзесяць, потым тры.

— Трынаццаць? Табе трынаццаць гадоў? І ты дасюль непісьменная? Зараз я звар'яцею... Вось ужо сапраўды: не было ў бабы клопату, дык купіла парася; не было ў цябе, Крушынскі, турбот, дык знайшоў сабе «кватарантку»...

— Ну вось што мне з табою рабіць? — спытаў, як няраз пытаў у свайго Барса, які таксама ўсё разумее, толькі сказаць не можа.

Дзяўчынка, усміхаючыся, пацiскала плячыма. Крушынскі ўбачыў, што яна ўмлела ад ежы, што ёй даўно хочацца спаць.

— Так, давай, дарагая, у ложак, — і на гэты раз яна і не падумала аслухацца. Пакорліва шмыгнула пад коўдру, выцягнулася там. Крушынскі накінуў зверху яе высахлы за гэты час, цёплы кажушок: — Пастарайся ўспацець, добра?

Дзяўчынка кіўнула, засынаючы. Ён закрыў далоняй святло лямпы, аднёс яе на стол. Затым, стараючыся не грымнуць чым-небудзь, знайшоў у «каморы» дзве пустыя бутэлькі: паўлітровую пластмасавую і звычайную, з-пад піва. Спаласнуў шкляную кіпнем, каб адышла пасля холаду. Напоўніў абедзьве вадою і падсунуў дзяўчынцы адну пад бок, другую ў ногі — замест грэлак.

Ён сам з ног валіўся ад стомы, але работы яшчэ быў непачаты край. Хоць бы той жа заяц. Бо чым яе карміць заўтра? У кутку хаткі было спецыяльнае прыстасаванне накшталт «шведскай сценкі». Падвязаўшы да адной з пярочак зайца за заднія лапы, паставіўшы ўнізе таз, Крушынскі спрытна аблупіў яго — скура злезла, як панчоха. У тазе разабраў. Выкінуў на двор кішкі і выпусціў следам сабаку — цяпер, нябось, не замерзне, пад'еўшы. Ногі, грудзіну — у чыгун, лісту туды, перцу, морквы, хай тушацца... Разаслаў каля грубкі на падлозе кажух, зверху бушлат. Нармалёва! Закрыў юшку ў грубцы, патушыў лямпу... Але не паспеў улегчыся, як зноў падскочыў.

Дзяўчынка задыхалася. Хуткае выздараўленне яе аказалася падманам. Яна зноў была ў непрытомнасці. Лоб яе быў усеяны буйнымі кроплямі поту і гарачы, што тая вада, якой Крушынскі напаўняў свае «грэлкі». Яе яўна тэмпературыла. Крушынскі паднёс да лямпы правую руку — было тры гадзіны ночы.

Так да самай раніцы і не ўдалося яму змружыць вачэй. Ён сядзеў каля хворай, трымаючы на яе гарачым ілбе далонь. Толькі гэта і памагала, толькі тады дзяўчынка пачынала дыхаць раўней. Нарэшце пад раніцу яна супакоілася. Жар спаў. Лоб быў мокры, але зусім не гарачы. Усё адно Крушынскі цяпер не мог паверыць, што гэта сапраўднае

выздараўленне. Дужа крохкім, кволым, ненадзейным яно было. Гарачка магла ў любы час вярнуцца.

Калі за вакном ледзь-ледзь развіднела, Крушынскі нацягнуў на сябе джынсы, світэр. З шафы дастаў новую скураную куртку і высокія, з тоўстай падэшваю чаравікі. Паклаў іх у сумку. На галаву не стаў адзяваць нічога, толькі прычасаўся без люстэрка.

З двара прымкнуў хату, але такім чынам, што калі піхнуць з сярэдзіны, дык замок спадзе. Стаў на лыжы. Радасны сабака сабраўся быў з ім. Крушынскі крыкнуў на яго, нават нямоцна перацягнуў лыжнай палкаю. І Барс застаўся ў двары, тужліва гледзячы гаспадару ўслед.

А той слізгаў лясной дарогай ў бок шашы. Сёння не было завірухі, але не было і сонца, проста пахмурна і здорава. Марознае паветра студзіла галаву. Адразу прапала санлівасць. Фізічны рух адначасова разганяў і тлумныя думкі. Усё будзе добра! Павінна быць добра. Цяпер трэба толькі, каб яму крышку пашэнціла…

Час ад часу ён спыняўся і правяраў палкаю глыбіню снегу на дарозе. Пад снегам была мёрзлая цвярдыня. Гэта радавала яго.

Каля самай шашы ён выгледзеў густы куст ядлоўцу. Схаваў у яго лыжы. Стоячы, пераабуўся ў «гарадскія» чаравікі, сумку са старымі павесіў у тым жа кусце на сучку. Захінуў галінамі і выйшаў на дарогу.

Шаша была пустая, адно пазёмка гуляла па ёй. Цяпер ад Крушынскага ўжо нічога не залежала. Можна спакойна курыць і чакаць. І спадзявацца на ўдачу. Канечне, мала верагодна, што такога падазронага барадатага пасажыра, які стаіць на пустой шашы сярод лесу, кінуцца наперабой падбіраць «папуткі»…

Алё яму і праўда сёння шэнціла. Першая ж машына аказалася міжгародн\u0456м рэйсавым аўтобусам. Крушынскі падняў руку. Чатыры габарытныя фары наблізіліся, асляпілі яго і пранесліся побач, абдаўшы яго халодным ветрам. Крушынскі пабег услед. Аўтобус звярнуў на ўзбочыну і спыніўся.

Неўзабаве Крушынскі сядзеў у цёплым, цёмным, амаль пустым салоне. Аўтобус з кожным кіламетрам набліжаў яго да Мінска. Прымхлівы, як і большасць мужчын, што пабывалі на вайне, Крушынскі па-дзіцячы радаваўся сваёй удачы: ад таго, як пачнецца дзень, думалася яму, будзе залежаць і тое, як ён пройдзе.

## Раздзел VII

*Горад. — Незгаворлівы прыватнік. — Крушынскі «выбівае» пазыкі. — Не так гэта проста. — Даўжнік. — Жанчына з хлопчыкам. — Шчодрасць Крушынскага. — Зноў нерваванне.*

Аўтобус падруліў да Усходняга вакзала. У Мінску развіднявала, патухалі ліхтары.

Крушынскі выйшаў на перон і паглядзеў на гадзіннік. Было сем раніцы. Ён падняўся на другі паверх. У буфеце купіў кавы, хаця кавай тое, што яму падалі, назваць было цяжка. Светлы прытарны салодкі напой, які так нагадваў армейшчыну! Толькі два глыткі і зрабіў Крушынскі, і з прыкрасцю адсунуў шклянку.

Трэба дзейнічаць — дарма што рана! Трэба даставаць грошы. Ён выцягнуў з кішэні паперку і падышоў да таксафона, прыкрытага пластыкавай накрыўкай-паўкругам. Пакуль набіраў нумар, барада шоргала аб халодную стылую трубку. На тым канцы доўга не адказвалі, ён з рашучай упартасцю націскаў

на кнопку паўтору. Калі ж у трубцы нарэшце шчоўкнула і сонны сярдзіты голас абазваўся:

— Алё! — Крушынскі, ні слова не кажучы, трубку павесіў. «Кліент» быў дома, гэта адзінае, што яму трэба было ведаць.

Ён выйшаў на перон. Машын на стаянцы было больш штук пятнаццаць, і каля кожнай стаў, пакручваючы ключы на пальцы, дзяцюк.

— Таксі бярэм!

— Куды трэба, малады чалавек?

Барадаты «малады чалавек» не звяртаў на прапановы ўвагі. Іншамаркі яго не цікавілі. Спыніўся ён каля чырвонага брудненькага «масквіча». Вадзіцель сядзеў у машыне. Крушынскі расчыніў дзверцы і моўчкі бухнуўся на пярэдняе сядзенне.

— Куды едзем? — спытаў шафёр, кладучы руку на шарык лапкі перадач.

Гэта быў зусім малады хлопец, з вусікамі, у скуранай карычневай куртцы, з нагруднай кішэні якой высоўваўся сотавы тэлефон. Крушынскаму хлопец спадабаўся.

— Барыс, — ён працягнуў руку.

Хлопец не адразу паціснуў яе.

— Стась, — назваўся, памарудзіўшы. Затым дэманстратыўна дастаў з кішэні свой тэлефон. — Але? Я ўзяў пасажыра. Знаходжуся на Усходнім вакзале.

Крушынскі адно пасміхнуўся ад ад гэтай наіўнай перастрахоўкі. Разам з тым крыху і прыкра зрабілася. І што яго так баяцца ўсе? Чым ён выклікае гэтую падазронасць? Барадою? Ці за гэтыя чатыры месяцы адзіноты ён сапраўды так моцна змяніўся, што і ў паходцы яго, і ў паглядзе з’явілася штось дзікаватае?

— Так, Стась, — сказаў ён, — ты мне спатрэбішся сама мала на дзве гадзіны. Атрымаеш сто даляраў.

— Згода. Дык куды паедзем?

— Не ведаю. Трэба падумаць.

— Што за жарты?!

Стась усхапіўся, нават дзверцы расчыніў, нібы збіраючыся клікаць таварышаў на дапамогу.

— Калі ты баішся, ці не верыш мне, я знайду другога, — сказаў Крушынскі.

Падзейнічала. Стась супакоіўся, зачыніў дзверцы. Толькі перапытаў недаверліва:

— Сто даляраў?

— Сто.

— Палову цяпер! — рашуча запатрабаваў Стась.

— Цяпер у мяне няма ніводнага беларускага рубля, не тое што даляраў.

Вочы ў Стася зрабіліся крулымі.

— Так! Давай, дзядзька, з машыны!

— Стась, калі ў мяне няма грошай з сабою, — цярпліва пачаў тлумачыць Крушынскі, — гэта не значыць, што іх не будзе праз дзесяць хвілін. Мне вінаватыя. Мы пад'едзем і забярэм пазыку. Я разлічуся з табою. Што тут незразумелага?

— А калі ты падманіш? Пойдзеш і не вернешся?

— Вярнуся.

— А калі ён табе нічога не дасць?

— Паедзем у іншае месца. І вось што, Стась. Я першы раз у жыцці бачу такога чалавека. Цябе так часта падманвалі? Як ты жывеш, нікому не верачы?

Стась маўчаў. Пальцы яго нервова барабанілі па рулі.

— Калі я не змагу раздабыць грошы, ты застанешся ні з чым, — дадаў Крушынскі, якога самаго пачало ўжо стамляць гэтае ўламванне.

— Называй адрас! — згадзіўся нарэшце шафёр.

Аднак не паспела машына крануцца з месца, як раптам зноў спынілася.

— Пачакай — можна ж прасцей! Навошта бензін дарма паліць? На, пазвані яму, спытай, ці аддасць, — Стась працягнуў Крушынскаму тэлефон.

— Дзівак ты. Хіба ж такія рэчы так робяцца? Не паспею я яму пазваніць, як яго і след прастыне. Тут знянацку трэба. Галоўнае, я ведаю, што ён цяпер дома.

— Лагічна, — не мог не згадзіцца Стась.

Хвілін праз дзесяць «масквічок», паблукаўшы крыху па брудных і калдыбаністых вулічках Чыжоўкі, спыніўся каля старога, але дагледжанага дома. Металічныя дзверы пад'езда зачынены былі на кодавы замок. Крушынскі званіць не стаў, а прыняўся прахаджвацца каля пад'езда ўзад-уперад. Стась заглушыў матор і цярпліва чакаў.

Чакаць давялося нядога. Неўзабаве дзверы расчыніліся. Дзўчынка на ланцужку вяла на шпацыр лупатага маленькага бультэр'ера. Крушынскі прытрымаў нагою дзверы:

— Дзякую! Ключы забыў.

У ліфце падняўся на трэці паверх. Зверху, над дзвярыма кватэры, на яго пазіраў аб'ектыў відэадамафона. Ён націснуў кнопку. Чаканне, чаканне — відаць, там, у кватэры яго разглядалі.

— Адчыні. Гэта Крушынскі, — сказаў ён, папярэджваючы абавязковыя «хто там?», ды «што вам трэба?»

— Барыс, ты? — залабуніў, прапускаючы яго ў аграмадную пярэднюю, мужчына ў адных трусах і ў майцы. Ён быў заспаны і босы. — Дзе ты знік? Што ў цябе за выгляд? Барада… Праходзь, калі ласка, распранайся! Чаго так рана? Што здарылася?

Не адказваючы ні наводнае з гэтага каскаду пытанняў, Крушынскі стаяў у парозе. Ён і не праходзіў і не распранаўся. З дзвярэй цягнула скразняком. Крушынскі прычыніў іх.

— Мне трэба грошы, — сказаў ён.

— Ах, як не ў час, Барыс! — даўжнік апусціўся на пуф, абхапіў галаву рукамі і аж застагнаў. — Дзе ж набрацца тых грошай?! Усё кепска, усё развальваецца…

Крушынскі акінуў вокам гасціную. Не падобна было, каб так усё кепска, каб так усё развальвалася. Нават памерамі сваімі гасцёўня не намнога саступала пляцоўцы ў кар'еры, дзе хлопчыкі гулялі ў хакей. Па цэнтры знаходзілася лесвіца, якая вяла наверх — кватэра была дзвюхпавярховая.

— Так што прабач — зусім не ў час ты… Пазней як-небудзь, — цягнуў сваю песню даўжнік.

— Канчай хныкаць, — груба перапыніў яго Крушынскі.

Усё гэта было яму задужа знаёма. Як толькі справа пачынала тычыцца вяртання пазыкі, так ва ўсіх без выключэння яго даўжнікоў аказвалася кепска. Усё ў іх развальвалася. Гэта ён, калі сам круціўся ў падобных сферах, мог не шкадаваць грошай, любіў раскідвацца імі направа і налева, пазычаў усім без разбору. Яму тады і ў галаву не магло прыйсці, як цяжка, амаль немагчыма потым будзе гэтыя грошы вярнуць. Усе як адзін даўжнікі, хаваючы вочы, уздыхалі, хітрылі, вілялі, скардзіліся, якія чорныя насталі для іх гадзіны, якія яны цяпер бедныя. Спачатку Крушынскі нават верыў гэтаму. А калі і не верыў, бачыў, што яго падманваюць, дык часта ў яго проста не хапала духу настаяць на сваім: прыгразіць, стукнуць па стале кулаком… Канечне, даўжнікі, ведаючы яго характар, як маглі карысталіся гэтым. Калі ж ён перабраўся ў леснічоўку, дык проста плюнуў на даўгі. Грашовае пытанне знікла само сабою. Невялічкіх зберажэнняў хапала яму, яшчэ і на Барса заставалася.

Але цяпер яму раптам стала крыўдна. Момант быў зусім іншы. Цяпер яму пазарэз трэба былі грошы — не для сябе.

— Ну, няма, хоць ты тут…

Нічога не кажучы, Крушынскі ступіў да яго. Даўжнік, які па-ранейшаму сядзеў на пуфіку, зрабіўся белы. Дужай рукой Крушынскі згроб яму на грудзях майку.

— Калі ты мне абяцаў аддаць? Праз два тыдні? А прайшло колькі? Два гады! Але я і цяпер бы цябе не чапаў — мне асабіста грошы больш не патрэбны. Яны трэба іншаму чалавеку!

Крушынскі адштурхнуў даўжніка, той ледзь не зваліўся з пуфіка. Жаласліва паглядаў на Крушынскага знізу ўверх, паціраючы шыю.

Крушынскі змякчыўся.

— Добра, тады давай так, — ён выцягнуў з кішэні нейкую брудную пакамечаную паперку. — Вось твая распіска. Тут чорным па белым, тваёй рукою ўказана, што ты вінен мне пяцьсот. Правільна? Аддай мне палову — і гэтая паперка твая. Дзвесці пяцьдзесят спісваю. Толькі цяпер, вось зараз жа аддай.

— Няма, — адварочваючыся, прашаптаў даўжнік. — Можаш забіць, задушыць мяне тут — няма ні капейкі, ні цэнта!

— Дзе тэлефон?

— Там, — кіўнуў галавою ўглыб гасцінай даўжнік. — Куды ты? Выцеры чаравікі, гразі нанясеш…

Крушынскі, не звяртаючы на яго плаксівае канючанне ўвагі, пайшоў, куды было паказана. Трубка-тэлефон ляжала на часопісным століку.

— Колькі слядоў нарабіў…

На самым версе лесвіцы, відаць, устрывожаная шумам, захінаючыся ў халат, паказалася маладая жанчына. Убачыла чужога і застыла на месцы. А за ёй выглянуў і хлапчук гадоў дзесяці. Ён кулачкамі праціраў заспаныя вочы і ціснуўся да матулі.

Крушынскі больш чым трэба затрымаўся на ім паглядам.

Пакуль ён набіраў нумар, каля ног і сапраўды нацякла лужына. Даўжнік з анучкаю поўзаў на карачках і падціраў яе. Такая спакуса была даць яму носца пад зад! — але Крушынскага стрымліваў, як ні дзіўна, выгляд гэтых жанчыны з хлопчыкам. Абое былі яны нейкія затраўленыя і спалоханыя. Крушынскі раптам падумаў, што не цукар жыццё ім сярод гэтай раскошы...

— Прывітанне. Гэта я, — сказаў ён, калі слухаўку на тым канцы нарэшце паднялі.

— Хто я? — спытаў нічуць не зменены сябраў голас.

— Крушынскі. Мне тэрмінова трэба грошы.

Сябар памаўчаў, падыхаў у трубку.

— Многа?

— Сама мала трыста даляраў.

— Так, трыста даляраў... У мяне няма, але... Дзе ты цяпер знаходзішся?

— Тут, у аднаго, — грэбліва зірнуў уніз Крушынскі. — У Чыжоўцы.

— На машыне?

— Так.

— Я ведаю, дзе дастаць. Пакуль пад'едзеш, усё будзе гатова.

— Дзякую.

Крушынскі кінуў на столік трубку і, ні на кога не гледзячы, ні з кім не развітваючыся, цяжка патэпаў да выхаду. Даўжнік з мокрай анучаю ў руцэ пабег следам.

У дзвярах Крушынскі спыніўся. Выцягнуў распіску, скамечыў і кінуў даўжніку пад ногі.

— На. За тое, што слядоў нарабіў. Паркет перасцелеш.

Прыпаўшы носам да экрана, даўжнік назіраў за Крушынскім да таго часу, пакуль не пад'ехаў ліфт і

Крушынскі не знік у ім. Тады павярнуўся і толькі цяпер убачыў на лесвіцы жонку з сынам.

— А вы што тут не бачылі?! — гаркнуў, як бы помсцячы за тое прыніжэнне, якому яны былі сведкамі.

— Пакладзі яго спаць, і прынясі сухую анучу! Бадзяюцца тут валацугі розныя... Гэты паркет ведаеш колькі каштуе? Адна шашка столькі, колькі табе і за месяц не зарабіць!

Жонка заплакала. Даўжнік падняў распіску і, не чытаючы, хуценька разарваў яе на дробныя кавалачкі.

## Раздзел VIII

*Стары сябар. — Крушынскі дастае грошы. — Дзе знайсці доктара? — Сябрава забыўчывасць, якая неўзабаве ледзь не абрынецца на Крушынскага бядою.*

Стась запытальна паглядзеў на Крушынскага.

— Трэба заехаць яшчэ ў адно месца, — абыякава прамовіў той, ямчэй усаджваючыся на пярэднім сядзенні.

— Так я і ведаў! Ды за каго вы мяне прымаеце! — ад абурэння Стась аж перайшоў на «вы».

Крушынскі моўчкі вылез з машыны. Перад тым, як ляпнуць за сабою дзверцамі, сказаў, чаканячы кожнае слова:

— З-за тваіх дурных выбрыкаў цяпер памірае чалавек. Трынаццацігадовая дзяўчынка.

І пайшоў, не азіраючыся, рукі ў кішэнях, па тратуары. На самым павароце, дзе вулічка выходзіла на бульвар, машына дагнала яго.

— Барыс! Ідзі сядай.

Голас у Стася быў зусім спакойны. Мабыць, на ўсё махнуў чалавек рукою, з усім прымірыўся. Будзь як будзе!

Усё гэтак жа моўчкі Крушынскі сеў у «масквіч».

— Куды цяпер?

— На Адоеўскага.

— Зразумела... Што, з гэтым нічога не атрымалася? — спагадліва запытаў Стась.

— Нічога. Гэта былы мой камандзір, — неахвотна патлумачыў Крушынскі. — Служылі разам у Афгане. Калі б хто тады сказаў, што ён ператворыцца ў такога...— не дагаварыў, адно рукою махнуў.

— Бываюць, — пагадзіўся Стась. — Дык што: так-такі зусім нічога не даў?

— Не ён мне, а я яму. Падараваў распіску на пяцьсот даляраў.

— Як... так?!

— Кінуў яму пад ногі.

Стась толькі прысвіснуў:

— Бываюць жа людзі! — невядома каго маючы на ўвазе — Крушынскага з яго шчодрасцю, ці сквапнасць былога яго баявога камандзіра.

Па дарозе да вуліцы Адоеўскага Стась яшчэ спытаў:

— А гэтая хворая дзяўчынка дзе? Не ў Мінску?

— Не, не ў Мінску, — коратка адказаў Крушынскі.

Далей абодва маўчалі.

Дом на Адоеўскага аказаўся звычайнай маласямейкай. Не было тут, канечне, ні дамафонаў, ні відэафонаў; дзверы ў пад'езд ледзь целяпаліся на пакрыўленых, разбітых завесках. Затое ў «холе», у фанернай кабіне тырчэла абвязаная хусткай вахцёрка.

— Да каго?!

— Да сябра, — адказаў Крушынскі.

— Дакументы!

Замест адказу ён усунуў у ваконца «шпакоўні» сваю барадатую галаву. Паклаў далонь на расчынены журнал, закрыўшы ёю ледзьве не ўсю старонку.

— Я спяшаюся, — сказаў ён ціха, нават ветліва. — Да таго я ж я злы. Чапаць мяне не раю. Усё зразумела?

Яшчэ і як зразумела! Да паўсмерці зляканай бабцы засталося толькі вачыма правесці гэтага страшнага кашлатага грамілу. Добра яна ведала з уласнага вопыту, чаго ад такіх можна чакаць.

Ліфт, канечне, не працаваў. Крушынскі пехатою падняўся на сёмы паверх. Доўгім вузкім калідорам пайшоў у канец яго, да кутняга пакоя. Дзверы ў пакой былі насцеж.

Крушынскі не быў тут ужо гады два, але цяпер, калі зайшоў, падзівіўся, што абсалютна нічога тут не змянілася. У малюсенькім калідорчыку стаяў той самы старэнькі халадзільнік і вуркатаў, як перагружаны трактар. У пакоі былі тыя самыя аблупленыя пажоўклыя шпалеры. У кутку была тая самая электраплітка на дзве фаеркі[1]. Як і два гады назад, так і цяпер на патэльні смажылася яечня; усё там скварчэла і пырскі ляцелі на сцяну.

Але самае цікавае, што і сябар не змяніўся. Тое ж заношаная кашуля ў клетку, тыя ж растаптаныя патнофлі на нагах, тая ж неахайная прычоска і шчаціна на шчоках, тыя ж добрыя сумныя вочы.

Затое сябар пры з'яўленні Крушынскага аслупянеў. Спачатку ён нават не пазнаў яго.

— Ну, барада! — яны абняліся. — Як жа ты ўмудрыўся так пастарэць за гэты час? Ці, наадварот, памужнеў?

[1] Камфоркі.

— Затое ты — не, — азіраючыся, з усмешкай, якую нязвыкла было бачыць, сказаў Крушынскі.— Аднак выбачай — зусім няма часу! Дастаў грошы?

— На, — сябар працягнуў яму неахайны жмутак. — Тут дзвесці пяцьдзесят даляраў — ледзь выклянчыў па знаёмых... І маіх сто. Усяго трыста пяцьдзесят. Хопіць? — і дадаў вінавата: — Больш у мяне няма.

— Хопіць, — Крушынскі, не гледзячы, запіхаў жмутак у кішэню. — Я аддам.

— Пра гэта не думай. Калі будуць, тады і аддасі.

— А сам як? — спытаў Крушынскі.

— Не прападу! Тэлевізар новы купіць збіраўся, а раз такая справа — пазаву знаёмага майстра, хай стары падладзіць, хоць адну праграму. Хопіць з мне!

— Дзякую, — Крушынскі моцна пацiснуў яму руку. — Ты і праўда не змяніўся...

— Дык а ты як? Хоць у двух словах!

— Магу нават у адным — цудоўна, — адказаў Крушынскі без усмешкі. — Вось толькі... непрадбачаныя абставіны.

— Гэта з-за іх табе спатрэбіліся грошы?

— З-за іх. Калі-небудзь потым усё раскажу.

Крушынскі выйшаў ужо на калідор, як раптам, успомніўшы штсьці, хутка вярнуўся.

— Слухай! Ты мне яшчэ можаш памагчы! Тэрмінова трэба доктар. Але... — ён замяўся. — Як бы табе сказаць... Нелегальны доктар, неафіцыйны... Тут такая справа, што не хочацца «свяціцца»...

— Разумею. Няма праблем. Гэтую просьбу нашмат лягчэй выканаць, чым першую, — засмяяўся сябар. — Тут літаральна праз вуліцу, у прыватным сектары, жыве адзін доктар. Даўно на пенсіі, але, здаецца, практыкуе яшчэ.

— Адрас хутчэй! -- папрасіў Крушынскі.

— Ды не помню я адпраса. Там гэтых завулачкаў, што сабак нярэзаных. Сам знойдзеш: направа, потым налева і першы дом з цэглы. Ён там адзіны на рагу... Ды я табе зараз з вакна пакажу!

— Не трэба, дзякую. Я знайду.

— Вось яшчэ што... Ён трохі любіць гэтае дзела... Можа быць не транспартабельным.

— Я яго дастаўлю куды трэба жывога ці мёртвага, — сур'ёзна паабяцаў Крушынскі.

— А куды даставіш? Дзе ты цяпер?

— У лесе, — не азіраючыся, адказаў Крушынскі.

Сябар правёў яго да ліфта і вярнуўся ў пакойчык. Зняў патэльню з пліткі. На сцяне вісеў фотаздымак: маладыя белазубыя ваенныя ў панамах, сярод якіх з цяжкасцю, але можны было пазнаць і Крушынскага, і гаспадара пакойчыка. Побач з фота — нейкая грамата ў рамцы з трэскнутым шклом.

## Раздзел IX

*Доктар. — Аб тым, як грошы змяняюць людзей. — Зной леснічоўка. — Медыцынскі агляд. — Дыягназ. — Класці на стол пальчаткі — кепская прыкмета! — Стасева падзяка. — Доктар просіць паперку і ручку.*

Менш чым праз гадзіну шустры «масквічок» ужо выбраўся з Мінска і паляцеў па шашы, курачы за сабою снежным пылам.

На заднім сядзенні драмаў з чамаданчыкам на каленях пажылы доктар. На шчасце, Крушынскаму ўдалося застаць яго дома. Доктар аказаўся чалавекам справы. Ні аб чым ён не распытваў, ніякіх умоваў не ставіў, згодзен быў ехаць, куды скажуць. Калі ж Крушынскі на месцы адлічыў яму дваццаць пяць

даляраў авансу, паабяцаўшы яшчэ столькі ж, у доктара загарэліся вочы і затрэсліся рукі. Крушынскі аднёс гэта да звычайнай старэчай сквапнасці. Канечне, бедна жыве чалавек, пенсіі не хапае, лектарскай практыкі ўжо няма.

Атрымаў сваю абяцаную палавіну, пяцьдзесят «зялёных», і Стась. І гэтага было не пазнаць цяпер. Куды падзеліся яго асцярога, недавер, раздражненне! Вясёлы, усім задаволены, цяпер ён уключыў гучна прыёмнік і, як салавей, падсвістваў мелодыям.

Ехалі гадзіны паўтары. Нарэшце злева прамільгануў паласаты слуп з указальнікам «в. Вялікая Паляна — 4 км.». Машына праехала яшчэ з паўкіламетра і спынілася. Ледзь прыкметная паваротка вяла ад шашы проста ў лес. Пакуль Крушынскі выцягваў з ядлоўцавага куста лыжы і сумку са старымі ботамі, Стась таксама вылез з машыны і аглядаў заваленую снегам, вузкую дарогу. На твары яго зноў з'явілася заклапочанасць.

— Праедзеш? — спытаў, падыходзячы, Крушынскі. — Я раніцаю ўсю гэтую дарогу абмацаў палкаю. Пад снегам цвёрда.

— Праедзем! — бадзёра адгукнуўся Стась; вось як грошы мяняюць у лепшы бок чалавека. — Колькі ехаць?

— Кіламетры два-тры.

Лыжы Крушынскі прымацаваў на багажніку зверху. Паехалі. Цяпер і апраўдалася, чаму Крушынскі выбіраў на стаянцы машыну з высокай пасадкаю — іншамарка адразу б легла тут на «жывот». Але і масквіч цёгся з горам папалам. Хутчэй нельга было — дужа вузкая дарога, хвоі часта стаялі так блізка, што можна было зашчаміцца паміж імі. Разоў колькі машына забуксоўвала і тады Крушынскаму з доктарам даводзілася штурхаць яе ззаду.

Сярод дрэў узнікла хатка. Пад'ехаць бліжэй было немагчыма. Спыніліся воддаль, на паляне.

— Дык ты тут і жывеш, значыць? — здзівіўся Стась.

— Тут і жыву, значыць. Ды хутчэй вы! — падагнаў доктара, які нязграбна выкульваўся з машыны.

Крушынскаму толькі цяпер, калі ўсё, што ён планаваў, было зроблена і ён апынуўся дома, стала трывожна. Хоць бы не здарылася чаго!

Каля хаткі слядоў, акрамя сабачых, не было. Замок таксама вісеў на месцы. Аднекуль з лесу выскачыў Барс, кінуўся на чужых, забрахаў, прыпадаючы грудзьмі да снегу. Потым убачыў, што людзям не да яго, супакоіўся і пабег аглядаць і абнюхваць машыну.

Дзяўчынка сядзела ў кутку на тапчане. Відаць, сабачы брэх устрывожыў яе. Але выглядала яна куды лепш чым учора. На шчочках была чырвань, вочы свяціліся здаровым бляскам. У Крушынскага адлегла з душы.

Доктар скінуў рукавіцы, ляпнуў іх на стол. Пахукаў на рукі:

— Ну, дзе наш хворы? А што так цёмна ў нас?

Як для Крушынскага, дык было аж занадта светла. Але доктару з непрывычкі, ды пасля двара, ды яшчэ падслепаватаму, канечне, здавалася цёмна.

— Святлей не будзе, — сказаў Крушынскі. — Лямпа ёсць карасінавая, але днём ад яе што толку.

— Ну і ну? Зусім няма электрычнасці?!

— Доктар, рабіце сваю работу.

— Канечне, канечне! Каля акна тут зусім светла... Давайце сюды свайго хворага.

Крушынскі падышоў да дзяўчынкі. Стараючыся гаварыць выразна, міжволі памагаючы сабе жэстамі, папрасіў:

— Уставай, не бойся. Гэта ж доктар. Нічога кепскага ён табе не зробіць.

Яна паслухалася. Адкінула коўдру. Сунула ногі ў валёнкі, якія прадбачлівы Крушынскі паставіў каля тапчана яшчэ раніцай, перад тым, як выправіцца ў горад. Крушынскі працягнуў ёй руку, яна падала сваю; ён падвёў дзяўчынку да стала. Доктар сядзеў на табурэце і бегаў вачыма па хатцы. На твары яго было шчырае здзіўленне, нават недавер. Відаць, раней яму і ў галаву не прыходзіла, што людзі ў такіх умовах могуць жыць цяперашнім часам.

— Доктар, у нас мала часу, — вярнуў яго ў рэальнасць Крушынскі.

Доктар схамянуўся:

— Так, так, і што ў нас?

«Пацыентка» моўчкі стаяла перад ім, сцягваючы на грудзях мужчынскую сарочку, якая знізу гармонікам спадала ёй на валёнкі. Крушынскі сам упершыню ўбачыў яе ва ўвесь рост. Не такая, яна, аказваецца, і малая — яму, высокаму, дастане да пляча.

— Дык як нас завуць? — Не дачакаўшыся адказу, доктар павярнуўся да Крушынскага. — Як яго імя?

— Гэта не ён, — буркнуў Крушынскі, — а яна. Завуць... э-э... Іра. Я вас не папярэдзіў, доктар... Яна не можа гаварыць.

Кашлатыя сівыя бровы ў доктара папаўзлі ўверх.

— А як жа...

— Не, так яна ўсё разумее і чуе! Толькі трэба вымаўляць словы павольней.

— Ага.

Доктар расчыніў саквояж, выклаў на стол навушнікі танометра, «грушу», слухавую трубку, металічны бліскучы малаточак.

— Распранайся да пояса.

Дзяўчынка кінула ўмольна-спалоханы позірк на Крушынскага.

— Рабі, што кажуць. Гэта ж доктар!

Крушынскі дэманстратыўна адвярнуўся. Прысеў перад цёплай яшчэ грубкаю. Пачаў збіраць да ладу яе ўчарашнія рэчы. Усё было ўжо сухое. Боцікі таксама высахлі ўсярэдзіне, толькі зверху пакарабаціліся, і загнуліся насы...

— Так, нос у парадку, — чулася Крушынскаму ад стала. — Язычок высалапім... Яшчэ... Дыхаць... Не дыхаць... Цяпер спіною... Выдатна! Сядзем на табурэтачку... Валёнак здымем, нага на нагу... Так...

Дзяўчынка войкнула, Крушынскі ўздрыгнуў, але не павярнуўся.

— Усё! Можаш апранацца і бегчы ў ложак.

Доктар пачаў складаць у саквояж інструменты. Дзяўчынка забралася на тапчан і зноў закрылася коўдраю да барады. Крушынскі запытальна глядзеў на доктара.

— Выйдзем на двор, — прапанаваў той. Голас у яго быў такі, нібыта яму зараз адкрылася нейкая тайна.

На двары абодва яны закурылі. Падляцеў і пачаў ласціцца да ног Крушынскага Барс.

— А добра тут! — прамовіў доктар. — Ціха, чыста... Гэта мая даўняя мара — таксама жыць аднаму, на прыродзе... Але не магу — сям'я! Жонка хоць і памерла ўжо, але дачка ёсць, зяць, унук... Усім памагаць трэба. Дзеля іх і жыву...

— Што з дзяўчынкаю? — перапыніў гэтыя недарэчныя, нецікавыя яму аўтабіяграфічныя падрабязнасці Крушынскі.

— З дзяўчынкаю? А дазвольце пацікавіцца, хто яна вам?

Пытанне было нечаканае. Аднак Крушынскі справіўся.

— Вы што, з міліцыі? — рэзка сказаў ён. — Ці вы ўсё ж доктар? У нас з вамі якая была дамова? Ні аб чым лішнім не пытаць і нічому не здзіўляцца. За гэта я вам плачу... Зрэшты, магу і адказаць! Што тут такога? Гэта мая... пляменніца. Прыехала ў госці, пайшла адна ў лес, гуляць, ну, і заблудзілася, пасля прыхварэла крыху...

— Усё, усё! Больш чым дастаткова. Пляменніца, дык пляменніца, — ахвотна згадзіўся доктар. — Дык вось, вашая пляменніца — абсалютна здаровая дзяўчынка. Як мы з вамі. Ці, лепш сказаць, як вы — я хоць і сам доктар, але здароўя даўно не маю, як той кравец, што застаўся без ботаў...

— Вы не памыляецеся? — усхвалявана перапытаў Крушынскі.

Яму раптам так радасна стала, што яна здаровая. Цяпер ён гатовы быў забыць, што доктар несімпатычны яму; Крушынскага адразу пачалі раздражняць гэтыя бегаючыя вочкі, гэтыя смяшкі, гэтае ўвесьчаснае пацiранне рука аб руку...

Доктар перахапіў яго позірк.

— Мерзнуць, — патлумачыў, — пальчаткі забыў на стале. Дык вось: у яе невялічкія, зусім бяскрыўдныя хрыпы ў лёгкіх і зноў такі невялічкая прастуда — нават грыпу няма. Абмаражэння, пра якое вы кажаце, я не знайшоў і слядоў. Хіба што, відаць, праводзілася прафілактыка?

— Я расціраў яе крыху снегам.

— Ну і добра. Хоць гэта і не рэкамендуецца, але, як кажуць, не так важныя лекі — абы памаглі! Іншае... — доктар запнуўся.

— Што?

— Прабачце, я вымушаны гэта сказаць. Вы плаціце мне немалыя грошы і я хачу адпрацаваць іх шчыра... Не хацелася б умешвацца, і таму падобнае, але мне здаецца, у Іры — Іра, яе ж так завуць?

— Доктар, бліжэй да справы!

— Што ў яе звычайнае знясіленне. Яна кепска харчуецца. Ёй не хапае элементарных вітамінаў. Потым, не крыўдуйце, яна запушчаная. Ёй трэба проста ў лазню. А таксама каларыйная ежа, чыстая пасцель, святло, цяпло, свежае паветра — словам, хоць бы нейкі перыяд нармальнага жыцця.

Крушынскі думаў аб чымсьці сваім. Доктару падалося, што ён не чуе яго апошніх слоў.

— Ёй патрэбны нармальныя ўмовы жыцця, — паўтарыў ён гучней. — Такі мой дыягназ, ён жа адначасова і рэцэпт.

Гэта Крушынскі пачуў.

— Зразумела. Дзякую. Вы і праўда вельмі харошы доктар, як мне вас і рэкамендавалі.

— Ну, дык! — расплыўся той ва ўсмешцы. — Вы яшчэ не ведаеце, дзе я працаваў, якіх людзі прайшлі пра гэтыя вось рукі...

— Пачакайце. А што ў яе з голасам? Ад чаго ў яе гэта?

— А што ў яе з голасам? — вочы ў доктара смяяліся, рукі пацiралі адна адну. — Гэта абсалютна нармальная, такая ж, як мы з вамі, дзяўчынка. Яна ўсё чуе, усё бачыць, усё разумее і выдатна можа гаварыць.

— Вы жартуеце?

— Малады чалавек, — тут доктар нават пакрыўдзіся, — я больш як трыццаць гадоў меў справу з арміяй, працаваў у розных ваенных шпіталях! Пятнаццаць гадоў запар быў галоўным прыёмных камісій у ваенкаматах! Таму паверце — сімулянта мне вылічыць тое самае, як вам раз плюнуць!

— Зразумела... Яшчэ раз дзякую, доктар, — Крушынскі палез у кішэню, выцягнуў пук скамечаных грошай, адлічыў дваццаць пяць даляраў. — Вось, як і дамаўляліся...

— Прыемна мець справу з такім, як вы!

Доктар грошы пералічыў, разгладзіў, склаў акуратна і схаваў беражліва ва ўнутраную кішэню старэнькага паліто.

— Можна пытанне? Да вас асабіста? — ён, нахіліўшы набок галаву, уважліва разглядаў Крушынскага.

— Канечне.

— Я не мог вас дзесьці бачыць? Паклясціся гатовы, што мы сустракаліся!

— Свет цесны. Магчыма.

— Вы ў Афганістане не служылі?

Крушынскі ўздрыгнуў і ў сваю чаргу ўважліва пазірнуў на доктара.

— Не! — сказаў рашуча. — Я ўвогуле... не быў у арміі.

— Гм... Значыць, памыліўся. Дый то — колькі часу прайшло!

— Многа бывае падобных людзей.

— Гэта праўда...

— Нас чакаюць, — нагадаў Крушынскі. — Чалавек з машынаю.

У хатку ўвайшлі хутка і ўбачылі, што дзяўчынка

стаіць каля вакна і прымярае доктаравы пальчаткі. Злоўленая "на месцы злачынства", яна густа пачырванела, сцягнула пальчаткі і асцярожна паклала на стол.

Доктар запіхнуў іх у кішэню:

— У «масквічы» цёпла, — ён узяў сакваяж.

У дзвярах павярнуўся і падміргнуў дзяўчынцы:

— Ну, шчасліва! Папраўляйся і не хварэй больш.

Крушынскі пайшоў правесці яго. Стась стаяў каля машыны, задуменна, па-філасофску сузіраючы наваколле. Мабыць, і яму падабалася тут. На твары яго напісана было, што ён удзячны свайму падазронаму барадатаму пасажыру, які нечакана

аб'віўся раптам ранняй раніцаю ў тлумным горадзе, выбраў менавіта яго някідкі «масквічок», развеяў яго, Стасевую, падазронасць, ды яшчэ і выцягнуў яго у гэты прыгожы, ціхі, утульны куточак, даў магчымасць супакоіцца, падумаць, падыхаць свежым паветрам — хай сабе і ненадоўга.

Крушынскі аддаў яму пяцьдзесятку.

— Дзякую.

— Гэта табе дзякуй! За тое, што... Зрэшты, сам разумееш!

Крушынскі павярнуўся, кабісці, Стась паклікаў яго:

— Пачакай!

Нырнуў у машыну. Паказаўся зноў -- з пустым пачкам з-пад цыгарэт, на якім штосьбыло запісана.

— Нумар майго сотавіка. Звані, калі будзеш у Мінску. Я заўсёды твой.

Крушынскі падзякаваў.

На шашу, ужо ведаючы збольшага дарогу, «масквічык» выграбся хутка.

— Дзіўны чалавек! — сказаў Стась доктару, усё яшчэ думаючы пра Крушынскага.

Доктар не абазваўся. Ён быў задуменны. Потым прамовіў — ці то да Стася, ці то самаму сабе:

— І ўсё ж яго недзе бачыў!

А калі — цяпер ужо злева — прамільгнуў паласаты слуп указальніка, доктар аж уздрыгнуў, ледзь шыю не скруціў, на гэты слуп азіраючыся.

— У вас блакноцік — можна, калі ласка? І ручку.

Стась адчыніў бардачок, падаў. Скасіўшы вочы, ўбачыў, што доктар запісвае — «Вялікая Паляна, 4 км». Стасю здалося, што ў доктара падрыгваюць рукі.

## Раздзел X

*Сімулянтка. — Гісторыя Вікі. — Недавер Крушынскага. —Разгубленасць яго. — Нядобры план.*

Крушынскі, гучна ляпнуўшы за сабою дзвярыма, увайшоў у хатку.

На душы ў яго адбывалася штосьць незразумелае. З аднаго боку ён адчуваў дзіўную палёгку, проста гара з плеч звалілася, калі пачуў, што дзяўчынка зусім здаровая. З другога — яму было прыкра, што яго, дарослага, разумнага, вопытнага мужчыну так абвялі вакол пальца. Галоўнае, ён не разумеў, навошта дзяўчынцы гэта?

Прыкрасць была і ад таго, што ён ноч не спаў, перажываў за яе, што паўдня прайшлі ў дарэмнай беганіне, клопатах, «разборках» — асабіста яму зусім непатрэбных; і што ён вымушаны быў прывесці сюды чужых людзей, якія зрабіліся міжвольнымі сведкамі ўсяго...

Крушынскі прысеў на табурэт і моўчкі пачаў пазіраць на дзяўчынку. Ён усё яшчэ спадзяваўся, што сумленне прачнецца ў ёй і яна першая пачне размову. Але яна вытрымала гэтую цяжкую паўзу. Толькі што пазірала не на Крушынскага, а ўбок кудысьці. Рукі яе нервова церабілі коўдру, насунутую па бараду.

Крушынскаму нічога не заставалася, як пачынаць самому.

— Так, мая мілая. Ты мне дужа дорага абышлася, каб я цябе вось так проста пакінуў у спакоі, каб ты і далей магла ламаць сваю камедыю. Зараз ты мне раскажаш усё. Праўду раскажаш. Я чакаю.

— А што... сказаў доктар? —ціха спытала яна.

Гэта былі першыя яе словы. І так дзіўна было чуць іх тут, сярод гэтых сцен! Крушынскі аж

уздрыгнуў. Разам з тым ён не мог не адзнычыць, што голас у яе прыемны, нейкі падманліва анёльскі; не псавала яго нават лёгкая асіпласць ад прастуды.

— Доктар сказаў, ты абсалютна здаровая. Так што я цябе ўважліва слухаю. Хто ты, адкуль, як апынулася ў лесе, чаго замярзала там? І галоўнае — што ты думаеш рабіць далей?

Адказ прыгучаў толькі на апошняе пытанне.

— Нічога. Мне няма куды йсці…

— Ну-ну! Гэта ты мне кінь адразу! Няма куды йсці… Што ты гэтым хочаш сказаць?

Яна маўчала.

— Можа, ты сабралася тут жыць? Я правільна зразумеў? Ты думала пра гэта, прызнайся? А ты дапускаеш, што такі варыянт можа не задавальняць некага? У прыватнасці, мяне, гападара?

«Навошта я з ёю так рэзка?» Крушынскі вырашыў змяніць тактыку.

— Добра, — сказаў ён мякчэй. — Давай спачатку. Як цябе завуць?

— Віка.

— Ну вось, ужо лягчэй. Дзе ты жывеш, Віка?

— Нідзе…

— Так, пачынаецца! Добра — а дзе ты жыла раней? Жыла ж ты недзе?

— У Гомелі.

— Ну вось! Так памалу і наблізімся да ісціны. Ужо нешта, ужо можна да нечага прывязацца. Віка з Гомеля, трынаццаць гадоў. Хто ў цябе бацькі? Ну, што ізноў не так? Чаму маўчыш? У цябе ёсць бацькі?

— Не ведаю, як сказаць…

— Кажы праўду.

— Тады — няма ў мяне нікога.

— Стоп-машына!

Крушынскі ўжо бачыў, што кожнае слова давядзецца выцягваць з яе як абцугамі. Але ён быў упарты, да таго ж верыў, што такім спосабам —

задаючы ёй пытанні і хвалячы за кожны адказ, ён свайго даб'ецца.

Так і адбылося. Пакрысе дзяўчынка разгаварылася. За ўвесь час, пакуль пераказвала невясёлую сваю гісторыю, яна ні разу не паглядзела на Крушынскага. Уставілася ў адну кропку — ў ваконца насупраць тапчана, нібы там вісеў якісьці экран, з якога яна і счытвала свой тэкст.

Спачатку Крушынскі слухаў уважліва. На кожнае слова ківаў галавою — так, так, разумею, бывае... У той жа момант ён стараўся не прапусціць ніводнае дэталі, вычэкваючы момант, калі дзяўчынка саб'ецца, заблытаецца і каб на гэтым злавіць яе.

Але яна не збівалася. Гладка, роўна, як па пісаным ліўся прыемны яе голас. І чым больш слухаў Крушынскі, тым больш аповед яе расчароўваў яго. Нейкай дужа сентыментальнай, слёзнай атрымоўвалася гісторыя, занадта ўжо біла на шкадаванне... Мноства такіх гісторый у газетах і па тэлевізары. З імі ўжо настолькі звыкліся , што цяжкавата нават бывае ўвайсці ў страшны іх сэнс — менавіта ад таго, што так многа іх. І ўжо ўспрымаюцца яны як штосьці нармальнае, будзёнае, як прагнозы сіноптыкаў ці праграма тэлебачання.

Нарадзілася і гадавалася наша Віка (калі ёй верыць, канечне) у горадзе Гомелі. Бацькі ў яе не было, а быў айчым, які больш часу праводзіў па турмах, чым на свабодзе. Жылі ўдвух з маці ў маленькім пакойчыку камунальнай кватэры; акрамя іх яшчэ тры сям'і. Кухня, прыбіральня, душ — усё агульнае... Маці ў рабочай сталовай мыла посуд. Словам, добра ці кепска, але жыць неяк можна было. І толькі калі на кароткія перыяды вяртаўся з турмы айчым, гэтае жыццё ператваралася ў кашмар. Пакойчык рабіўся нейкім прытонам. Чужыя людзі — «сябры», лаянка, п'янкі, разборкі...Толькі і засталося з тых часоў у памяці, што заслона цыгарэтнага

смярдзючага дыму ды бразканне парожніх бутэлек пад сталом. Напіваючыся, айчым любіў паказаць сваю праўду і сілу — лупцаваў кожнага, хто пад руку, не глядзеў ні жонкі, ні падчаркі, ні «сябра», ні суседа...

Канчаліся гэтыя гулі заўсёды адным і тым жа. Міліцыя, пратакол, суд — і доўгая камандзіроўка ў казённы дом, які быў для айчыма бліжэй чым родны. Толькі тады нарэшце ўздыхалася ім з маці вальней. Хоць паспаць можна было, хоць урокі спакойна павучыць, хоць паесці — маці часта прыносіла са сталовай аб'едкі (так і сказала Віка Крушынскаму — аб'едкі). Тады ж наладжвалася і справы ў школе, Віку пачыналі хваліць, ставілі добрыя адзнакі... Аднойчы іхні клас вазілі ў Мінск, у цырку там былі, гулялі па скверы Янкі Купалы, які насупраць цырка... Гэта запомнілася, як адна з нямногіх радасцей. Яшчэ неяк на Новы год раздавалі ў школе гуманітарную дапамогу, і ёй таксама дасталіся дзве вельмі прыгожыя мяккія лялькі, прысланыя добрымі людзьмі з Галандыі.

Апошні суд «упаяў» айчыму аж чатыры гады. За гэты час можна было б і забыцца на яго; аднак ён на іх не забыўся. Патрапіў пад амністыю, ужо ўлетку выйшаў на волю. Мала таго, яшчэ і з нейкімі грашыма вярнуўся. Яны там, у турме, рабілі мэблю, вось ім і налічвалі грошы, а пры выхадзе аддавалі. Айчым не пытаў, ці ёсць у падчаркі сукенка, абутак, ці можа яна якую шакаладку хоча... Усё да капеечкі ішло на выпіўку. Адразу ж, нюхам чуючы, паспаўзаліся ўвечары такія, як сам. І назаўтра, і напаслязаўтра... А жнівень канчаецца, у школу вось-вось — і няма ў чым ісці ў тую школу! Аднак і гэта можна было б перажыць неяк, каб не самае страшнае. Не вытрымала маці. І без таго затурканая, бязвольная, хворая, цяпер яна проста пачала співацца разам з айчымам і яго кампаніяй.

Апусцілася, пачала лаяцца, зрабілася раздражнёнай, часценька таксама спаганяла злосць на дачцэ, нібы тая была вінаватая… Страціла працу ў сталовай, а разам і мачымасць нешта прыносіць дамоў. Жылі і «гулялі» на айчымавы грошы, і канца не было відаць гэтаму пеклу.

Паступова дзяўчынка проста перастала з'яўляцца дадому. Бадзяжнічала, добра што верасень быў цёплы. Ні ў якую школу, вядома, не хадзіла. Начавала ў парку на лаўцы, на вакзале, ў падвалах, на паддашшах, у кінутых — пад знос — дамах, нават аднойчы ў скірдзе саломы за горадам «жыла» цэлы тыдзень. Дома яе адсутнасць нікога не трывожыла. Калі заяўлялася зрэдку, каб хоць што перахапіць паесці, бачыла там адно й тое: цыгарэтны дым, пустыя пляшкі і такія ж пустыя вочы людзей, што сядзелі за сталом, а некаторыя і ляжалі пад ім… Ніхто не спытаў, дзе ты прападаеш, дзе начуеш, што ясі? А ёй спачатку сяброўкі-аднакласніцы насілі сякую-такую перакуску, потым перасталі, і зразумела чаму — ім, хатненькім, чысценькім, дагледжаным было сарамна важдацца з ёй, бяздомнай бадзяжкаю. Пачала хадзіць па чужых кватэрах, хлусіла, што яны з бежанцаў, або пагарэльцы. Хто даваў — грашыма, прадуктамі, хто зачыняў перад носам дзверы, некаторыя лаяліся, пагражалі выклікаць міліцыю. Адзін стары хрыч запрасіў у кватэру і хацеў пацешыцца з яе, ледзьве паспела ўцячы.

Тым часам айчым дakанаў свае не такія і вялікія грошы. А піць трэба ж неяк! Хтось з кампаньёнаў прапанаваў мудрае выйсце: прадаць пакойчык, адзінае, што яшчэ можна было прадаць. Тут жа, як з-пад зямлі вырасшы, з'явіліся дабразычліўцы, ветлівыя маладыя людзі, прапанавалі свае паслугі ў афіцыйна-бюракратычным афармленні здзелкі; і праўда — уміг пакой аказаўся прыватызаваны (суседзі, шчаслівыя, што пазбавяцца нарэшце

ад абрыдлай сямейкі, падпісвалі ўсе паперы, не чытаючы), потым прададзены, а ранейшыя гаспадары, айчым з маці, атрымалі свой «барыш» — суму, за якую купілі роўна дваццаць пляшак гарэлкі! Калі Віка чарговы раз прыйшла, як яна лічыла, дамоў, высветлілася, што нават такой дамоўкі ў яе больш няма. У пакоі жылі чужыя людзі. Айчым, расказала добрая суседка, якая заўсёды любіла Віку, за тыдзень прагуляў барыш, узяўся «чысціць» чужыя дачы. Асабліва любіў ён паядаць марынаваныя гуркі з памідорамі ў слоіках. За гэтым заняткам у адной з дач міліцыя яго і заспела, а хуткі суд вярнуў яго ў родныя сцены турмы. Што да маці, дык спачатку яна ашывалася каля крамаў, збірала пляшкі, затым знікла. Бачылі яе нібыта на аўтобусным вакзале, нібыта на чыгуначным...

Канчалася восень. Пачыналася зіма, а з ёю — вятры, снягі, сцюжа.... Удзень Віка бадзялася па горадзе, заходзіла ў магазіны і ў тыя ж вакзалы пагрэцца, жабравала па кватэрах. А ўвечары ехала электрычкай за горад, у адну пустую дачу — там выцягваўся з дзвярэй прабой. Закутвалася ў лахманы і начавала на падлозе. Памятаючы горкі айчымаў вопыт, ні да якіх слоікаў з марынадамі і кампотамі нават не дакраналася, хоць часта якая брала спакуса! Усё ж вечна так цягнуцца не магло. Хтосьці высачыў яе, сказаў гаспадарам. Тыя замянілі не тое што прабой з замком, а нават і дзверы — з драўляных на металічныя. Заставаўся адзін шлях — на вакзал. Там аднойчы яны і сустрэліся, бяздомныя маці з дачкою. Віка ледзь пазнала яе. Матуля была цвярозая, плакала, кляла айчыма, скардзілася, што зусім хворая. Але чым магла памагчы ёй дачка? Маці раптам дастала з адной са сваіх сумак, якімі вечна абчапляныя бамжы, абрывак навагодняй паштоўкі, настолькі стары, пашарпаны, што нічога, што там напісана, амаль нельга было разабраць, толькі

прозвішча. «Гэта нейкая айчымава цётка... з Сімферопаля, — праз кашаль казала маці, — найдзі яе... Можа, і прыме... Пра мяне не думай, ратуйся, дачушка, сама! Падай у ногі, прасі, малі...» — «Ды як мне яе знайці, тую цётку?!» — «Мо ў якім адрасным стале, мо ў міліцыі, мо так хто падкажа... Прозвішча ж вядома!» На развітанне Віка дала ёй грошай, што настарцавала па людзях, сабе пакінула адну драбязу — у лазню схадзіць, ды ў танную цырульню, ды купіць што ў дарогу.

За Гомелем, на Чарнігаўскай трасе яе падабраў першы ж дальнябойшчык. Узрадваная, яна нават увагі не звярнула, што пасля вялізнага моста — развілкі, дзе сыходзілася, перапляталіся і разбягалася ў розныя бакі дзесятак малых і вялікіх дарог, яны паехалі не на поўдзень, а на захад — на Мінск. Калі сцямнела, дальнябойшчык пачаў прыставаць да яе. Яна ўкусіла яго за руку. Тады ён спыніўся і высадзіў яе — нават не высадзіў, а проста выкінуў з кабіны. Вакол быў лес і мяла завіруха. Усё далейшае ён, Крушынскі, ведае. Дзяўчынка пайшла ў гэты лес, стараючыся забрацца чым глыбей, затым наламала пад ніз лапак і легла пад хвойку. Помніць яна толькі, што стала ёй добра, цёпла — і больш нічога.

— Дык ты пагэтаму нямой прыкінулася? — спытаў Крушынскі. — Быў свежы прыклад з гэтым ... дальнябойшчыкам?

Яна кіўнула.

— Ясна... Ану, пакажы мне той абрывак паштоўкі, — папрасіў ён.

— Паштоўка ў сумцы засталася, а сумка ў машыне.

— Як?! — ён аж ускочыў з табурэткі. — Ты адзіны свой паратунак не пры сабе насіла, а ў нейкай сумцы?!

— Ды я помню прозвішча, — абыякава сказала яна, — а больш там не разабраць, усё расплылося.

— Ну і то добра, што хоць прозвішча запомніла... Хаця! — Крушынскі машынальна выцягнуў цыгарэты, але схамянуўся, што ён не адзін ужо. Кінуў пачак на стол. — Хаця мала верагодна, што і там ты некаму будзеш патрэбная... Нават калі і знойдзеш тую цётку... А ўвогуле, — прыйшло яму раптам на розум, — чаму я павінен табе верыць?

Ён уважліва, як бы выпрабоўваючы, паглядзеў на яе. Яна маўчала.

— Во папаў... Во ўліп, дык уліп... Ну, добра, не крыўдуй. Я табе веру. Кожнаму слову. І што цяпер рабіць?

Яна паціснула плячыма.

— Не магу ж я цябе тут пакінуць!

— А чаму і не? — спытала яна раптам, і далей, не даючы яму апамятацца, загаварыла хутка: — Я б да вясны толькі пажыла — і ўсё! Я памагаць вам буду, есці варыць, падмятаць...

Ашаломлены, ён моўчкі глядзеў на яе. І толькі калі ўбачыў, што ў яе вішнёвых вачах — мальба скрозь слёзы, узарваўся:

— Ты думаеш, што ты кажаш?! Падмятаць! Ды табе вучыцца трэба, за партаю ў школе сядзець, а не ў глухамані, без святла без радыё, з чужым дарослым дзядзькам... Калі б ты была хоць хлопчыкам! — вырвалася ў яго міжволі. Ён замоўк тады, зразумеўшы, якое глупства вярзе. А калі б хлопчык, дык што? Ніякіх гасцей! Ні хлопчыкаў, ні дзяўчынак! Не для таго ён так крута мяняў сваё жыццё, каб звязваць яго з кім бы там ні было! Ды і ўвогуле — што гэта такое? Гэта нейкі абсурд, з якога боку ні глянь! Гэта ж не сабака прыбіўся, не кот — чалавек, тут нават чыста юрыдычныя могуць быць наступствы! Трэба ж некаму паведамляць, звязвацца з уладамі, нейкімі камісіямі, міліцыямі... Не, не, ніякай гаворкі тут нават быць не павінна!

— Прабач, я крычу, злуюся, — сказаў ён, астываючы, — гэта лішняе. Давай так. Ты хочаш тут застацца? А мне што казаць людзям? Калі яны даведаюцца?

— А ніхто не даведаецца. Удзень я не буду выходзіць з хаткі, як сёння.

— Не выдумляй! — ізноў давялося яму павысіць голас. — Табе трэба са сваімі аднагодкамі быць, з маткаю, з цёткай крымскаю… не ведаю, з кім! Але не са мною! Ты ж зусім не ведаеш, хто я, што я…

— А я табе веру, — сказала яна спакойна. — І не баюся цябе.

Крушынскі да таго ўразіўся, што нават гэтага «ты» не заўважыў.

— Адкуль такая… ўпэўненасць?

— А проста бачу, які ты. Я ўмею ў людзях добра разбірацца.

Ён гмыкнуў. Смешна было чуць гэтую дзіцячую пахвальбу.

— Разбірацца… З лялькамі табе б яшчэ гуляць, а не ў людзях разбірацца. Значыць, так. Яшчэ раз прашу — выкінь усё з галавы. Ды і бачылі цябе, доктар гэты, і таксісту ён расказаў, канечне! — І зноў запнуўся Крушынскі. Ды што такое! Ён як бы сам хоча пакінуць яе тут, але ўвесь час шукае прычыны, па якіх зрабіць гэта нельга!

— Цяпер, вось зараз, выганяць я цябе, само сабою, не збіраюся. Адпачні, падлячыся… Але заўтра, чуеш? заўтра я адвязу цябе ў горад і пакіну там. Зразумей мяне, Віка. І не крыўдуй. У мяне сваіх клопатаў вышэй галавы. Усё, больш на гэтую тэму не гаворым. Справа вырашана!

Крушынскаму і праўда не цярпелася хутчэй, і хоць бы як-небудзь, скончыць і непрыемную гутарку, і ўвогуле ўсю гэтую гісторыю. Ну, нічога, заўтра яна скончыцца!

Ён адчуў раптам голад; успомніў, што і дзяўчынка ж нічога не ела. А ён, спяшаючыся, і не купіў у горадзе нічога.

— У нас жа зайчаціна сохне ў грубцы!

Замітусіўся Крушынскі, пачаў даставаць гаршчок...

Наталіўшы голад зайчацінай, якая зусім не засохла, а аказалася надзіва смачнай, маўчалі. Крушынскі курыў, пускаючы дым ў лаз грубкі. Ён усё думаў аб нечым. І дзяўчынка думала.

Ён спытаў:

— Дык ты праўду мне расказала? Пра сябе?

У адказ ён пачуў... хіхіканне. Ён здзіўлена ўталопіўся ў яе. І ўбачыў, што яна ляжыць тварам у падушку. Плечы яе ўздрыгвалі. Тое, што Крушынскі прыняў за смех, былі слёзы. Яна ўсхліпвала.

Ён не стаў суцяшаць яе. Толькі моцна зацягнуўся апошні раз, аж да кашлю. Якія тут маглі быць суцяшэнні... Што можа ён зрабіць у гэтай дурной сітуацыі, ды і наогул у гэтым жорсткім, бязлітасным жыцці? У якім нават ён ламаўся, і ледзь выжыў — ён, здаровы, дужы мужчына, салдат! А тут — крохкае, няшчаснае дзіця...

«Як верабей за пазухай», — падумалася яму.

## Раздзел XI

*Раніца. — Зной у горадзе. — Крушынскі едзе ў тралейбусе. — Віка затрымана. — Міліцыянер правярае дакументы. — Метамарфоза. — Вяртанне ў леснічоўку.*

Звечара спаць леглі рана, і прачнуліся рана. Віка, добра ўчара пад'еўшы, выспалася. Яна выглядала зусім здаровай.

— Ты гатова? — без цырымоній спытаў Крушынскі.

Яму трэба было быць суровым, каб не даць пасяліцца ў сабе ні каліва жаласці.

— Гатова...

Папілі гарбаты з малінаю. Крушынскі нецярпліва пазіраў на гадзіннік.

— Усё, апранайся.

Віка пакорліва выконвала ўсе яго загады. Апранулася. За гэтыя суткі адзенне высахла, яшчэ ўчора Крушынскі нават выбіў на снезе яе паліто, а потым вычысціў шчоткаю, і сяк-так падрамантаваў маланкі на боціках.

Да Мінска дабраліся лёгка і хутка. Крушынскі ўжо ведаў, што ёсць такі харошы ранішні аўтобус, які падбірае пасажыраў нават у цемры на лясной дарозе.

На Усходнім вакзале ўсё было рыхтык, як учора. Шэрыя людзі, бляклыя ліхтары, сіплы голас дыспечаркі ў дынаміках... Крушынскі з Вікай стаялі на пероне.

— Апошні раз пытаю — возьмеш грошы? — сказаў ён.

— Не вазьму!

Яна бліснула на яго вачыма і адвярнулася.

— Як хочаш.

Крушынскі і сапраўды не разумеў гэтай яе дурной нейкай прынцыповасці, ці проста капрызу. Яшчэ ўчора ўвечары ім быў абдуманы план: памяняць тыя, што засталіся, даляры, купіць дзяўчынцы хоць бы паліто, набыць білет да Кіева і даць грошай на цягнік адтуль да Сімферопаля. Такі ўчынак падаваўся самому Крушынскаму высакародным. А што ён больш можа зрабіць? Выратаваў яе, адкачаў, прывёз доктара, а цяпер адправіць яе туды, куды яна хацела. Гэтага больш чым дастаткова. Урэшце, яны чужыя людзі. Здзіўленню яго не было межаў, калі дзяўчынка гэты план катэгарычна адвергла. Невядома чаму, але яна і слухаць не хацела пра грошы. Увесь яе выгляд

паказваў — ты здраджваеш мне, выкідваеш, як кацяня, мяне на вуліцу, за гэта хочаш адкупіцца нейкімі грашыма? У гэтай бяздомнай дзяўчынкі быў проста шляхецкі нейкі гонар. Крушынскі нават запаважаў яе за гэта.

— Не хочаш — як хочаш, — паўтарыў ён холадна. — Ну што, давай развітвацца? Яшчэ раз кажу — інакш я не магу. У мяне сваё жыццё... Усё! Бывай.

Павярнуўся і хутка, не азіраючыся, пайшоў да тралейбуснага прыпынку.

Як і ўчора, таксісты заступалі яму дарогу:

— Таксі бярэм, малады чалавек!

— Амаль бясплатна!

Крушынскі пашукаў вачыма Стасеў «масквіч». Сёння машыны не было.

Працоўны дзень толькі пачынаўся. На прыпынку таўкліся чужыя людзі. І ўсё ж Крушынскі нейкай інтуіцыяй адчуў, што сярод іх стаіць зараз за яго спінаю нехта не зусім чужы. Ён рэзка павярнуўся. Так і ёсць. Віка прыйшла за ім і цяпер стаяла, няшчасная, сіратлівая, у старэнькім сваім адзенні, за два крокі ад яго

— Ты што, так і будзеш хадзіць за мною? — спытаў ён, азіраючыся. — Не рабі з мяне, калі ласка, монстра, які кідае бедненькае дзіцятка ў гарадскія трушчобы на згубу... Мне да сябра трэба ехаць, аддаць доўг учарашні. Хоць бы тое, што засталося... Віка, зразумей мяне! Стань на маё месца!

Але яна стаяла на сваім — на прыпынку каля аплёванай сметніцы. Плечы ў яе былі апушчаны. Унурыўшыся, яна глядзела сабе пад ногі. У Крушынскага раптам зашчымела сэрца. Ён не чакаў, што гэтае развітанне дасца яму так цяжка. Ён думаў, усе гэтыя слюнцяйскія сентыментальныя перажыванні даўным-даўно ачарсцвелі, акамянелі, памёрлі ў ім.

Пад’ехаў тралейбус. Ляпнулі настылыя дзверы, разам з клубамі пары пачалі вывальвацца на прыпынак пасажыры — хто перадам, хто бокам, хто задам... Крушынскі ў апошні раз азірнуўся. Дзяўчынка сядзела на лаўцы. Ён ледзь не крыкнуў: «Не сядзі, холадна ж!» Але на яго самога крыкнулі ззаду, і падштурхнулі ў плечы:

— Ты заходзіш?!

— Стаў, як пень!

Яго проста ўнеслі ў салон. Ён апынуўся заціснутым з усіх бакоў. Вакол былі чужыя целы і чужыя твары. Ці ён паспеў адвыкнуць ад усяго гэтага, ці сапраўды едзе ў такую гарачую гадзіну, «час пік», калі людзі спяшаюцца на працу і ад таго злыя, але адна жорсткасць, адна варожасць чыталася яму на гэтых тварах. Прага заціснуць слабейшага, жаданне заняць лепшае месца — хоць некалькі лішніх сантыметраў у душным тралейбусе! Мала таго, што гэтая атмасфера існавала сама па сабе, яна, як заразная хвароба, магла яшчэ і перадавацца. Крушынскі са страхам адзначыў, што і яму хочацца штурхаць, адціскаць, займаць свабаднейшае месца... Натуральны адбор! Барацьба за выжыванне! Гэты тралейбус быў паменшаны копіяй жыцця, жыцця жорсткага, у якім слабыя саступалі, жыцця, у якое ім, Крушынскім, толькі што быў укінуты, як трэска ў раку, слабы бездапаможны малы чалавечак...

Працуючы локцямі, ён пачаў праціскацца да выхаду. На яго бурчэлі, але ён не звяртаў ўвагі.

— Куды лезеш?

— Не мог прайсці адзін прыпынак!

На вуліцы Крушынскі ўдыхнуў на поўныя грудзі паветра. Амаль бягом кінуўся назад да вакзала. Прахожыя саступалі яму дарогу. Ужо зусім развіднела. Яшчэ здалёк ён убачыў на прыпынку Віку. Дзяўчынка была не адна. Высокі, не меншы за Крушынскага міліцыянер трымаў яе за плячо і,

нагнуўшыся, дапытваў яе. Супакойваючы дыханне, Крушынскі падыходзіў бліжэй. Ужо і словы можна было расчуць.

— Дык ты скажаш, чый ты? — сярдзіта пытаў міліцыянер; ён таксама памыліўся, думаючы, што перад ім хлопчык.

Крушынскі перамог жаданне падысці да іх адразу. Ён завярнуў за газетны кіёск і вынырнуў з другога боку.

— Не замёрз тут без мяне, сынок? — спытаў заклапочана, знарок не заўважаючы міліцыянера.

Той здзівіўся, але руку з пляча дзяўчынкі паспешліва зняў.

— Ну, у мяне ўсё гатова, — казаў абы-што Крушынскі. — Затрымаўся трохі, дык там чарга была...

І нібы толькі цяпер ён убачыў міліцыянера.

— Што такое, старшына? Што здарылася?

Старшына ўважліва яго агледзеў. Відаць, гэты барадаты граміла, які невядома адкуль узнік, таксама здаўся яму падазроным.

— Вы бацька гэтаму хлопчыку?

— А хто я яму, па-вашаму? — іранічна сказаў Крушынскі. — Проста так, з вуліцы? Бацька, канечне. Дык а што здарылася?

Калі б на месцы старшыны быў які малады міліцыянер, дык не толькі адказ, а і само з'яўленне Крушынскага задаволіла б яго. Але старшына быў чалавек у гадах. Такія ва ўсе дзіркі ўлезуць, выслужваючыся, такім бы толькі шпіёнаў лавіць на граніцы.

— Вашы дакументы, — папрасіў ён.

— Хіба ў нас ваеннае становішча? Ці камендацкая гадзіна? Дакументы пры мне, я магу іх паказаць, канечне, калі вы скажаце, у чым я, альбо мой сын (ён прытуліў да сябе Віку) вінаватыя.

Старшына адказаў не адразу.

— Акцыя ў нас, — працадзіў праз зубы. — У сувязі з тэрактамі ў Маскве.

— Дык тэракты ў Маскве, а акцыя ў вас?

— А акцыя ў нас! — яўна пачынаючы злавацца, адрэзаў старшына. — Правяраць у раёнах вакзалаў і ўвогуле скапленняў людзей усіх падазроных. Дакументы папрашу!

— Я — падазроны?

Крушынскі развёў рукамі і нават азірнуўся, нібы заклікаючы людзей у сведкі. Разам з тым уважліва аббег вачыма ўсю прывакзальную плошчу. І праўда, на плошчы сёння было шмат міліцэйскіх і ваенных патрулёў.

— Дакументы! Апошні раз прашу.

Старшына пацягнуўся да рацыі, што пішчала ў яго на баку.

— На.

Крушынскі падаў яму дакументы. Віка, якая з цікавасцю сачыла за ўсёй гэтай сцэнай, убачыла нейкую маленькую чырвоную кніжачку замест пашпарта. І яшчэ адну, шэрую, з выявай некага ордэна ці медаля на вокладцы.

Дзяўчынцы падалося, што Крушынскі пачырванеў. Яму як бы сорамна было, і не хацелася, каб яна была сведкай гэтаму.

Наўрад ці прыемна назіраць, як чалавек з ветлівага, спакойнага, ціхмянага ператвараецца ў разгневанага, грубага, злога. Але працэс зваротны, калі злы робіцца добрым і мяккім — гэта заўсёды прыемна. І тады даўжэй хочацца назіраць за падобнымі метамарфозамі. Вось толькі, на жаль, не часта яны здараюцца.

Але цяпер усё адбылося менавіта так. Спачатку недавер, потым разгубленасць адбіліся на старшыноўскім твары.

— Тут, на фота... вы без б-барады, — старшына нават заікнуўся.

— Бараду можна і згаліць, — адказаў Крушынскі.

Гэтыя словы ўсё вырашылі. Старшына быў пераможаны. Акуратна загарнуў кніжачкі, аддаў Крушынскаму. Сам выцягнуўся і ўзяў пад казырок.

— Прашу прабачэння... Служба.

— Я разумею. Нічога страшнага. Гэта вы прабачце, калі што не так, — Крушынскі заспяшаўся. — Хадзем, да... — і ледзь не сапсаваў усё, ледзь не сарвалася з языка «дачушка». Вось яшчэ дурная сітуацыя!

— Хадзем, сынок.

Гадзіны праз тры з вакзала выехаў стары дабіты «Лаз», рэйсавы аўтобус «Мінск — Вялікая Паляна — Жытнявічы». У ім знаходзіліся Крушынскі з новаспечанай «дачкой-сынам». З сабою везлі яны два ладныя пакункі. У адным было паліто, боты і шапка — усё хоць і не дужа дарагое, затое новенькае, прыгожае і цёплае. У другім, які на каленях трымаў Крушынскі, бо аўтобус трэсла і заносіла на паваротах, было рознае смакоцце: каўбаска, ёгурты, яблыкі, апельсіны, бананы...

Віка не хавала радасці. Усмешка не сыходзіла з яе твару. Ад гэтай умешкі твар харашэў, неяк цяплеў, рабіўся, так бы мовіць, па-сапраўднаму дзявочым.

Што да яе новага «бацькі», таму было не да вяселля. Глыбокая зморшчына перасекла яму лоб. Праўда, ён ні на міг не ўсумніўся ў правільнасці свайго ўчынку. У тым, што вырашыў забраць дзяўчынку да сябе. Цяпер яму страшна было ад думкі, а што, калі б Віку не затрымаў міліцыянер? І яна сышла б кудысьці, і знікла назаўсёды, прапала б у гэтым горадзе?..

Аднак цяпер узнікала мноства новых праблем. Крушынскі зусім не ўяўляў, што рабіць далей. На пакупкі пайшла ўся без астачы рэшта даляраў. За што жыць? Ён прывык да ежы грубай,

непераборлівай — а цяпер? Чым карміць дзяўчыку? А калі не карміць, не «даглядаць» (як выказаўся доктар), дык які тады толк ад яе жыцця ў леснічоўцы?

Хапала аб чым падумаць. І толькі радасць дзяўчынкі, якую Крушынскі бачыў на яе твары, калі пазірkваў на яе спадцішка, супакойвала яго. Нейкі ўнутраны голас шаптаў яму — пакуль што ты ўсё робіш правільна! Усё будзе добра, усё абыдзецца і нават акупіцца табе!..

— Якія гэта дакументы ты яму паказаў? — успомніла раптам Віка. — Што за кніжачкі? Чаму ён так змяніўся?

Ад гэтага нечаканага пытання змяніўся і сам Крушынскі. Панура буркнуў:

— Забудзь ад гэтым. І ніколі больш не пытай. Прыйдзе час, і ты аб усім даведаешся. Добра?

Яна кіўнула. Ёй падалося, што Крушынскі спалохаўся гэтага пытання, бо вакол пасажыры, які маглі б падслухаць яго адказ. Але што за тайна?! Што гэта за такі загадкавы чалавек?! І як цікава, што жыццё звяло іх разам!

А ён падумаў — вось яно і пачынаецца. Азіранне па баках, прыстаўлянне да вуснаў пальца, канспірацыя, двайное жыццё… І нікуды ад гэтага не дзенешся. Сам так захацеў.

## Раздзел XII

*Стары знаёмы — доктар Пратасевіч. — Успомніў! — Кароткая біяграфічная даведка. — Сумная старасць.*

— Ну, канечне! — усклікнуў доктар, стукаючы сабе ў лоб сагнутым пальцам.

Нарэшце ён успомніў, дзе мог бачыць гэтыя пільныя, не па гадах разумныя вочы, чуць гэты крыху шапялявы голас. Ну, вядома!

Успомнілася доктару даўняя падмаскоўная вясна, Падольскі шпіталь для ваенных, рэабілітацыйная палата, скалечаны «афганец», які памёр, бедны, адразу пасля аперацыі… Усе дактары ведалі, што не жыць яму — так і адбылося… Дык вось, сябар-зямляк, што прыходзіў з суседняга корпуса і «афганца» даглядаў, і ёсць сённяшні таямнічы барадач!

Успомніў доктар — успомнім і мы доктара. Перанясемся ў пачатак аповесці, калі расчыняюцца дзверы ў палату і з’яўляецца… Так, так — стары наш знаёмы доктар Пратасевіч! Які быў накіраваны з Мінска ў Падольск на «курсы падвышэння кваліфікацыі», які ўсё хваліўся, што з Беларусі родам і памагаў землякам; той самы, які аднойчы прынёс скалечанаму «афганцу» магнітафон «Вясна» (ні сном ні духам не ведаючы і не здагадваючыся, колькі няшчасця прынясе яму ў далейшым гэты касетнік!).

Нічога дзіўнага, дарагія чытачы, калі вы не адразу разгадалі, што малайцаваты гаманкі доктар з Падольскага шпіталя і сухенькі, жыццём пакамечаны дзядок, якога вазіў у сваю леснічоўку Крушынскі — адзін і той чалавек. Апошнія пятнаццаць гадоў моцна змянілі нашага доктара. Ён быў ужо на пенсіі. Жыў сумна і адзінока, без сяброў, без знаёмых, у звычайнай хаце ў цэнтры вялізнага двухмільённага горада. Горад усё большаў, разрастаўся — і ўшыркі, за кошт акраінаў, і ўвысь — будуючы шматпавярховыя дамы. А пра Грушаўку, гэты «анклаў» у самым цэнтры, нібы забыліся. Як і на людзей, што тут жывуць, як і на яго, старога доктара. Па першым часе, калі, выдаўшы замуж дачку, Пратасевіч застаўся адзін, ён усё спадзяваўся, што неўзабаве гэтыя хаты знясуць, і атрымае ён кватэру, хай сабе невялічкую. Тады былі б пярэбары, пераезд, улазіны, розная будаўнічая мітусня, новыя суседзі… Усё было б весялей! Але ішоў год за годам. Нічога не

мянялася. Хаты не зносілі. І цяпер доктар даўно ўжо нічога не чакае…

Давайце ж, дарагія чытачы, хоць мы з вамі яго адведаем. Пабудзем з ім якіх хвілін пяць у гэтым кароткім раздзельчыку — пацерпім!

І так — пасля таго, як звазілі нашага доктара Пратасевіча ў лес на «экскурсію», а потым заплацілі даляры і прывезлі пад самыя веснічкі назад, ён нарэшце успомніў, дзе мог бачыць барадача. Успомніў ён і яшчэ сёе-тое… Цяпер яму карцела падзяліцца сваім адкрыццём. Але каму ***такое*** скажаш? Хіба што зяцю Ігару…

Доктар Пратасевіч сядзеў за пустым сталом у пустой хаце і, чакаючы вечара, то пазіраў на гадзіннік, то проста ў вакно, на двор. Было ўсяго тры гадзіны дня, а зяць Ігар будзе дома не раней пяці.

На двары, якраз насупраць вакна, доктар Пратасевіч бачыў калінавы куст. Ён быў абсыпаны снегам і здаваўся круглым, як шар. І сярод гэтага снегу штосьці чырванелася: ці то гронкі ягад, ці то снегіры прыляцелі… А можа, і тое, і тое — снегіры ласуюцца ягадамі… Як хутка праляцела жыццё, — думаў доктар Пратасевіч, — гэта ж ёсць недзе фотаздымак, яго маленькая дачка пад гэтым калінавым кустом. А цяпер і яна даўно дарослая, і ў самой ужо дзіця…

Было, было ад чаго задумацца доктару! Усё правільна — жыццё прамільгнула амаль без следу!

Так атрымалася, што камандзіроўка ў Маскву стала для яго апошняю. За гэтыя паўтара дзесяцігодзьдзі змяніўся не толькі ён. Увесь звыклы, ранейшы свет пабурыўся, як домік з пяску, а разам з ім, з тым «старым светам», скончылася і кар’ера доктара Пратасевіча. Маладзейшыя, спрытнейшыя калегі ўмомант скемілі, што ўрачэбная справа — адна з самых прыбытковых, таму ў ёй лепш абыходзіцца без канкурэнтаў. У гэтай барацьбе за выжыванне

доктар Пратасевіч прайграў. Ён апынуўся сярод няўдачнікаў. Як толькі яму стукнула шэсцьдзесят, яго проста звольнілі з ваеннага шпіталю, нічога не тлумачачы.

Зберажоных грошай хапіла на тое, каб вывучыць дачку, выдаць яе замуж і пабудаваць ёй з зяцем двухпакаёвую кааператыўную кватэру.

Сам доктар Пратасевіч не адразу апусціў рукі. Спачатку ён спрабаваў трохі рыпацца. Хадзіў па розных фірмах, прасіўся хоць лабарантам у розныя медыцынскія ўстановы... Не бралі — стары, тут маладыя без працы. Спрабаваў практыкаваць «на даму», кустарным чынам... Нічога з не выйшла. Пацыенты ішлі лячыцца да тых, хто не скупіўся на прывабную рэкламу, а якая рэклама магла быць у доктара Пратасевіча? Ад рукі напісаная, убогенькая абвестка (з махрой тэлефонных нумаркоў знізу), прыклееная на шчыце тралейбуснага прыпынку — паміж «Здыму кватэру» і прапановай пахудзець хутка і эфектыўна.

Доктар Пратасевіч здаўся. Цяпер яму ўжо і ўспамінаць не хацелася, што і ён жа некалі быў малады, удачлівы, перспектыўны, што яго паважалі — талент, казалі, залатыя рукі! Хто б тады мог падумаць, што такая будучыня чакае яго! Цяпер з кожным годам ён усё менш і менш разумеў, што адбываецца навокал. Гэта раней, у часы яго маладосці, ды і сталасці, усё было ясна. Працуй, старайся! Калі пашэнціць, можаш выбіцца ў начальнікі, а гэта значыць большы аклад. Жыві сабе ціхенька, складай рублі ў панчоху, ці ў касу на кніжку кладзі... Цяперашнія маладыя, нябось, і слоў такіх не ведаюць — «ашчадная кніжка»...

Цяпер доктар Пратасевіч жыў на адну пенсію. І тую эканоміў, стараўся не траціць ніводнай лішняй капеечкі, каб потым аддаць унуку. Ні перад кім больш, ні перад дачкой, ні перад зяцем яму не было

так сорамна за сваю беднасць, як перад любімым Ігаркам. На яго ж, Ігарка, ішлі ўсё падзаробкі. Былі яна, праўда, вельмі рэдкія, выпадковыя — як вось сёння з гэтым барадачом.

Што й казаць, пашэнціла сёння! Пяцьдзесят «зялёных» за пару гадзін… І не толькі гэтае! Галоўнае, што вёска называецца Вялікая Паляна!

Пра апошняе доктар Пратасевіч стараўся знарок не думаць. Адцягваў да вечара, калі ўбачыць зяця Ігара. Уяўляў, які твар у яго зробіцца, калі ён пачуе гэтую проста неверагодную гісторыю!

## Раздзел XIII

*Паход да зяця Ігара. —Няўдачнік. — Філасофскі настрой доктара Пратасевіча. — Пяцьдзесят даляраў. — Настальгія. — Ізноў усплывае магнітафон «Вясна». — Завязка дэтэктыву. — Старая касета, якая неўзабаве крута зменіць ход аповесці.*

Роўна ў пяць доктар Пратасевіч стаяў перад дзвярыма зяцевай кватэры і націскаў кнопку званка.

Зяць толькі што прыйшоў, не паспеў нават пераапрануцца. У сваім чорным, расшпіленым пінжаку і белай кашулі без гальштука, поўненькі і невысокенькі, ён быў падобны на пінгвіна.

Старонячыся, каб упусціць цесця ў пярэднюю, зяць спытаў:

— Здарылася што? Вы не тэлефанавалі…

— Нічога не здарылася. Проста зайсці вырашыў. Пасядзець, пагаварыць.

Доктар казаў гучна і смела, бо ведаў, што ў кватэры больш нікога няма. Уласнай дачкі ён пабойваўся. Звычайна яна не адабрала бацькавых знянацкіх візітаў. Ды і сам доктар ведаў, што толькі раз на месяц яму тут радыя — калі прыносіць

зберажоную пенсію. Але сёння дачка працавала ў другую змену, з'явіцца толькі гадзіны праз дзве. А ўнук Ігар — на курсах англійскай мовы.

— Ідзіце на кухню, раз прыйшлі, -- вяла прапанаваў цесцю зяць.

Для доктара Пратасевіча заўсёды было загадкай, чым Ігар займаецца? Нібыта працуе, ці «состоит», як сам ён кажа, пры нейкім фондзе — пры адной з тых незлічоных, цьмяных арганізацый, якіх столькі расплодзілася і якія бязліка-падобныя нават сваімі назвамі (...).

Так ці інакш, а толк ад зяцевай дзейнасці быў малы. Задуманасць і панурасць усё часцей гасцілі на яго твары.

Доктар прадыбаў на кухню. З сабою ён прынёс пакунак у цэлафанавым пакеце. Адразу бухнуў яго на стол.

— Што гэта? — спытаў зяць.

— Выпіўка, закуска...

— У пяць гадзін дня?! Ну і час вы знайшлі! Бачыце ж, я сам толькі што парог пераступіў! Галодны, не пераадзеты...

— Хіба ты жанчына, — пажартаваў цесць, — што табе трэба да стала вячэрнія строі?

Зрэшты, сёння, пасля паездкі ў лес, яго цягнула больш на філасофію, чым на жарты. Ва ўсім яму бачылася імклівая зменлівасць жыцця. Вось і гэты Ігар...

Пакуль зяць неахвотна, вельмі марудна пачаў збіраць на стол, цесць назіраў за ім. І дзівіўся пераменам. Здаецца, зусім нядаўна Ігар быў хударлявым, прыгожанькім, цёмна-русым, сарамлівым хлапчуком, якога шчаслівая дачка за руку прывяла да бацькі ў дом — на агледзіны.

Цяпер па кухні лянiва рухаўся паўнаваты мужчынка, з лысінай замест русявай густой чупрыны... Але галоўнае ўсё ж было не гэта, не

знешні выгляд, а выраз твару. Адбітак нейкай абдзеленасці на ім. Так — чыталася на зяцевым твары — ну, вось такі я, не шэнціць мне, дык хіба я вінаваты, што не шэнціць?

Усё гэта было знаёма і самому цесцю. Ён адчуваў долю і сваёй віны — у тым, што не дужа ладзіцца жыццё ў дачкі з зяцем. Хаця што значыць не ладзіцца? Жывуць не горш не за ўсіх. Але не так, як хацелася б.

Канечне — зусім нядрэнна было б, каб доктар Пратасевіч быў чалавек багаты! Як тыя пялегаваныя[2] дзядкі з замежных серыялаў— розныя там плантатары, магнаты, фабрыканты-мультыміліянеры... Калі б жыў у апартаментах, меў вілу на беразе мора і з'яўляўся ўладальнікам акцыяў якой-небудзь нафтавай кампаніі... Тады іншыя былі б да яго і адносіны. Тады ён аўтаматычна рабіўся б паважаным цесцем для зяця, любімым бацькам для дачкі, мудрым, шчодрым дзедам для ўнука...

Мары, мары! Доктар уздыхнуў. Пакуль што замест кантрольнага пакета нафтавых акцый ён мог прапанаваць зяцю ўсяго толькі пяцьдзесят даляраў.

Што ён і зрабіў. Не ламаючыся, проста выцягнуў з кішэні дзве дваццаткі і дзве пяцёркі. Разгладзіў, паклаў на край стала. Падсунуў да зяця. Сказаў абыякава, нібы кожны вечар дараваў зяцю па пяцьдзесят даляраў:

— На вось, вазьмі, Ігарку што купіш.

І праўда — убачыўшы «зялёныя», ураз пасвятлеў зяць тварам. Разгладзіліся зморшчынкі на ілбе, нават голас змяніўся.

— Дзе вы ўзялі?

— Зарабіў сёння. Усяго за пару гадзін.

— Някепска! І як, калі не сакрэт?

---

[2] Дагледжаныя, выпешчаныя.

— Зараз раскажу. Я таму і прыйшоў. Ты проста не паверыш…

— Пачакайце! — перабіў зяць. Кінуўся да лядоўні. — Бо што ж гэта ў нас за сухамятка… Катлеты разагрэем зараз…

Пакуль ён завіхаўся каля пліты, перачарочваючы на патэльні катлеты, доктар вырашыў не губляць часу, а ўжо цяпер расказваць — так карцела яму гэтая гісторыя.

— Дык вось: сёння ўраніцы — стук у дзверы. Што такое? Адчыняю — мужчына. Высокі, барадаты. Мне, кажа, да вас параілі звярнуцца як да вопытнага, прафесійнага (доктар падняў угару ўказальны палец) спецыяліста. Трэба з'ездзіць у адно месца і агледзець хворага. Вось вам аванс — выцягвае з кішэні скрутак даляраў і адлічвае дваццаць пяць. Ну, трэба, дык трэба! Я хуценька збіраюся, сакваяж у зубы. На вуліцы таксоўка чакае. Паехалі. Я думаў, блізка — дзе там! Хоць мне што, я ж за бензін не плачу. Тарабанілі кіламетраў сто пяцьдзесят — дзвесці ад Мінска, у сяло Вялікая Паляна.

Доктар уважліва паглядзеў на зяця і паўтарыў:

— Вялікая Паляна.

— Не чуў пра такую.

— Ну, канечне, табе гэтая назва нічога пакуль не кажа… Аднак пачакай! Завезлі мяне не ў сяло нават, а ў глухі лес. У малюсенькую хатку з адным вакном. Ні электрычнасці, ні радыё… Хворая дзяўчынка сядзіць у кутку на нейкім тапчане. Агледзеў я, абстукаў яе, заняло ўсё хвілін пятнаццаць… Гатова. Пяцьдзесят даляраў, плюс дастаўка туды і назад!

Доктар зглынуў сліну. Вельмі моцна пахла катлетамі. Нарэшце зяць паклаў на цэнтр стала драўляны кружок, на яго — гарачую патэльню.

Выпіўшы па чарцы, абодва падчапілі відэльцамі па катлеціне і дружна пачалі дзьмухаць на іх. Потым хвілін колькі на кухні чуваць было толькі чвяканне.

— Бывае, — прамовіў зяць, перабіўшы голад. — Цяпер многа такіх... як гэты ваш барадач... Знарок у аднапакаёўках жывуць, у лясных хатках, дарагіх машын не купляюць, апранаюцца бедненька... А капні глыбей — у кожнага тысячы, калі не мільёны! Даляраў, я маю на ўвазе.

— Ды не... Гэта барадач не падобна, каб быў багаты.

— А што за дзяўчынка? — пацікавіўся зяць, па другой наліваючы.

— Не ведаю. Ды справа тут не ў дзяўчынцы... Іншае цікава — барадач! Я, хоць і не адразу, але ўсё ж пазнаў яго! Некалі ён лячыўся ў Падольскім шпіталі, ляжаў у «афганскім» корпусе. Там мы і сустракаліся з ім.

— А-а, зразумела. Вось хоць бы і гэтыя «афганцы», — гнуў сваё зяць, — таксама паўладкоўваліся. Фонды розныя, арганізацыі, асацыяцыі... Фінансаванне, ільготы, якія ўсё падзяліць ніяк не могуць. Глядзелі па тэлевізары? У Маскве сярод белага дня на могілках узарвалася бомба, сярод «афганцаў», якія свайго хавалі!

— Не глядзеў, — адказаў доктар. — Ігар, такая справа... Я цэлы дзень сёння думаю: ці не даў я некалі маху? Ці не зрабіў я некалі вялікага глупства?

— Што такое?

— А вось паслухай. Нікому ніколі я гэтай гісторыі не расказваў. Па-першае, забыўся, па-другое, усур'ёз не ўспрымаў яе... Да сённяшняй сустрэчы з гэтым барадачом.

— Ну, ну — не цягніце!

— Гадоў пятнаццаць назад, гэта ты ведаеш, накіравалі мяне ад ваенкамата ў той самы Падольскі шпіталь...

І доктар коратка распавёў ужо вядомую нам перадгісторыю. Пра скалечанага, сляпога, без рук без ног «афганца», які паступіў у Падольск з Ташкента, пра тое, як ён апынуўся ў «лёгкай» палаце, як хворыя не любілі і пабойваліся яго, пакуль не знайшоўся яму з іншага корпусу таварыш, таксама «афганец», сержанцік — прыходзіў да яго кожны вечар, даглядаў...

— Ды вось! Прынёс я неяк гэтаму няшчасаму абрубку, каб хоць трохі развеяць яго, сваю «Вясну». Памятаеш, быў у мяне такі старэнькі касетнік? Пасля я яго Ігарку аддаў, гуляцца.

Зяць кіўнуў: памятаю.

— Неўзабаве пераводзяць нашага «афганца» ў аднамесную палату. (Натуральна, і магнітафон туды ж). Пачынаем рыхтаваць яго да аперацый. Праходзіць адна, другая — сам прафесар Пятроўскі аперыруе, і някепска аперыруе! — але арганізм ужо настолькі аслаблены, што пасля трэцяй у небаракі проста не вытрымала сэрца... Памёр пад наркозам. Інакш кажучы, заснуў і не прачнуўся.

— Шкада, — прамовіў зяць без аніякага шкадавання ў голасе. Насадзіў яшчэ адну катлету на відэлец.

— Адвозяць нашага «афганца» ў морг. Я забіраю сваю «Вясну». Вось тут пачынаецца самае цікавае, калі не сказаць — неверагоднае! Магнітафон стаіць на «запісе»! Аказваецца (гэта пазней стала вядома), прывезлі «афганца» пасля адной з аперацый у палату, пачалі перакладаць на ложак... І тут адзін з санітараў адступіўся і сеў на тумбачку, на магнітафон. Ты ж ведаеш «Вясну» — прымітыўная сістэма, клавішы выпуклыя, лёгка ўключаюцца... Вось гэты санітар сваёй (прабач, не за сталом будзь

сказана!) задніцай і націснуў адначасова на клавішы «пуск» і «запісь»!

— Цікава... Ну, і што з гэтага?

— А тое. Цэлы бок касеты, якая была ў магнітафоне, аказаўся, канечне, сцёртым. Калі ж я чыста машынальна перагнаў істужку на пачатак і запусціў па-новаму... Касета была не пустая! Магнітафон запісаў трызненні «афганца»! Ты, Ігар, можа, не ведаеш (зрэшты, не дай Бог і ведаць такое!), што многія хворыя падчас аперацыі, ці пасля, адыходзячы ад наркозу, могуць падоўгу, чыстым голасам і цалкам лагічна распавядаць аб рэальных падзеях свайго жыцця. Такая атрымоўваецца міжвольная споведзь... Гэтым, дарэчы, здаўна карыстаюцца розныя спецслужбы.

— Ну-ну! — усё больш зацікаўліваўся зяць. — І што ж такога нагаварыў «афганец»?

— Ды ў тым і справа, што не помню! Праслухаў — і ўсё. Толькі падумаў яшчэ, помню, што варта зберагчы касету; прыеду ў Мінск і падарую яе сябру-псіхолагу. Яны такімі рэчамі цікавяцца... Забыў, канечне! Запрапала недзе касета, ды і псіхолаг мой, стары сябра, даўным-даўно ўжо недзе за мяжою...

— Не адхіляйцеся ад тэмы, — перапыніў гэты настальгічны экскурс зяць. — Дык што ж там усё-ткі было, на касеце? Няўжо зусім нічога не помніце?

— Чаму, сёе-тое помню... Пару-тройку слоў, што часцей паўтараліся...

— І якія словы?

Доктар задраў галаву, успамінаючы.

— Так. Шкатулка... Каштоўныя камяні... Груз двесце... Але галоўнае — сяло Вялікая Паляна! Гэтае гучала разы чатыры! Чаму я запомніў, чаму мне і ўелася ў памяць — бо Падмаскоўе ж, Тула не так далёка, а там Ясная Паляна. Дзе Талстой

пахаваны, — патлумачыў цесць зяцю. — Нас туды на экскурсію вазілі…

— Пры чым тут Талстой?

— Ну, так, проста … Падобнае гучанне: Вялікая Паляна — Ясная Паляна.

Зяць быў яўна расчараваны.

— Нямнога ж вы запомнілі. Сапраўды, гісторыя цікавая... І не больш. Ды і то — цікавая хіба што толькі для вашага былога сябра-псіхіятра...

— Псіхолага, — паправіў доктар.

— Ну, псіхолага. А як для людзей звычайных, такіх, напрыклад, як мы з вамі… Не разумею, што тут да чаго можна прышпіліць?

— Да таго, — урачыста сказаў доктар, — што я сёння быў паблізу Вялікай Паляны! А барадач — ніхто іншы, як той самы сержанцік, які сябраваў з нябожчыкам-«афганцам»! З якім яны вечарамі шушукаліся!..

— Вось я-а-ак, — працягнуў зяць.

— Вось так! Хіба не дзіўны гэты збег? Чаму малады, здаровы, заслужаны чалавек раптам ні з таго ні з сяго адгадоўвае бараду і зашываецца ў глушэчу? Ды не абы-куды, а ў тое самае месца, якім трызніў чалавек перад смерцю? Згадваў гэтую Вялікую Паляну, як заклінанне!

— Сапраўды… У гэтым нешта ёсць… А можа яшчэ што ўспомніце? — з надзеяй спытаў зяць.

— Нічога больш. Хоць забі! Вось каб цяпер паслухаць…

Зяць Ігар раптам з разяўленым ротам уставіўся на цесця.

— Пачакайце! Калі мы сюды перабіраліся… У каморы стаіць скрынка з-пад тэлевізара, можа, там засталося…

— Магнітафон?

— Ды які магнітафон!.. «Вясну» вашую даўно малы малатком пабіў, і выкінулі на сметнік! Касеты

могуць быць! Клянуся, што я іх бачыў недзе... Па-ча-кай-це!

Зяць выбег з кухні. Цесць задумліва жаваў катлету.

Праз нейкі час Ігар вярнуўся.

— Пуста, няма ў скрынцы. Але я пабажыцца гатовы, што...

— Ёсць прымаўка: нават самую непатрэбную рэч захоўвай тры гады. Толькі тады можна выкідваць, — уставіў доктар. Ён з задавальненнем назіраў за зяцевай мітуснёю. Прыемна было, што ягоная даўняя гісторыя так узбудзіла Ігара.

— Дык жа не тры, а пятнаццаць гадоў прайшло!

Усё ж штосьці не давала зяцю супакою. Адклаў відэлец, ізноў усхапіўся. Падсунуў табурэтку да антрэсоляў:

— Падайце газету, калі ласка. Вунь, на падаконніку.

Падаслаў газету на табурэт, узабраўся на яго, тоўсценькі і нізенькі, расчыніў дзверцы антрэсоляў. Паваліліся, зазвінелі парожнія бутэлькі...

— Ёсць! — усклікнуў зяць. — Я ж казаў? Казаў жа? Вось яны!

Ён працягнуў цесцю скрынку з-пад абутку. Сам саскочыў, разаслаў на падлозе газету. Высыпаў ўсё са скрынкі.

Нейкі час зяць з цесцем моўчкі глядзелі на груду бліскучай, у клубкі зблытанай істужкі.

— Чорт, здаецца, ніводнай цэлай! — сказаў Ігар.

Доктар, крэкнуўшы ад болю ў паясніцы, нагнуўся; абодва пачалі ў чатыры рукі шнырыць у кучы. Доктар адшукаў кавалак пластыку, на якім можна было прачытаць «...ясна» — «Вясна». Вочы яго затуманіліся. Відаць, гэтыя старыя, некалі любімыя рэчы нагадалі цяпер яму вясну яго жыцця.

Затое зяцю было не да настальгіі. Варушыў, калупаўся ў гэтым ворасе — з настырнасцю механіка, што шукае сярод markup рознага металічнага друзу вельмі патрэбны шурупчык ці гайку... Марна!

Падняліся.

— Як жа вы так не зберагдлі? —ізноў упікнуў цесця зяць.

— Вось так і не збярог...

Ігар паглядзеў на гадзіннік.

— Ну што, збірайцеся памалу. Хутка нашая з'явіцца. А я прыбяру тут...

І праўда, позна ўжо было.

Развіталіся. Доктар паехаў дамоў, у сваю пустую, такую ж, як сам адзінокую хату.

Гадзін у дванаццаць ночы яго разбудзіў тэлефонны званок.

— Усё ў парадку! — пачуўся ў трубцы ўзбуджаны зяцеў голас. — Я знайшоў кавалак плёнкі з голасам «афганца»! У вашай Вялікай Паляне схаваны каштоўнасці!..

## Раздзел XIV

*Высачылі! — Версія Валіка. — Планы Крушынскага. — Арыгінальны спосаб палявання на курапатак. —Крушынскі прызнаецца ў тым, што ён злачынец. — Недавер Вікі. — Цені за вакном.*

Дні тры нашы хлопцы, Цім з Валікам, сачылі за таямнічай лясной хаткаю. Станавіліся пасля ўрокаў на лыжы — і ў лес. Проста катаюцца людзі — што, ужо і пакатацца нельга ў сваім родным лесе? Падгадвалі час, калі Крушынскі быў на паляванні. Падбіраліся да самай хаткі.

Сапраўды, дзіцячыя сляды вакол яе на снезе! Замка няма на дзвярах, а гаспадар жа ў адлучцы! Зазіралі ў вакенца, але яно было закрыта фіранкаю.

І тым не менш многа чаго хлопцам ўдалося дасягнуць. Напрыклад, яны пасябравалі з Барсам. Ён пазнаваў іх і, пачуўшы свіст, нёсся да іх стрымгалоў, ведаючы, што перападзе яму пачастунак.

Увечары трэцяга дня Цім з Валікам нарэшце атрымалі самае надзейнае пацверджанне, што леснічоўка не пустуе і ў адсутнасць барадача. Фіранка была адкрыта! Калі ж яны, азіраючыся па баках, асцярожненька наблізіліся, у вакне з'явілася дзіцячая рука і фіранку зашморгнула!

— Ну, што? — не ўнімаўся Цім, калі хлопцы ехалі з лесу ў вёску. — А ты не верыў!

— Ну, не верыў... Цяпер веру. Сапраўды, штосьці тут загадкавае, нячыстае, — вымушаны быў пагадзіцца Валік. — Вось толькі чаму барадач не замыкае дзверы? Чаму гэты ягоны кватарант сам хаваецца ад людзей?

Але не так проста Ціма збіць з тропу. Самыя неверагодныя здагадкі так і пёрлі з яго.

— Як ты не разумееш? Яны з барадачом заадно! З аднае кампаніі. Адседжваюцца пасля якога-небудзь злачынства. Цяпер ведаеш колькі такіх выпадкаў, калі дарослыя ўцягваюць у свае банды дзяцей? Менш падазрэнняў!

— Не, — рашуча сказаў Валік. — Лухта гэта ўсё. Я думаю, што ні барадач, ні яго госць ніякія не злачынцы.

— Аднак жа не проста так ён жыве тут, і па лесе цягаецца! Усё як бы шукае нешта...

— Можа, ён — агент спецслужбаў? Які выконвае тут важнае заданне?

Цім, якому абы прастор для фантазіяў, ахвотна пагадзіўся.

— Магчыма! Тут жа была некалі ракетная ваенная база; можа, цяпер хочуць яе аднавіць, вось ён і выбірае прыгоднае месца...

Крушынскі таксама бачыў сляды лыж і чаравікаў каля хаткі. Гэта ўстрывожыла яго. Асабліва тое, што цікавяцца ім не дарослыя, а падлеткі. З дарослым можна пагаварыць, даросламу можна растлумачыць, а ад гэтых ніколі не ведаеш, чаго чакаць.

З Вікай яны дамовіліся так: яна нібыта яго пляменніца. Прыехала з Гомеля да яго ў госці. Чаму не ў школе вучэбнай пароюр? — вось з гэтым узніклі цяжкасці.

Абое доўга выдумлялі прычыну, чаму Віка не вучыцца.

— Казаць, што ты хворая? — гадаў Крушынскі. — Узяла даведку ў паліклініцы?

Віка, падумаўшы, адмоўна хіснула галавой. Валасы ў яе прыкметна адраслі нават за гэты кароткі час; яна пахарашэла, паздаравела і ўжо наўрад ці можна было б зблытаць яе з хлопчыкам.

— Так доўга не хварэюць, — сказала яна. — Даведку дні на тры могуць даць. Ну, на тыдзень. Але ж не настолькі.

— Тады што?

— Скажам, што я выдатніца. І вучуся па індывідуальным раскладзе. Нібыта мне давзолена свабоднае наведванне ўрокаў. Бо настаўнікі ведаюць, што ў канцы года я і так здам усё на «выдатна».

Крушынскі здзівіўся:

— Ну, ад сціпласці ты, я гляджу, не памрэш. Пачакай, а што, хіба цяпер у школе здаюць кожны год іспыты?

— У школах не, а ў гімназіях здаюць. Пачынаючы з пятага класа. А я нібыта вучуся ў гімназіі...

На тым і пагадзіліся. Хоць уся гэтая версія была, канечне, шыта белымі ніткамі.

План далейшых дзеянняў Крушынскага быў наступны (ён падзяліўся ім з Вікаю ў той дзень, калі

яны вярнуліся з Мінска і дзяўчынка, шчаслівая, прымярала першыя ў жыцці абноўкі). Віка пакуль што будзе жыць у леснічоўцы. Раз ужо лёс звёў іх, раз ужо Крушынскі ўратаваў яе, дык павінен давесці справу да канца — тым ці іншым чынам дзе-небудзь уладкаваць дзяўчынку.

— ... Збыць цябе з рук, — вырвалася ў яго неабдумана.

Паводзіць сябе яна павінна як мага больш скрытна. Будзе старацца не трапляць на чужыя вочы. Сам Крушынскі тым часам пашле ў Сімферопаль пісьмовы запыт: ці пражывае там такая й такая, і па якім адрасе? Пісьмо будзе заказное. Акрамя таго, у асобнай прыпісцы ён укажа, што калі за гэтыя паслугі трэба плаціць, ён заплаціць далярамі. З такой прыпіскаю, на яго думку, сімферопальскія чыноўнікі хутчэй будуць варушыцца.

Гэта быў найлепшы варыянт. І Віку ён задавальняў цалкам. Сама не магла ж яна паслаць у Сімферопаль пісьмо. Па-першае, у яе не было месца, куды мог бы прыйсці адказ, а па-другое, яна проста не ведала, як гэта робіцца.

— Сімферопаль — адзіная наша зачэпка, — уголас разважаў Крушынскі. — Нават калі не дачакаемся адказу — давядзецца ехаць туды. Паходзім, папытаем у людзей — хоць нехта ды будзе тую тваю цётку ведаць... Але паездка магчымая толькі вясною ці летам. Грошы, зноў-такі ў іх усё ўпіраецца!.. Але я дастану. Мне вінаватыя многа, калі я яшчэ бізнесам займаўся...

Гэтыя яго словы ўразілі Віку больш, чым што.

— Ты быў бізнесменам?! Самым сапраўдным? Такім, якія ў дарагіх машынах ездзяць?

— Быў, — неахвотна прызнаўся Крушынскі. — Самым сапраўдным, як у фільмах па тэлевізары паказваюць... У малінавым пінжаку, з сотавым

тэлефонам у нагруднай кішэні і з растапыранымі пальцамі... Аднак канчаем гэтую тэму. Дамовіліся?

Віка кіўнула.

— Грошы я дастану. Любым чынам. На крайні выпадак у мяне яшчэ ёсць варыянт, самы надзейны... Так што вышэй нос! Не сумуй... сынок! — пажартаваў Крушынскі. — Усё павінна атрымацца.

А яна і не сумавала. Яна ўжо бачыла, што прапасці ёй гэты чалавек не дасць. Яна і не ведала, што такія людзі на свеце бываюць. Ёй было добра тут. І які ён дужы, разумны. добры! І загадкавы. Быў сапраўдным бізнесменам, а жыве чамусьці тут, у глушэчы. адзін... Мае нейкія дакументы, ад якіх міліцыянеры выцягваюцца перад ім «смірна». Яму вінаватыя грошы, а ён не спаганяе іх... Суцэльныя тайны!

Так яны і пачалі жыць, дзіўны барадаты Крушынскі і прыблудная дзяўчынка.

Расклад іхніх дзён быў даволі аднастайны. Віка спала на тапчане, Крушынскі — на падлозе ля печы. Падымаўся ён рана. Ціха ступаючы па хатцы, дзе кожная рэч была пад рукою, гатаваў сняданак. Затым — а дзяўчынка яшчэ спала — сыходзіў з сабакам у лес.

Яму шэнціла. Рэдкі быў дзень, калі ён вяртаўся без здабычы. Прыносіў зайцаў, а часцей — курапатак, якіх налаўчыўся здабываць нават без стрэльбы, і блізка каля хаткі, у бярэзніку, дзе птушкі начавалі. Для гэтага трэба была бутэлька з-пад шампанскага. Крушынскі наліваў у яе кіпню і рабіў у снезе пад бярозамі дзіркі, штук пяць, пакуль не астывала вада. Курапаткі лезлі ў гэтыя дзіркі, як куры на седала. За ноч дзіркі зацягвала тонкім лядком і хоць, канечне, трэба быў пэўны спрыт, каб ухапіць птушку — часта яны целам прабівалі лёд і ўзляталі, усё ж адна-дзве перападала і Крушыскаму.

Гэтую сваю ўдачлівасць ён звязваў з Вікаю. У яго мільгала містычная думка, што гэта яму знак «зверху» — як узнагарода, як падзяка ад нейкіх сілаў за тое, што ўратаваў чалавека і цяпер апякуецца над ім.

Яму нават удалося-такі ўпаляваць старога ліса. Мо з тыдзень, пакуль сохла расцягнутая на папярочках скурка, у леснічоўцы стаяў такі «пах», што Віка кашляла і дэмастратыўна заціскала нос. Але вось скурка падсохла. Вечары два Крушынскі сядзеў над ёю, дубячы; далоні ў яго зрабіліся сінімі, як вымазаныя ў атрамант. Нарэшце каўнер быў гатовы.

Крушынскі накінуў яго дзяўчынцы на плечы. Адступіўся:

— Дык ты, аказваецца, красуня!

— Праўда? — яна заірдзелася. — Як шкада, што люстэрка вялікага няма!..

Разы два Крушынскі ездзіў у горад па нейкіх сваіх справах. Вяртаўся невясёлы. Відаць, не так лёгка, як яму здавалася, было выбіваць пазыкі...

Добра было вечарамі. Лес кругом. Цемра. Шумяць хвоі... На стале лямпа, да святла якой хутка прывыкла Віка. Барс у сваім цёплым кутку бурчыць у сне... Ідылія сям'і, утульнасці, нават дастатку!..

Абое любілі маўчаць такімі вечарамі. Крушынскі курыў перад грубкай. Віка, закутаўшыся ў коўдру, сядзела на тапчане, пазірала на яго і думала аб ім. Колькі ўжо разоў яна спрабавала разгаварыць яго — марна!

— На ўсё свой час, — суха адсякаў Крушынскі.

Цікавасць распірала дзяўчынку. Хто ён урэшце? Што за дакументы паказваў тады міліцыянеру на вакзале? Пакуль Крушынскі быў у адлучках, яна абшукала кожны куточак у хаце. У каморы, «у шафе» пад бялізнаю... Нічога! Канечне, Крушынскі заўсёды трымаў гэтыя важныя дакументы пры сабе.

— Ведаеш, — прамовіў ён адным з такіх вечароў, седзячы перад грубкаю, — ведаеш, Віка, як я многа думаю апошнім часам... Пра цябе. Пра сябе. Я столькі паспеў у жыцці нарабіць памылак, столькі награшыў, што цяпер думаю — ці не сам Бог цябе прыслаў? ***Збавеннем*** мне...

— Якіх гэта грахоў ты паспеў нарабіць? — спытала яна з недаверам. — Таксама мне — злачынец! — яна гмыкнула чыста па-жаночы. — Крушынскі, я даўно табе хацела сказаць... Згалі ты гэтую бараду! Не пасуе яна табе! Сапраўды, можна падумаць, што злачынца якісьці...

Ён, не адказваючы, перавёў размову на другое.

— Віка, вось што б ты рабіла зараз, калі б, напрыклад, даведалася, што я забіваў на вайне людзей? Альбо што я сядзеў у турме? Ці што я здзейсніў злачынства, аб якім ніхто пакуль не ведае? Што б ты рабіла? Па-ранейшаму жыла б тут, ці збегла б даўно куды вочы глядзяць? — ці ўсур'ёз, ці то жартам дапытваўся Крушынскі.

— Я ведаю, ты маніш. Нічога гэтага, ніякіх злачыстваў ты нарабіць не мог. Проста табе захацелася чамусьці папалохаць мяне — нібы я дзіця малое...

У гэты момант ускінуўся на сваёй ляжанцы Барс. Выбег на сярэдзіну хаты і забурчэў на вакно. За вакном мільгануліся дзве цені.

Крушынскі, у чым быў, не апранаючыся, выскачыў на двор. Сабака за ім. Аднак «сачыльшчыкаў» ужо і след прастыў.

Здзівілі Крушынскага паводзіны Барса. Ён не гаўкаў, і не кінуўся за чужакамі ўпагоню — хоць бы крышку, для адводу вачэй... Ён паводзіўся сябе так, як бы гэтыя людзі былі знаёмыя яму.

Крушынскі вярнуўся ў хатку. Яго трэсла ад холаду і ад злосці. Усё, з гэтым сачэннем ён пакончыць! Заўтра ж!

— Хто там? — спытала Віка.

— Ніхто. Сойкі на падваконне прылятаюць... Не бойся!

— А я і не баюся. У цябе ёсць такія паперы, што нас ніхто не зможа зачапіць.

— Адкуль ты ведаеш?

— Ты ж пры мне міліцыянеру паказваў, каля вакзала!

— Запомніла? Вось іменна: міліцыянеру, — прамармытаў Крушынскі. — На якога-небудзь сержанціка ці на старшыну гэтыя «важныя паперы» яшчэ могуць падзейнічаць... І не больш. Усё, Віка. Давай спаць. Заўтра ты будзеш адна цэлы дзень. Зварыш бульбы, сала падсмажыш...

— А ты зноў у горад?

— Зноў.

## Раздзел XV

*Знаёмства. — Дык хто ж такі Крушынскі? — Засцігнутыя на месцы злачынства. — Нарэшце ў леснічоўцы. — Допыт. — Версія Валіка. — «Антымілітарысцкі» маналог Крушынскага.*

Віка і праўда зусім не сумавала, калі Крушынскі з'язджаў у горад ці сыходзіў на паляванне.

Наадварот, яна любіла адзіноту. Тады ўзнікала адчуванне, што яна гаспадыня ўсяго гэтага. І хаткі, і дабра ў ёй, і вакольнага лесу. Раней яна ніколі не жыла дзе-небудзь у вёсцы, сярод прыроды. Таму ўсё тут здавалася ёй новым, цікавым, нязведанным.

У лесе ў яе быў любімы куток. Той самы бярэзнічак, дзе Крушынскі здабываў з-пад снегу курапатак. Сапраўдныя бярозы падобныя былі на тыя, што некалі ў школе ёй так лёгка ўдавалася

маляваць — кантуры ствала і ўпоперак заштрыхаваныя рыскі...

Крушынскі выправіўся ў горад прыкладна з гадзіну назад. Віка выйшла на двор і паманіла сабаку. Той грыз у кутку пад дрывотняю костку і не выказаў ніякага жадання ісці з ёю.

Пайшла сама.

Сцяжынка была вузкая, у адзін крок. Паветра пахла смалой і снегам. Лес маўчаў. Сонца толькі-толькі падымалася.

Маршрут у Вікі заўсёды быў адзін і той жа. Бярозавы гай, які яна абагне паўкругам. Вялізная разлапістая елка. Некалькі кустоў арэшніку, абсыпаных серабрыстым інеем. Рачулка, якую цяпер, пад снегам, і не відаць. Масток праз яе, вельмі прыгожы, з круглых бярвенцаў, гарбаты пасярэдзіне.

Віка нікуды не спяшалася. Сёння на душы ў яе было неяк асабліва ціха, спакойна, нават урачыста...

Аднак да любімага мосціка ёй дайсці не ўдалося. Не паспела яна прамінуць сваю елку, як ззаду пачуўся хлапечы голас:

— Эй!

Яна сама ўскрыкнула ад нечаканасці. Азірнулася.

Пад елкаю, усяго за якіх пяць крокаў ад сябе яна ўбачыла двух хлапчукоў, высокага і нізкага. Віка застыла на месцы. Хлапчукі выйшлі на сцежку і пакіраваліся да яе.

— Не бойся нас, — дружалюбна сказаў нізкі, падыходзячы.

— Нічога мы табе не зробім, — падтрымаў яго высокі.

Сапраўды: Віка нейкай інтуіцыяй адчула, што пагрозы ад іх ёй чакаць не варта. На выгляд гэта былі звычайныя вясковыя хлопчыкі, прыблізна яе аднагодкі. Адкрытыя твары, чыстыя вочы, добрыя галасы... «Хатнія» такія, дамашнія хлапчучкі. Зусім не

падобныя да той шпаны, што набачылася яна ў Гомелі (сама абы-дзе бадзяючыся...) Гэтыя наўрад ці будуць дражніць яе, прыставаць, абзывацца.

Хлопцы падыйшлі зусім блізка.

— Дык ты... дзяўчынка? — высокі прысвіснуў, больш пільна яе агледзеўшы. — Як цябе завуць?

Яна адказала не адразу. А калі загаварыла, у голасе яе была дзёрзкасць.

— А вы хто?

— Ты, галоўнае, не бойся, — паўтарыў высокі. — Мы мясцовыя, з Вялікай Паляны. Мяне завуць Валік, яго — Цімох, альбо, для скароту, проста Цім...

— Ну, мяне, дапусцім, Віка. А што вы тут робіце? А-а! — здагадалася яна раптам. — Гэта вы былі ўчора пад вакном? І ўвогуле — гэта вы сочыце за хаткаю?

— Мы, — пакорліва прызнаўся Цім.

— Але навошта? Што вы тут выглядаеце?

— Мы падумалі...

Валік замяўся, пазірнуў на сябра. Цім сказаў:

— Мы думалі, што табе патрэбна наша дапамога. Можа, ты ў небяспецы?

— З чаго вы ўзялі?

— Ну, чалавек гэты барадаты... Падазроны...

— Чым ён вам падазроны? Тым, што барадаты? — спытала яна з'едліва, а ў самой пахаладзела ўсярэдзіне.

— Са стрэльбаю ходзіць... Людзей цураецца...

— Жыў адзін, цяпер ты з ім, — дадаў Валік.

Яна задумалася на хвілінку. Як лепш іх пераканаць? Высмеяць, або пагаварыць з імі сур'ёзна, так, як вучыў яе Крушынскі?

Выбрала другое.

— Ніякі ён не падазроны! І нікога не цураецца! Гэта мой родны дзядзька. Я прыехала з Гомеля да яго ў госці.

Хлопцы пераглянуліся.

— Ну, — насмешліва спытаў Валік у Ціма.

Сябар толькі развёў рукамі і патупіўся. Маўляў — чаго ўжо тут, бывае! I я ж не святы, магу памыляцца... Але я нават рады, паказваў яго вінаваты выгляд, што памыліўся і што барадач ніякі не бандыт...

— Фу! — раптам крыкнула Віка. Па сцежцы з усіх ног нёсся да іх Барс.

— Не чапаць!

Валік прысеў. Сабака з разгону кінуўся яму ... у абдымкі. Цім таксама нагнуўся і пацерабіў Барса за вушы. Потым дастаў з кішэні і кінуў яму лусту хлеба.

— На, Барс.

— Вось яно што-о, — працягнула Віка. — Дык вы знаёмыя? Вы яго проста падкупілі?

— Гэта было няцяжка, — сказаў Цім. — Ён добры вельмі...

— Віка, — спытаў Валік, разгінаючыся, — а ўсё-такі хто ён?

— Як хто? Сабака.

— Ды не, твой дзядзька!

— А, дзядзька? Ну, ён...

Хацела б яна і сама гэта ведаць! Віка яшчэ раз уважліва агледзела хлопчыкаў. Не, першае ўражанне ад іх не было памылковым. Такім можна давяраць. I калі яна з імі пасябруе, як Барс... Крадком, канечне, ад Крушынскага... Вось было б здорава. Бо, што там ні кажы, а яна такая адзінокая! Даўно разгубляла ўсіх сяброў і сяброўак... А галоўнае — і праўда ж! — яны цікавяцца тым самым, што й яна: хто такі гэты Крушынскі? I калі яны аб'яднаюць намаганні, пачнуць разгадваць гэта разам... Хто ведае? Можа, тады атрымаецца наадварот: не яны ад яе, а яна ад іх штосьці пра свайго «роднага дзядзьку»?

Для пачатку Віка прыкінулася наіўнай.

— Дык а чым ён вас канкрэтна цікавіць?

— Ну, жыве адзін…

Яшчэ перад гэтым яны, не змаўляючыся, адно каб не стаяць на месцы, памалу пайшлі ў напрамку леснічоўкі. Віка — сцежкаю, а хлопцы з бакоў, цалiком. Сабака недзе знік.

Тройца параўналася з елкаю.

— …Маўчыць, — працягваў Валік, — невядома на якія грошы жыве…

— А што яшчэ робіць?! — раздаўся ззаду голас.

Гэта быў Крушынскі. Ён хаваўся за елкаю і ўсё чуў.

Хлапчукі рвануліся было ўрассыпную… Але позна! За шкірку і аднаго, і другога схапілі моцныя, што абцугі, далоні.

— Дык я пытаю: што ён яшчэ робіць? — грозна казаў Крушынскі.

Хлапчукі маўчалі. Нават марыць вырвацца з гэтых «абдымкаў» нельга было.

— Пайшлі! — так і павёў іх Крушынскі, перад сабою, трымаючы за каўняры.

Віка ішла ззаду. Яна спалохалася крыху, бо не ведала, чым гэта ўсё скончыцца. Ёй было шкада новых сяброў. Але што магла яна зрабіць? Адно толькі малілася ў думках, каб Крушынскі не зрабіў хлапчукам чаго кепскага, не застрашыў іх, бо тады б яны напэўна перасталі б сюды прыходзіць…

Адзін Барс дурэў ад радасці, насіўся сабе па снезе. Чаму б і не радавацца? Усе людзі, добрыя яго сябры, якія кормяць яго, гуляюцца з ім, якіх ён любіць усім сваім сабачым сэрцам, нарэшце сабраліся ў адным месцы, усе разам!

Падыйшлі да хаткі. Крушынскі ўштурхнуў хлопцаў у дзверы. Адступіўся, даючы зайсці Віцы, і сам зайшоў апошнім.

Вось і спраўдзіліся мары Ціма з Валікам пабываць у таямнічай леснічоўцы. Саміх «запрасілі»!

Толькі радасці ад такога «запрашэння" было, канечне, нямнога...

Крушынскі паставіў хлопцаў побач пасярод хаткі. Сам сеў на табурэт. Рукі паклаў на стол. У яго быў выгляд строгага суддзі, што чакае ад падсудных апошняга слова. Не хапала толькі стоса папераў перад ім, ды з бакоў — народных засядацеляў.

— А ты што стаіш? — звярнуўся раптам да Вікі. — Ці да іх хочаш? Пазнаёміліся ўжо?

Дзяўчынка здзіўлена падняла на яго вочы. Ён што, рэўнуе? Ці ёй проста падалося?

Хлопцы глядзелі ў падлогу. Перад гэтым абодва, не змаўляючыся, паздымалі шапкі і цяпер яшчэ больш падобныя зрабіліся на непаўналетніх злачынцаў.

Віка ціхенька прысела на другую табурэтку. «Допыт» пачаўся.

— Так, — строга сказаў Крушынскі. — На пытанні адказваць хутка і коратка. Па чарзе. Высокі, ты адказваеш першы. Усё зразумела? Тады паехалі! Як даўно вы тут ашываецеся? Колькі часу?

— Тыдзень, — буркнуў, галавы не падымаючы, Валік. — Нават больш...

— Каму расказвалі, каму хваліліся?

— Нікому! — усклікнулі хлопцы ў адзін голас.

— І пра яе ніхто, акрамя вас, не ведае?!

— Ніхто!

— Ніводзін чалавек больш!

Крушынскі задумаўся.

— Калі не хлусіце, — змякчыўся ён голасам, — тады гэта мяняе справу. З падазроных вы аўтаматычна пераходзіце ў разрад проста сведкаў... Дазваляю сесці. Туды, на тапчан.

Цім з Валікам прымасціліся з краю, плячо да пляча. Віка з палёгкаю выдыхнула.

— Паселі, як вераб'і! — нават асмелілася пажартаваць яна.

— А ты памаўчы, — сказаў Крушынскі. — з табой яшчэ будзе размова. Асобная. І так, хлопцы! Давайце цяпер сур'ёзна. Я сёння, вось зараз, хачу паставіць на ўсім гэтам кропку. Мне надакучыла гэта. Пагадзіцеся, не дужа прыемна жыць пад увесьчасным наглядам. Ведаючы, што за табою сочаць. Што вам з мяне трэба? Што вас цікавіць? Абяцаю расказаць вам усё.

Віка слухала, затаіўшы дыханне. Нарэшце! Вось ён, даўно чаканы момант!

— Але ў мяне ёсць умова, — працягваў Крушынскі. — Вы павінны маўчаць і надалей. Таму што тайна, якую пачуеце, тычыцца не аднаго мяне. Гэта... дзяржаўная тайна. Згода?

Хлопцы пераглянуліся. Вочы ў іх гарэлі.

— Згода!

— Абяцаем, клянёмся!...

— Тады спачатку я хачу паслухаць вас. Дарэчы, заадно і пазнаёмімся.

Хлопцы не паспелі адкрыць раты, як іх апярэдзіла Віка:

— Гэта Цім, злева — Валік!

— Не паказвай на людзей пальцам, — заўважыў ёй Крушынскі. — Мяне можаце зваць дзядзька Барыс. Дык хто я такі, па-вашаму? Хто пачне?

Валік штурхнуў Ціма плячом. Той ветліва, у кулак, адкашляўся.

— Спачатку мы (зноў штуршок плячом)... ну, адзін я... думаў, што вы...

— Смялей, смялей! — падбадзёрваў Крушынскі.

— Што вы — злачынец... Што хаваецеся тут, у лесе, ад пераследу...

— Так, так, разумею. А потым?

— А потым, — цяпер Валік заспяшаўся гаварыць, — мы зразумелі, што тут нейкая тайна! Вы выконваеце важнае дзяржаўнае даручэнне!

— Словам, я — агент спецслужбаў?

— Так, — адказаў Валік.

Віка слухала разявіўшы рот. Вушам сваім не верыла. Дык вось яно што! Як яна адразу не здагадалася?!

— Можа, нават здагадваецеся, якое заданне я выконваю? — дапытваўся Крушынскі.

— Мы думаем...

— Смялей!

— Мы думаем, што вам даручана знайсці тут, у нашых ваколіцах, месца для ваеннай базы, — нерашуча сказаў Валік.

— Альбо месца для будаўніцтва шахт для запуску ядзерных ракет, — дадаў Цім.

Крушынскі аж сумеўся. Нейкі час вялікімі вачыма пазіраў на хлопчыкаў. Потым прамовіў:

— Значыць, і на нашым пакаленні гэтая мілітарысцкая брыдота не закончылася... Значыць, і вам — з такіх гадоў! — напаўняюць бедныя галовы тым жа самым... Скажыце мне, дзеля Бога! — ускінуўся ён раптам, — навошта нам, «маладой, мірнай» краіне Беларусь ізноў спатрэбіліся ракетныя шахты?! Ваенныя сакрэтныя базы?! З кім мы сабраліся ваяваць? Каму пагражаем кулачкамі?! Калі гэта ўсё скончыцца?!

Здзіўленыя гэтым нечаканым яго маналогам, дзеці маўчалі. Ды яны і не ведалі, што казаць.

Проста яны не разумелі дарослага Крушынскага.

## Раздзел XVI

*Крушынскі расказвае пра сябе. — Афганская вайна. — Новы герой — Васіль. — Шкатулка з палаца Аміна. — Чорны жэмчуг. — Хто пра што думае.*

Ды Крушынскі і сам хутка астыў. Нібы спахапіўся, што трохі не ў той стэп яго нясе, што крыху не той кантынгент слухачоў у яго, таму і пытанні ягоныя не па адрасе.

— Забудзем пра гэта! Не, хлопцы, не, Віка! Не шукаю я тут месца для ваеннай базы. І не збіраюся будаваць ракетныя шахты. Аднак я здзіўлены. Вы амаль угадалі!

У гэты момант параўнаўся з вакном і заглянуў у яго зыркі сонечны промень. У леснічоўцы зрабілася светла.

Віцы, якая сядзела збоку ад Крушынскага і магла бачыць яго ў профіль, падалося, што ў вачах у таго блукаюць хітрынкі.

— Усё трохі прасцей... Я сапраўды выконваю тут спецзаданне. Магчыма, не менш важнае за вашы ваенныя базы... І з дакументамі ў мяне ўсё ў парадку. Віка можа пацвердзіць. Канечне, я не павінен быў бы расказваць вам гэта! Але раз вы даказалі, што ўмееце трымаць язык за зубамі, і раз ужо я абяцаўся — так і быць, раскажу... Што вы ведаеце пра Афганскую вайну? — спытаў ён раптам.

— Афганскую? Усё ведаем!

— Многа чаго!

Хлопцы загаварылі наперабой.

— У нас два мужчыны ў Вялікай Паляне жывуць, якія там ваявалі!

— І яшчэ адзін загінуў!

— Помнік яму стаіць, на могілках!..

— Усё? — выслухаўшы іх, спытаў Крушынскі.

— Усё.

— Ну што ж, і гэтага нямала. Улічваючы, што вас яшчэ, мабыць, і на свеце не было. калі тая вайна пачалася. Навошта яна ўвогуле была патрэбна? — справа іншая, не пра тое пакуль гаворка. А пра тое, што нам, ***спецслужбе***, — сказаў ён важна, робячы націск на гэтым слове, — таскама работы хапала; у

шапку спаць не даводзілася. Былі сярод салдатаў незадаволеныя, былі здраднікі, былі такія, хто трапляў у палон да «душманаў» і іх завярбоўвалі там... Вось імі, у асноўным, і займаліся.

А цяпер уявіце сабе вялізны ваенны шпіталь пад Масквою. У двух карпусах — цяжкапараненыя, што паступаюць сюды з Афганістана. Само сабою, яны нас больш за ўсіх астатніх і цікавілі. Да таго ж зручна было кантраляваць іх. Усе ў адным месцы. Многія месяцамі прыкутыя да ложкаў... Бясконцыя размовы, розныя крамольныя выказванні... Словам, раздолле, прастор, самае шырокае поле дзейнасці для нас, спецслужбаў (Крушынскі яўна злоўжываў паўтарэннем гэтага слова).

Дык вось. У некаторых палатах стаяла апаратура для падслухоўвання. Не ва ўсіх, канечне, і не круглыя суткі мы сядзелі з навушнікамі — такое толькі ў фільмах бывае... Але адна палата нас асабліва зацікавіла. Ляжаў у ёй паранены «афганец»... Паранены нават не тое слова. Быў ён без рук, без ног, сляпы — але ж гаварыць мог! Пры жаданні, канечне. Цікавіў ён нас найперш сваім службовым спіскам, а таксама біяграфіяй. Родам з Беларусі, безбацькавіч, з дзіцячага дому. Служыў у спецыяльным дэсантным батальёне, тым самым, які прымаў удзел у штурме палаца кіраўніка Афганістана Аміна яшчэ аж у 1979 годзе; тады ж — гэта вам для агульнага развіцця — у Кабул упершыню і ўвайшлі савецкія танкі. Пачалася вайна. Неўзабаве наш герой патрапляе ў палон да "душманаў". Уцякае адтуль пры самых загадкавых абставінах... Калі яму верыць, з дапамогаю нейкай афганскай дзяўчынкі — акурат як Жылін у «Каўказкім палонніку»; чыталі?

— Не-а.

— Ну, гэта няважна. Неяк ён уцёк, акрамя таго вынёс на сабе хворага знясіленага таварыша... Герой, словам! Аднак і ў герояў свой лёс, і ім не заўсёды

шэнціць. Тым больш на вайне, тым больш на «афганскай». Былі ў іх там такія снайперы: падскочыць такі з-за пагорачка, стрэліць у паветры, прыцэльна стрэліць! — і падае. Усё за паўсекунды! І невядома, адкуль стрэл, дзе снайпер? — а наш нежывы ўжо...

Карацей, знайшоўся і на нашага героя свой снайпер. І быў ён, герой, канечне, а не снайпер, у выглядзе абрубка дастаўлены ў падмаскоўны ваенны шпіталь. Усе дактары, ды, відаць, і сам ён, ведалі, што жыць яму ад сілы месяц.

У ваенных шпіталях свая атмасфера. Бяда, калецтва далёка не заўсёды збліжаюць людзей, часцей наадварот, раз'ядноўваюць. З нашым «афганцам» ніхто не хацеў сябраваць. Ды і нас, спецслужбы, ён наўрад ці зацікавіў бы, каб раптам не аб'явіўся ў яго прыяцель. Звалі яго... ну, скажам, Васіль. Таксама пасля службы ў Афгане паранены ў сківіцу і ў руку. Пачынае ён нашага героя даглядаць. Прыбіраць за ім, карміць з лыжачкі... Ці проста таму рабіў ён гэта, што беларус і меў добрую душу, ці... Вось тут мы, спецслужбы, задумаліся! А можа, было ў яго штосьці на розуме? Можа, штосьці хоча ён у нашага абрубка выведаць?

— А што... ў яго можна выведаць?! — выкрыкнуў у нецярпенні Цім.

— Не перабівай! — цыкнула Віка.

— Аднойчы, — спакойна працягваў Крушынскі (як бы аповесць якую па кніжцы чытаючы), — наш чалавек выпадкова ўключаецца ў палату... І адразу налятае на сюрпрыз! Васіль з «афганцам» адны ў палаце. І «афганец» штосьці ціха расказвае яму. Не ўсё, але сёе-тое нашаму чалавеку ўдаецца запісаць... Але якой важнасці нават гэтае «тое-сёе»!

Прыкладна вось што паведаміў сябру «афганец». Пры штурме палаца Аміна — а палац, трэба заўважыць, быў проста раскошны — у адным з

пакояў наш «афганец» убачыў на століку маленькую шкатулку. Дужа прыгожай яна яму падалася, каб можна было ўтрымацца ад спакусы прыхаваць яе за пазуху... Ён і прыхаваў. Тым больш, ідзе бой, страляніна, крыкі, стогны... Каму тут справа да нейкай шкатулачкі?! Калі ж са штурмам было ўсё пакончана і батальён дэсантнікаў атрымаў перадых, у цёмным кутку ён адчыніў свой трафей і...

— Золата?! — укрыкнуў, аблізваючы перасохлыя вусны Цім. Ён і да гэтага сядзеў, як іголках; усё ў ім бунтавала.

— Бяры вышэй, — пасміхнуўся Крушынскі. — Каштоўнасці! Шкатулка была з верхам набітая каштоўнымі каменьчыкамі. Алмазы, сапфіры, ізумруды, рубіны, а галоўнае — чорны жэмчуг! Які лічыцца самым каштоўным у свеце. У прыродзе сапраўднага яго вельмі мала, здабываюць яго толькі ў адным месцы — каля берагоў Паўднёвай Афрыкі.

Крушынскі змоўк, паглядваючы на дзяцей. Разумеючы, што цяпер творыцца ў іхніх душах. Шкатулка, каштоўнасьці, рэдкі жэмчуг, бераг Паўднёвай Афрыкі — а сляды вядуць у іхнюю глухамань, у Вялікую Паляну!

Віка думала: з якім цікавым чалавекам ёй пашэнціла пазнаёміцца і быць разам.

Валік — што Цім не памыляўся; звязаны гэты барадач-Крушынскі з тайнай, ды яшчэ з якою!..

А Цім, у якога ніколі не было сумненняў у тым, што яго родныя мясціны самыя прыгажэйшыя, багацейшыя і загадкавыя за ўсе іншыя на зямлі, — Цім ужо працаваў фантазіяй на будучыню. Ён ужо бачыў перад сабою гэтую інкрустацыяй агранёную шкатулку, ужо адчуваў у руках прыемную яе цяжкасць, ужо знаходзіў яе і перасыпаў у пальцах, як гарошыны, чорны жэмчуг!

## Раздзел XVII

*Працяг маналога Крушынскага. — Узлёт і падзенне Васіля. — Цім прагне разблытаць гісторыю. — Зарок маўчання. — Матацыкл.*

— Далей!

— Калі ласка, дзядзька Барыс!

— Што сказаў Васілю «афганец»?!

— Далей, — пачаў Крушынскі, — мы расчулі наступнае. Мне ўдалося, казаў афганец Васілю, пераправіць шкатулку ў Саюз. І цяпер яна знаходзіцца ў...

— У Беларусі, у Вялікай Паляне! — уклікнуў Цім.

— Ды перастань ты круціцца!

— І перабіваць, — дадала Віка. Яна як бы ўжо нейкае права мела на Крушынскага, не давала яго ў крыўду, заступалася за яго.

— У Беларусі, у ваколіцах Вялікай Пляны. — пацвердзіў Крушынскі. — Далей «афганец» амаль шаптаў. І нам мала што ўдалося расчуць. Напрыклад — «я ўжо нежывы, я ведаю, — ціха казаў ён, — таму пра шкатулку ведаеш ты адзін... Усё тваё... Паедзеш туды... Зробіш... Абяцай, што зробіш...» Тут у палату пачалі заходзіць іншыя хворыя, і «афганец» замоўк. І тыя апошнія яго словы было адзінае, што мы, спецслужбы, мелі. Назаўтра «афганца» забіраюць на аперацыю, потым — на другую... Словам, ён памёр.

Што да Васіля, той, неўзабаве выпісаўшыся са шпіталя і дэмабілізаваўшыся, пачынае паводзіць сябе дзіўна. Канечне, у нас ён на заметцы. Мы сочым за ўсімі яго дзеяннямі і перамяшчэннямі. А ён першае што робіць — гэта едзе ў сяло Вялікая Паляна і ставіць на свае грошы...

— Помнік! — Ціма не проста было суняць

— Так. Той самы, які вы згадвалі сёння. На месцы, дзе пахаваны ваш зямляк-«афганец». Пасля чаго наш Васіль нібыта забыўся пра ўсё на свеце. Ды й то, можна яго зразумець! Малады, здаровы, разумны. Прайшоў вайну. З медалямі. Ад дзяўчат няма адбою. А тут яшчэ такое пачынае заварочвацца!.. Перабудова, канец Савецкага Саюза, вольны бізнес, лёгкія грошы, вясёлае, невядомае раней жыццё... Тут аб усім забудзеш, не тое што пра хваравітае трызненне нейкага калекі і пра нейкую міфічную шкатулку! Наперабой завуць Васіля ў розныя фірмы, абяцаюць залатыя горы. Пачаў ён з целаахоўніка, затым вырас да менеджэра, потым — камерцыйнага дырэктара... Грошы шалёныя, замежныя паездкі, рэстараны. іншамаркі...

Галава кругам у Васі! А мы з яго вачэй не спускаем. І не ўмешваемся. І дачакаліся. Вельмі хутка пайшлі ў Васіля няўдачы. Сяброў у яго не было; там дзе «круцяцца» вялікія грошы, сяброў ніколі не бывае. Сям'ёю не абзавёўся. Пасады свае пагубляў, прычым у зваротным парадку: камерцыйны дырэктар — менеджэр — целаахоўнік — проста вартаўнік, пакуль не выгналі зусім. Пачаў наш Васіль піць. Улез у даўгі, прадаў усё, што можна было...

А тут яшчэ звалілі на яго нейкую махінацыю, з камп'ютэрнай тэхнікай звязаную, «падставілі» яго, і хоць следчыя разабраліся, што ён тут ні пры чым, аднак месяцы тры давялося праваляцца на нарах...

— Вось і ўсё, — абарваў сам сябе Крушынскі. — У нас ёсць самыя дакладныя звесткі, што неўзабаве Васіль павінен тут з'явіцца. Тады ён і выведзе нас на месца, дзе схавана шкатулка.

Віка, пераглянуўшыся з хлапчукамі, нерашуча спытала:

— А ён... хіба не мог забраць яе раней?

— Не мог. У камеру да яго мы падсадзілі свайго чалавека. Аднойчы Васіль і прагаварыўся. Маўляў,

так і так, вось выйду адсюль, адпачну, адляжуся... А потым махану ў адно месца, дзе мяне капітал чакае. Раней, сказаў яшчэ Васіль, грошы і без таго вадзіліся, таму не было патрэбы чапаць гэты свой «персанальны банк»... Вось цяпер і мы яго пачакаем! Каб узяць цёпленькім, а шкатулку з каштоўнасцямі вярнуць таму, каму яна па законе належыць — дзяржаве.

— Пачакайце... Вось толькі... — Валік зрабіў задуменны выгляд.

— Што толькі?

— Навошта чакаць Васіля? Няўжо нельга самім паспрабаваць адшукаць шкатулку?

— І то праўда! — падтрымаў Валіка Цім. — Мы ж тут усё чыста ведаем, кожны куточак!

— Не раю вам гэтым забіваць сабе галаву. Без Васіля шкатулку нам не знайсці ніколі. Няўжо вы думаеце, што за пятнаццаць гадоў мы б яе не адшукалі б, каб можна было?! Пра шкатулку забудзьце. Нас павінен цікавіць толькі Васіль.

Цім уздыхнуў расчаравана.

— А можа, паспрабаваць усё-ткі? — спытаў з надзеяй. — Яшчэ раз? У нас у сяле жывуць два «афганцы» былыя... Можа, з імі што-небудзь звязана?

— Нічога з імі не звязана! — адказаў Крушынскі. — За каго вы нас, спецслужбы, прымаеце? На іх мы выходзілі, і неаднойчы. Апытвалі. Глуха! Яны зусім у іншы час служылі ў Афганістане. Так што ўсе канца губляюцца, і толькі Васіль можа іх разблытаць. Зразумела?

— Зразумела...

— І чаму я вам гэта расказваю — таксама? Вы проста змусілі мяне! Бо я баяўся, што вы разнясеце розныя плёткі па ўсім сяле, і нейкім чынам Васілю пра мяне стане вядома... Тады ён яшчэ не скора тут паявіцца! Але раз ужо вы аб усім ведаеце — самі павінны разумець: цяпер мы звязаны адной

вяровачкай. Цяпер вы проста вымушаны маўчаць! Згода?

— Яшчэ б!

— Канечне!

— Мала маўчаць; раз вы ўжо ў курсе справы, дык павінны яшчэ і памагаць мне!

— Мы згодныя!

— Але як?! Чым?!

— Ну, напрыклад, вы ж разумееце, што я часта не магу бываць у сяле... А вы жывеце там. Гуляеце, лазіце паўсюль... Хлопцы вы назіральныя, сур'ёзныя, умееце трымаць язык за зубамі... Таму патрабуецца ад вас ўсяго толькі — заўважаць незнаёмых падазроных людзей. Кожны з іх можа аказацца Васілём. І тады дакладваць мне. Усё гэта не за так, не за бясплатна, — дадаў Крушынскі. — Калі вам пашэнціць, калі вы справіцеся і высачыце Васіля, вас чакае ўзнагарода. Хто з вас што б хацеў?

Пытанне дык пытанне! Тут любы задумаецца! Гэта ж яшчэ гледзячы што разумее пад «узнагародай» Крушынскі... Можа, для яго гэта — звычайная аўтаручка з блакнотам? А можа, аўта... мабіль! А можа, пуцёўкі ў кругасветнае падарожжа? Паміж аўтаручкай і аўтамабілем разбежка ой-ё-ёй, і трэба яшчэ ведаць межы гэтай будучай узнагароды!.. Дый ці не розыгрыш гэта?

Але Крушынскі быў сур'ёзны.

Віка адвярнулася і абыякава пазірала ў вакно. Каму-каму, а ёй узнагарода не свяціла.

— Ну? — падагнаў хлопцаў Крушынскі. — Ты, Цім, што хацеў бы?

— А можна... матацыкл? Хоць бы «Мінск»! — дадаў ён паспешліва і чамусьці вінавата.

— Матацыкл? А колькі табе гадоў?

— Трынаццаць...

— Дык як жа ты «на правы» здасі?

— А ён бы стаяў у мяне ў гаражы, чакаў, пакуль вырасту!

— Будзе табе матацыкл, — урачыста паабяцаў Крушынскі.

На тым і развіталіся. Быў прызначаны дзень, калі хлопцы могуць наведвацца ў леснічоўку — серада, і час — толькі раніцаю. І, само сабою, каб ні адна жывая душа не даведалася!

Калі хлопцы пайшлі, Крушынскі не хаваў радасці.

— Ну, цяпер, спадзяюся, можна жыць спакойна, — сказаў ён.

Але Віка была панурая.

## Раздзел XIX

*Прывабнасць тайны. — Цімава прага дзейнасці. — Помнік. — Два «афганцы». — Паход да Міколы Танкіста. — Валікаў сакрэт.*

І так, цяпер усё стала на свае месцы. Усё было зразумела: хто такі «барадач», чаго ён тут ашываецца, што за «нявольніка», ці лепш сказаць, «нявольніцу» трымае ў сваёй леснічоўцы... Усё было проста, нават будзённа... Але вось жа дзіва! Рэальнасць і будзённасць гэтыя аказаліся нашмат цікавейшымі за ўсе фантазіі!

Пасля знаёмства з Вікаю і з Крушынскім жыццё нашых хлопцаў набыло зусім іншы сэнс. Бо адна справа — проста жыць, як і ўсе навокал. Есці, піць, спаць, тэлевізар глядзець, урокі вучыць... У хакей гуляць, на лыжах па лесе гойсаць...

І зусім іншая — ведаць тое, чаго ніхто больш не ведае! Жыць з адчуваннем тайны. Насіць яе ў сабе. Ды яшчэ якой тайны! Дзяржаўнай, з каштоўнасцямі звязанай... Ужо адно ведаць пра гэта — амаль тое самае, што шукаць скарб, нават яшчэ цікавей!

А на двары нарэшце ўсталявалася сапраўдная зіма. Са сваімі снягамі, траскучымі маразамі, ранішнім інеем на дрэвах і вечаровымі зоркамі на небе. Вось-вось будзе любімае свята — Новы год. Школьная елка... Зімовыя канікулы... Таму няпраўдаю будзе сказаць, што Цім з Валікам так ужо «зацыкліліся» на пошуках шкатулкі з каштоўнасцямі, каб не заўважыць і не цаніць іншых радасцяў жыцця.

І ўсё ж! Недзе на трэці дзень пасля выпадку ў леснічоўцы Цім падзяліўся з сябрам сумненнямі:

— А што, калі ён проста маніў нам? Каб перасталі за ім сачыць? Потым — гэтая Віка... Чаму яна да яго ні з таго ні з сяго прыехала?

— Ну, чаму... — няпэўна адказаў Валік. — Не ведаю! Сама яна не гаворыць, а распытваць няёмка. Зрэшты, а чаго ты яшчэ хацеў? Мы і так даведаліся больш, чым трэба. І пра барадача, і пра яго «закладніка». Больш мы проста нічога не можам!

— У тым і справа...

Няўрымліваму Ціму прагнулася дзейнічаць. А прастору для дзейнасці было якраз і няшмат. Склаўшы рукі, сядзець і чакаць, пакуль аб'явіцца ўласнай персонаю Васіль? Добра. Але нават такое пасіўнае чаканне не магло быць да канца апраўдана. Ну, дапусцім, прыедзе Васіль. І што — ён будзе гуляць па ўсім сяле, галаву задраўшы? У ва ўсіх на вачах?

Хлопцам заставалася толькі паспрабаваць вызначыць тыя вельмі нямногія шляхі, якія хоць неяк, хоць ускосна, але перасякаюцца з «афганскай» гісторыяй. Можа, і намацаецца якаясь танюткая нітачка? Пацягнуўшы за якую, можна будзе паспрабаваць разблытаць увесь клубок...

Першай зачэпкай тут быў помнік загінуўшаму «афганцу». Другой — два жывыя аднасяльчаніны, што некалі ў Афганістане служылі.

— З помніка і пачнем, — вырашыў Цім.

Пайшлі на могілкі.

Цяпер, зімою, апошні прытулак «афанца» ўяўляў сабою белы сумёт. Нават агароджа па самы верх была замецена. Са снегу вытыркаўся адно помнік. На ім быў барэльеф салдата, які адной рукой абапіраецца на АКМ, а другой цягнецца да... валошкі. Барэльеф крыху нагадваў манумент «Смага», што ў Брэсцкай крэпасці. Толькі там салдат імкнецца да вады.

Нічога не прынёс агляд помніка. Пастаялі каля яго хлопцы. Паспрачаліся яшчэ: а ці бываюць у Афганістане беларускія валошкі? Сышліся на тым, што нават калі і няма, то гэта — даволі прыгожы сімвал. Вобраз чалавека, які цягнецца, як сасмяглы да вады, да сіняй кветкі далёкай Радзімы...

Затым сябры паўдня правялі ў сельскай бібліятэцы. Вывучалі кнігу свайго раёна, якая называлася «Памяць». Кніга была таўсценная і цяжкая.

Асабліва зацікавілі нашых хлопцаў тры раздзелы. Першы, пад назваю «Героі і ахвяры», пачынаўся такімі дубовымі словамі: «Па рашэнню ЦК КПСС і Савецкага ўрада ў канцы 1979 г. на тэрыторыю Дэмакратычнай Рэспублікі Афганістан былі ўведзены савецкія войскі. Гісторыя дасць канчатковую ацэнку афганскай вайне, але, якой бы ні была гэтая ацэнка, ніколі не забудуцца гераічныя подзвігі нашых воінаў у далёкай краіне»...

Другі раздзел называўся — «Не вярнуліся з Афганістана». Восем чалавек з раёна загінулі; у раздзеле прыводзіліся іхнія біяграфіі, вытрымкі з пісем і фотаздымкі.

І трэці, самы кароткі — «Тут шануюць іх памяць». Канчаўся гэты раздзельчык вершам. Да таго ён лёг хлопцам на душу, што Цім папрасіў у бібліятэкаркі ручку і паперу і акуратна перапісаў яго, каб вывучыць потым напамяць.

З краіны афганскай вярнуліся ў цынку —
Не суджаны быў ім шчаслівы працяг.
Сівее матуля няўцешная: «Сынку!..»
І бацьку пячэ невыносна ў грудзях…

Хай слёзы твае нам сумленне апаляць,
Бо ці ж перад імі няма ў нас віны?
Няхай зберажэ наша горкая памяць
Абраннікаў гэтай нянашай вайны.[3]

Апошнія словы гэтага цудоўнага верша білі, здавалася, проста ў сэрца…

Пасля бібліятэкі вырашына было праведаць жывых «афганцаў».

Адзін, Колька Танкіст, жыў побач, на Сяле, другі, па мянушцы Кандагар, далёка — у Зарэччы. Цяжка было нават уявіць сабе двух больш розных людзей. Хаця і дзіўна гэта! Абодва ж прайшлі праз аднолькавае пекла, абодва паварыліся ў адным і тым жа катле — і які розны вынік!

Колька Танкіст быў чалавек набожны, ціхі, калі не сказаць затурканы. Не піў, не курыў, ніхто ніколі не чуў ад яго лаянкі, ніколі не ўступаў ён у спрэчкі, з кожным, і старым, і малым, згаджаўся, ківаючы галавою; усе ведалі, што гэта ў яго нервовы цік пасля кантузіі.

Кандагар піў бязбожна, лаяўся так, што хацелася заціснуць вушы. П'яны, ганяў з сякераю жонку з дзецьмі. Абодва «афганцы», дарэчы, мелі свае сем'і і дзяцей — амаль аднагодкаў нашым Ціму з Валікам.

Калі хлопцы смела ўвайшлі ў чужы двор, Колька Танкіст калоў дровы. У дужых яго руках смачна гэкала сякера. Убачыў хлопцаў, спыніўся на паўзамаху. Паклаў сякеру на калодку. Выцер аб

[3] З верша Міколы Кусянкова "Рэквіем".

куфайку рукі. Нібы якія важныя начальнікі да яго прыйшлі, а не два падшыванцы. Зрэшты, так ён паводзіўся з усімі, паводле прынцыпа — раз чалавек завітаў да мяне, значыць ёсць у яго пільная патрэба; адкладвай работу і давай яму ўвагу.

Хлопцы ў першы момант нават разгубіліся ад такой ахвотнай паслужлівасці дарослага мужчыны. Цім нічога не прыдумаў, як выдаць сходу:

— Дзядзька Мікола, вы знаёмыя з такім Барысам Крушынскім? Які ў лесе жыве? Ён, як і вы, з Афганістанам неяк звязаны.

Колька Танскіст заківаў галавою сцвярджальна — маўляў, так, ведаю. А адказаў адмоўна.

— Не, незнаёмы. Я даўно ўжо ні з кім з былых аднапалчанаў не падтрымліваю ніякіх адносін. Я забыў пра ўсё.

Сур'ёзны, поўны адказ. Якія тут яшчэ могуць быць пытанні? Аднак у Ціма знайшлося адно:

— Дзядзька Мікола, вось вы былі ў Афганістане... Скажыце. адтуль можна было што-небудзь вывезці? Ну, золата там... Альбо каштоўнасці... І калі можна, дык якім чынам?

Можна, можна — заківаў дзядзька Мікола. А адказаў:

— Рукі-ногі з галавою. Гэта адзінае, што адтуль можна было вывезці. Даў Бог вярнуцца жывым — вось і самыя большыя каштоўнасці.

— Да Кандагара няма сэнсу ісці, — панылым голасам сказаў Цім, калі хлопцы выйшлі на вуліцу.

— Канечне, — згадзіўся Валік.

Тут толькі да нашых сяброў дайшло: якія ж яны ўсё-ткі наіўныя! На што тут можна было спадзявацца? Канечне, такі шлях, што яны выбралі, быў тупіковы. Не кажучы ўжо, што іхняя залішняя цікаўнасць магла толькі пашкодзіць Крушынскаму. Ён жа іх папярэджваў, каб не лезлі нікуды, маўчалі.

— А можа, цяпер сходзім у леснічаўку? — прапанаваў Валік, скоса зіркнуўшы на сябра: здагадаўся той ужо, ці не?

Не прызнавацца ж яму было, што на яго падзейнічала ўся гэтая «афганская» гісторыя з зусім іншага боку, чым на Ціма. Не так яго зацікавілі міфічная шкатулка з каштоўнасцямі і яшчэ больш міфічны Васіль, як рэчы больш празаічныя. Валіка ўразіла судакрананне да чужога жыцця. Гэты лес, заснежаная ўтульная хатка, дзе няма ні святла, ні радыё, ні газет, ні тэлевізара... Затое ёсць адна дзяўчынка з горада Гомеля.

Наш Валік проста закахаўся. Яму падабалася тое, што Віка вельмі прыгожая. Што яна паводзіць сябе зусім не так, як смяшлівыя, несур'ёзныя, пуставатыя іх аднакласніцы — а як амаль дарослая. І ўсё адно лёгка з ёю! Якая ў яе сціплая і добрая ўсмешка, які прыемны голас!.. І загадкавая яна не менш за Крушынскага. З якой яна сям'і? Як яна вучыцца? Якія кніжкі любіць? Хто ў яе сябры?

Усё гэта было нова нашаму Валіку. І заманліва. Вось чаго яго цягнула ўвесь час у лясную хатку.

Аднак Цім, здаецца («дзякаваць Богу», падумаў Валік), ні аб чым не здагадваўся.

— Табе што было сказана? — спытаў ён. — Без патрэбы там не з'яўляцца. Толькі раз на тыдзень, і толькі ўвечары, каб ніхто не бачыў.

— Гэта я помню, — адказаў Валік, стрымаўшы ўздых.

## Раздзел XVIII

*Цім дабіваецца свайго! — Дзве гісторыі, якія ён супастаўляе і робіць адкрыццё. — Валік зайздросціць сябру.*

Ёсць харошая беларуская прымаўка: хто пытае, той не заблукае. Валік галаву гатовы быў бы даць на адсячэнне, што справа іхняя марная. Ніколі не разблытаць ім гэтай «афганскай» тайны! За што тут ухапіцца? З якога боку падступіць? Дзе хоць якая зачэпачка?

Але Цім быў упарты, так лёгка ён здавацца не збіраўся... І адбылося дзіва! Звычайны белагаловы кірпаты беларускі хлапчучок разгадаў-такі тайну пятнаццацігадовай даўнасці!

Як часта бывае, разгадка прыйшла адтуль, адкуль і чакаць яе было немагчыма. Папярэднічалі гэтаму два эпізоды. Нічым нібыта паміж сабою не звязаныя. І трэба была Цімава неўтаймаваная фантазія, каб гэтыя эпізоды супаставіць і зрабіць, без перабольшання, адкрыццё!

Увечары таго самага дня, калі хлопцы хадзілі перш на могілкі, затым у бібліятэку і да Колькі Танкіста, Цім прычапіўся да бацькі:

— Тата, раскажы пра помнік гэтаму «афганцу». Хто яго паставіў? Чаму такая дзіўная на ім выява? І хто быў гэты салдат? Дзе ён жыў? Дзе яго радня?

У іншы час бацька толькі рукою махнуў бы — маўляў, адчапіся. Але гэтым вечарам была нагода. Бацька сядзеў за сталом і набіваў гільзы для стрэльбы. Купленых патронаў ён цярпець не мог, любіў сам валэндацца з гільзамі. Таму цяпер рукі ў яго былі занятыя, а язык — вольны.

І тата расказаў.

— З гэтым помнікам увогуле дзіўная гісторыя. Гады тры салдат ляжаў пад звычайным крыжам, у звычайнай магілцы. Але аднойчы з'яўляецца ў Вялікай Паляне чалавек, ідзе да бацькоў загінуўшага...

Цім уздрыгнуў. «Васіль! — мільганула здагадка. — Гэта ж Васіль прыязджаў! Значыць, не маніў Крушынскі!»

—...Так і так, кажа, я блізкі сябар вашаму сыну, разам ваявалі, таму лічу сваім абавязкам як след ушанаваць яго памяць. Калі ў мясцовых уладаў рукі не даходзяць, я сам пастаўлю на магіле помнік. І за тры дні паставіў! Ну, не сам, канечне, прыязджалі з горада майстры. Раствор, бетон, плітка, усё такое...

— Ну, і далей?

— Далей чалавек знікае назаўсёды. А бацькі салдата рэгулярна, кожны месяц пачынаюць атрымліваць грашовыя пераводы. Ды такія сумы, што ім і не сніліся! Так і памерлі, дзякуючы ўладам. А я так думаю, — закончыў бацька, — што гэта ён прысылаў! Аднапалчанін гэты самы...

— Канечне, Ва... — ледзь не вырвалася ў Ціма «Васіль». — Канечне, ён! Аднапалчанін!

— Чаму гэта цябе зацікавіла раптам?

— Так, проста... Выява на помніку прыгожая. Вось і падумалася: хто такую мог зрабіць?

— Што праўда, тое праўда — усім падабаецца. Нават з Мінску прыязджалі, фатографы, на кінакамеру здымалі...

У гэтую ноч Ціму сніўся адзін і той жа сон: чалавек, які цягнецца рукою да васілька. Здаецца, вось-вось схопіць яго, сарве — але ніяк! Нібы міраж, растае кветка, расплываецца, аддаляецца... І зноў трэба падпаўзаць да яе, а яна зноў — растала... Нібы кліча некуды, заве за сабою...

Назаўтра з самай раніцы Цім быў у Валіка. А ў таго — поўная кватэра гасцей. Сябры зачыніліся ў Валікавым пакоі.

Цім коратка пераказаў тое, што пачуў учора ад бацькі.

— Ведаеш, што гэта значыць? Што Васіль — не выдумка, а рэальнасць! Ён існуе! Аднаго толькі не разумею...

Цім пацёр скроні.

— Навошта ён прысылаў бацькам салдата грошы? — падказаў Валік.

— Хоць бы і гэта... Навошта яму ўвогуле так закарцела паставіць помнік? Вось у чым для мяне загадка!

— Ну, мала што.

Валік пацiснуў плячыма. У гэты момант увайшла Валікава маці і запрасіла хлопчыкаў да стала.

— Ды еў я, — пачаў аднеквацца Цім. — З дому ж толькі што!

— Ну, хоць гарбаты папіце.

І Валік сказаў:

— Хадзем, бо і праўда — госці ж. Няёмка будзе, што мы на вочы ім не паказваемся. Яшчэ падумаюць немавед што...

Але на кухні гасцей ужо не было. За сталом сядзела і піла гарбату толькі адна дзяўчынка. Гэта была Валікава стрыечная сястра Света. Цім павітаўся, Света прамаўчала.

Пачалі піць гарбату.

— А вось у Англіі, калі п’юць гарбату, ніхто не сёрбае! — сказала раптам Света, не гледзячы на Ціма.

Той аж падавіўся. Пачаў піць ціха, адно вуснамі дакранаўся да шклянкі.

— У цывілізаваных краінах лыжачку са шклянкі звычайна выцягваюць, — ізноў зрабіла заўвагу Света.

А каб ты спрахла! Вось дастача! Цім выцягнуў лыжачку, паклаў на сподак.

— Чаго ты прычапілася да яго? — заступіўся Валік за сябра. — Дай папіць спакойна чалавеку. Падумаеш, з’ездзіла ў Англію! Дык што ўжо, такой ледзі зрабілася?

— Не толькі ў Англію. Яшчэ ў Іспанію, Францыю і Германію, — сказала Света і загнула чатыры пальцы. — І гэтым летам у Германію паеду.

Мы перапісваемся сем'ямі. Яны нам прысылаюць падарункі. І нават маркі.

— Як гэта? — пацікавіўся Валік.

Цім адсунуў шклянку з недапітай гарбатаю і слухаў вельмі ўважліва.

— Звычайна. У канверце, разам з пісьмом.

— А... хіба так можна? — хрыпатым голасам спытаў Цім.

Света толькі гмыкнула ў адказ. Маўляў, толькі так і можна.

Цім схапіў Валіка за руку і пацягнуў з кухні. На калідоры ён нагнуў сябраву галаву і зашаптаў яму ў самае вуха:

— Вось яно! Усё!

— Што ўсё?

— Я ўсё ведаю! Ой-ё-ёй, як усё проста! Грошы ў канверце, разумееш?!

— Не, — шчыра адказаў Валік.

— Шкатулку пераправілі з Афганістана ў труне! Разумееш цяпер? Каштоўнасці ляжаць у магіле! Пагэтаму і прыязджаў Васіль, і помнік паставіў! Гэта ж як сейф! Яны ж там могуць захоўвацца вечна!

Валік быў уражаны не менш за сябра. Цяпер Цім адкрыўся яму з зусім іншага боку. Вось табе і троечнік, вось табе і фантазёр-летуценнік! З нічога, з двух пустых эпізодаў зрабіць такія высновы!

Разам з тым ён не адчуваў зайдрасці да Ціма. Наадварот, яму радасна стала ад таго, што яны — сябры.

## Раздзел XIX

*Зяць Ігар не йдзе на службу, а прыязджае да цесця. — Праслухоўванне касеты. — Груз «дзвесці». — Планы авантурыстаў. — Зяць распісвае цесцю будучае багатае жыццё.*

Пасля начнога званка, з якога вынікала, што Ігар знайшоў касету з голасам «афганца», ужо раніцай наступнага дня зяць сядзеў у пустой халоднай цесцевай хаце.

На службу Ігар сёння не пайшоў. Было гэта ўжо само па сабе падзеяй. Заўсёды ён быў абавязковы і дысцыплінаваны. Толькі штось сапраўды надзвычайнае магло прымусіць яго паламаць расклад.

З сабою зяць Ігар прынёс магнітафон, якасны, самсунгаўскі — не тое, што цесцева колішняя «Вясна». Ігар уставіў у яго старую, трэснутую, скочам перамотаную касету.

— Амаль... уся... ноч ...на гэта... пайшла, — мармытаў ён чамусьці шэпатам, хаця яны былі толькі ўдвух у хаце.

Доктар Пратасевіч таксама не выспаўся. Цяпер ён усё пазяхаў, слухаючы зяця няўважліва.

— На аловак намотваў істужкі гэтыя... Вось бачыце, нават палец апух... І ўсё ж наткнуўся! Знайшоў! Зараз...

Ігар дастаў аркушык паперы, асадку.

— Учора спісваў з касеты, — патлумачыў ён. — Цяпер, можа, новае штось расчуем, дык адразу запісаць трэба.

Ён урачыста націснуў на клавішу.

Абодва падсунуліся бліжэй да магнітафона і ўталопіліся ў яго; з такім самым заміраннем, нецярпеннем, ледзь не з містычным страхам пазіралі калісь людзі на першае радыё, гадаючы, што гэтая «патэльня» можа выкінуць у наступны момант, чаго ад яе можна чакаць.

Магнітафон трашчаў і сіпеў.

— Стужка старая, клееная ў трох месцах... Слухайце! Во! Во!

Доктар напружваў слых, як мог. Нават нагнуўся над магнітафонам. І праўда, расчуў ён нейкі голас — далёкі, бы з таго свету.

Ігар звяраўся па паперцы.

— Чулі? Чулі?

Цесць не ведаў, што і казаць. Калі шчыра, нічога ён не разабраў.

— Як жа так? — расхваляваўся Ігар. — Давайце яшчэ раз! Я вам буду расшыфроўваць.

Адматаў назад касету. Пачаў, як глухому, кожнае слова перакладаць цесцю.

— Чуеце? «Запамінай... Разам з грузам дзвесці...»

Цяпер доктару падалося, што сапраўды — ён разбірае голас пятнаццацігадовай даўнасці, узмоцнены зяцем.

Зноў трэск у магнітафоне.

— Вось! Слухайце! «...Пераправілі шкатулку... Паедзеш у Вялікую Паляну... Вялікую Паляну — запомні!.. Знайдзі шкатулку...» Ну, як вам?!

— Гэта ўсё? — расчаравана спытаў доктар.

— А гэтага мала?! — Ігар аж з месца падхапіўся і забегаў туды-сюды па пакоі. — Як жа вы адразу не датумкалі?! Тады яшчэ, у Маскве, калі першы раз слухалі?

— Ты ж не раўняй свой магнітафон з маім, — пачаў апраўдвацца доктар. — Ды і слых у мяне не раўня твайму...

— Груз дзвесці! Груз дзвесці! — паўтараў, не слухаючы яго, Ігар. — Гэта ж дурню зразумела! Гэта ж цынкавая труна, так?

— Так.

— Яны ў труне пераправілі каштоўнасці! Разам з забітым салдатам! Разумееце? Цынкавая пасылка!

— Паслухай, Ігар, — сказаў доктар. — Не бяры ты ўсё так блізка да сэрца. Гэта ж можа быць звычайнае трызненне чалавека пад наркозам! Яны

табе ведаеш чаго нагаварыць могуць у такім стане? Цэлыя аповесці, раманы! Толькі слухай ды запісвай за імі...

— А я веру!

— Добра. Нават калі гэта і праўда — дык за пятнаццаць гадоў даўным-даўно ўсё распатронілі, тысячу разоў можна было гэтую магілу раскапаць, і...

— Вы так думаеце? А хто пра гэта ведаў? Акрамя барадача? А вы ўпэўнены, што «афганец» паспеў расказаць барадачу ***ўсё***?! Да канца?

Доктар задумаўся. А сапраўды!

— Можа быць, яму перашкодзілі? І потым, пад наркозам, ён як бы дагаворваў сваю споведзь! Тады атрымоўваецца — мы з вамі адзіныя, хто ведае праўду!

— Столькі часу мінула, — няўпэўнена сказаў доктар. — Калі ў труне і былі каштоўнасці, барадач іх даўно выкапаў бы...

— Калі б ён іх выкапаў, дык чаго б яму там сядзець, ашывацца столькі часу? Яго і след прастыў бы за мяжою дзе-небудзь! Ён даўно ўжо дзесь у Парыжы тырчэў бы!

І з гэтым вымушаны быў пагадзіцца доктар. Ігар развіваў сваю думку далей:

— Дапусцім, барадач ведае, дзе каштоўнасці. Але як іх узяць? Не думайце, што гэта так проста! Гэта ж не пагорак на полі раскапць, гэта ж крымінальная справа... А можа — і хутчэй за ўсё! — ён проста вычэквае. Ведаючы, што каштоўнасці нікуды ад яго не дзенуцца.

— Чаму? — спытаў доктар.

— Што чаму?

— Навошта ён так доўга чакае?

Ігар пацёр скроні. Прызнаўся:

— Вось гэтага я і сам не разумею. Тут ёсць некалькі варыянтаў. Альбо ён проста баіцца, альбо...

Вы ўвогуле ведаеце, што такое «груз дзвесці»? — спытаў Ігар.

— Ну, так... Прыблізна.

— Я ўчора пазваніў аднаму чалавеку, спецыялісту ў такіх справах. Ён мне ўсё растлумачыў. Гэта звычайная драўляная труна, узятая ў цынкавую абалонку. Цынк таўшчынёю ўсяго ў некалькі міліметраў, па швах запаяны волавам.

— Ну і што?

— А тое, што трэба ж час, каб цынк акісліўся ў зямлі. Каб яго, груба кажучы, іржа з'ела. А гэта залежыць ад глебы. Ад яе кіслотнасці. Ад таго, нізкая там мясціна, ці высокая. Перыяд акіслення і распаду цынка можа цягнуцца ад чатырох да дзесяці гадоў. Сочыце за думкаю?

— Сачу. Дык ужо ж пятнаццаць гадоў прайшло.

— У тым і справа! Барадач марудзіць, таму што проста не ведае, дзе шкатулка! «Афганец» не паспеў сказаць яму самага важнага!

— А калі паспеў?

— Тады барадач чакае, пакуль акісліцца і саржавее цынк.

Доктар апамятаўся.

— Ігар! Усё гэта да таго неверагодна... Мне здаецца, ніводзін нармальны чалавек не будзе чакаць, калі ў яго пад носам такое багацце...

— Стоп! — і на гэта быў адказ у зяця Ігара. — Што мы ведаем пра таго забітага салдата?

— Нічога...

— Вось іменна. Калі ў яго былі бацькі, сваякі... Тады як гэта прыйсці і раскапаць магілу? Ды назаўтра ж спахопяцца, шукаць пачнуць... Вось наш барадач і жыве там! Адцягвае час да самага зручнага, самага беспройгрышнага моманту!

Зяць да таго быў перакананы ў сваёй праўдзе, што і недаверліваму цесцю пачало гэта перадавацца.

— Дык ты думаеш... — пачаў ён.

— Не думаю, а нават не сумняваюся! Каштоўнасці — у труне! І ад нас патрабуецца адно: узяць іх, пакуль не позна! Мой план такі. Няважна, ведае барадач, дзе схаваны каштоўнасці, ці не. Але раз ён марудзіць — мы павінны дзейнічаць! У самы бліжэйшы час мы паедзем у Вялікую Паляну, уночы, і забярэм каштоўнасці.

— Дык для гэтага ж... трэба раскапаць магілу! — дайшло да доктара.

— Так. І што ў гэтым страшнага? Усё прадумана, верце мне! Усе варыянты абмазгованы... Раскапаем магілу, забярэм каштоўнасці... Потым, само сабою, пастараемся ўсё акуратна зараўняць. Каб і слядоў не засталося. А рыдлёўку падкінем барадачу. Усё! Нас ніхто не будзе бачыць, нас там ніхто не ведае, ніхто ніколі і не падумае, што такое маглі зрабіць прышлыя. Але барадачу — не апраўдацца ніколі! Усе факты супраць яго! Сам служыў у Афгане — раз. Ва ўсіх на вачах — два. Дзяўчынку нейкую ў сябе хавае — тры. Ды ўсю ваколіцу абыйдзі — больш падазронага і не знойдзеш!

Зяць зірнуў на цесця і дадаў:

— Гэта крайні выпадак, канечне...

Цесць мыляў вуснамі.

— Пачакай, — сказаў ён. — Як гэта — «падкінем рыдлёўку»? Гэта ж з нашага боку будзе называцца...

— Добра, добра! Не хочаце — не будзем нічога падкідваць. І без рыдлёўкі на барадача першага падумаюць... Чыя магіла будзе раскапана? «Афганца». А барадач у нас хто? «Афганец»!

— Гэта так...

— Кажу ж вам, — зяць пастукаў пальцам па скроні, — усё абмазгована!

— А калі лухта ўсё гэта? Калі пуста будзе ў труне?

— Ну і што? Гадзіну, максімум дзве згубім — падумаеш! Пасмяемся потым, успамінаючы... Ды калі на тое пайшло, я званіў учора знаёмаму юрысту. Кансультаваўся. Нават калі «накрыюць» нас — нічога страшнага! За гэты артыкул, апаганьванне магіл, цяпер нават турмы не даюць! Так, штраф, альбо, у горшым выпадку, умоўны тэрмін... Але гэта самы горшы, самы крайні выпадак! — спахапіўся Ігар. — Затое, калі нам пашэнціць...

Раптам падступіўся бліжэй і абняў зяць цесця за плечы. Зашаптаў, бліскаючы вачыма:

— Дзед! Домік вам купім, на беразе возера! Рыбу вудзіць будзеце... У Крым кожнае лета ездзіць... А хочаце — за мяжу, у Балгарыю, у Грэцыю? Хочаце ў Грэцыю?

— Гм, — пасміхнуўся цесць. — У Грэцыю!

— Я ўласную фірму адчыню, з прыцягненнем замежнага капіталу... Жыццё дае нам такі шанец! І будзе вялікім глупствам не выкарыстаць яго!

## Раздзел ХХ

*Злосць Крушынскага — заместа пахвальбы. — У Ціма апускаюцца рукі. -- Калі ж з'явіцца Васіль? — Сур'ёзная размова з Вікаю. — Узаемны недавер. — Выправа ў Гомель.*

Пасля такіх важных навінаў, само сабою, Цім з Валікам не маглі чакаць прызначанага ім для «візіту» дня.

Ужо ў абед яны стукаліся ў дзверы леснічоўкі. На іхняе шчасце, Крушынскі з Вікай былі дома. Калі хлопцы ўваліліся ў хатку, Крушынскі хутка прыняў са стала і схаваў у кішэню бушлата якісь канверт.

— Ну, што зноў здарылася?

Цім, ззяючы вачыма, пачаў выкладаць усё па-парадку: і пра кнігу «Памяць», і пра верш у ёй, які

пачынаўся словамі «у цынкавай труне», і пра паход да Колькі Танкіста, і пра бацькаву гісторыю — прыезд Васіля, і пра тое, што Валікавай сястры прысылаюць грошы у звычайным канверце...

— Шкатулка з каштоўнымі камянямі — у труне! — урачыста закончыў Цім. — Так яна і была перапраўлена з Афганстана! А помнік, што паставіў Васіль...

Крушынскі, які ўвесь гэты час стаяў да хлопцаў спінаю, раптам павярнуўся, і ў Ціма словы захраслі ў горле. Не проста пануры быў Крушынскі, а злы! Такім нават Віка бачыла яго ўпершыню.

— Апошні раз вас папярэджваю — не лезце нікуды! — працадзіў ён праз зубы.

Цім з Валікам стаялі, як аплёваныя. Замест чакаемай пахвальбы атрымаць раптам такія словы!

— Вы, канечне, хлопцы разумныя і здагадлівыя — нават задужа! Але і мы, ну, спецслужбы, не дурнейшыя! Няўжо вы думаеце, што мы ні аб чым не здагадваліся? Гэты варыянт — што шкатулка ў труне пад помнікам — быў у нас адным з першых! — працягваў дабіваць хлопчыкаў цяжкімі сваімі словамі Крушынскі. — Больш таго: мы ведалі, што скалечаны «афганец», той, які расказаў Васілю тайну, нейкі час быў у Афганістане... як вам лепш растлумачыць? Словам, ён меў справу з грузам «дзвесці». Былі такія спецыяльныя каманды пры кожным палку. І, канечне ж, для яго не ўяўляла складанасці пераправіць каштоўнасці менавіта такім чынам. Схаваўшы іх у труне.

— Дык калі вам усё вядома... — пачаў быў Цім.

— Яшчэ раз кажу — забудзьце! Бо можаце толькі нашкодзіць сваімі «расследаваннямі»! Без вас ёсць каму разбірацца. І яшчэ: у нас, ну, спецслужбаў, ёсць сумненні. А раптам шкатулка не ў труне? Тады што? Не можам жа мы, не ведаючы на ўсе сто працэнтаў, ускрываць магілу. Нават нам,

спеслужбам, — ізноў занадта часта пачаў скланяць гэтае слова Крушынскі, — не ўсё дазволена. Па-першае, гэта падсудная справа, а па-другое — а што калі там, у труне, ніякай шкатулкі не акажацца? Пра гэта вы падумалі? І што потым тлумачыць людзям? Калі пойдзе пагалоска, што хтосьці, хай сабе і спецлужбы, трывожылі чужую магілу?

Цім успомніў пра абяцаны матацыкл. Вось дурань, а ён ужо амаль быў паверыў! Спадзяваўся на нешта!..

— Дык навошта тады вы чакаеце Васіля? — спытаў Валік.

— Ды ці аб’явіцца яшчэ тут той Васіль — вось у чым пытанне... Хаця, — спахапіўся Крушынскі, — канечне! Усё так. Мы чакаем Васіля і спадзяемся, што ён выведзе нас на шкатулку. І калі ён нават пачне раскапваць магілу... Тады і возмем яго, «цёпленькага», адразу на месцы.

— А-а, забраць каштоўнасці чужымі рукамі? — з’едліва сказаў Цім.

— А інакш нельга! Толькі так. Самі мы проста не маем права нічога прадпрымаць. І вас прашу — нікуды не ўлазьце самі! Ну, цяпер, спадзяюся, усё зразумела?

Якраз-такі цяпер ні хлопчыкам, ні Віцы нічога і не было зразумела.

— Дык а калі хоць прыблізна ён прыедзе? — спытаў Валік.

— Хто?

— Як хто? Васіль.

— Не ведаем. Гэтага ніхто не ведае. Можа, вельмі хутка, а можа нават і ніколі.

— Дык... пачакайце! А як жа вы? Вы ж не можаце чакаць яго тут вечна! Хіба вы гадамі тут будзеце жыць?

Крушынскі нарэшце пасміхнуўся.

— А ты хацеў бы?

Валік хутка зірнуў на Віку і адразу ж адвёў вочы.

— Вельмі, — шчыра адказаў ён.

Крушынскі ступіў да сяброў. Абняў абодвух за плечы.

— Харошыя вы хлопцы. Я рады, што мы пасябравалі. Гэта праўда. А наконт таго, колькі я тут прабуду... Можа, і назаўсёды. Жыць... і чакаць Васіля, канечне! — дадаў ён.

Віка сабралася правесці хлопцаў і заадно прайсціся лесам, пагуляць. Але Крушынскі спыніў яе.

— Пачакай. Нам трэба сур'ёзна пагаварыць.

Настрой у Ціма быў самы паганы. Ды і ў Валіка не лепшы. Ён так хацеў прайсціся з Вікаю! А цяпер невядома нават, калі яны зноў пабачацца. Хоць ты пад вакно падкрадвайся, як зусім нядаўна яны рабілі!

— Або ён нам хлусіць, або штосьці не дагаворвае, — разважаў Цім, калі хлопцы ішлі лесам. — Або... я нічога не разумею! Калі ён сапраўды спецагент, дык такое адчуванне, што галава яго забіта невядома чым, толькі не каштоўнасцямі!

— І не Васілём, — падтрымаў Валік.

Вось у гэтым хлопцы не памыляліся.

Менш за ўсё думаў цяпер Крушынскі пра інкогніта-Васіля і пра афганскую шкатулку. Апошні час ён быў сам не свой. Нейкая трывога пасялілася ў душы, і чым далей, тым больш яна мацнела. Баяўся ён і хлопцаў, якія сваёй залішняй актыўнасцю маглі «навесці» на леснічоўку, а гэта значыць — на Віку; баяўся ён апошнім часам і саму дзяўчынку. Крушынскаму пачало здавацца, што яна падманвае яго. Ён сумняваўся ў праўдзівасці яе сентыментальна-слёзнай гісторыі.

— Дык што за важная размова? — яна даўно церабіла яго за рукаў бушлата.

Крушынскі апамятаўся. Дастаў з кішэні змяты канверт.

— Я быў сёння на пошце, — сказаў ён. — Вось, прыйшоў адказ з Крыма. Чалавека з такім прозвішчам у Сіферопалі няма. І ніколі не было.

Віка таксама зрабілася сур'ёзнай.

— А адрас? А паштоўка?

— Віка, сядзь, калі ласка. Ты ўжо амаль дарослая, давай пагаворым па-даросламу. Табе не здаецца, што маці… ну, яна магла проста падабраць гэтую паштоўку дзе-небудзь? І знарок адарвала назву горада. Прыдумала сімферопальскую цётку.

— Навошта?!

— Каб даць табе хоць якую надзею. Каб ты з'ехала. Каб яна не бачыла цябе, а ты яе… такую.

Віка маўчала. Цяжкі настрой гэты перадаўся і Крушынскаму.

— Паслухай, дзяўчынка. Мне не падабаецца, што ўсё ў нас так безнадзейна застыла. Проста завісла! Я не бачу ніякага выйсця. І, калі быць да канца шчырым — я табе не веру. Прызнайся: ты гаварыла мне праўду? Усю? Бо апошнім часам я, сам не ведаю чаму, пачаў ва ўсёй гэтай гісторыі сумнявацца. Я не веру ні ў айчыма, ні ў твае прыгоды, ні ў хворую маці на вакзале, ні ў тое, што пакой у вас адсудзілі…

Віка марудна падняла на яго вочы. У іх стаялі слёзы. Разам з тым Крушынскі не мог не адзначыць, што яна ўмее трымацца. Калі загаварыла, дык голас у яе быў звычайны.

— Твая гісторыя пра Васіля, — спакойна сказала яна, — пра спецслужбы і каштоўныя камяні таксама, прабач, малаверагодная. Гэта ім, Ціму з Валікам, можаш у вушы гудзець, але не мне.

— Нічога сабе! Якія мы самастойныя! Якія вопытныя! Як ты можаш не верыць даросламу чалавеку?

Яна гмыкнула.

— Вось якраз дарослым я менш за ўсё і веру.

— Ну-ну! Якія мы самастойныя, — Крушынскі, аднак, змяніў тэму. — Добра. Пакуль што не пра мяне, і не пра маю гісторыю гаворка... Вось што мы з табою зробім. Заўтра ж паедзем у твой Гомель. Я хачу на месцы ўсё высветліць.

Яна ўскрыкнула спалохана:

— Нізавошта не паеду туды!

— Паедзеш. Як міленькая. Гэта адзіны спосаб праверыць, ці праўду ты казала. Зразумей, Віка, — ён заціснуў яе далонькі ў свае лапы, — пакуль я не буду ва ўсім упэўнены, я не змагу зрабіць для цябе... Ну, тое, што задумаў.

Разлік ягоны апраўдаўся. Жаночая цікаўнасць у ёй узяла верх над капрызам.

— А што ты задумаў?

— Пабачыш, — адказаў ён ухіліста. — Усяму свой час. І яшчэ, Віка. Я ведаю, што табе можа быць цяжка ў Гомелі... Але давядзецца пацярпець. Мы здымем кватэру. Ты будзеш сядзець там, нікуды не выходзячы. Проста мне трэба, каб ты была пад рукою.

— Ну, калі так — я згодная...

Збірацца пачалі яшчэ з вечара — хаця якія там зборы? Узяць якую перакуску ў дарогу. Памыцца, у парадак сябе прывесці. За Барса цяпер можна было не баяцца, за хлопцамі ён не прападзе.

Калі Крушынскі з нажніцамі ў руцэ прыладкаваўся перад люстэркам, каб падраўняць бараду, Віка не вытрымала:

— Ды згалі ты яе!

Ён прамаўчаў. Думаючы, што яна проста саромецца яго, барадатага, такога старога. Бо ў Гомелі яе знаёмыя могуць убачыць іх разам.

Назаўтра выйшлі з дому вельмі рана. На шашы іх падабрала першая ж «папутка», і завезла ў

Жытнявічы, да саменькага чыгуначнага вакзала. Крушынскі купіў білеты. Неўзабаве яны ўжо сядзелі ў цёплым вагоне цягніка «Гродна — Гомель», які вёз іх у родны дзяўчынчын горад.

## Раздзел XXI

*Перамена надвор'я. — Гомель. — Кватэра па найме. — Пошукі Крушынскага. — Чаго б хацелася Віцы? — Начлежны дом. — Крушынскі падкупляе начальніцу. — Зноў барада!*

Цягнік не прапускаў ніводнага слупа, спыняўся на кожнай станцыі, на кожным раз'ездзе.

Пазіраючы ў вакно, Крушынскі з Вікаю проста дзіву даваліся — як рэзка пацяплела! Яшчэ раніцаю, калі выходзілі з хаткі, канечне, на адлігу ўсё паказвала, але ў лесе поўна было снегу, і нічога не сыпалася з неба. А тут! Нібы прыехалі ў чужую краіну. Снег ляжыць толькі дзе-нідзе, туман з'ядае яго. А галоўнае, дождж стукае ў шыбіну, і гэта ў студзені месяцы!

Што ўжо было казаць пра вялікі горад. Гомель сустрэў нашых вадроўнікаў тым жа дажджом, туманам і да ўсяго бруднай кашай расталага снегу пад нагамі.

На выхадзе з тунэля ў горад стаяла жывая чарга.

— Кватэры здаем!

— Таксі, каму таксі?

Крушынскі, успомніўшы Стася, адчуў сябе чалавекам вопытным у такіх справах. Пахадзіў туды-сюды — Віка стаяла ў тунэлі, баючыся высунуцца на дождж. Выбраў чысценькую, ахайную бабульку. Ізноў, як і ў выпадку са Стасем, яму пашэнціла. Бабулька здавала двухпакаёвую кватэру

на суткі, у самым цэнтры, і не так ўжо і дарага. Адно што яна адразу ж запатрабавала дакументы.

— А калі нам больш, чым на суткі, спатрэбіцца? — спытаў Крушынскі, падаючы ёй пашпарт. — За дадатковую плату, канечне!

— Ды калі ласка. Жывіце на здароўе. Абы чалавек быў харошы.

Адразу падняла настрой гэтая невялічкая ўдача. Ёсць дзе прыткнуцца — ужо няблага. Кватэра аказалася блізка каля вакзала — раз, была такая ж ахайная і чысценькая, як і яе гаспадыня — два. Праўда, і з аплатаю Крушынскі не паскупіўся.

Віка была ў захапленні. Што і казаць, не леснічоўка! Мэбля, тэлевізар, халадзільнік, тэлефон, прыбіральня, ванная...

Як толькі дзяўчынка апынулася тут і агледзела, нібы гаспадыня, усё, так адразу заявіла, што нікуды з кватэры не выйдзе, пакуль Крушынскі з усім не разбярэцца. Нават у краму не будзе выходзіць.

І не выходзіла. Крушынскі разумеў яе. Утульнасць гэтага — свайго — жытла, хоць і часовага, хоць на некалькі ўсяго сутак, але свайго, — Віка ўспрыняла як узнагароду ёй, як кампенсацыю за ўсё сваё ранейшае непрыкаяннае жыццё. Канечне, ёй трэба было проста пабыць адной. Проста пасядзець у гэтых сценах. Паляжаць у ванне. Забыцца перад тэлевізарам — а Віка глядзела ўсё падрад, ад рэкламы да бясконцых серыялаў...

Сам Крушынскі прападаў у горадзе з ранку да вечара. Вечарам заяўляўся, стомлены і галодны. Віка сустракала яго ў парозе, хапала сумку, бегла на кухню, выкладвала ў лядоўню прадукты. Крушынскі тым часам разуваўся, ставіў мокрыя чаравікі пад батарэю. Віка несла ў ванную яго скураную куртку, вешала там на «плечыкі».

— Ну, што? — пыталася з'едліва. — Як поспехі?

— Крыху ёсць...

Раніцаю, калі дзяўчынка яшчэ песцілася пад цёплай коўдраю, Крушынскі сыходзіў у туманны, хліпкі горад.

Прайшло тры дні. За гэты час Крушынскі паспеў пабываць на ранейшай Вікавай кватэры. Пагаварыў з суседзямі, хоць гэта аказалася не так і проста. Барадаты, падазронага выгляду чалавек не схіляў да шчырай гутаркі. Ды і сам Крушынскі ледзь усё не сапсаваў, адрэкамендаваўшыся:

— Я з камісіі па справах непаўналетніх. Збіраю матэрыялы пра дзяўчынку, Віку, што некалі жыла тут.

На яго шчасце, знайшоўся дзядок-адстаўнік, які патлумачыў спалоханым суседкам:

— Чаго вы вылупіліся? Барады, ці што, не бачылі? Тэлевізар трэба глядзець! Цяпер барада нават у арміі дазволена!

Крушынскі даведаўся аб усім, што яму трэба было. Віка не зманіла. Іхні з маці пакойчык належаў цяпер нейкім прахадзімцам. Паперы былі аформлены паводле ўсіх правілаў.

На наступны дзень Крушынскі пачаў з вакзалаў, чыгуначнага і аўтобуснага. Распытваў прыбіральшчыц, дзяжурных, касірак, буфетчыц, нават вакзальных бамжоў. Ці не траплялася ім на вочы жанчына такой і такой знешнасці? Дзе яе можна знайсці? Ведаем, адказвалі, бачылі, была такая, усё плакалася пра сваю дачку, скардзілася, як падманулі іх з кватэраю... Дзе яна цяпер? — а хто ж ведае? Хіба што міліцыя.

І на трэці дзень Крушынскі прыняўся абыходзіць аддзяленні міліцыі і пункты правахоўы. Тут яму ўжо было прасцей, і барада не перашкаджала: ён проста паказваў свае кніжачкі... Тыя самыя, што так цікавілі Віку.

Нарэшце ў Цэнтральным РАУС яму пашэнціла.

— Як жа, помню такую, — сказаў дзяжурны старлей. — Затрымлівалі яе некалькі разоў. А што толку? Грошай на штраф усё адно няма. Плача, кашляе... З падазрэннем на сухоты была накіравана ў... Зараз скажу.

Дзяжурны пачаў гартаць журнал. Крушынскі чакаў цярпліва.

— А, вось. Дыспансер-размеркавальнік.

— Што гэта такое? — здзівіўся Крушынскі.

— Ды звычайная начлежка. Для бедных, для бамжоў розных. Там іх трохі кормяць, трохі лечаць — і нам, міліцыі, спакайней, хоць перад вачыма не мільгаюць.

— Дзе яна знаходзіцца?

— А вось, перапішыце адрас.

Увечары Крушынскі быў задуманы больш, чым звычайна.

— Здарылася што? — спытала Віка, ставячы перад ім патэльню з яечняй: адзінае, што яна ўмела гатаваць.

— Віка, — сказаў Крушынскі, — як ты думаеш, а што калі Васіль сапраўды існуе? І возьме ды і аб'явіцца ў нашай Вялікай Паляне?

— Ну і хай аб'яўляецца.

— Тады я вымушаны буду выканаць сваё абяцанне. Хлопцы атрымаюць матацыкл. А табе што? Ты ж так нічога і не папрасіла!

— Я? — яна прысела на канапу, задумалася. — Не папрасіла таму, што хочацца мне многага... Я ведаю, што вашыя спецслужбы ніколі мне гэтага не дадуць.

— І ўсё ж, — не адчапляўся ён. — Напрыклад?

— Напрыклад, хачу свой куток. Хоць кватэру, хоць хату, хоць леснічоўку... Хоць нару! Але каб гэта было толькі маё! Хачу жыць з мамаю, як некалі жыла... Хачу, каб прадуктаў было многа... Апранацца хачу добра, прыгожа...

Крушынскі слухаў з усмешкаю.

— А ў школу хадзіць? — падкалоў ён.

— У школу — таксама. Толькі ў нармальную школу! Не ў такую, як нашая.

— Віка, я знайшоў, дзе твая мама, — сказаў ён без усялякай сувязі. — Заўтра мы да яе паедзем.

Дзяўчынка нічым не выявіла ні радасці, ні здзіўлення. І голас не змяніўся, калі спытала:

— Гэта абавязкова?

— А ты як думаеш? Ты ж родная дачка ёй! Ты ж толькі што хацела...

— Досыць. Едзем, дык едзем.

«Начлежка» (ці як выказаўся старлей, "дыспаснсер-размеркавальнік") знаходзілася за Сожам, у раёне Нова-Беліцы. За гэтыя дні Крушынскі даволі добра вывучыў горад, напамяць ведаў усе маршруты — лепш за ўсё ў Нова-Беліцу было дабірацца пятым нумарам тралейбуса.

Усю дарогу Віка маўчала і ціснулася да яго. Крушынскаму падалося, што яе нават крыху ліхаманіць. Ён ужо каяўся, што выцягнуў яе з утульнай цёплай кватэры-«крэпасці»... Адно добра — дарога была нядоўгай.

Прыехалі. Адшукалі вуліцу і дом. Начлежка аказалася звычайным двухпавярховым, з бярвення баракам. Збоку над дзвярыма прыбіты быў паржавелы квадрацік бляхі, на якім ледзь угадваўся нумар дома.

Віка пазірала на гэты барак са страхам. Перад дзвярыма яна спынілася, як укапаная, і рашуча заявіла:

— Я не магу. Можна, я тут пачакаю?

Крушынскі не стаў яе ўпрошваць. Пайшоў адзін. Яна з падзякаю зірнула яму ўслед, калі за ім ляпнулі дзверы і ён знік у бараку.

Яго сустрэла цемра калідора, а таксама востры пах карболкі і мокрай падлогі. У канцы калідора, дзе

было святлей, ён разгледзеў жанчыну ў халаце, якая чапляла анучу на швабру. Пакіраваўся туды. Ні на адных дзвярах, што выходзілі на доўгі калідор, не было шыльдаў.

— Дзе тут у вас хто галоўны? — павітаўшыся, спытаў ён.

— Там, наверсе, — буркнула прыбіральшчыца.

Па скрыпучай драўлянай лесвіцы ён падняўся на другі паверх. Такі ж доўгі калідор. Той жа пах сырой падлогі і карболкі. Такія ж дзверы... Не, стоп! Такія, ды не такія. Вось — дэрмацінам абабітыя, з масіўнай пазалочанай ручкаю... Крушынскі паспрабаваў пастукаць, але пальцы яго патанулі ў дэрмаціне.

Але, як ні дзіўна, яго пачулі. Дзверы раптам расчыніліся і на парозе ўзнікла высокая жанчына сярэдніх гадоў, нафарбаваная, расфуфыраная, з пярсцёнкамі на пальцах абедзьвух рук. Ад яе пахла дарагой парфумай. Крушынскі ад нечаканасці аж зняў з галавы шапку. Дужа вялікі быў кантраст паміж гэтай начальніцай і ўбоствам начлежкі.

— Што вам трэба?

Крушынскі растлумачыў.

— Хадземце, я правяду вас у палату.

Жанчына зачыніла дзверы на ключ, не даўшы магчымасці Крушынскаму нават заглянуць у яе кабінет.

Палата была тут жа, на другім паверсе, побач з кабінетам. Крушынскі чакаў убачыць тут штосьці кшталту турэмнай камеры, таму не без хвалявання пераступіў парог следам за начальніцай. Аж не! Было тут, праўда, цесна — дзесяць коек стаялі амаль упрытык адна да адной і ўсе былі занятыя; стаяў тут, канечне, пах, ад якога Крушынскі ў першы момант ледзь не задыхнуўся... І ўсё ж, і тым не менш! Адносна чыста, адносна светла, адносна цёпла... Са

столі не капае... Як для бамжоў, дык тут проста санаторый.

— Вось, — начальніца паказала на крайнюю койку злева. Сама не выйшла, а толькі адступіла крышку ўбок. Скрыжавала на грудзях свае пярсцёнкамі ўнізаныя рукі.

Крушынскі нерашуча наблізіўся да койкі. На ёй ляжала нейкая бабулька. З-пад коўдры відаць быў толькі яе твар, а па падушцы раскідаліся сівыя валасы. Калі бабулька, пачуўшы галасы і крокі, расплюшчыла вочы, Крушынскі ледзьве не ўскрыкнуў. Перад ім ляжала Віка, якая за пяць хвілін пастарэла на семдзесят гадоў. Ды вось чаму дзяўчына так заўпарцілася, каб не йсці сюды! Яна прадбачыла ўсё гэта!

На бабульчыным твары адбіўся страх. Калі загаварыла, сухі нядобры кашаль перашкаджаў ёй.

— Не трэба... мяне... выпісваць!.. Я хворая... вельмі... прашу!

«Ды гэта ж яна мяне за доктара прымае, — дайшло да Крушынскага. — Ці за нейкага начальніка! Яна баіцца, што я магу зараз выпісаць яе! Гэта значыць, выкінуць на вуліцу, у гэтую макрэчу, холад і голад!»

— Колькі можна хварэць? — умяшалася начальніца. — Курорт вам тут, ці што? Паляжала трохі, падлячылася — хопіць, дай другім месца. Жадаючых навалам.

Бабулька трэслася ў кашлі. Уваленыя шчокі яе былі мокрыя ад слёз. Як добра, падумаў Крушынскі, што Віка не пайшла і не бачыць усяго гэтага!

— Можна мне з вамі пагаварыць? — звярнуўся ён да начальніцы.

Выйшлі з ёю на калідор.

— Прашу вас — не выпісвайце пакуль яе.

Начальніца слухала яго, трымаючы рукі скрыжаванымі на грудзях.

— А вы ведаеце, колькі дзяржаве абыходзіцца адзін койка-дзень? — спытала яна. — Вы ведаеце, колькі такіх, як яна, яшчэ і горшых, што па падвалах жывуць і са сметніцаў кормяцца? Якія толькі і марацъ, каб патрапіць сюды?

Крушынскі палез у кішэню:

— Я гатовы заплаціць грошы.

— Дарэчы, а хто вы такі? Кім вы ёй даводзіцеся?

— Я? — сумеўся Крушынскі. — Ёй? У прынцыпе, нікім. Чужы чалавек.

— Так-такі і чужы? Не сын, не брат, не сват, не пляменнік? А то спачатку сплавіце чалавека, а потым сумленне загрызае?

Вунь яно што! Крушынскаму зрабілася горача. Ён зразумеў ход думак начальніцы. Яна думае, што ён радня Вікавай маці. Выгнаў яе на вуліцу, а цяпер клянчыць, просіць, каб пакінулі яе ў начлежцы! Аказваецца, і такі «бізнес» існуе!

— Я не заслужыў гэтага, — прамовіў ён ціха. — Я праўда зусім чужы ёй.

Падзейнічала. Пакорлівыя яго словы змякчылі суровую начальніцу.

— Дык што вы там гаварылі пра грошы? — спытала яна. — Колькі вы можаце заплаціць?

— Колькі трэба! — заспяшаўся ён. — Яшчэ і пераплачу!

— Тады добра. Хадзем да мяне ў кабінет, афармім паперы. Усё будзе афіцыйна. Абяцаю, што ўсе вашыя грошы на яе ж і пойдуць. Перавядзем у іншую палату, будуць лекі, дагляд...

Віка чакала Крушынскага на тым самым месцы, дзе ён яе і пакінуў. Кароткія хлапечыя валасы яе былі ў кропельках дажджу. Крушынскі дастаў насоўку і выцер ёй мокрыя лоб, нос і шчокі.

— Ну, усё ў парадку, — бадзёра адказаў на маўклівае яе запытанне. — Твая маці яшчэ паляжыць

тут. Пакуль не паправіцца. Ёй тут добра, яна сама сказала! — паспешліва дадаў ён.

— А не выкінуць яе? —так і спытала Віка, «выкінуць», а не «выпішуць».

— Не хвалюйся. Я аб усім дамовіўся з нача… з загадчыцай аддзялення. Твая маці будзе тут столькі, колькі спатрэбіцца. За ёю будзе харошы дагляд…

— Ты заплаціў ім? — спытала дзяўчынка. Памаўчаўшы, сама сабе і адказала: — Канечне, заплаціў! Дзякуй за ўсё, Барыс…

І пацёрлася, бы кацяня, аб яго далонь.

Калі ехалі тралейбусам назад, у цэнтр, адбылася наступная сцэна. Віцы ўдалося сесці, Крушынскі стаяў побач. Раптам нейкая дзяўчына паднялася з суседняга месца:

— Сядайце, калі ласка, — ветліва прапанавала Крушынскаму.

Яго гэты эпізод толькі ўзрадваў. З палёгкаю плюхнуўся ён на працёснутае, пашарпанае сядзенне. Азірнуўся на Віку. Дзяўчынка, нахмурыўшы лоб, нервова пакусвала губы.

— Віка! Чуеш? Што з табою?

— Колькі разоў прасіла… Згалі ты гэтую бараду! Як я яе цярпець не магу!

## Раздзел XXII

*Незнаёмец. — Дыялог у краме. — Вандроўка па Вялікай Паляне і ваколіцах. — Цім бяжыць у лесніччоўку. — Пуста! — Запіска. — Куды падзець Барса?*

Пакуль Крушынскі з Вікаю ўладжвалі свае справы ў Гомелі, у Вялікай Паляне таксама сеё-тое адбылося.

Роўна ў дванаццаць гадзін дня з рэйсавага аўтобуса выйшаў невысокі поўненькі мужчынка. Быў

ён у скураным паліто, у капелюшы; з-пад паліта выглядвалі беленькая кашуля і гальштук.

Мужчынка выйшаў на прыпынку і з цікавасцю пачаў азірацца. Па ўсім відаць было, што тут, у сяле, ён упершыню. Тры вуліцы збягаліся да прыпынку. Мужчынка выцягнуў з кішэні нататнік з алоўкам і пазначыў план гэтых вуліц. Побач з прыпынкам бялела цэглаю вясковая крама. Нядоўга думаючы, мужчынка пакіраваўся туды.

У краме, нечакана вялікай, як для сяла, на два аддзелы, было пуста. За касавым апаратам прадаўшчыца чытала газету. Яе напарніца, абапёршыся локцямі на прылавак, піла каву і лена пазірала на адзінага наведніка.

Мужчына выбраў тую, што з газетай. Падыйшоў, павітаўся — і адразу:

— Скажыце, можна ў вашым сяле купіць дом? Ці хоць бы хату?

Валікава маці, а гэта была менавіта яна, адклала газету і адказала:

— Не. Усё параскуплялі, нават самыя развалюхі.

— І што гэта вы так нашую Вялікую Паляну ўсё палюбілі? — умяшалася напарніца. — Тут жа ні вады, ні рэчкі, адзін лес кругом.

— А хто яшчэ палюбіў? — адразу ж павярнуўся да яе цікаўны незнаёмец.

— Ды многія! Палова сяла лічы што прыезжыя.

— Адзін нават леснічоўку купіў, — сказала Валікава маці. — Так і жыве сам, у глухамані.

— Праўда? У лесе жыве адзін? Не можа быць!

Жанчыны пакрыўдзіліся.

— Схадзіце ды паглядзіце, — прапанавала напарніца. — Ён толькі сюды, у краму, і заходзіць раз на тыдзень. Таму мы і ведаем яго лепш, чым хто.

— Ды я веру, веру вам! Проста дзіўна ўсё гэта...

— А вы ж можаце купіць участак зямлі, — сказала Валікава маці, — раз вам так тут падабаецца. Будуйцеся ды жывіце.

— А можна? — ізноў у руках мужчыны з'явіўся нататнік з алоўкам. — І дзе б вы мне параілі?

— Пад самым лесам. Там усе будуюцца.

А напарніцу нататнік чамусьці насцярожыў:

— Вы часам не журналіст? Ці, можа, з якою праверкаю да нас?

— Ды не, — засмяяўся мужчынка. — Я такі ж служачы, як і вы! На прыроду пацягнула, дачу купіць захацелася. Сабраў вось крыху грошай, напазычаўся... Адзін знаёмы і падказаў мне вашае сяло.

На развітанне мужчына сказаў, што збіраецца пахадзіць па сяле, па ваколіцах — можа, і выбера месца для дачы.

— А ў вас ёсць машына? — гукнула яму ўслед Валікава маці. — Тут без машыны цяжка!

— Пакуль што няма — але будзе! Проста павінна быць, — неяк загадкава паабяцаў мужчынка.

Сяло, як на тое, выглядала пустынным. Ніводны чалавек не трапіўся мужчыну на вочы. А яму толькі таго і трэба было. За ваколіцай, дзе канчаліся хаты, ён збочыў з дарогі, нагнуўшыся. зачэрпнуў снегу. Снег быў рыхлы. мяккі... Мужчына заўсміхаўся. Яго ўзрадвала гэта. Значыць, хутка адліга! Трэба адліга! І тады яны з цесцем здзейсняць задуманае. Тады купіцца і машына, і ўчастак, і дача, і шмат, шмат чаго іншага... Толькі не ў Вялікай Паляне, шаноўныя! У Іспаніі, у Партугаліі, на Канарах!..

Агляд сяла заняў менш гадзіны. Неўзабаве у нататніку быў выкрэслены падрабязны план геаграфічнага размяшчэння Вялікай Паляны і ваколіцаў. Пазначаны быў таксама лес, поле, вуліцы,

крайнія хаты... Цяпер заставалася самае галоўнае: наведацца на могілкі.

Перад тым, як зайсці ў расчыненыя варотцы, мужчына зноў паазіраўся. І зноў задаволенасць з'явілася на яго твары. Могілкі былі на водшыбе. Далекавата і ад сяла, і ад дачнага пасёлка. Вельмі добра!

Помнік загінуўшаму «афганцу» і шукаць не трэба было, ён сам кідаўся ў вочы. Мужчына абышоў яго вакол. Затым прысеў, прасунуў руку паміж прэнтамі агароджы і разгроб снег. Паказалася бетонная бардзюрынка, адна з чатырох, што складалі надмагільны прамакутнік. Мужчына пакратаў яе, яна лёгка паддалася.

— І гэта добра! — уголас сказаў сам сабе мужчына.

Цяпер ён ведаў усё. Больш тут не было рабіць. Мужчына паглядзеў на гадзіннік і заспяшаўся назад, у сяло, каб паспець на аўтобус да Мінска.

Паспеў. Заскочыў у аўтобус. І знік чалавек, як і не было яго. Калі прыязджаў, дык хоць бы прадаўшчыцы яго бачылі, а як ад'язджаў — ніхто.

Ніхто, ды толькі не Цім! Хоць і астудзіў яго пыл падчас апошняй сустрэчы Крушынскі, аднак у хлопчыка за правіла ўвайшло цікавіцца кожным незнаёмцам, які прыязджае ў сяло. Не прамінуў яго ўвагі і мужчынка ў капелюшы. Цім бачыў, як ён выходзіў з крамы, запіхваючы ў кішэню паліто нататнік.

Мужчынка з крамы, а Цім — у краму.

— Хто гэта быў, цётка Галя? — спытаўся ў Валікавай маці нібы проста так, між іншым.

— Ды нейкі — хату, кажа, хачу купіць, ці ўчастак пад дачу...

Ёкнула ў Ціма сэрца. Застукала ў скронях. А што, калі гэта... Васіль?! Няўжо пашэнціла нарэшце?! Матацыкл будзе... Новенькі «Мінск», пажадана

зялёнага колеру... Як бы ён песціў яго, гладзіў па сядзенні, мыў бы кожны дзень... А як прыемна вуркоча матацыклетны матор, а як соладка пахне бензінавы дым!

Абы спраўдзілася! Трэба толькі пераканацца, што гэта Васіль, а ніхто іншы. Каб быць упэўненым на ўсе сто. А зрабіць гэта прасцей простага: калі чалавек заходзіў на могілкі — значыць... Можна лічыць, матацыкл ужо стаіць у двары...

Цім асцярожна пашыбаваў да могілак. Вось яны, сляды! І вось яны, тыя ж самыя, каля помніка «афганцу»! І больш каля нічыйго! Цяпер у Ціма не магло быць ніякага сумнення. Гэта Васіль. І трэба хутчэй паведаміць Крушынскаму. Не забягаючы нават да Валіка, каб не губляць дарма часу, Цім кінуўся да леснічоўкі. Так хутка ён не бегаў нават на ўроках фізкультуры.

Пуста! Нікога! Замок на дзвярах хаткі... Ах, як крыўдна! Куды яны маглі падзецца ў такі момант?!

Аднекуль выскачыў Барс. Кінуўся Ціму на грудзі, заскавытаў жаласна, просячы хоць што. Вочы ў сабакі свяціліся галодным бляскам.

— Няма нічога! Я не ведаў, што ты тут сам, без гаспадароў! Ну, хадзем, хадзем... Пажывеш у мяне, пакуль яны не вернуцца.

А калі яны вернуцца? Гэтага Барс табе не скажа. Можа, сёння да вечара вернуцца. А можа, заўтра? А можа, праз тыдзень? Дык за гэты час Васіль сто разоў паспее забраць шкатулку — і шукай тады ветру ў полі!

Дома Цім схапіў ліст паперы. Напісаў: «Васіль тут!!! Быў на могілках!!!» — уляпіўшы для пераканаўчасці аж шэсць клічнікаў. Які ні быў стомлены, а нават адпачыць не прысеў. Адрэзаў скібу хлеба Барсу — і зноў у леснічоўку. Запіску, скручаную ў трубачку, запхнуў у шчыліну замка. Толькі тады

трохі яму спакайней стала. Запіску немагчыма будзе не заўважыць.

А ў гэты момант фальшывы «Васіль» — на самай справе доктара Пратавіча зяць Ігар — сядзеў у хаце ў цесця і расказваў, хвалячыся, як удала правёў ён разведку. Паказаў цесцю нататнік з геаграфічным планам мясцовасці. Доктар Пратасевіч блізарука паўглядаўся. Тыцнуў пальцам:

— Вось тут яго хатка. Вось, бачыш? Тут шаша, а прыкладна вось тут, дзе ў цябе пазначаны лес, хатка...

Зяць абвёў гэтае месца кружком.

— Вы ўпэўненыя?

— Амаль не сумняваюся.

— Ды гэта ж зусім блізка ад могілак! — зяць не хаваў радасці. — Ну, цяпер будзем чакаць, калі сыйдзе снег!

— Да вясны?

— Навошта — да першай адлігі! Мне здаецца, наш барадач чакае таго ж самага. Вось і апярэдзім яго!

Доктар памаўчаў. Відаць, штосьці яму ўсё ж у гэтым плане не падабалася, не мог ён падзяліць зяцевага аптымізму.

— Ігар, ты ўсур'ёз думаеш, што можна... ну, уночы раскапаць магілу? І потым зараўняць яе, узнавіць амаль такой як была?

Зяць нават разлаваўся:

— Канечне, не! Сто разоў вам тлумачыў! Зараўняем хоць бы так, каб не адразу ў вочы кідалася! А потым усё адно на барадача падумаюць!

— Добра, добра, — заківаў доктар. — Будзем чакаць адлігі.

## Раздзел XXIII

*Надвор'е дапамагае зяцю з цесцем. — Адліга. — Двое рыбакоў прыязджаюць... у лес. — Чаканне. — Ноч. — Крадзёж рыдлёўкі. — Могілкі.*

Чакаць давялося нядоўга.

Як мы ўжо ведаем з папярэдніх раздзелаў, зіма раптам адступіла — часта бывае такое пасля моцных студзеньскіх маразоў. Закапала з дрэў. Шпарка пачаў раставаць снег. Пачарнелі дарогі; канавы ўзбоч іх былі поўныя талай вады.

Так надвор'е само прыйшло на дапамогу двум авантурыстам, умяшалася ў іх планы і міжволі прыспешыла фінал нашай гісторыі. Не толькі надвор'е, а іншыя абставіны спрыялі доктару Пратасевічу і яго зяцю: Крушынскі ж акурат быў у ад'ездзе! Праўда, аб гэтым яны пакуль што не ведалі...

План дзеянняў быў распрацаваны авантурыстамі даўно. Ён здаваўся ім ідэальным. Усё было разлічана. Да рэалізацыі яго вырашылі прыступіць ужо заўтра, у суботу. Тут таксама мелася свая логіка. Абодва яны, зяць з цесцем, любілі зімовую рыбалку і нярэдка ў выхадныя выязджалі на Мінскае мора; бывала, што і з начоўкаю. Так што ні ў кога іхняя адсутнасць не выкліча падазрэння. Каму якая справа да двух мужчын, апранутых у аднолькавыя хімабаронаўскія касцюмы-«скафандры» (як для нашага выпадку, дык зручныя яшчэ тым, што боты-бахілы не пакідаюць выразных слядоў), са скрынкамі на плячах, у будаўнічых падшлемніках з доўгімі «хвастамі»? Многа такіх можна ўбачыць — асабліва на вакзалах, асабліва ў выхадныя дні.

Аднак жа трохі дзіўна было, што нашыя героі выправіліся на рыбалку не на электрычцы, як заўсёды, а на аўтобусе, які ехаў не на звыклае

Мінскае мора, а ў зусім іншы бок. Што папрасілі вадзіцеля спыніцца не каля возера ці якой рачулкі, а сярод лесу, дзе звычайна толькі грыбнікі ўлетку выходзяць.

Але і ў гэтым, падумаўшы, дзіўнага мала. Ёсць, значыць, у людзей нейкая запаведная мясцінка, раз прыехалі сюды!

Было гадзіны тры дня. У лесе, куды заглыбіліся доктар Пратасевіч з зяцем Ігарам, вісеў туман і капала з дрэў. Трэба ж, зіма, а такое робіцца... Наламалі сушэйшых, з-пад самага нізу, смалістых галінаў, расклалі агеньчык. Адразу весялей стала. Зяць выцягнуў са скрынкі прыпасы: тонкія «паляўнічыя» вэнджаныя каўбаскі, хлеб, сала; цесць — балгарскі слоік малюсенькіх марынаваных гуркоў і пляскатую бутэльку з цёмна-бурштынавай вадкасцю. Прыклаліся па чарзе да рыльца, разазагрэлі на агні каўбасу, падмацаваліся. Яшчэ весялей стала. Сытасць у жываце і смеласць на душы... Гарыць вогнік, патрэскваюць смалістыя лапкі... Здорава!

А ў лесе тым часам пачало цямнець. Нізкае неба апусцілася яшчэ ніжэй, на самыя дрэвы, а потым і зусім апала на сырую цёмную зямлю, злілося з ёю. Уверсе, над галавой, не відаць было ні зораў, ні месяца. Надыйшла ранняя зімовая адліжная ноч.

— Пара! — скамандаваў Ігар.

Вось тут і пачаліся першыя непрыемнасці. Доктар Пратасевіч ніяк не мог знайсці дарогу да леснічоўкі. Ён жа быў у гэтых мясцінах толькі аднойчы — днём, калі вакол ляжаў белы снег, а сам доктар сядзеў у цёплай машыне. А тут цямрэча, хоць вока выкалі! Ні сцежкі, ні дарожкі, і сам лес здаецца зусім іншым...

Давялося вяртацца назад на шашу. Добра, што была яна зусім пустая ў гэты час. Зяць уключыў ліхтарык. Пахадзілі абодва, як вартавыя на пасту,

узад-уперад па ўзбочыне, пакуль нарэшце не натыкнуліся на ўказальнік. «В. Вялікая Паляна, 4 км.», — высветліў ліхтарык.

— Ну, вось! — узрадваўся доктар. — Цяпер я ўсё ўспомніў!

Сапраўды, хутка знайшлася дарога. Доўга затым ішлі па ёй, цёмнай, пакручастай, свецячы ліхтарыкамі пад ногі. Спатыкаліся, лаяліся шэпатам. Пад нагамі чвякала гразь, галіны секлі па руках і тварах.

Кожны, хто хоць раз хадзіў па начным лесе, ды яшчэ ў непагадзь, пацвердзіць, што ліхтарык памагае мала. Калі памагае ўвогуле. Лепш выключыць яго і даверыцца ўласным вачам. Так нашы авантурысты і зрабілі.

Доктар збіўся-такі з дарогі і вывеў зяця да кар'ера — таго самага, дзе адбывалася хакейная баталія. Цяпер у кар'еры стаяла вада замест лёду. Цесць з зяцем прайшлі па самым крутым абрыве і нават не заўважылі; проста цуда нейкае, проста пашэнціла, што не пазвальваліся ўніз.

Леснічоўка ўзнікла перад імі раптоўна. Доктар, які па-ранейшаму ішоў наперадзе, ледзь не стукнуўся ілбом у дзверы.

— Вось яна! — зашаптаў, павярнуўшыся да зяця. — Тут я быў! Тут ён жыве!

— Але дзе ён? Непадобна, каб тут жылі…

Зяць зазірнуў у чорнае вакно, нібы штосьці мог там убачыць. Доктар тым часам намацаў на дзвярах замок.

— Зачынена, Ігар! Яго проста дома няма!

Пачуўшы гэта, Ігар смела ўключыў ліхтарык.

— І сабакі няма, — яшчэ больш узбадзёрыўся доктар.

— А гэта што?

Ігар паказаў ліхтарыкам на нейкую прыбудовачку — ні то дрывотню, ні то прыбіральню.

— А ну, пачакайце, — ён расчыніў скрыпучыя дзверы і знік усярэдзіне прыбудовы.

Штосьці ўпала там, грукнула... Доктар аж прысеў ад страху. Паказаўся зяць, трымаючы ў руцэ рыдлёўку:

— Глядзіце, што тут ёсць.

Сапраўды, удача! У абодвух авантурыстаў, канечне, былі і свае жалязнячкі — сапёрскія, з двух бакоў навостраныя, у брэзентавых футаральчыках; адну з іх і плаванавалася пасля «аперацыі» падкінуць барадачу. А тут і падкідваць не трэба. Бяры чужую рыдлёўку, якая, дарэчы, зручней за іхнія маламеры, пакарыстайся ёю, а потым вярні на месца — і хай гаспадар сам пасля адказвае, дзе яго інстумент гасцяваў.

Ад хаткі папраставалі ў напрамку сяла. Тут ужо зяць Ігар, успомніўшы свае самаробныя схемы-«карты» з нататніка, пачаў арыентавацца. Цяпер ужо ён вёў доктара. Вунь і Вялікая Паляна, свеціцца рэдкімі агнямі... А вунь, яшчэ далей, участкі дачныя...

Сяло прамінулі па ўзлеску. А вось і яны, могілкі! Перад носам. Арудуй сабе, як хочаш, і ніводная жывая душа не ўбачыць. І леснічоўка, аказваецца, не так далёка. Што ні кажы, а шэнціць ім, цьфу-цьфу-цьфу!

Каля магілы «афганца» прыселі на карачкі. Перадыхнулі крыху — хоць і ў такіх, нязручных позах.

— З Богам, — сказаў зяць Ігар, падымаючыся, і доктар уздрыгнуў — так недарэчна, нават дзіка прагучала гэтае пажаданне, да таго не вязалася яно з той бязбожнай справаю, якую сабраліся яны зараз рабіць.

## Раздзел XXIV

*Авантурысты раскапваюць магілу. — Страх доктара Пратасевіча. — Фіяска. — Прапажа рукавіцы.*

«Працавалі» без ліхтарыкаў, у поўнай цемры, амаль навобмацак. Але пакуль што зладжана, без хібаў і памылак. Усё атрымлівалася. Спачатку павыцягвалі з зямлі бардзюрынкі, прысланілі да агароджы. Зяць асцярожна падкапаў помнік з боку магілы.

— Памажыце! — пазваў цесця, калі помнік пачаў нахіляцца.

Доктар аберуч упёрся ў халодны граніт. Зяць хуценька падсунуў пад ніз помніка, упоперак магілы, адну бардзюрыну, для страхоўкі — другую.

— Адпускайце...

Помнік стаяў роўненька, нібы ніхто яго і не трывожыў. Цяпер можна было раскапваць магілу, не баючыся, што ён зваліцца на галаву. І, калі рабіць усё з толкам, абачліва, не спяшаючыся... Выкапаць, забраць з труны каштоўнасці, акуратна засыпаць магілу, вярнуць на месца бардзюрынкі, награбсці зверху як мага больш бруднага снегу, прайсціся вакол магілы з венічкам, знішчыўшы хоць збольшага сляды... Калі зрабіць усё гэта, то нават ўдзень, за пяць крокаў ніхто нічога не заўважыць! Магіла як была, так і ёсць, помнік як стаяў на ёй, так і стаіць... Ды хто тут дужа прыглядаца будзе? Хто зімою на могілкі ходзіць? Хіба што на Радаўніцу, дык да таго часу, пасля зімы, усе магілкі аднолькавымі паробяцца!

Вось як было задумана авантурыстамі.

А на крайні выпадак — калі ўсё ж убачаць, што з магілаю няладна, дык на тое існуе барадач. З ягонай, зямлёй запэцканай, рыдлёўкаю.

Так што амаль ніякай рызыкі. Адно працуй!

Капалі на змену. Абодва, каб не пакінуць адбітку пальцаў на дзержаку рыдлёўкі, былі ў рукавіцах; ці, лепш сказаць, доктар — у пальчатках, а зяць — у звычайных будаўнічых «спяцоўках».

З непрывычкі доктар вельмі хутка стаміўся. Па спіне ў яго цёк пот, ногі трэсліся, далоні смылелі... З цяжкасцю адбыўшы сваю — пяціхвілінную —чаргу, ён скідваў пальчаткі і дзьмухаў на рукі; вадзяныя мазалі набрыньвалі нават пад пальчаткамі.

Зяць шчыраваў адзін. З шоргатам уядалася ў цвёрдую зямлю рыдлёўка. Яма рабілася ўсё глыбейшаю. Доктар адыйшоў да нейчай магілы і абапёрся спінаю аб агароджу. Вакол былі сілуэты крыжоў і помнікаў. Чорныя дрэвы, як прывіды, цягнуліся сваімі сухімі скручанымі рукамі-галінамі да доктара, нібы сабраўшыся ашчаперыць яго. Яму стала вусцішна. Чаго яны тут, на могілках?! Што яны тут робяць?!

У гэты момант доктар выразна пачуў, як рыдлёўка стукнула аб штосьці. І адразу ж глыбіні ямы, як з калодзежа, пачуўся глухі зяцеў голас:

— Гатова!

Доктар падбег да ямы. Аднак нават зазірнуць туды не адважыўся. Спытаў зводдаля:

— Што там? Цынкавая труна?

— Ды якая цынкавая, — будзённа адказаў зяць, — усё даўно рассыпалася ўжо, і цынк, і тое, што ў цынку... Давайце, спускайцеся! — загадаў дзелавіта.

У доктара раптам пачалі стукаць зубы. Ці то ён паспеў схапіць прастуду, пастаяўшы, разгарачаны, каля халоднай агароджы, ці яшчэ ад чаго, але зубы так барабанілі, што даводзілася падпіраць рукой скіўіцу.

— Іг...гар, я... не магу!

З ямы вытыркнулася зяцева галава.

— Што не магу? Спалохаліся? Вы ж доктар! Кажу вам — тут за пятнаццаць гадоў нічога амаль не засталося! Акрамя шкатулкі, канечне... Ну?

— Не... магу.

— Тады свяціце мне зверху.

— Не... магу! — як заклініла доктара.

Зяць плюнуў.

— Чорт з вамі. Падайце мне ліхтарык! І сякерку...

Доктар падаў — а сам хутчэй уцякаць, да свае агароджы. Стаяў, калаціўся і нават уявіць не мог, што ж там, у яме, цяпер робіцца?..

Доўга не абзываўся зяць. Нарэшце ён моўчкі выбраўся наверх. Доктар кінуўся да яго:

— Што?! Што?! Знайшоў?!

У адказ яму ўпёрліся ў нос мокрыя брудныя пальцы, і доктар не так убачыў, як здагадаўся: гэта яму паказваюць дулю.

— Вось што я там знайшоў! Бачылі?! — зяць знясілена апусціўся проста на халодны жвір каля ямы. — Дурань! Пракляты дурань! — ён аж застагнаў, аж у лоб сабе пачаў стукаць. — Так добра жылося... У цяпле, у дабрэ... Не — захацелася большага! Паверыў, як дзіця неразумнае, як школьнік — нейкім магнітафонам, нейкім касетам... Дурню старому, гэтаму вось!..

— А ты добра глядзеў? — нясмела папытаўся доктар.

— Лезьце ды праверце!

Зяць быў злы, проста кіпеў увесь. Доктар пачуваўся, як пабіты сабака. Калі б хоць бы на гэтым усё скончылася! Калі б можна было б зараз сабрацца ды спакойна сысці адсюль! Дудкі. Трэба прыбраць усё. Нагадзілі, нашкодзілі, дык трэба ж, як ліса хвастом, сляды за сабою замесці.

Валэндаліся да паўночы. Але зрабілі больш-менш добра. Закідалі, старанна падраўнялі

магілу, абклалі бардзюрынкамі; доктар рукамі зграбаў з-пад дрэваў, дзе яго было больш, снег і насіў сюды, прысыпаючы ім свежую зямлю... Потым выхапіў у зяця венік і доўга, стараннасцю жадаючы загладзіць віну, шкрэбаў ім на магіле — раўняў снег, і вакол магілы, і паўсюль, дзе яны маглі ступаць.

Зяць пасвяціў ліхтарыкам. Прыдзірліва ўсё агледзеў. Застаўся задаволены.

— А ведаеце, нічога. Амаль як такі было, — крыху адпусціла яго.

Што да старога цесця, той ледзьве трымаўся на нагах. А яшчэ ж не ўсё! Яшчэ ж аднесці ў хатку рыдлёўку. Яшчэ ж да шашы дапасці. У лесе сядзець, мёрзнуць да раніцы. Потым зноў ісці, ісці! — бо не будзеш жа спыняць аўтобус ці якую машыну адразу каля саменькага ўказальніка «Вялікая Паляна»!

Што да зяця Ігара, дык у таго клопатаў было яшчэ больш. Таму мала было дабрацца ў Мінск — трэба было яшчэ недзе купіць свежай рыбы. Рыбаком ён лічыўся умелым, удачлівым і ніхто яму, канечне, не паверыць, калі пасля начоўкі вернецца дамоў з пустымі рукамі.

Змраныя, брудныя, ледзь цягнучы ногі, пабрылі да леснічоўкі. Доктар раптам адчуў, што яго мерзне правая рука. Няма пальчаткі! Праверыў па кішэнях — няма...

Канечне, зяцю аб гэтай прапажы ён нічога не сказаў, не пасмеў нават заікнуцца.

## Раздзел XXV

*Пільнасць Цімавага бацькі-лесніка. — Крушынскі з Вікаю вяртаюцца з горада. — Цімава запіска. — Вечар. — За леснічоўкаю зноў сочаць. — Раніца. — Апошняя блытаніна з «Васілём». — Пацалунак. — З’яўленне хлопчыкаў з трывожнымі навінамі. — Арышт Крушынскага.*

Гэта толькі незадачлівым шукальнікам скарбаў, доктару Пратасевічу з зяцем Ігарам, якія ніколі не жылі ў вёсцы і абсалютна не мелі паняцця пра псіхалогію вяскоўцаў, здавалася, што ўсё будзе шыта-крыта, ніхто нічога не заўважыць.

Ужо на другія суткі зямля на магіле прасела. На трэція суткі Цімаў бацька, ідучы паўз могілкі ў лес на абход, раптам спыніўся і аж рот разявіў ад здзіўлення. Яго любімы помнік салдату «афганцу» быў пахілены! Завярнуў на могілкі, падышоў... Божа мой, магілу капалі! Хто?! Навошта?! Калі?! Ціка-а-ава ўсё гэта!..

Для яго, вопытнага лесніка, ніякай цяжкасці не склала прасачыць, куды вядуць сляды. Вось яны — на пагорачку зямлі. А вось яны — у мокрым снезе, які, дарэчы, пачынаў падшэрхваць, а гэта значыць, сляды, нібы ў гіпс закутыя, надоўга захаваюцца. А вось галінка зламаная...

Ляснік ішоў проста па слядах і ўжо нават не глядзеў пад ногі. Ён не сумняваўся, што сляды вядуць у леснічоўку. І што належаць яны чалавеку, які даўно быў у яго на падазрэнні. Хатка на замку... Цімаў бацька абышоў яе, ізноў натыкнуўся на сляды — яны вялі ў прыбудоўку. Ляснік нырнуў туды, неўзабаве выйшаў з рыдлёўкаю, запэцканай зямлёй і глінай.

— Тэ-э-эк! — працягнуў ляснік.

Было гэта раніцай. А позна ўвечары таго ж дня вярнуліся з Гомеля Крушынскі з Вікаю. Вельмі кепская, гразкая была дарога ад шашы, таму і прыйшлі ў леснічоўку так позна. Сабакі нідзе не было. Крушынскі пачаў піхаць ключ у замок — ключ не ўлазіў.

— Што такое?.. Паспрабуй, Віка, у цябе пальцы спрытнейшыя...

Дзяўчынка выцягнула са шчыліны мокрую паперчыну. Разгарнула:

— Ды гэта ж запіска!

Нават у цемры сваімі маладым вострым зрокам змагла разабраць Цімавы «гатычныя» каракулі. Прачытала ўголас:

— «Васіль тут!!! Быў на могілках!!! Цім». Нічога сабе! — усклікнула Віка. — Дык ты не маніў? Праўда ўсё гэта, з Васілём?

— Лухта ўсё гэта, з Васілём, — у тон ёй адказаў Крушынскі, адчыняючы замок. Ён нават не зірнуў на запіску. — Ідзі, Віка, мыйся — і лягай спаць. Позна ўжо.

— Дык а хто тады прыязджаў?

— Не ведаю, — адмахнуўся Крушынскі. У яго не было ніякага жадання гаварыць на гэтую тэму.

Ды і Віка: як толькі ўлеглася ў любімы тапчан, як толькі дакранулася галавою да падушкі — так і заснула мёртвым сном. А Крушынскі доўга яшчэ корпаўся, тупаў па хатцы. Запаліў грубку, грэў ваду, бразкаў нейкімі слоікамі... Яму здавалася, што ўжо вельмі позна.

Але чалавеку — не падлеткам Ціму з Валікам, — а дарослламу чалавеку, які стаяў зараз пад хвояю за дзесяць метраў ад леснічоўкі, так не здавалася. Чалавек убачыў святло ў вакне, удыхнуў гаркаваты дым з коміна. «Тэ-э-эк, — сам сабе прамовіў, — ну вось і добра!» І знік.

Віка прачнулася, калі на двары ўжо развіднела. Нарэшце скончылася праклятая адліга. За вакном ляжаў свежы снег. У леснічоўцы было халаднавата — значыць, за ноч узяўся і мароз. Дзяўчынка, усунуўшы ў валёнкі ногі, падышла да грубкі, прыклала далонь. Нават цэгла была халодная. Віка павярнулася да «ляжанкі» Крушынскага... і аслупянела.

Ніякага Крушынскага не было. На яго месцы ляжаў і ціхенька хроп нейкі незнаёмы мужчына. Праз увесь твар яго — ад падбародка да самай шчакі, цягнуўся крывы, выпуклы шнар.

«У Афгане паранены ў сківаіцу!..» — успомніла Віка аповед Крушынскага. Дык гэта ж... і ёсць Васіль! Крушынскі прывёў яго ўночы, паклаў на сваё месца, вось ён і спіць тут!

Мужчына прыкрыў далоняю вочы.

— Што гэта... светла так? — прамармытаў спрасонку... голасам Крушынскага. Затым расплюшчыў вочы. Падхапіўся і сеў.

Віка пільна глядзела на яго. Ён пачырванеў і адвярнуўся.

— Дык вось яно што, — прамовіла яна. — Вось чаму ты быў такі ўпэўнены, што ніякі Васіль тут з'явіцца не можа. Бо Васіль — гэта ты!

Ён маўчаў.

— Гэта ты даглядаў у шпіталі скалечанага «афганца»?

— Я.

— Гэта табе ён расказаў перад смерцю пра шкатулку?

— Мне. Ну вось... Цяпер ты ўсё ведаеш. Сама ж прасіла згаліць бараду... Думала, гэта я так, ад няма чаго рабіць, дзеля моды яе гадую? Цяпер, нябось, і пазіраць на мяне брыдка.

Віка працягнула руку і пагладзіла шнар пальцам... І раптам хутка прысела на коленцы, нагнула Крушынскаму галаву і дакранулася да шнара вуснамі.

Моцны стук у дзверы прымусіў іх абодвух уздрыгнуць.

— Хто там? — крыкнуў Крушынскі.

— Гэта мы, дзядзька Барыс! — пачуўся голас Ціма, а таксама радаснае, нецярплівае сабачае цяўканне. Прыйшлі хлопцы і прывялі Барса.

Віка, спяшаючыся, нацягвала світэр і спартыўныя штаны.

— Пачакайце хвіліну, дайце апрануцца...

І праўда, не больш чым праз хвіліну ён ужо адчыняў дзверы. Хлопцы, і сабака разам з імі, не ўвайшлі, а ўсе ўтрох проста-такі ўваліліся ў леснічоўку. Барс, які б рады гаспадарам ні быў, на грудзі кідацца не адважыўся, шмыгнуў на сваё месца. Цім з Валікам ад узрушэння, і ад таго, што патрапілі пасля двара ў хатку і вочы іхнія яшчэ не паспелі прывыкнуць, нават не адразу заўважылі, што Крушынскі не такі, як звычайна.

— Вы чыталі маю... запіску? — Цім захлёбваўся словамі. — Васіль раскапаў магілу! Пазаўчора ўночы! А мой бацька...

— А яго бацька, — перабіў Валік, — вырашыў, што гэта вы!

Валік замоўк раптам. І Ціму, які сабраўся быў гаварыць, наступіў на нагу — маўляў, паглядзі, хто перад табою!

Але Цім не заўважаў нічога.

— ...Бацька прыходзіць учора ўвечары, — тарабаніў ён, — і хваліцца: ведаю, кажа, хто раскапваў магілу! Сляды, кажа, у леснічоўку вядуць, а мне гэты барадач заўсёды быў падазроны... Я ледзь стрымліваўся, каб не засмяяцца! Яны ж не ведаюць, што са спецслужбаў! Во смеху будзе, калі прыедуць вас арыштоўваць! Уяўляю іхнія твары!

— Ты спачатку на гэты твар паглядзі, — нветліва абарвала яго Віка. — Разуй вочы! Які ён спецслужбіст? Ён і ёсць Васіль... я хацела сказаць, што ніякага Васіля не існуе ўвогуле, — сама заблыталася.

Цім нарэшце падняў вочы на Крушынскага — і здранцвеў. Нейкі час у леснічоўцы панавала нямая сцэна.

— Дык... тады хто раскапаў магілу? — парушыў маўчанне Валік.

А Цім усклікнуў:

— Якая розніца?! Бацька яшчэ з раніцы пайшоў у лясніцтва, каб у Жытнявічы, у міліцыю пазваніць! Яны ж вось-вось прыедуць сюды! Па вас!

— Па мяне? Супакойся, — прамовіў Крушынскі. У самога ў яго, аднак, выгляд быў крыху разгублены. — Якая магіла, якія раскопкі… Нічога не разумею.

— Ды што тут разумець?! Уцякайце, хавайцеся, пакуль не позна! Кажу ж — зараз тут будзе міліцыя!

— Цім, не падымай паніку. Вы ж ведаеце, мяне не было тут усе гэтыя дні…

— Ды ў тым і справа! Бацька хваліўся, што рыдлёўку нейкую знайшоў у вас у двары! А ёй зямля, з магілы!

Крушынскі раптам замітусіўся, выцягнуў ключы з кішэні, потым скрутак грошай. Кінуў грошы на стол, адздзяліў адзін ключ ад кольца… Тады апамятаўся.

— Што за абсурд! — паглядзеў на Віку. — Хаця вось іменна абсурд… Я ж нават не магу сваім алібі пакарыстацца… Так, слухайце мяне ўважліва! Калі яны сапраўды прыедуць — я не ведаю вас, а вы мяне! Запомніце гэта. Для вас жа лепей, а найбольш — для Вікі. За мяне не хвалюйцеся. Нічога яны мне не зробяць. Калі і забяруць, дык патрымаюць крыху і адпусцяць. Але вас я падстаўляць не хачу!

— Віка, — звярнуўся да дзяўчынкі і да гэтага цвёрды яго голас пацяплеў, — вось табе запасны ключ, вось табе грошы. Святло пастарайся не запальваць, прадукты пакуль ёсць… Калі што — хлопцы купяць і прынясуць. Чуеце, хлопцы? Каб глядзелі яе, як сястру! Што б там ні здарылася.

— Не бойся, Віка, — горача запэўніў Валік, — з намі не прападзеш!

— Я і без вас не прападу…

А Ціму нават у такі момант іншае не давала спакою:

— Той, хто капаўся ў магіле, забраў каштоўнасці! — заявіў ён. — А рыдлёку вам падкінуў, каб зваліць на вас усё!

— Цім, ды не магло там быць ніякіх каштоўнасцей…

Крушынскі не дагаварыў і пачаў прыслухоўвацца. Барас таксама падхапіўся, загаўкаў звонка.

Усе выскачылі на двор. Аддалёку чуваць было гуркатанне машыны.

— Так, — распарадзіўся Крушынскі, — усе ў лес! Час у нас ёсць, блізка усё-адно яны не змогуць пад'ехаць!

Сам кінуўся ў хатку, ліхаманкава сабраў, запіхнуў у сумку нямногія дзяўчынкавы рэчы. Не забыў прыхапіць са стала грошы і ключ. Ізноў на двор:

— Хутчэй адсюль!

Машына ўжо не вуркатала, відаць, ужо ішлі сюды пехатою. Калі дзеці зніклі між хвояў, Крушынскі вярнуўся ў леснічоўку. Сеў і спакойна закурыў сабе, ні аб чым не думаючы. Чакаў ён нядоўга. На двары затупалі. Без стуку расчыніліся дзверы і на парозе ўзнік Цімаў бацька-ляснік, за ім — два міліцыянеры ў форме. У руцэ ў лясніка была ягоная, Крушынскага, рыдлёўка.

— Пяць хвілін табе на зборы, — не вітаючыся, нічога не тлумачачы, сказаў адзін з міліцыянераў.

А ў лесніка раптам аж рыдлёка — доказ віны Крушынскага — выпала з рукі і бразнулася аб падлогу.

— Пачакайце… дык я ж яго ведаю! — разгублена неяк сказаў ляснік. — Я пазнаў яго, без барады! Гэта ж… ён прыязджаў сюды гадоў пятнаццаць назад! І ставіў помнік на магіле!..

Са сваёй хованкі, закрытыя кустамі ядлоўцу і хвоямі, дзеці бачылі, як выводзілі Крушынскага. Ён замкнуў хатку.

— Рукі за спіну! — скамандавалі яму.

Барс проста разрываўся нейкім істэрычным брэхам.

## Раздзел XXVI

*Адныя. — Агеньчык каля кар'ера. — Хлопцы даведваюцца ўсю праўду. — Што рабіць? — Віка размаўляе з Барсам.*

Хоць у Вікі і быў запасны ключ, і хоць Цімаў бацька таксама паехаў у міліцэйскай машыне — «для дачы паказанняў», а гэта значыла, ніхто чужы не прыдзе больш у леснічоўку, ва ўсіх трох не было ніякага жадання вяртацца ў апусцелае жытло. Без Крушынскага леснічоўка губляла сваю таямнічасць, прыцягальнасць, а рабілася звычайнымі чатырма сценамі і дахам, што чамусьці недарэчна тырчаць сярод лесу.

Адно, Віка заскочыла на якую хвілінку, узяла што-кольвечы з прадуктаў, прывезеных учора з Гомеля. Хлеб, сала, тры яблыкі, каўбасу... Не забыла прыхапіць і запалкі.

Хлопцы павялі яе да свайго кар'ера. Адшукалася і зацішнае месца — на стромкім беразе тры паваленыя хвойкі, на якіх можна было сядзець, як на лавачках, а пасярэдзіне гэтага трохкутніка — акурат пляцовачка для агню. Унізе, пад самымі нагамі, быў кар'ер — як якое возера. Іншым часам, асабліва ўлетку, сядзець бы на гэтым высокім беражку ды любавацца прыродаю. Але цяпер хлапчукам нават у галаву не прыйшло, што не так даўно бесклапотна ганялі яны тут шайбу. І найбольшай бядою для іх быў прапушчаны гол! Колькі

за гэты час адбылося падзей! У тым ліку і сапраўдная бяда.

Цяпер хлопцы адчувалі, што зрабіліся амаль дарослымі.

Расклалі агеньчык. Валік прыцягнуў аднекуль сухую, доўгую і даволі тоўстую хвойку. Адным канцом паклаў на вагонь. Згарыць кавалак — зноў трэба падпіхнуць трохі.

— Як в'етнамскі гурок, — сумна прамовіў Цім, гледзячы на сябравы завіханні. — Адрэжаш кавалак, за ноч новы вырастае.

— Гэтай хвоі надоўга хопіць, — запэўніў Валік.

Надоўга! Начаваць яны тут, ці што, сабраліся?..

Пачалі падсмажваць сала на агні, падстаўляючы знізу лусты хлеба.

— Крушынскі наказваў цябе глядзець, а мы наадварот — твае прыпасы знішчаем, — пазнавата спахапіўся Валік.

— Ды ежце, шчасце такое, — сказала Віка.

Не да прыпасаў ёй было цяпер. Валік, ледзь не ў вагонь рукою з хлебам лезучы, каб ніводная кропля тлушчу не прапала, пачаў філасофстваваць:

— Дык што! Як я зразумеў, Крушынскі і «Васіль» — адно й тое ж?

— Псеўданім, — падказаў начытаны Цім.

— Без цябе ведаю. Значыць, ён таксама ваяваў у Афгане? Значыць, мае ўсе патрэбныя дакументы?

— Калі гэта «Васіль», — ізноў умяшаўся Цім, у якога думкі ішлі ў крыху іншай, чым у ва ўсіх, плоскасці, — дык гэта... Крушынскі некалі паставіў наш помнік. І высылаў грошы бацькам «афанца» да канца іх жыцця!

— ...У яго ёсць важныя дакументы, — цярпліва выслухаўшы сябра, працягваў Валік. — Значыць, ніхто такога заслужанага чалавека доўга трымаць у турме не будзе!..

Віка толькі гмыкнула:

— Ды ён у грош не ставіць гэтыя дакументы! Саромеецца іх. Нябось, і паказваць іх не стане. Ды і не такія яны важныя — ён сам неяк адзываўся пра іх з іроніяй.

— Тады, — рашуча сказаў Валік, — вось што мы зробім. Паедзем у міліцыю і заявім, што Крушынскага, калі раскапвалі магілу, у сяле не было. Што ён ездзіў у Гомель з пляменніцай…

Віка ўздыхнула і адвярнулася. Яна нервова ламала ў пальцах сухую галінку на роўныя, па сантыметры, кавалачкі.

— Нічога вы не ведаеце! — сказала яна. — Ніякая я яму не пляменніца. Я ўвогуле ніхто… Бяздомная. Проста ён мяне ад смерці ўратаваў. А мне не было куды йсці. Зразумейце, што ён не можа ім нічога сказаць! Ён не можа пакарыстацца… гэтым…

— Алібі, — і тут уставіў Цім.

— Ну, так! Бо інакш я ўсплыву, на мяне выйдуць! І забяруць куды-небудзь, у які дзіцячы дом, альбо ў «размеркавальны прыёмнік» — ёсць такія… Я ведаю, ён нічога пра мяне скажа. І ўвогуле не будзе апраўдвацца! І яго зробяць вінаватым!

Тут, канечне, трэба была паўза, каб усе гэтыя навіны хлопцам пераварыць. Цім першы парушыў маўчанне.

— Віка, у нас проста няма варыянтаў… Калі Крушынскага не адпусцяць, табе давядзецца ва ўсім прызнацца. Ён жа цябе ўратаваў…

Валік аж на ногі ўскочыў:

— Ты думаеш галавою?! Ці чымсьці іншым?! — ні Цім, ні Віка нават не чакалі ад яго такой эмацыйнасці. — Яна прызнаецца, яго вызваляць — а яе куды?! Ты ведаеш, што з дзіцячых дамоў дзяцей прадаюць за мяжу?! На «запчасткі», так гэта ў іх называецца!

Віка спалохана глядзела на яго. Мабыць, раней ёй гэта і ў галаву не прыходзіла. Цім таксама збянтэжыўся.

— Ну, загнуў... Тэлевізар менш глядзець трэба...

— Не вучы, што мне рабіць!

Астыў, аднак, крыху Валік. Прысеў.

Так і сядзелі ўтрох, уздыхаючы, — бы не дзеці былі ў самай шчаслівай пары свайго жыцця, а два дзядкі з бабулькаю, што ўсяго набачыліся, што глынулі ліха за доўгі век і цяпер застаецца ім толькі сядзець ды ўспамінаць...

Але ж нават і старыя не суткамі расседжваюцца. Хлопцам трэба было па хатах . Віцы нічога не заставалася, як вяртацца ў пустую леснічоўку.

На развітанне вырашылі: пачакаць суткі. Сёння увечары Цім асцярожна пастараецца ўсё выведаць у бацькі: як трымаўся Крушынскі? Што яму можа «свяціць»? Калі праз суткі Крушынскага не адпусцяць — тады Віка павінна сысці адсюль. Дзесьці схавацца. Няважна, куды сысці і дзе схавацца... А хлопцы паедуць у горад і прызнаюцца ва ўсім. Хто такая Віка. Хто такі «Васіль». Што Крушынскі не мог раскапваць магілу.

Жорстка ў адносінах да Вікі? Але гэта адзінае разумнае выйсце! З якім і сама дзяўчынка згадзілася. Крушынскі не вінаваты, а невінаватыя ў турме сядзець не павінны. Трэба ратаваць яго, бо сам ён ратавацца не будзе, зберагаючы Віку. Што тут незразумела?

Памятаючы наказ Крушынскага, Віка ў той вечар не запальвала ні лямпу, ні ў грубцы. Рана легла спаць. Яшчэ і не цёмна было. Доўга трэслася пад халоднай коўдраю. Барс падышоў да самага тапчана і глядзеў на яе, павільваючы хвастом. Дзяўчынка

адчула пяшчоту да яго, адзінай жывой істоты, што заставалася з ёю.

— Барс, мілы, — звярнулася яна да сабакі. — Памятаеш, ты знайшоў мяне? У лесе, пад снегам? А гаспадар твой не выгнаў, прытуліў... І дзе ён цяпер? У сырых сценах!

Ад гэтых уласных слоў так шкада ёй стала і Крушынскага, і сябе, што захацелася плакаць. Яна ўспомніла, як Крушынскі прывозіў ёй доктара. Як купляў ёй апельсіны, бананы, яблыкі. Тушыў для яе зайца і здабываў і смажыў курапатак. У Гомель яе звазіў. Адшукаў яе маці і заплаціў грошы, каб тую не выганялі з бальніцы. Нарэшце, бараду зголіў — яе, Віку, паслухаўшы! Дарослы чалавек, а паводзіны, як у дзіцяці малога! І чаму ён так носіцца з ёю? Хто яна яму?

— Барс, чаму ён так са мною носіцца? — паўтарыла Віка ўголас сабаку. — Ты часам не ведаеш? А вось я, здаецца, ведаю... Хаця і баюся гэтага! І ніколі нікому не скажу!

Барс стукаў хвастом па падлозе і аддана, акурат, як на Крушынскага, глядзеў на яе. І ёй здавалася, што ўсё-ўсё ён разумее...

Пакрысе яна сагрэлася, скурчыўшыся пад коўдраю ў камячок. Прыснілася ёй летняе рамонкавае поле, па якім яна бяжыць босая, не бяжыць, а ляціць нават, ледзь кранаючы нагамі кветкі — так, што яны нават не прыгінаюцца. І нагам яе надзіва цёпла!

Дзяўчынка не ведала, што гэта Барс тайком залез на тапчан і скруціўся клубком у яе нагах, грэючы іх.

## Раздзел XXVII

*Барс у каторы раз выручае людзей. — Пальчатка. — Віка ўспамінае доктара. — Нумар на цыгарэтым пачку. — Трэба дзейнічаць!*

Віка так прытрымлівалася наказаў Крушынскага, што ад залішняй стараннасці забыла зачыніць дзверы на ноч. Пад раніцу Барс піхнуў іх лапамі, выслізнуў на двор і пабег па сваіх сабачых справах.

Калі Віка прачнулася, сабака ляжаў у кутку за грубкаю і ціха гырчэў — як робяць сабакі, калі хтосьці хоча адабраць у іх ежу. Канечне, гырчэў ён нарочне. Але ж сапраўды грыз штосьці!

Віка падыйшла бліжэй. Барс ашчэрыў на яе маладыя белыя клыкі і наступіў на сваю знаходку лапаю.

— Што гэта за дрэнь? А ну, не еж абы-чаго...

Віка адшурхнула сабаку. Падняла тое, што ён грыз. Гэта была скураная пальчатка, брудная і мокрая ўсярэдзіне, да таго ж пацярпелая ад сабачых зубоў. Аднак дзяўчынка, перамагаючы непрыемнасць, надзела яе на руку... Штосьці вельмі і вельмі знаёмае! Яна прымярала яе ўжо аднойчы! Гэтая самая пальчатка была некалі на яе руцэ!

І Віка ўспомніла доктара з горада... Хіхіканне яго і пацiранне рук... Агляд — цыпкі на скуры ад дакранання інструментаў... Крушынскі з доктарам выходзяць, яна прымярае пальчаткі, забытыя на стале...

Не было сумнення, што гэта адна з тых пальчатак. Але як яна тут апынулася?!

«Дзе ты яе знайшоў?» — ледзь не папытала ў Барса. Ды схамянулася: колькі можна гаварыць з ім? На ўсе пытанні ў яго адзін адказ — стуканне хвастом па падлозе.

Крушынскага арыштоўвалі так хутка, што ён не паспеў (ці знарок не захацеў, бо ў цёплым бушлаце ў камеры зручней) нават пераапрануцца. Скуранка яго вісела ў «шафе». Віка пачала шнырыць па кішэнях. Куртка пахла Крушынскім... Нічога! Усе чатыры кішэні пустыя. Толькі крышкі ад тытуню, ды ва ўнутранай, «патаемнай» кішэні — пусты, скамечаны пачак ад цыгарэт...

Пачакайце. Але Крушынскі не курыць такіх! Дзяўчынка расправіла пачак. Збоку былі напісаны чужым почыркам восем лічбаў і пад імі — слова

«СТАСЬ».

Хлопцы прыйшлі роўна ў дзесяць, як і дамаўляліся. Абодва былі панурыя. Стараліся не глядзець на Віку. І дарма! Бо калі калі глянулі б, сёе-тое маглі б убачыць. Напрыклад, што ў вішнёвых вачах яе скачуць такія ж іскрынкі, як і ў Крушынскага, калі ён расказваў легенду пра Васіля...

— Крушынскі маўчыць, — сказаў Цім, уздыхнуўшы, і прысеў на табурэтку. — Яму «шыюць», бацька расказваў... Вось, тут запісана ў мяне, — Цім зачытаў з кавалачка паперы, — трыста сорак сёмы артыкул, частка першая — апаганьванне магілак...

— Яму! — усклікнула абураная Віка. — Які нічога не апаганьваў, а наадварот, за ўласныя грошы паставіў помнік чужому чалавеку!

— Што ж будзем рабіць? — спытаў Валік. — Адразу папярэджваю: у міліцыю я не пайду! І Віку падстаўляць не збіраюся!

— Баішся, каб яна не знікла адсюль? — ціха, у падлогу гледзячы, прамармытаў Цім.

— Што-што?

— Паўтары! — у адзін голас усклікнулі Віка з Валікам.

Не такі Цім дурны, каб паўтараць.

— Вось што, хлопчыкі, — сказала Віка, і «хлопчыкі» цяпер толькі звярнулі ўвагу, якая яна

сёння вясёлая і ўпэўненая ў сабе. — У мяне зусім іншы план. Мы паедзем у Мінск. Усе разам.

— Як так?

— Чаму ўсе?

— Здаецца, я ведаю, хто раскапваў магілу. Мы павінны самі знайсці злачынцу. І я адна магу пазнаць яго.

Хлопцы пераглянуліся. Вось табе і Віка!

— А як жа той мужчынка, які прызджаў у сяло і бадзяўся па могілках? — спытаў Цім. — Я ўпэўнены, што без яго рук не абыйшлося.

— Магчыма, злачынцаў было некалькі. Бачыце гэтую пальчатку? — узяла са стала і паказала хлопцам Віка. — Дык вось, калі мяне, непрытомную, падабраў тады Крушынскі, на другі дзень...

З вялікай цікавасцю выслухалі хлопцы і пра доктара з Мінска, і пра тое (дзяўчынка нічога не стала ўтойваць), як яна прыкінулася нямой і як хутка раскусіў яе доктар, і пра забытыя ім пальчаткі, якія яна прымервала. Адну з іх Барс сёння знайшоў і прывалок сюды.

— Гэтую вось самую.

— Ты ўпэнена, Віка?

— Упэўнена. Проста... у мяне сваіх пальчатак ніколі не было. Я першы раз у жыцці іх адзела. Як такое можна забыць?

— Дык, значыць, Крушынсчкі ведае гэтага доктара? — спытаў Валік. — Не на вуліцы ж ён яго падабраў.

— Думаю, што ведае, — адказала дзяўчынка. Яна ўспомніла, як Крушынскі не хацеў пакідаць яе ў сябе, і адзін з ягоных довадаў быў такі: «Ды і доктар гэты бачыў цябе!» Па яго інтанацыі яна тады зразумела, што Крушынскі з доктарам — даўнія знаёмцы.

Але пра гэты эпізод дзяўчынка расказваць не стала. Такога кшталту ўспаміны маглі належаць толькі ёй і Крушынскаму...

— Тады навошта нам ехаць у Мінск? — перабіў яе думкі Валік. — Паедзем у Жытнявічы, у міліцыю да Крушынскага, раскажам пра пальчатку, ён назаве адрас, дзе гэты доктар жыве.

— Зараз, — іранічна азвалася Віка. — Хто нас да яго пусціць? Хто мы яму такія? Да таго ж тры першыя дні падследным забаронены любыя пабачанні, нават з роднымі людзьмі. Толькі з адвакатам.

Віка казала як спецыяліст па такіх справах.

— Адкуль ведаеш? — з зайдрасцю (знайшоў чаму зайздросціць) да такой яе эрудыцыі спытаў Цім.

— Ведаю. Неяк з маці да айчыма хадзілі, — неахвотна патлумачыла Віка. — Дык вось! Калі мы самі знойдзем, дзе гэты доктар жыве, ды напішам афіцыйную заяву, ды прыкладзем пальчатку — тады іншае! Тады яны вымушаны будуць адпусціць Крушынскага.

— Але як мы знойдзем таго доктара? — засумняваўся Валік.

Цім падказаў:

— Трэба пакапацца ў рэчах Крушынскага! Павінны ж быць у яго нейкія блакноты, адрасы, тэлефоны...

— Ужо зроблена, — з усмешкай адказала Віка. Дастала пачак з-пад цыгарэт з кішэні. — Крушынскі такія не курыць. І почырк не яго. Значыць, гэты нумар «сотавіка» напісаны альбо рукою самога доктара, альбо чалавека, які іх тады падвозіў. Мы нават імя ведаем — Стась!

— Ну, Віка, — Валік адважыўся на камплімент. — Ты мала таго, што прыгожая, дык яшчэ і такая разумная, назіральная... Пазайздросціць можна!

Не Валік, а дзяўчынка пачырванела: яе так рэдка ў жыцці хвалілі. А Цім сказаў насмешліва:

— Ну, ну, потым будзеце хваліць адзін аднога... Колькі цяпер? — узяў са стала будзільнік і чамусьці прыклаў яго да вуха. — Палова на адзінаццатую? Ён правільна паказвае? У дванаццаць аўтобус на Мінск. Збірайцеся.

— Пачакай, а грошы? — ускінуўся Валік.

— Ты што, забыў? — нагадала Віка. — Крушынскі ж пакіў нам грошы!

— А ты не баішся, што цябе ўбачаць?

— Няхай бачаць, — адказаў за дзяўчынку Цім. — Няхай прывыкаюць, што яна тут. Толькі не забывайце: Віка, ты — пляменніца Крушынскага!

## Раздзел XXVIII

*Мінск. — Званок на "сотавік". — Стась не здраджвае сваёй звычцы. — Дом у прыватным сектары. — Цімава смеласць. — Віка пазнае доктара, а Цім — Ігара. — Аддзяленне міліцыі. — Заява паводле ўсіх правілаў. — Крах доктара Пракулевіча з зяцем Ігарам.*

Хлопцы не аднойчы ездзілі ў Мінск — і разам, і нават самі, таму дома не ўзнікла ніякіх пытанняў. Валік сказаў, што яму трэба купіць адну важную кнігу (маці нават грошы яму дала), а Цім, не прыдумваючы ніякай прычыны, проста ляпнуў:

— Паедзем з Валікам ў Мінск гуляць. Надакучыла тут.

— Ды глядзі, пад машыну не падлезь, — папярэдзіла маці. — Гэта ж Мінск, а не Вялікая Паляна!

— Не вучы вучонага. Не ў першы раз!

Віка з'явілася на прыпынку за лічаныя хвіліны да адпраўлення аўтобуса. Ніхто з пасажыраў нават не

звярнуў на дзяўчынку ўвагі. Мала тут дачнікаў, перасяленцаў ды ўвогуле чужых людзей! Усё адно і хлопцы, і Віка рабілі выгляд, што яны незнаёмыя. Так і даехалі да Мінска, ні словам не перакінуўшыся.

На вакзале першым чынам купілі тэлефонную картку. Цім узяў у Вікі пачак з-пад цыгарэт. Набраў нумар — з таго самага таксафона, з якога званіў некалі Крушынскі сваім даўжнікам.

— Алё! Мне, калі ласка, трэба Стась.

— Слухаю, — буркнуў сярдзіты голас.

— Дзе вы жывеце? — пачаў хітры Цім. — Да вас ёсць важная справа. Нам трэба сустрэцца.

— А ты дзе знаходзішся?

— На ўсходнім вакзале. Цэнтральны перон.

— Тады не кладзі трубку…

Нічога не разумеючы, Цім пераглянуўся з сябрамі. Праз хвіліну ён пачуў у трубцы:

— Хочаш пабачыцца, дык азірніся.

Стась, трымаючы каля вуха "сотавік", стаяў каля самага таскафона. Яму выйсці з «масквіча» і падысці сюды было якіх метраў пятнаццаць. Ён падазрона агледзеў тройку сяброў.

— Ну, я слухаю. Што вам трэба?

Цім запытальна зірнуў на Віку. Тая крутнула галавою — не, гэта не доктар!

— Мы ад Крушынскага, — сказаў Цім.

— Якога яшчэ Крушынскага?

— Вы вазілі доктара да яго ў леснічоўку, — умяшалася Віка. — Каля сяла Вялікая Паляна.

— А-а! Ну, ведаю. І што?

— Вы ж адвезлі таго доктара назад у Мінск?

— Дапусцім.

— Вы памятаеце, куды? Нам тэрмінова трэба яго адрас!

— Яшчэ і тэрмінова, — пасміхнуўся Стась. — Не, не помню.

Стась які быў падазроны, да ўсяго і да ўсіх недаверлівы, такі й застаўся.

— А што вы за такія юныя следапыты? Навошта вам доктар?

— Ккрушынскі ў турме, — сказала Віка, гледзячы Стасю ў вочы. — А ён ні чым не вінаваты. Мы ведаем, што... Словам, што вінаваты ва ўсім доктар! А зваліў на Крушынскага!..

— Крушынскі ў турме? — Стась задумаўся. — Дык вы, значыць, сабраліся «абмяняць» яго на доктара? Нешта ўспамінаю... Калі ад'язджалі, дык сядзеў ён, як на цвіках... Папрасіў у мяне аловак, паперу... У самога рукі дрыжэлі... Я яшчэ тады падумаў — штосьці ён такое замыслівае!

— Дык вы скажаце адрас?

— У прынцыпе, нам не паложана. Ёсць такое правіла ў таксістаў: ніколі нікому не называць каардынаты кліентаў... Але толькі дзеля Барыса! На яго і на ваша шчасце ён мне спадабаўся. Хадзем у машыну.

Праз паўгадзіны сябры вылезлі з «масквіча» на вуліцы Адоеўскага. Злева спрэс цягнуўся так званы прыватны сектар.

— Вунь дом, — паказаў пальцам Стась, — бачыце? Прывітанне Крушынскаму. Калі вызваліцца, хай паведаміць. Ну, поспехаў!

Сябры наблізіліся да самых веснічак паказанага ім дома. Сабакі ў двары не было, ужо добра.

— Ну, паграбуся памалу, — прашаптаў Цім.

Не паспеў ён узяцца за веснічкі, як дзверы з дома расчыніліся і на парозе паказаўся... нізенькі мужчынка! Той самы, які швэндаўся па Вялікай Паляне і заходзіў на могілкі!

Следам, праводзячы мужчынку, на ганак выйшаў і нейкі стары дзед.

— Чаго табе, хлопчык? — насцярожыўся дзед, убачыўшы Ціма.

— Нічога, — адказаў той і засмяяўся. Цяпер ім ужо сапраўды нічога больш не трэба было. Усё зразумела. Вось дзе яны жывуць, сапраўдныя злачынцы!

Аднак на вуліцы яшчэ перапытаў ў Вікі:

— Ён?

— Ён. Той самы доктар.

— А з ім хто, цікава? — сказаў Валік.

— А з ім — той самы «Васіль», якога я бачыў у Вялікай Паляне!

Валік толькі прысвіснуў.

Бліжэйшае аддзяленне міліцыі знаходзілася ў вельмі зручным месцы — побач з празрастай, нібы з аднаго шкла зробленай кавярняю. Дамовіліся, што Віка будзе сядзець там, у цяпле, і чакаць хлопцаў, колькі спатрэбіцца.

Дзяжурны — малодшы лейтэнанцік без фуражкі — крыху здзівіўся, калі двое падлеткаў, высокі і нізкі, зайшлі ў вестыбюль і наблізіліся да ваконца.

— Мы хочам зрабіць важную заяву. Каму гэта можна, вам альбо следчаму?

Дзяжурны надзеў фуражку і ў сваю чаргу спытаў:

— У пісьмовай ці ў вуснай форме?

— У пісьмовай. Толькі нам папера трэба.

— А вы зможаце?

— Паспрабуем...

— Калі ласка. Вось вам папера, вунь стол. Напішаце — аддадзіце мне.

Хлопцы пісалі, а дзяжурны ўсё пазіркваў на іх. Праз хвілін дзесяць перад ім леглі два, буйным Цімавым почыркам спісаныя, аркушыкі. Дзяжурны пачаў чытаць. Прачытаў.

— Нічога сабе!...— Падняўся. — Хадземце за мною.

Хлопцы падняліся за ім на другі паверх. Каля аднаго з кабінетаў стаялі тры, разам змацаваныя, крэслы.

— Пачакайце тут, калі ласка, — дзяжурны пастукаўся і зайшоў у кабінет, а дзверы, відаць, знарок, пакінуў расчыненымі.

— ...Першы раз у жыцці такіх талковых хлопцаў бачу, — пачуўся яго голас. — А напісалі як! У нас акадэміі паканчалі, а граматыкі не ведаюць...

Цім заірдзеўся. Валік паляпаў яго па плячы.

— Ды будзе табе... — прамармытаў Цім. — Звычайная хроніка!

Пісаў ён заяву па прынцыпе «нічога лішняга». Раздзяліў яе на дзве часткі: 1) уводзіны ў курс справы і 2) голыя факты. У ноч з такога на такое чысло раскапана магіла ў Вялікай Паляне; па падазрэнні ў злачынстве арыштаваны Жытнявіцкім РАУС Барыс Крушынскі, былы «афганец»; у сувязі з гэтым маем паведаміць наступнае: за тры дні перад здарэннем у сяло прыязджаў чалавек, які пражывае ў г. Мінску па такім і такі адрасе, і цікавіўся менавіта гэтай магілай; акрамя таго, у ваколіцах Вялікай Паляны знойдзена пальчатка (прыкладаецца да заявы), якая належыць чалавеку, што пражывае там сама, дзе і першы падазроны. Няма сумнення, што гэта саўдзельнікі. Просьба найхутчэй выпусціць ні ў чым не павіннага Б. Крушынскага і ўзбудзіць крымінальную справу супраць сапраўдных злачынцаў. Дата, прозвішчы з прыпіскай — вучні шостага класа Вяліка-Палянскай сярэдняй школы, подпісы.

— І дзе ты так налаўчыўся? — спытаў Валік.

— Кніжак многа чытаю...

— Зайдзіце! — паклікаў хлопчыкаў следчы. Гэта быў стары мажны чалавек з сівымі вусамі.

Зайшлі, селі ва ўжо мяккія крэслы за стол, насупраць следчага. Той званіў некуды па тэлефоне і не спускаў з хлопчыкаў пільных вачэй.

— Ага... Так, так! Запісваю...

І запісваў, гледзячы не на паперу, а на хлопчыкаў! Такога ім яшчэ бачыць не даводзілася.

Даволі доўга ішла тэлефонная размова. Нарэшце следчы паклаў трубку.

— Зараз я гаварыў з Жытнявічамі, — патлумачыў ён. — Скажыце, кім вам даводзіцца гэты Крушынскі? Што вы за яго так турбуецеся?

— Нікім...

— Проста сябар. Старэйшы, — адказаў Цім.

— А ці ведаеце вы, што ваш старэйшы сябар ужо аднойчы быў судзімы? Праўда, неўзабаве высветлілася, што ён невінаваты...

— Ведаем!

— Расказаў, значыць? Добра... Ваш Крушынскі, канечне, герой, ардэнамі-медалямі ўзнагароджаны, і ўсё такое. Аднак блізка з ім сыходзіцца я б вам не раіў. Дужа ж ўжо нейкая бурная біяграфія ў чалавека!

Хлопцы маўчалі.

— Зрэшты, хай вашыя бацькі з гэтым разбіраюцца, — спахапіўся следчы. — Я вас слухаю. Вы паводле ўсіх правілаў напісалі заяву, а цяпер паўтарыце, калі ласка, вусна.

Цім, як змог, паўтарыў.

— Дзякую! — сказаў следчы, выслухаўшы. — Усё. Ваша місія скончана. Вас выклічуць, калі трэба будзе.

— А як мы даведаемся пра вынікі? — пацікавіўся Валік.

— Чакайце вашага сябра. Вернецца Крушынскі — значыць, усё ў парадку. Значыць, вы не памыліліся. І яшчэ! Канечне, вам будзе аб'яўлена

падзяка, вы атрымаеце каштоўныя падарункі і гэтак далей...

— Мы зусім не дзеля падарункаў, — сказаў Цім.

— Я разумею. Пачакайце... У любым выпадку — нават калі вы і памыляецеся, а мне вельмі б не хацелася, каб вы памыліліся, — вы сапраўдныя хлопцы. Сапраўдныя сябры. Я проста хачу паціснуць вам руку...

Сівавусы следчы разам з аператыўнай групай сам выехаў па ўказаным адрасе. Хлопцам на развітанне ён сказаў: «Хоць я і не да канца ўпэўнены, што нешта з гэтага выйдзе...»

Давялося ўпэўніцца.

Пасля, прыгадваючы вобыск і неадэкватныя паводзіны грамадзяніна Пратасевіча, уся следчая група клалася ад смеху. Па-першае, доктар страшэнна спалохаўся, калі ўбачыў людзей у форме і ў цывільным. А хіба калі чалавек не вінаваты, ён палохаецца так? Па-другое, на пытанне ў лоб: «Гэта ваша пальчатка?» — здуру ляпнуў:

— Мая...

— Дзе вы былі ў ноч з такога на такое?

— Рыбу лавіў. На Мінскім моры.

— Хто можа пацвердзіць?

— Зяць мой, Ігар...

— Адрас яго! І тэлефон — службовы, і хатні!

Калоцячыся ад страху, доктар назваў. Адразу ж выйшлі двое. Завялася машына на вуліцы. Следчы працягваў допыт.

— А як пальчатка аказалася ў Вялікай Паляне, за дзвесці кіламетраў ад Мінскага мора?

— Не ведаю...

— Пакажыце мне адзенне, у якім вы ездзілі на рыбалку.

Лепш бы не рабіў гэтага доктар Пратасевіч! Ён нават гразь і гліну не счысціў са свайго

хімабаронаўскага касцюма. Да ўсяго, другая, цэлая пальчатка, але такая ж брудная, выпала з кішэні.

— І дзе вы ўмудрыліся на Мінскім моры, зімою, так выпэцкацца?

— Не ведаю…

Следчы, які сам быў някепскі рыбак, палез у скрынку.

— Як вы лавілі рыбу, калі ў вас нават вудкі не размотаныя? Калі ў вас ўсе, як адна, мармышкі сухія?

— Не ведаю…

Следчы махнуў рукою і нават дапытваць перастаў. Не варта было марнаваць час. Неўзабаве прывялі зяця Ігара. Той убачыў пальчаткі, убачыў брудны касцюм, убачыў перакошаны страхам цесцеў твар... Усё зразумеў. Стары гультай! Нават касцюм у парадак не змог прывесці! А дамаўляліся як?!

— Дык што, — звярнуўся следчы да Ігара, — будзем праводзіць экспертызу? Здымаць адбіткі пальцаў? Рабіць выезд на месца злачынства? Ці адразу пярэйдзем да галоўнага: што вы рабілі ўночы на магіле «афганца»?

— Не трэба... экспертызы, — выціснуў Ігар. — Запісвайце!..

## Раздзел XXIX

*Вяртанне Крушынскага. — Хлопцы ходзяць героямі. — «Легалізацыя» Вікі. — Дык ці была шкатулка з каштоўнасцямі? — Містыка. — «Сабака на сене». — Дзяўчынцы здаецца, што ўсё гэта сон.*

Крушынскага выпусцілі тым жа вечарам.

Усё сяло толькі і гаварыла аб апошніх падзеях. Усе ведалі, што нейкія прахадзімцы з Мінска капаліся на магіле «афганца», шукалі нейкі скарб, нічога,

канечне, не знайшлі, бо адкуль яму, гэтаму скарбу, было тут узяцца?

Усе таксама ведалі, што Крушынскага арыштавалі несправядліва, па нагаворы. Перажывалі за яго — як бы ўжо ён зрабіўся іхнім, вясковым. Бо і праўда — каму ён што кепскага рабіў, такі непрыкметны, ціхі? Да таго ж гэта менавіта ён некалі паставіў на магіле свайго сябра такі прыгожы помнік! За ўласныя грошы!

Аб гэтым расказаў людзям Цімаў бацька-ляснік. Самому лесніку было сорамна перад Крушынскім, ён збіраўся прыйсці ў леснічоўку прасіць прабачэння і на поўным сур'ёзе казаў сыну: «Падрыхтуй ты як-небудзь барадача свайго...», і збянтэжана чухаў патыліцу.

Аднак Цім і сам быў сярдзіты на Крушынскага. Навошта ён хлусіў ім пра спецслужбы, пра афганскую шкатулку, пра Васіля?.. Калі ўжо так карцела яму, дык мог бы і менш праўдападобную гісторыю выдумаць... І зусім не абяцанага матацыкла, якога ён цяпер, вядома, ніколі не атрымае, шкадаваў Цім. Не настолькі ён быў наіўны, каб спадзявацца на такі дарагі падарунак. Проста каму прыемна, калі цябе падманваюць, дык яшчэ так сур'ёзна, так грунтоўна, так дакладна?..

— Яго таксама можна зразумець, — апраўдваў Крушынскага Валік. — Ён правільна зрабіў. Падумай: цэлыя канікулы мы жылі гэтай тайнаю! А калі б ён проста прагнаў нас? Нічога не прыдумваючы? А так — цікавей было жыць...

Зрэшты, нават і ведаючы, што скарб — усяго толькі міф, прыдуманы Крушынскім, хлопцы пачуваліся героямі. Гэта ж менавіта яны раскрылі злачынства; міліцыі толькі заставалася арыштаваць віноўных! Гэта ж менавіта яны мала таго, што ўратавалі ад турмы Крушынскага, дык яшчэ і памаглі «легалізаваць» Віку. Цяпер дзяўчынцы не трэба было

хавацца. Усё проста. Са слоў Ціма з Валікам вяскоўцы ўжо ведалі, што яна — пляменніца Крушынскаму, прыехала да яго з Гомеля на канікулы. Пажыве крыху, ды і паедзе.

— А што: гэтага доктара, і таго, другога, хто з ім быў — у турму пасадзяць? — пацікавілася Віка ў Крушынскага.

Быў позні вечар. Крушынскі сядзеў на сваім любімым месцы —перад грубкай, і пакурваў у комін.

— Гэтых? — рассеянна перапытаў ён. — Ды не, наўрад ці... Суд улічыць і матывы, і нанесены ўрон, і гатоўнасць кампенсаваць гэты ўрон, і характарыстыкі на іх, і раскаянне... Упэўнены — выкруцяцца яны!

Забягаючы наперод, скажам, што Крушынскі як у ваду глядзеў. Так і атрымалася. Не падмануў зяця Ігара знаёмы юрыст, усё сышло аферыстам з рук, лёгкім перапалахам абыйшлося; хаця ў Ігара і былі вя-я-лікія непрыемнасці па службе!..

— А шкада, — прамовіла Віка. — Шкада, што гісторыя з афганскай шкатулкай усяго толькі легенда. Выдумкі!

Крушынскі сядзеў прыгорбіўшыся. Маўчаў. Часта зацягваўся цыгарэтаю. Віка ўважліва паглядзела на яго. Раптам неверагодная здагадка цюкнула ёй у галаву. Толькі жанчына можа ўгадваць такія рэчы (а не Цім з Валікам; яны адразу паверылі, што ніякага скарбу не было!).

— Ці... гэта не легенда? — прашаптала Віка.

— А ты як думаеш? — павярнуўся ён да яе.

— Я магу і памыляцца... Але думаю, шкатулка існавала. Ты даўно забраў яе. Яшчэ калі ставіў на магіле помнік.

Віка сказала, а сама сцялася ўнутрана. Ёй страшна было, што рассмяецца зараз Крушынскі, альбо проста агрызнецца: «Ды колькі можна?! Як мне ўсё гэта надакучыла?!»

Не засмяяўся. Не агрызнуўся.

— Гэта было вельмі лёгка зрабіць, — толькі і сказаў вінавата і ціха. — Помнік тры дні ставілі... Раствор, бетон, крошка, там падкапаць, там падважыць... Вось я і выбраў адну ноч... Нават рабочыя нічога не заўважылі.

— І ты... ўсё патраціў?! За гэтыя пятнаццаць гадоў?!

— Не паверыш, але амаль што нічога.

— Дык шкатулка ў цябе?

— Яна схавана ў надзейным месцы. Я, Віка, калі б нават і захацеў, дык нічога не змог бы патраціць.

— Як... гэта?

— Так. Гэта не мае каштоўнасці. Яны не прыносяць мне шчасця, — сур'ёзна гаварыў Крушынскі. — Проста містыка нейкая! Праўда: за гэты час я паверыў і ў Бога, і закляцці, і ў забабоны, і ва ўсё замагільнае, нерэальнае... Ды тут любы на маім месцы паверыў бы. Гэта праклятыя каштоўнасці, Віка! Я не магу імі распраджацца, не магу траціць іх на сябе, а яны не адпускаюць мяне! Ведаеш выраз ***сабака на сене***? Вось так і я! Як ланцугом якім да гэтага месца прыкуты! Як вартаўнік, што павінен быць заўсёды побач!

— А ты... спрабаваў іх траціць?

— Яшчэ і як спрабаваў. Але ўсё ператваралася толькі ў шкоду мне.

— І што, аніяк немагчыма ад іх пазбавіцца? — спытала яна спагадліва. — Ну, аддаць каму-небудзь... Хіба мала знайшлося б ахвочых?

— Пасылкаю паслаць, як Бэндэр пасылаў свой мільён камісару фінансаў? — пасміхнуўся Крушынскі. — Пазбавіцца, аддаць іх, канечне, можна было б... Вось толькі ці аддадуцца яны? Ці ***захочуць*** яны ў чужыя рукі аддавацца? Вельмі і вельмі сумняваюся!

— У мяне, дарагая Віка, крыху іншы план, — працягваў Крушынскі. — Здаецца, толькі цяпер я пачынаю штосьці разумець... Цяпер — калі ты ў мяне паявілася. Помніш, некалі я казаў, што цябе, можа, сам Бог прыслаў — як збавенне мне, як падказку выбару далейшага шляху? Дык вось: калі я пачаў, прабач, траціць сёе-тое на цябе... Вось тут грошы слухаюцца! Вось тут усё ідзе нармальна! Нібы нейкі сігнал паступае, нейкі званочак звініць — усё правільна, ты, Крушынскі, робіш тое, што трэба! І таксама было, калі я штомесяц пасылаў грашовыя пераводы бацькам «афганца»; звінеў той жа «правільны» званочак, усё йшло ў мяне добра і душа была больш-менш спакойная! Дык, можа, у гэтым справа?

Крушынскі не сцвярджаў, ён раіўся з Вікай, як з дарослаю.

— Як ты думаеш? Можа, закляцце з гэтых каштоўнасцей здымаецца менавіта так: не на сябе трэба іх траціць, а на іншых? На тых, каму каму гэтыя каштоўнасці неабходныя, хто мае ў іх сапраўдную патрэбу...

— Як... я, напрыклад? — сказала Віка, гледзячы ў падлогу.

— Як ты, напрыклад, — пацвердзіў Крушынскі. — Няўжо ты думаеш, што лёс звёў нас выпадкова?..

Дзяўчынка слухала і не ведала, верыць усяму гэтаму, ці не. Яна так мала чаго ў жыцці бачыла. Для яе нават тая звычайная гомельская двухпакаёўка, дзе яны з Крушынскім трое сутак пражылі, здавалася нейкім незямным цудам, ледзь не вяршыняю чалавечага шчасця... І раптам — такое! Шкатулка, незлічонае багацце — і ўсё гэта ў рэальнасці!

І Крушынскі, якога яна лічыла добрым сваім геніем, анёлам-ўратавальнікам — адзіны, каму гэтае багацце належыць! Здавалася б, жыві не хачу... Аж

не! Варта было яму толькі ўзяць у рукі гэтую «загаворaную» шкатулку, як зараз-жа, з гэтага моманту і наступіла расплата — немагчымасць сваім багаццем пакарыстацца... Сабака на сене... Горш не прыдумаеш!

У дзяўчынкі кружылася галава. Ды ці не сон гэта?! Ці не прачнецца яна зараз — і ці не ператворыцца тады гэтая лясная хацінка, што зрабілася ёй ужо як бы роднаю, у сырую пракураную камуналку, герой-«афганец» Барыс Крушынскі — у азызлага, налітага гарэлкаю айчыма, які вярнуўся пасля чарговай адсідкі, а яна сама, Віка, у ранейшую, мурзатую, затурканую і няшчасную дзяўчынёху, якой проста прысніліся ўсе гэтыя прыгоды?.. І як жа страшна будзе прачынацца. Замест прыгожай, фантастычнай казкі — безвыходная, безнадзейная шэрасць, замест жмені каштоўных камянёў — заціснутае ў брудным кулачку бананавае лупінне...

## Эпілог

*Здзіўленне бабулек каля пад'езда. — Кватэра. — Крушынскі выяўляе сябе як практычны чалавек. — Чорная жамчужына. — Аб чым стукаюць колы?*

Надышла вясна. Быў канец красавіка. Даволі моцна падпякала сонца і асабліва адчувалася гэта ў горадзе, нават тут, у кампактным, утульным старым раёне Гомеля, дзе амаль кожны дворык, створаны з пяціпавярховых «хрушчовак», патанаў у зеляніне клёнаў і ліп. На клумбах, газонах — скрозь, дзе не было вытаптана, усё жаўцела дзьмухаўцамі, гэтымі маленькімі копіямі сонца, гэтымі пасланнікамі неба на зямлю, гэтымі прадвеснікамі скорага лета...

Да адной з «хрушчовак» ціха падкаціў блакітны «мэрсэдэс». Бабулькі, што ўрадок сядзелі на лаўцы каля пад'езда, насцярожыліся. З «мэрса» выйшаў высокі, плячысты, добра апрануты і чыста паголены мужчына. Крыху бракаваў яго знешнасці толькі доўгі крывы шнар на ўсю шчаку. Мужчына адчыніў заднія дзверцы і памог выйсці адтуль дзяўчыне, ці нават дзяўчынцы — танклявай, вельмі прыгожай і коратка падстрыжанай; хутчэй за ўсё (падумалі бабулькі) дачцэ.

Потым з машыны выбралася бабуля, на выгляд яшчэ старэйшая за тых, што сядзелі на лаўцы. Мужчына хацеў і ёй дапамагчы, але яна спалохана схавала рукі за спіну. У «мэрсе» застаўся толькі мужчына за рулём.

Дзіўная працэсія зайшла ў пад'езд.

Першым па лесвіцы падымаўся Крушынскі, следам — маці Вікі, якую яны толькі што забралі з бальніцы-«начлежкі»; апошняю ішла Віка. Дзяўчынка толькі цяпер пачынала здагадвацца, што за сюрпрыз сабраўся зрабіць ёй з маці Крушынскі. Але, баючыся памыліцца, усё яшчэ верыла не да канца.

Спыніліся на трэцім паверсе, перад металёвымі дзвярыма ажно з двума «вочкамі». Крушынскі адчыніў замок ніжні, адчыніў верхні. Усё гэта крыху нагадвала адмыканне сейфа. Увайшлі ў кватэру. Памяшканне было падобнае на офіс або на гатэльны нумар. Вельмі светла. Даволі прасторна. Нічога лішняга. Белыя шпалеры і чорныя мэбля.

— Сядайце, калі ласка, — Крушынскі мякка ўзяў жанчыну за локаць і падвёў да канапы.

Жанчына свабодна сесці не адважылася; прыткнулася на самым краечку. Было відаць, яна абсалютна не разумее, што ж тут адбываецца.

Віка стаяла каля камп'ютэрнага століка. Крушынскі падыйшоў да яе. Узяў са століка тэчку з паперамі.

— Віка, тут усё, што трэба. Гэтая кватэра вашая. Тры пакоі, еўрарамонтам праробленыя ў чатыры. Кухня, ванная, дзве лоджы, лядоўня, тэлевізар, камп'ютэр, мэбля на першы час... Словам, разбярэшся.

— Што... усё гэта значыць, Крушынскі?

— Кватэра прыватызаваная, гэта ваша з маці ўласнасць, — не слухаючы дзяўчынку, казаў ён. — Вось ордэр.

Адна паперка легла на стол.

— Як... табе гэта ўдалося?!

— Я забраў пашпарт тваёй маці, — растлумачыў Крушынскі. — Помніш, калі мы прыязджалі зімой? І хадзілі... ну, у бальніцу? Дарэчы, вось ён.

Паклаў на стол пашпарт.

— Вось табе, — зашамацела яшчэ адна паперка, — даведка, што з восені ты залічана ў гімназію... Адна з лепшых! — паспешліва дадаў ён, нібы напярод баючыся спрэчкі. — Платная, з паглыбленым вывучэннем беларускай мовы і літаратуры!

— Дзякую...

— Вось даведка, што ўсё заплачана да канца вучобы.

Яшчэ два дакументы — з рознымі круглымі, квадратнымі і трохкутнымі пячаткамі — ляглі на стол. «Договор в пользу третьего лица» — ухапіла вачыма Віка.

— Вось гэта, глядзі, — гэта самае важнае... Копія дамовы банкаўскага ўкладу на тваё імя. Пакуль табе не споўніцца чатырнаццаць, працэнты будзе атрымліваць маці. А з наступнага году — ты.

— Ко... колькі? — спытала Віка, заліўшыся чырванню.

Аднак Крушынскі не здзівіўся пытанню.

— Гэта вылічваецца проста. Пакладзена ў банк тры тысячы даляраў, так? Пятнаццаць адсотак у год... Падай, калі ласка. ручку... Дзелім на дванаццаць месяцаў... Так! А тое, што атрымалася — на 1, 25... Атрымоўваем каля трохсот, — падняў на Віку вочы Крушынскі, — даляраў. Думаю, з вас хопіць.

Дзяўчынка адвярнулася.

— Крушынскі... Няўжо гэта праўда? Тое, што цябе... так душаць чужыя грошы? І ты так хочаш пазбавіцца ад іх?

— А ты не разважай па-даросламу, — параіў ён. — Табе не пасуе. Як мне мая барада некалі... Ну, усё!

Ён падняўся. На твары яго блукала ўсмешка, а вочы былі сумныя.

— Паеду; трэба яшчэ Ціму купіць матацыкл... Зялёнага колеру.

— Ты раскажаш ім, ну, Ціму з Валікам, пра ўсё? — спытала Віка і чамусьці азірнулася на маці.

— Не, канечне.

— Разумею... Пачакай! — усклікнула яна, калі Крушынскі пакіраваўся да дзвярэй. — Мы што, вось так... і растанемся?!

Ён усё пасміхаўся разгублена. Сам не ведаў, як трэба паводзіцца ў такіх выпадках.

— Чаму растанемся? Мы ж ведаем адрасы... Ведаем, дзе адзін аднаго шукаць...

— Ты і праўда вырашыў вяртацца? Можа, пажывеш тут хоць тыдзень, ці два? — без аніякай надзеі спытала яна.

— Паеду, — сказаў ён. — Не адпускае...

Віка зразумела, што гэта «афганец», авальны партрэт хлопца на помніку не адпускае Крушынскага.

— Пачакаем! — бадзёра сказаў ён. — Можа, і адпусціць... Калі-небудзь... Ну, ну, Віка! Не ўздумай плакаць!

— Хай хутчэй адпускае, — прамармытала яна, выціраючы вочы. — Якраз і я падрасту... І калі адпусціць — прыходзь! У любы час дня і ночы... Я буду думаць пра цябе. І чакаць...

Раптам Крушынскі ўспомніў штосьці і хутка засунуў руку ў кішэнь.

— Ледзь не забыў. Табе, на памяць, — паклаў на стол маленькі, малахітавага колеру футарал і выйшаў, не развітваючыся, ляпнуўшы за сабою дзвярыма.

У футарале ляжала чорная гарошына. Густа-цяжка-ртутная, як кропля акамянелай нафты. Апраўленая ў тонкія карункі срэбра — і на срэбным танюсенькім ланцужку. Гэта была чорная жамчужына, самая рэдкая ў свеце, якую здабываюць толькі ў адным месцы ў Паўднёвай Афрыцы...

Блакітны «Мэрсэдэс» з шыкам даставіў Крушынскага да вакзала. Яшчэ праз гадзіну цягнік «Гомель — Гродна» адправіўся ў сухапутнае падарожжа па Беларусі. Крушынскі сядзеў адзін у чатырохмесным купэ.

«Ча-каць! Ча-каць! Ча-каць!» — старанна, упарта выстуквалі колы.

...Тое ж самае застаецца і нам з вамі, шаноўныя чытачы.

Чакаць. Чакаць!

І верыць, што і ў герояў аповесці, і ў нас з вамі ўсё будзе добра. Усе іхнія і нашыя мары рана ці позна абавязкова спраўдзяцца. Дзе-небудзь, калі-небудзь...

*Мінск, 2001г.*

# *Апавяданні*

## ЦУГЦВАНГ*

Грамадзянін следчы!

На ўчарашнім допыце Вы зачыталі мне новую заяву грамадзяніна Віталя Крывіцкага, які праходзіць па маёй справе як пацярпелы. Такім чынам да абвінавачвання мяне ў "нанясенні лёгкіх цялесных пашкоджанняў" дадаецца яшчэ адно: грамадзянін Крывіцкі абвінавачвае мяне ў "наўмысных дзеяннях", што нібыта прывялі да смерці яго дзядзьку, "пенсіянера Крывіцкага Івана Адамавіча, з мэтай завалодання маёмасцю нябожчыка".

Вы, грамадзянін следчы, прапанавалі мне яшчэ раз усё падрабязна ўспомніць і запісаць. "Толькі праўду", — сказалі Вы. Нібыта мне застаецца штосьці іншае! Яшчэ Вы сказалі, каб я пастараўся не забыцца нават драбязы, бо на судзе кожнае нязначнае, здавалася б, слова можа быць павернута як за, так і супраць мяне.

Грамадзянін следчы!

Я даўно здагадваўся, што справа не скончыцца адно канстатацыяй факту "нанясення лёгкіх цялесных пашкоджанняў" Крывіцкаму, здагадваўся, што рана ці позна гэтую гісторыю давядзецца адкруціць назад. Таму я быў падрыхтаваны. Але прашу ўлічыць, што пасля ўчарашняй гнюснай заявы Крывіцкага я не магу прыйсці ў сябе, мае паказанні могуць атрымацца задужа шматслоўнымі, я магу заблытацца ў адступленнях і прапусціць штосьці важнае.

Акрамя таго я ўпэўнены, грамадзянін следчы, — гісторыя падасца Вам неверагоднаю.

---

* У шахматнай гульні — становішча, пры якім супернік вымушаны рабіць нявыгадны для сябе ход.

Аднак я буду пераказваць яе як ёсць; ні выдумляць, ні апраўдваць сябе, ні чарніць кагосьці цяпер мне не мае сэнсу.

Таксама лічу сваім абавязкам паведаміць: у камеры, дзе я нядаўна знаходзіўся і адкуль мяне перавялі ў сувязі з новым абвінавачваннем, пра Вас, грамадзянін следчы, так добра адзываліся, лічылі Вас чалавекам справядлівым. І мне чамусьці здаецца, што Вы мне паверыце.

II

Пачалося ўсё, грамадзянін следчы, з піва і... шахматаў. Аднак па парадку.

20 верасня 199* года, г.зн. амаль шэсць месяцаў назад, прыкладна каля 16 гадзін я выйшаў з Дома быту, што на Маскоўскай, і на прыступках станцыі метро "Інстытут культуры" выпадкова сустрэў свайго даўняга знаёмага, пазней пацярпелага, Крывіцкага Віталя. (У Доме быпу я забіраў адрамантаваны парасон).

З Крывіцкім мы некалі разам вучыліся ў адной групе ва ўніверсітэце. Ніякага сяброўства паміж намі не было і не магло быць — я заўсёды лічыў, што гэты хлопец крыху недапечаны. З другога курса яго выгналі за поўную непрыгоднасць да вучобы (як ён увогуле патрапіў ва універсітэт і пратрымаўся цэлы год — так і засталося для ўсіх загадкаю). Разоў колькі ён яшчэ заходзіў у інтэрнат, пасля недзе знік і мы не бачыліся гадоў дзесяць. Пра яго я чуў рознае: ці то выгадна ажаніўся з мінчанкаю, ці то з'ехаў у вёску, ці сядзіць у турме, ці то страшэнна разбагацеў і цяпер за мяжою... Усё выглядала праўдападобным і дапасоўвалася такога кручанага чалавека, як Крывіцкі.

Тады, каля метро, я зусім не пазнаў бы яго, каб ён не абазваўся першы. Я нават забыў, як яго завуць, і спярша, звяртаючыся да яго, знарок няўцямна

мямліў штосьці сярэдняе паміж Уладзімірам і Уладзіславам.

Мы перакінуліся параю звычайных у такіх выпадках слоў: што ды як? Крывіцкага, помню, уразіла і чамусьці насмяшыла, калі я не без гонару сказаў, што вось зноў вучуся — на платных курсах па маркетынгу і менеджменту.

— Лухта! — гучна заявіў Крывіцкі (ён і раней не ўмеў гаварыць спакойна). — Грошы выкінеш — а толку? Вось скажы — што толку? Ведаеш, колькі цяпер такіх "менеджменаў", як ты?

Я не ведаў. Я бачыў толькі, што гэтыя дзесяць гадоў даволі моцна змянілі майго колішняга аднакурсніка знешне, але ніяк не духоўна. Ён застаўся такім жа пустым, нецікавым гарлапанам, як і быў.

— Ну, а ты?

— А што я? — крычаў мне, як глухому, Крывіцкі і шморгаў мяне за рукаво курткі — яшчэ адна яго даўняя невыносная звычка. — Купі-прадай, жыві не хачу! Вольны казак! Пазаўчора з Германіі вярнуўся, хацелі машыну прыгнаць, ды паліцыя тармазнула, ледзь адмазаліся!.. Паліцаі, разумееш? У нас міліцыя, а там — паліцыя. А то ў Бельгіі яшчэ быў выпадак, таксама з паліцыяй звязаны...

Я яшчэ раз агледзеў яго. Што й казаць — важны еўрапеец: схуднелы няголены твар, выпетраныя вусны, доўгія, да плеч, валасы, паношаная скураная куртка, джынсы, красоўкі — усё паношанае, але, праўда, чыстае.

Трэба было развітвацца, вядома, і хутчэй уцякаць ад яго. Тым больш мяне яшчэ чакалі сто спраў. Але я чамусьці не развітваўся і не ўцякаў.

Упэўнены, што кожны, у тым ліку і Вы, грамадзянін следчы, хоць раз у жыцці траплялі ў падобную сітуацыю. Бывае, увесь дзень распісаны проста па хвілінах, усюды рвешся паспець, з тым

пабачыцца, таму патэлефанаваць... І раптам сустракаеш якогась няважнага, непатрэбнага табе чалавека, з якога — цвёрда ведаеш — ні цяпер, ні пазней табе не выйдзе аніякае карысці. Але вось жа, як чорт пад руку штурхае, плюеш на ўсе планы і гробіш з ім такія каштоўныя, незваротныя хвіліны, гадзіны, а то і дні.

Ды і словы яго, прызнаюся шчыра, — "лухта твая вучоба", "што толку?" — звычайныя банальныя словы, якія мог бы сказаць любы з гэтага натоўпу, што віраваў вакол нас, — прыйшліся неяк акурат да часу, запалі ні з таго ні з сяго ў душу... А сапраўды, навошта ўсё?.. Куды я бягу, куды лячу?.. Жыццё кароткае — імгненне, не болей... Мне хутка трыццаць, а што я маю, хоць вечна некуды імчуся? Сям'і няма, кватэры няма, грошы, якія цягну з бацькоў ці падзарабляю абы-дзе, ляцяць направа і налева... Ці акупіцца калі-небудзь усё гэта? Аніякай гарантыі...

Словам, мною раптам апанавала тая самая славутая "славянская філасофія" — абстрактная, бясплодная, пазбаўленая практыцызму, філасофія, якая еўрапейцу ці якому-небудзь амерыканцу, мабыць, і ў сне не сніцца.

— Замялі нас, значыць, у Бельгіі,— крычаў Крывіцкі, — пасадзілі, само сабою, у каталажку...

— Не крычы так, калі ласка.

— А, прабач! — сумеўся ён. — Слухай, — вінавата паляпаў па кішэнях, — у цябе не знойдзецца пару тысёнцаў на метро?

"Вось табе і Бельгія, вось табе і Германія, — падумаў, помню, я. — Так і ведаў, што скончыцца ўсё просьбаю на талончык ці жэтон".

— Я аддам, даю слова! Зматаюся ў Польшчу ці ў Германію, прыганю машыну...

І вось тут, грамадзянін следчы, я зрабіў яшчэ адну, ці не галоўную, памылку — я пашкадаваў

гэтага пустамелю. Я бачыў, што ён рады нашай сустрэчы, рады, што я даю яму ўвагу; я адчуваў, здагадваўся, што ехаць яму ў прынцыпе няма куды, што нідзе яго асабліва не чакаюць.

— Можа, па піву? — першы прапанаваў я, прыкідваючы, колькі грошай са мною і якую частку з іх можна патраціць.

Ён толькі моўчкі, як аддаиы сабака на гаспадара, зірнуў на мяне.

Мы адышліся да піўнога кіёска, што на рагу Маскоўскай, узялі па куфлі піва, прыселі за незаняты столік.

— Дык чаму табе смешна, што я вучуся? — усё ж карцела мне даведацца. — Цяпер многія пайшлі перавучвацца.

Крывіцкі адвёў руку з куфлем і здзьмухнуў на газон густую пену:

— Век жыві, век вучыся — усё адно дурным памрэш. Так завяшчаў вялікі Ленін, так вучыць камуністычная партыя, — дадаў ён і засмяяўся, запрашаючы смяяцца і мяне, нібы выдаў не чарговую банальшчыну, а расказаў дасціпны анекдот.

Я спытаў, ці ёсць хоць нейкая доля праўды ў тых чутках, што пра яго хадзілі? У сэнсе турмы, жаніцьбы з мінчанкаю і таму падобнае.

Крывіцкі яшчэ больш ажывіўся:

— Чаму чуткі? — і распавёў, як пра нешта зусім будзённае, некалькі эпізодаў сваёй бурнай біяграфіі.

Так, быў жанаты з мінчанкаю, нават і цяпер, пасля разводу, яшчэ жывуць разам на кватэры ў яе бацькоў; паспытаў і турмы, адсядзеў колькі месяцаў — "па дурасці, за аліменты!"; сапраўды, збіраўся быў назаўсёды з'ехаць у вёску, але замест гэтага падаўся за мяжу — "праз Польшчу ў турнэ па Еўропах, аўтастопам, ды паліцаі каля Страсбурга

тармазнулі!.."

Ён забыўся, што я прасіў гаварыць цішэй, і зноў амаль крычаў і размахваў рукамі. З-за суседніх столікаў на нас азіраліся.

А я слухаў і не ведаў, верыць яму ці не. Проста не ўкладвалася ў галаве, як чалавек майго веку пасля стольkіх прыгодаў умудрыўся так і не набыць сталасці, сур'ёзнасці, урэшце элементарнага розуму...

Мы паўтарылі "па піву", потым я (не ведаю, чаму) купіў па "сотцы" гарэлкі і адзін на двух "бутэрброд" — лустачку хлеба з іржавымі скурчанымі долькамі селядца зверху. Крывіцкі дастаў з кішэні ножык, разрэзаў "бутэрброд" напал, акуратна выцер лязо сурвэткаю.

"Вось табе і ўсё турнэ па Еўропах", — ізноў падумаў я, назіраючы за ім. Але падумаў лена, без аніякіх эмоцый.

Я ўжо зміры ўся, што на гэтым не скончыцца, што наперадзе яшчэ цэлы вечар, — адзін з тых "вясёлых", а на самой справе бесталковых, ні на што растрачаных вечароў, згадка пра якія дзён колькі мучыць і не дае спакою, раздражняе, як боль фізічнай траўмы, а потым усё наглуха забываецца, насуха выціраецца з памяці.

— О, ідэя! — прачытаў мае думкі Крывіцкі. — Даўно я не быў у Адамавіча свайго — пайшлі? Купім пляшку, у Адамавіча можа закусіць знойдзецца...

Я зразумеў, што да ўсяго Крывіцкі яшчэ проста галодны.

— Што за Адамавіч? — спытаў я.

— Як лепш растлумачыць... Ну, Адамавіч, во такі дзед, я вас пазнаёмлю. Комік першай гільдыі!

— Хто ён табе?

— Адамавіч? Вось дапусцім, у цябе бацька, так? Брат бацькі твайго бацькі, ці як гэта... Дзед, словам. А можа, дзядзька, не ведаю. Дык пайшлі, тут побач, на Фабрыцыуса!

Вось так, грамадзянін следчы, дзякуючы чалавеку, якому я пазней нанясу "лёгкія цялесныя пашкоджанні", я патрапіў да чалавека, у смерці якога мяне абвінавачваюць.

III

У гастраноме на Маскоўскай мы купілі пляшку "Імперыялу" (нуль сем) і дварамі папраставалі на Фабрыцыуса.

Дарогаю Крывіцкі расказаў, што гэтаму Адамавічу даўно за семдзесят, жыве адзін і нават не быў ніколі жанаты, "што ён зубны стаматолаг" і вельмі багаты.

— Адамавіч — апошняя мая надзея, — сказаў раптам Крушынскі.

— У сэнсе?

— У прамым сэнсе — хата. Мяне цесць даўно б вытурыў, каб не ведаў пра Адамавіча. Вось так і жывём, чакаем, пакуль дуба ўрэжа мой стары, Адамавіч, значыць... — Крывіцкі ўздыхнуў, але адразу ж ізноў развесяліўся: — А камічны дзед, Адамавіч мой! Сам пабачыш!

— Пачакай, ты ўпэўнены, што ён табе кватэру адпіша?

—А каму яшчэ? Я самы блізкі яму, Адамавічу... Во сюды! Мы зайшлі ў пад'езд і па шырокай, як ва ўсіх старых "сталінскіх" дамах, аблупленай лесвіцы падняліся на трэці паверх. Крывіцкі націснуў кнопку званка і не адпускаў да таго часу, пакуль не шчоўкнуў замок. Дзверы прачыніліся чуць, на адну шчылінку. Старэчы голас прашамкаў:

— Хто гэта?

— Свае!

— Свае ўсе дома.

— Адчыняй, Адамавіч! Ты ж бачыш нас! — крычаў Крывіцкі.

— Што табе трэба?

— Праведаць прыйшоў!

— Я здаровы.

— Адамавіч, харэ ламацца! Адчыняй!

— Скажы, нашто я табе?

Так працягвалася даволі доўга. Мне пачало гэта надакучаць. Разоў колькі я парываўся сысці, але Крывіцкі хапаў мяне за куртку, падміргваў, даючы зразумець, што ўсё скончыцца добра. Нарэшце ён выклаў галоўны козыр:

— Мы не з пустымі рукамі!

— Так бы адразу і казаў, — і дзверы, як ні дзіўна, расчыніліся.

Дзядок саступіў, прапускаючы нас. Мы ўвайшлі ў цесную брудную пярэднюю аднапакаёўкі. Пад вешалкаю, на якой віселі злінялы драпавы палітон і балоневы плашч, стаялі валёнкі і гумавыя боты.

Сам дзядок быў невысокі, худзенькі, у нейкім бабскім кабаце, абвязаны ў паясніцы тоўстай ваўнянай хусткаю, у трыко і ў стаптаных пантофлях на босу ногу — нічога ў яго абліччы не было помнага, нічога выразнага, звычайны стары пень (прашу прабачэння, грамадзянін следчы).

— Што вы мне прынеслі? — замест прывітання спытаў дзядок, блізарука прыглядаючыся да пляшкі, якую выцягнуў з унутранай кішэні курткі Крывіцкі.

— "Імперыял".

— Добра! Не люблю гарэлкі. А закусіць?

— Дзед, ты многа хочаш, мала палучыш. Куды йсці, на кухню?

— Ідзі на кухню. Не трэба разувацца! — прыкрыкнуў на мяне, убачыўшы, што я нагнуўся і расшнуроўваю чаравікі.

Маленькая, стандартная — пяць ці шэсць "квадратаў" — кухня сустрэла нас вострым непрыемным пахам, што йшоў ад нявынесенага вядра са смеццем. Тут панавала такое ж запусценне,

такі ж бязлад, як і ў пярэдняй. Брудны лінолеум у сінія і белыя клеткі, у кутку — нізенькі, пузаты, пажаўцелы ад часу халадзільнік, на якім — кіпа газет, такіх жа пажоўклых. У кутку пад батарэяй сушацца на падасланай газеце старыя чаравікі, у кутку каля дзвярэй — стол без абруса, на стале пуста. Сцены з аблупленай фарбаю таксама пустыя, голыя — няма ні звыклых кухонных скрынак, ні палічак, адно над ракавінаю прымацавана звычайная танная сушка, у якой сіратліва тырчаць рэбрамі некалькі талерак і місак, а пад ракавінаю — стаіць тое самае вядро, ад якога ідзе непрыемны пах, з верхам поўнае смецця.

Але самае дзіўнае, што адразу кінулася ў вочы і ўразіла, бо зусім не пасавала да ўсяго гэтага запусцення, нават убоства, — гэта новенькія, пакрытыя бліскучым лакам шахматы. Так, акурат пасярэдзіне кухні стаяла табурэтка, на якой — дошка з расстаўленымі шахматамі.

— Ну ты ўжо зусім!.. — Крывіцкі паморшчыўся і пацёр нос. — Хоць бы фортку расчыніў, ці што... Цябе ж вытураць адсюль за антысанітарыю.

Адамавіч асцярожна адставіў табурэтку з шахматамі да батарэі:

— Чорта з два, — сказаў чамусьці мне, а не Крывіцкаму. — Кватэра прыватызаваная. Мая. Што хачу, тое раблю. Не чапай! — прыкрыкнуў, калі Крывіцкі ўзяўся адчыняць фортку. — Скразняк будзе, а ў мяне спіна баліць, ты ж бачыш — хусткаю абвязаны!

— Ды я трохі, хоць на шчылінку. — Вынесі лепш вядро, калі так табе пахне!

Крывіцкі зрабіў выгляд, што не чуе; ён неўпрыкмет падміргнуў мне.

— Спіна, кажаш, баліць? — перапытаў з прытворным жалем. — Дык, можа, скора таго, а, Адамавіч? Можа, хаваць скора давядзецца?

— Не дачакаешся!

Адамавіч зазірнуў у халадзільнік, дзверцы якога расчыніліся з іржавым рыпам, дастаў адтуль пустую гранёную шклянку. Хукнуў у яе, выцер усярэдзіне ражком хусткі, паставіў на стол. Уздыхнуў:

— За закуску выбачайце, госці дарагія. Самі бачыце, як жыву. І ў магазін цяжка выбрацца, ды й купляць няма за што...

— Ну і жмот! Дай хоць якую цыбуліну з хлебам! Я стаяў каля дзвярэй (табурэтка з шахматамі была адзінай на кухні) і адчуваў тое ж, што, відаць, і любы б чалавек на маім месцы. Куды я патрапіў? Навошта я тут? Нашто патраціў грошы — каля дзесяці даляраў, а яшчэ ж, як кажуць, "не вечар"?..

Пасля нядоўгага аднеквання і ламаніны Адамавіч, крэкчучы, палез пад стол, пашамацеў у адной з картонных скрыначак, што там стаялі, выцягнуў тры невялікія цыбуліны. Абцерабіў у пальцах шалупінне:

— Хлеб сам вазьмі, у халадзільніку, — загадаў Крывіцкаму. А мне патлумачыў: — Усё адно туды няма чаго класці, дык я яго і не ўключаю. Чаго дарма электрычнасць пераводзіць? Так і служыць, усё адно як шафа.

— Вось жмот, — Крывіцкі адчыніў халадзільнік. — Сапраўды, пуста! Хочаш паглядзець? Я адмовіўся. Крывіцкі паклаў побач з цыбулінамі кавалак чарствога батона.

— Ну ты ўжо зусім здзяцінеў, Адамавіч! Хіба ж так можна? Памрэш — хто цябе хаваць прыйдзе? Я не пайду!

— Без цябе пахаваюць, не бойся.

— Можа, сапраўды няма ў чалавека? — умяшаўся, каб не стаяць маўчком, я.

— У яго ды няма! Такія жмоты ведаеш якія багатыя? Адамавіч, скажы яму, колькі ў цябе грошай!

— От пустазвон...

— Ты ж паў-Мінска мог бы скупіць — што, не

так? — От шалапут, — ківаў галавою Адамавіч. Крывіцкі наліў яму першаму, і Адамавіч выпіў прагна, нагбом — як сасмяглы чалавек, што дарваўся да шклянкі калодзежнай чыстай вады. Калі я выпіў і пачаў хрумстаць цыбулінай, дзед раптам заўважыў:

— Зуб ніжні трэба лячыць, малады чалавек. Не запускайце. — Як вы ўбачылі? — здзівіўся я, кратаючы языком рэшткі пломбы, якая сапраўды выкрышылася дзён колькі назад. — Ён ды не ўбачыць! Усё жыццё зубы ставіў — адкуль жа і грошы ў яго.

— Тады б вы сабе паставілі, — сказаў я, убачыўшы, як Адамавіч жуе мякіш. Яўна ў яго ў самога з зубамі было не ўсё ў парадку.

— Ён ды паставіць. Золата шкада!

— Пустазвон, — ані не крыўдзіўся дзед.

Доўга не чакаючы, паўтарылі. Крывіцкі развесяліўся:

— Ну што, дзед, выпіў? А цяпер — дыскатэка! Я падышоў да табурэткі з шахматамі. Адамавіч ні з таго ні з сяго аж затросся.

— Мо гуляеце? — з надзеяй запытаў ён.

— Так.. гуляў калісь, — я не стаў хваліцца, вядома, што быў чэмпіёнам раёна сярод школьнікаў.

— Не сядай з ім, ён пamешаны на шахматах! І сапраўды, Адамавіч ажывіўся так, што вочы засвяціліся нейкім дзіўным, нават фанатычным бляскам. Раптам кінуўся ў пакой, з'явіўся з двума табурэтамі ў руках:

— Сядай, — да мяне. — А ты, — Крывіцкаму, тыцкаючы яму штосьці ў руку, — збегай пакуль, купі, ну, сам ведаеш.

— Даўно б так! — Крывіцкі, задаволены, сышоў.

Разыгралі: Адамавічу выпалі белыя. Ён доўга нацэльваў старэчыя дрыготкія пальцы, складзеныя ў жменьку, на цэнтральную пешку, затым хуценька

адымаў руку, нават хаваў за спіну. Урэшце прасунуў пешку на e4, і пасля майго ходу, ужо не думаючы, другую пешку на f4 — каралеўскі гамбіт, даволі хітры, але састарэлы пачатак... (Калі вы не ведаеце, грамадзянін следчы, каралеўскі гамбіт — гэта каскад прыгожых ахвяраў у белых, трох пешак і каня, каб вызваліць "калідор" па лініі f і пасля ракіроўкі атрымаць моцную атаку; зрэшты, магчыма, гэта не галоўнае ў маіх тлумачэннях.)

Некалі я і сам любіў карыстацца гэтым пачаткам, але цяпер усё забылася; адразу патрапіў у "пастку", нарабіў памылак — не памог і лішні конь, і лішнія пешкі. Я пачаў задумвацца над хадамі куды даўжэй за Адамавіча, якога спачатку не прыняў усур'ёз як шахматыста.

Да таго ж Крывіцкі вярнуўся, пачаў шумець, перашкаджаць, падносіў нам "імперыял", тоўкся за маёй спіною і падказваў адно і тое ж:

— Канём хадзі, канём! — такі ў яго быў жарт. Словам, я прайграў. Здаўся недзе на пятнаццатым ходзе.

— Тэорыю трэба вучыць, малады чалавек, — Адамавіч, не проста задаволены, а шчаслівы, паціраў сухія рукі.

— На высадку! — гарлапаніў Крывіцкі. — Зараз вып'ем, тады я сяду!

Ён закасаў рукаво ў кашулі, напінаў біцэпс і ўсё чапляўся да Адамавіча:

— Выходзь, стары, на арэну!

З першага ходу стала ясна, які ён гулец. Як і ва ўсіх недалёкіх, тупаватых людзей мышленне ў яго было, калі можна так сказаць, шашачнае, не здольнае да абстрактнага камбінавання. Стаіць фігура пад боем — значыць, трэба браць.

— А если он меня прикончит матом, то я его через бедро с захватом, или ход конем по голове! — крычаў ён, хапаў з дошкі каня і жартаўліва

замахваўся на дзеда, які, праўда, аніяк на гэта не рэагаваў.

Крывіцкі прапусціў "дзіцячы" мат у тры хады, мы памяняліся. На гэты раз я добра вымучыў дзеда, тым больш, што Крывіцкаму надакучыла, ён курыў у фортку і не перашкаджаў нам, — і ўсё ж Адамавічу ўдалося-такі правесці ў ферзі адну-адзіную лішнюю пешку.

Я, грамадзянін следчы, рэдка бачыў у сваім жыцці такіх шчаслівых людзей, як Адамавіч у той вечар, калі двойчы выйграў у мяне. Я ведаў самых розных шахматных "фанатаў", яшчэ ў дзяцінстве любіў па выхадных хадзіць у парк, дзе гулялі ў шахматы на грошы і дзе гэтая бяскрыўдная гульня часам нагадвала "баі без правілаў" — у прамым сэнсе многія партыі заканчваліся фізічнымі бойкамі. Але Адамавіч, чалавек, які, можна сказаць, стаіць адной нагою ў магіле, радаваўся так, нібы выйграў па меншай меры мільён даляраў. Ён прытанцоўваў (я не жартую) на месцы. Ён смяяўся, паціраў рукі і ўсё паўтараў:

— Тэорыя, малады чалавек, тэорыя!

IV

Калі мы выйшлі на двор, было зусім цёмна. Крывіцкага развезла — не так, мабыць, ад выпітага, колькі ад свежага восеньскага паветра пасля смуроднай кухні. Да таго ж ён курыў, не перастаючы. Мы прыселі на лавачку каля пад'езда.

— Чаму ты ўвесь час пра нейкае золата, пра нейкія грошы нёс? — спытаў я.

— Што значыць "нёс"? — пакрыўджаны маім недаверам, Крывіцкі нават працверазеў. — Паслухай, хлопец, — ты ведаеш, што такое зубны тэхнік? Ды яшчэ прыватны? Ты ведаеш, што такое паставіць зубы без чаргі? Ведаеш, якія колісь грошы за гэта выкладвалі?

— Ну, здагадваюся.

— Нават і не здагадваешся! А ці ведаеш ты, колькі золата ідзе на каронку ці на зуб, дапусцім, з залатога персценя? Думаеш, усё да грама? Памыляешся! На кожным зубе, на кожнай каронцы абавязкова штосьці эканоміцца. А ўжо выплавіць гэтыя лішкі ў злітак і дзіця малое зможа.

А сапраўды, падумаў я. Мне прыгадалася раптам гісторыя, даўным-даўно вычытаная ў нейкай кніжцы. Справа ў тым, што золата вельмі мяккі метал — вага, напрыклад, манеты змяншаецца нават пасля таго, як яе патрымаеш у пальцах. Гэтым і карыстаўся адзін кемлівы банкаўскі служачы. Кожную суботу, калі ў банку пералічвалі залатыя манеты, ён прыносіў з дому новенькі дыванок, якім засцілаў стол, у канцы работы акуратна яго скручваў у трубачку, дома спальваў на спецыяльнай патэльні і кожны раз атрымліваў злітачак чыстага золата.

— І дзе ён можа хаваць тыя злiткі? — ляпнуў раптам я нечакана для сябе самога.

Крывіцкі паблажліва засмяяўся:

— Ты, я гляджу, як той Адамавіч — многа хочаш! Дзе хавае... Спытай што-небудзь лягчэйшае.

— Ды ці ёсць яны ўвогуле?

Крывіцкі прамоўчаў, нібы набіваючы сабе цану. Падняўся з лаўкі:

— Пайшлі памалу, мне дабірацца далёка, у Курасоўшчыну...

— Я вазьму табе таксоўку, — прапанаваў я, зразумеўшы, да чаго ён хіліць.

— Праўда? Ты— сапраўдны сябар! А піва яшчэ купіш?

— Куплю.

Мы пайшлі да Маскоўскай, Крывіцкі хістаўся, і я вёў яго пад руку.

Кіёск з разліўным півам быў даўно зачынены. Я купіў бутэлечнага, здаецца, нават імпартовага.

— Ты ж ведаеш, я сядзеў, — глынуўшы піва, гучна адрыгваючы, расказваў Крывіцкі, — за аліменты. Амаль паўгода. Выйшаў адтуль — ну, думаю, гады, я вам устрою! Пра жонку з цесцем. Жонкі, праўда, дома не аказалася, яе шчасце, а цесця змалаціў на горкі яблык. Адвёў душу. Добра, што ён паддаты быў тады, адразу пабоі не здагадаўся зняць. Але ўсё адно — праз дзень піша на мяне заяву, я, вядома, ні сном ні духам, мала ты дзе, цесць, валэндаешся, ды і паддавала ты добры, можа, упаў дзе-небудзь п'яны і ўсе праблемы... Словам, выкручваюся, як магу. Аднак выклікаюць да следчага, той спачатку для прафілактыкі ўрэзаў па нырках пару разоў... Я адпіраюся. Тады ён моўчкі штосьці піша на аркушыку і падсоўвае мне пад нос. Уверсе стаіць лічба тры, а ўнізе — сума, якую я і ў руках не трымаў![*] Значыць, выбірай: ці тры гады "страгача", ці "на лапу". Аркушык забраў і пры мне спаліў у попелцы. Паказвае на дзверы — свабодны!

—Ну і?

— Ну я ногі ў рукі — і да Адамавіча свайго... Так і так, кажу, ратуй, дзед, другі раз я адтуль жывым не выйду, ведаю гэта. Памажы, адкупі, свая ж кроў, не чужая! Дзед які ні чокнуты, а паверыў, адно сказаў: "Грошай у мяне няма, у далярах вашых я не разбіраюся. (Тады толькі пачыналася гэтая карусель з перабудоваю.) Але ў мяне, кажа, ёсць штосьці лепшае за грошы і за даляры. Схавана яно ў надзейным месцы, мне трэба час, каб дастаць. Паедзеш заўтра на вакзал, у камеры захоўвання знойдзеш такую й такую ячэйку, а вось табе лічбы, якія набярэш, — і з хітрым выглядам піша штосьці на шматку паперы — акурат як той следчы! — і падае мне. — Калі ў цябе, кажа, хапіла розуму за паўгода двойчы дапасці да турмы, дык павінна хапіць і на

[*] Не ў крыўду Вам сказана, грамадзянін следчы.

тое, каб адчыніць дзверцы ячэйкі". Я зірнуў і ледзь не абамлеў. Ды ён проста здзекуецца з мяне!

— А што там было?

— Ахінея нейкая, яж спачатку здалося, старэчы маразм! Я ўжо не помню даслоўна — нешта, "ад майго адымі сваё, дадай палавіну матчынага, падзялі на бацькавае..." А ён радуецца як дзіця: "Цяпер, кажа, я, ведаючы цябе і твой язык, калі што, заўсёды адкручуся!"

— Ты сур'ёзна?

— Кажу ж, здзяцінеў чалавек пад старасць, ты ж сам бачыў! А па-другое, падумаўшы, і сапраўды — успомні, як раней строга з золатам было, гэта цяпер поўна скупак, любую рэкламную газету разгарні — паўсюль аб'явы; а тады, напрыклад, тармазнулі б мяне каля камеры, застукалі б з золатам, хто б усур'ёз успрыняў тую запісачку і на Адамавіча падумаў? Дарэчы, і "шыфр" яго аказаўся наіўным, як і сам Адамавіч: трэба было ўзяць гады нараджэння, ад Адамавічавага адняць мой і таму падобнае. Выходзіла акурат чатыры лічбы, а літару я проста падабраў механічна. Адкрыў дзверцы і знайшоў там пакуначак, у якім ляжаў вось такі...

Крывіцкі правёў пальцам па рыльцы бутэлькі:

— Вось такі злітак. Я бягом на Батанічную, ад радасці і здуру цыганам амаль за паўцаны аддаў. Але следчаму акурат хапіла, адкупіўся, справу закрылі. Затое Адамавіч, як пачуў, колькі я за яго метал узяў, — мо з паўгода на мяне нават пазіраць не хацеў, такі злы быў. І цяпер я добра ведаю — хоць разапнуся перад ім, хоць на каленях буду поўзаць і ногі цалаваць — не дасць ні капейкі! Крывіцкі ўздыхнуў. — Адна надзея — хату адпіша...

V

Раптам я заўважыў, што акрамя недапітай бутэлькі з півам пры мне больш нічога няма. А

парасон дзе? (Памятаеце, грамадзянін следчы, я забіраў парасон з рамонту?) Застаўся ў Адамавіча. Было яшчэ не так і позна, можна было спакойна вярнуцца і забраць. Але я нічога не сказаў Крывіцкаму. Пасадзіў яго ў машыну, напярод расплаціўся з таксістам, а сам на метро паехаў у сваё Уручча, дзе здымаў пакой.

Працверазеў і абдумаўся я яшчэ па дарозе. Дурань, каго я слухаю, каму веру! Мне трыццаць гадоў, а я слухаю нейкую ахінею пра нейкія "зліткі золата", "шыфроўкі", "камеры захоўвання"!.. Як не сорамна?!

Гаспадыня яшчэ не спала, піла гарбату на кухні. Я ціхенька праслізнуў у свой пакой, не стаў ні есці, ні піць. Лёг спаць, а сон не йшоў. Перад вачыма стаялі то шахматныя фігуры, то зубны тэхнік Адамавіч, у якога ў самога кепскія зубы, то пастарэлы твар Крывіцкага, то парасон, які вісіць зараз недзе там, у пярэдняй, на вешалцы...

Потым я задрамаў, але сярэдначы прачнуўся, бы ад штуршка, ужо зусім цвярозы, і раптам іншыя думкі заснавалі ў галаве. Я зразумеў, што гісторыя гэтая не скора забудзецца, бо наколькі яна здаецца на першы погляд неверагоднаю, настолькі ж яна і заманлівая. Адзінокі, хворы, стары чалавек, які ў любы час можа, як выказаўся Крывіцкі, "дуба ўрэзаць"... Няўжо, калі ў яго сапраўды ёсць багацце, ён не зразумее, што ўсяго ў магілу не забярэш?.. Няўжо ён не разумее, што яго Крывіцкі — не той чалавек, каму можна даверыць нават маленькую суму?..

Хто з нас, грамадзянін следчы, хоць раз у жыцці не любіў марыць? У кім з нас яшчэ з дзяцінства не жыве вера ў цуд? Выйсці, скажам, на вуліцу і раптам знайсці кашалёк, набіты грашыма... Або цэлы чамадан... А зрэшты, які ў гэтым цуд? Хіба не бывае такога? Вунь сусед нядаўна расказваў:

выходзіць ён рана-раненька, гадзін у пяць, на вуліцу — у яго праца такая, што трэба рана выходзіць, — і бачыць на прыпынку, пад ліхтаром, ляжачага чалавека з раскінутымі рукамі, побач — шапка і "дыпламат". І вакол ні душы. "Мне б, дурню цара нябеснага, — расказваў сусед, — схапіць "дыпламат" ды ногі хутчэй адтуль! Але хто мог ведаць, што там?! Ды і боязна. Вярнуўся дамоў, патэлефанаваў у міліцыю, у "хуткую", пакуль выйшаў зноў да прыпынку, яны ўжо там. Мужчына жывы, толькі п'яны і пабіты моцна. Занеслі яго ў "хуткую", а мне міліцыянеры выпісваюць даведку, каб на рабоце апраўдацца, і просяць быць панятым. Залазім у машыну, адчыняюць яны "дыпламат", і ў мяне, — расказвае сусед, — ды, думаю, і ва ўсіх, хто там быў, літаральна сінее ў вачах: "дыпламат" увесь, з верхам набіты пачкамі новенькіх фунтаў стэрлінгаў!"

Вось вам і "цуд". І праўда, як казаў герой вядомага рамана: раз сярод людзей пакуль яшчэ ходзяць грошы, значыць, павінны быць і асобы, у якіх гэтых грошай вельмі і вельмі многа. І наш Мінск не выключэнне. Паслухаеш, пачытаеш газеты, пагаядзіш тэлевізію — усе такія бедныя, такія жабракі, што толькі міласціну прасіць; але ж нехта ўвесь час купляе каштоўныя рэчы, адзенне, дарагія прадукты, ездзіць на красунях-іншамарках, прасаджвае ў казіно па тысячы даляраў за вечар... Я стараўся прагнаць ад сябе гэтыя думкі. Я казаў сабе:

"Калі такія дзівосы, як знаходка "дыпламата", набітага фунтамі, і здараюцца, дык не з табою!" — а іншы голас нашэптваў мне: "Ды чаму не з табою? Чым ты горшы? Паглядзі, напрыклад, не на Крывіцкага, а на іншых сваіх аднагодкаў: для многіх з'ездзіць, скажам, у Іспанію, Англію, Амерыку — тое ж самае, што для цябе ў вёску да бацькоў. І гэта не здаецца ніякім дзівам! А пачыналі яны, як і ты, на пустым месцы. Цяперашнім часам усё магчыма,

любое дзіва можа зрабіцца яваю, трэба толькі моцна хацець яго, ну, і варушыцца як-небудзь..."

Клянуся, грамадзянін следчы, мне і ў галаву не прыходзіла тады жадаць Адамавічу смерці, — ды і які сэнс у гэтым?! Што можна ўзяць ад мёртвага? Бяруць ад жывых... Проста я фантазіраваў у тую ноч, нявінна, па-дзіцячы фантазіраваў: хай бы і са мною нарэшце здарыўся цуд, і, скажам, падараваў мне той жа Адамавіч кілаграмаў так з пяць сваіх зліткаў — навошта яны яму? А ў мяне — першапачатковы капіталец, кватэру змог бы купіць, адзецца па-людску, дзяўчыну ў дарагі рэстаран звадзіць... Ды, Божа мой, што значыць, калі не трэба лічыць праклятыя рублі, калі ў кішэнях шастае "зеляніна" даляраў, — элементарна адчуваеш сябе Чалавекам!..

Заняткі ў нас у другую змену; да абеду не было куды сябе дзець, я сабраў канспекты і паехаў у бібліятэку. Але заказаў, сам не ведаю чаму, не падручнікі, а зборнік... "Шахматныя мініяцюры". Гартаў яго, аднаўляючы ў памяці мудрагельствы такой любімай некалі гульні, адразу ўбачыў і зразумеў сваю ўчарашнюю памылку ў "каралеўскім гамбіце"... Але ўвесь час не пакідала адчуванне, што ёсць у мяне наперадзе нешта радаснае, прыемнае, — і ўспаміналася: "Парасон!"

Гэта можна параўнаць, грамадзянін следчы, з тым, як некалі была ў мяне каханая дзяўчына, прыходзіла да мяне, а потым забывала штосьці — шарф, кнігу, пальчаткі; я ведаў, што гэта знарок, каб прыйсці яшчэ раз, і, ведаючы гэта, на душы рабілася прыемна і радасна...

## VI

Без пятнаццаці чатыры я падыходзіў да дома на Фабрыцыуса. Знаёмая лесвіца, учарашнія знаёмыя смуродныя пахі... Я націснуў кнопку званка і падрыхтаваўся да такой жа доўгай "дуэлі" на словах,

якую вялі ўчора Адамавіч з Крывіцкім.

Але дзверы расчыніліся адразу. Адамавіч, у той жа апратцы, што і ўчора, з абвязанай хусткаю паясніцаю, хутка і ахвотна, нібы мы дамаўляліся пра сустрэчу, упусціў мяне:

— Праходзь.

Я патаптаўся ў пярэдняй, не ведаючы, што рабіць далей, што казаць. А Адамавіч моўчкі, пільна аглядаў мяне з галавы да ног. Каб не напалохаць яго, я ўсміхнуўся і як мага мякчэйшым голасам нагадаў:

— Парасон... Я забыў учора парасон.

— Парасон? Ці яшчэ штосьці?

— Не, здаецца, усё.

— А золата? — раптам падміргнуў мне Адамавіч. — Нябось, расказаў учора той пустамеля пра золата, вось ты і прыплёўся!

— Не разумею...

— Усё ты разумееш. Расказаў, набрахаў табе, а ты і паверыў. Паверыў жа? А яшчэ дарослы чалавек — як не сорамна? Ён усяму Мінску пра мяне небыліцы бае. Але падумайце сваёй галавою — калі б у мяне было золата, ці грошы, — хіба б я так жыў, як жыву? Я не настолькі яшчэ дурны, каб мне не хацелася пагуляць хоць пры канцы жыцця, — але за што? І рад бы — ды пуста!

Пуста было і ў мяне на душы. Хоць я і разумеў, што дзед кпіць, пацяшаецца з мяне — хоць бы таму, што навошта ён вось цяпер перада мною апраўдваецца, хто я яму такі? — разам з тым я не мог не прызнаць лагічнасці яго слоў. Усё правільна, ніякага багацця няма, і ён, баючыся мяне, чужога чалавека, тлумачыць мне гэта. А калі нават дапусціць, што ёсць багацце, дык як яго ўзяць? На якіх правах? Забіць зараз дзеда і пачаць абшукваць кватэру?

Мне сорамна прызнавацца, грамадзянін следчы, але я стаяў перад Адамавічам увесь чырвоны,

як шкадлівы вучань перад настаўнікам. Калі здранцвенне прайшло, я зняў з вешалкі свой парасон, зацісную пад пахаю:

— Прабачце... Дык я пайду?

— Пачакай, давай у шахматы, раз прыйшоў Толькі разувацца не трэба, — і патупаў на кухню. — Я спяшаюся... — аднак жа нейкі чорт, што сядзеў усярэязіне, пацягнуў мяне следам. На кухні было чысцей, чым учора, праветрана, вядро з-пад смецця стаяла пустое, адно лінолеум у сіне-белыя клеткі быў такі ж брудны, мо з год нямыты. Я адразу заўважыў, што акрамя табурэта з расстаўленымі шахматамі стаяць яшчэ два — значыь, дзед сапраўды чакаў мяне. Але цяпер гэта не мела ніякага сэнсу. Я быў злы на сябе, злы за свае дурныя дзіцячыя мары, за страчаны дарма час... Адзінае, чым суцяшаўся, — значыць, праз гэта трэба было прайсці, каб супакоіцца і жыць, як і жыў раней.

— Дзе ты вучышся? — нечакана спытаў Адамавіч, робячы першы ход. — Раскажы трохі пра сябе. Бацькі ёсць?

Я неахвотна адказаў. Злосць, як ні дзіўна, памагла мне, і я выйграў тры партыі запар, чым давёў Адамавіча ледзь не да шоку.

— Тэорыя, — мармытаў ён, і калі браўся за фігуру, так сціскаў яе, што пальцы бялелі. — Што значыць тэорыя...

Потым мне надакучыла, і я даў Адамавічу выйграць тры партыі. Ізноў, як і ўчора, я са здзіўленнем назіраў метамарафозу, што адбывалася з чалавекам, якому даўно ўжо трэба думаць пра той свет. Адамавіча падмянілі. У яго разгарнуліся плечы, у яго памаладзелі, заіскрыліся шчасцем вочы; Вы не паверыце, грамадзянін следчы, ён пачаў нават напяваць казліным голасам модны апошнім часам шлягер!..

Мне было страшэнна нудна тут. Пасля шостай

партыі я падняўся і катэгарычна заявіў:

— Усё, пайду!

— А можа, яшчэ? — пачаў упрошваць Адамавіч. — На пасашок?

— Не. Я спяшаюся.

— Ну, што ж, — ён глыбока ўздыхнуў і пайшоў правесці мяне да дзярэй.

Вось тут адбылося наступнае. Зазіраючы мне ў вочы, дзед раптам гулліва ўшчыкнуў мяне за бок і прашаптаў:

— А ёсць золата! Толькі халеры знойдзеце, хоць усё тут абшукайце. Я не такі дурны, як вам з тым шалапутам здаецца, я ведаю, што вы змовіліся. Вы, цяперашнія, за капейку зарэжаце, а то за золата! — і паківаў мне пальцам.

— Як вам не сорамна... — я не дагаварыў.

Хутка сунуўшы ў бакавую кішэню кабата руку, Адамавіч, не зводзячы з мяне вачэй, працягнуў мне на далоні невялікі, памерам з палову запалкавага карабка злітак цёмна-жоўтага металу.

— І такіх многа! — прашаптаў ён, хаваючы злітак назад, не даўшы мне нават як след разглядзець яго. Я стаў агаломшаны. Вось гэта фокус!

— Дык будзеш прыходзіць у шахматы гуляць? — Адамавіч хіхікаў і пашчыкваў мяне за бок.

— Мабыць... буду, — я зглынуў сліну.

VII

З таго дня пачаліся мае пакуты, якія можна параўнаць, і то вельмі прыблізна, з нераздзеленым каханнем. Я кахаў і "хацеў" — а мяне не кахалі і "не хацелі", але і не адпускалі ад сябе, падаючы слабую надзею.

Доўжылася гэта амаль месяц. Кожны вечар я, нібы пад гіпнозам, плёўся да Адамавіча, гадзінамі сядзеў у яго на кухні за шахматамі, робячы выгляд, што абдумваю хады, што радуюся, калі выйграю і

засмучаюся, калі атрымліваю мат. Само сабою, выйграваў я рэдка, адну-дзве партыі за вечар — больш было небяспечна, каб не пакрыўдзіць, не спужнуць, не астудзіць капрызлівага дзеда...

Заняткі я, вядома, запусціў — якія заняткі, калі я магу атрымаць усё адразу, калі ў адзін момант, як у той чарадзейнай казцы, мне ў рукі можа прыпльщь тое, дзеля чаго я ў прынцыпе і вучуся, — багацце.

Я цярпеў, грамадзянін следчы, і чакаў — як хітры вопытны палюбоўнік церпіць і чакае ўзаемнасці ад халоднай непрыступнай красуні. А гэты момант усё ніяк не наставаў. Кожны вечар, часта запозна, вяртаючыся на метро дамоў, я скрыгітаў зубамі і ледзь не плакаў ад злосці. Я схуднеў, еў мала. Начамі не мог спаць. Але надыходзіла раніца, і вось я ўжо з нецярпеннем чакаю, калі ж вечар? У мяне соладка пачынае трымцець сэрца: "А раптам сёння? Чаму ён усё распытвае, з якой я сям'і? Чаму так прыглядаецца да мяне, нібы хоча сасватаць мне нявесту? Выпрабоўвае? Несумненна. Гэта Крывіцкі мог не заўважыць такога, але не я. Адамавіч сапраўды сватае мяне, каб ажаніць потым... са сваім багаццем! А пакуль прыглядаецца, што я за жаніх, ці ў добрыя рукі патрапіць яго скарб. А жаніх павінен быць ветлівы, усмешлівы, культурны, чысценькі, абавязковы. Гэта пазней, пасля вяселля, можна ссунуць на бок гальштук, можна будзе дазволіць сабе расслабіцца..."

Адамавіч між тым выпрабоўваў мяне — хоць і прымітыўна, аднастайна, але нямала нерваў каштавала выконваць ягоныя капрызы. Усе яны зводзіліся да аднаго: праверыць, ці не хачу я яго забіць.

Напрыклад, седзячы за шахматамі, ён хапаўся раптам за сэрца, пачынаў войкаць, стагнаць:

— Там... у пакоі... парашок на стале... Ох,

хутчэй!.. Я кідаўся ў пакой, дзе пахла нежылым духам, уключаў святло, хутка аббягаў вачыма небагатае ўбранства, стараючыся ўгадаць, дзе можа быць схавана золата. У гэтай старой шафе, на якой зверху пад шклом дзве палічкі з кнігамі? У гэтым стаматалагічным крэсле, што, пакрытае цыратаю, стаіць тут проста сярод пакоя чужароднай няўклюдаю? У ложку, пад ложкам? У падаконніку? У ножцы стала? Знаходзіў парашок, бег на кухню, набіраў вады ў шклянку. Адамавіч пільна сачыў за кожным маім рухам, тады браў парашок, дэманстратыўна высыпаў яго ў вядро з-пад смецця, а ваду выліваў у ракавіну:

— Адпусціла; сядай гуляць.

— Які ж вы дзівак, Адамавіч, далібог, — прыязным голасам, мякка дакараў я яго.

Гэта паўтаралася ў розных варыянтах — напрыклад: "Зрабі мне ўкол, толькі набірай лекі ў шпрц тут, на кухні!" Я бег у пакой, знаходзіў у аптэчцы аднаразавы шпрыц, лекі, на Адамавічавых вачах набіраў, выціскаў з іголкі струменчык і толькі падступаўся з уколам, як Адамавіча "адпускала". Усе гэтыя праверкі былі, паўтаруся, аднастайныя, усе мелі на мэце паказаць, што Адамавіч заўсёды напагатове і не такі прасцячок, каб не здагадацца пра нашыя з Крывіцкім планы. (Яму па-ранейшаму здавалася, што ў нас з Крывіцкім змова супраць яго.)

Праўда, быў выпадак, калі я ледзь не "засыпаўся". У адзін з вечароў мы мірна сядзелі за шахматамі. Раптам Адамавіч, як заўсёды ні з таго ні з сяго, падазрона ў мяне ўставіўся, тады збялеў і пачаў гучна стагнаць. Я памог яму дабрацца да ложка, накрыў коўдраю... І тут цюкнула мне ў галаву: а што, як на гэты раз праўда, і ён не жартуе? Вунь якое дыханне частае, з хрыпамі, уздрыгвае ўвесь — відаць, ад прыступаў болю, твар бела-сіні, нездаровы...

— Выкліч "хуткую", паміраю!.. — і калі я кінуўся ў пярэднюю, дзе на тумбачцы стаяў тэлефон, пачуў ззаду: — Тэлефон адключылі, не заплаціў у час, бяжы на двор!..

Я збег уніз. Каля таксафона не было ні душы. І вось тут — каюся, грамадзянін следчы, — на кароценькі міг я ледзь не паддаўся спакусе. Нашто спяшацца?.. Можа, пастаяць, пакурыць, потым сказаць Адамавічу, што чарга была, ледзь выпрасіў пазваніць... А можа, пакуль падымуся, дзед мой (прашу прабачэння) будзе ўжо халодны?.. І тады, калі прыедуць і забяруць яго, можна будзе да самай раніцы застацца ў яго кватэры...

Але і ў той раз інтуіцыя падказала мне, што трэба іграць ролю сумленна і да канца. Я пазваніў па "нуль-тры", назваў адрас; мне адказалі — "чакайце, выязджаем".

Калі я, задыханы, уляцеў у кватэру, Адамавіч мой сядзеў на кухні, як ні ў чым не бывала, перад шахматнай дошкаю, і абдумваў чарговы ход.

— Збегаў? А мяне адпусціла.

Я знясілена прысеў на табурэтку насупраць.

— Як вам не сорамна, Адамавіч? Стары чалавек...

— За што мне сорамна? Што блага зрабілася, а потым прайшло? Дык на тое старасць.

— Вас жа аштрафаваць могуць за ілжывы выклік, вы хоць прытварыцеся хворым, калі яны прыедуць! Ці мне збегаць, сказаць, каб не ехалі?

— Ды сядай гуляй, чаго ты носішся? Яшчэ невядома, ці прыедуць.

— А, дык вы сумняваецеся, ці выклікаў я іх увогуле? Які ж вы, далібог... Няўжо вы ўсур'ёз думаеце, што я... смерці вашай хачу? — з самым нявінным выглядам, надаўшы голасу ноткі лёгкай крыўды, сказаў я.

— Хто цябе ведае? Не ў шахматы ж ты ходзіш

сюды гуляць.

Я пакрыўджана пацісnуў плячыма. Мы пачалі чарговую партыю. "Хуткая" сапраўды так і не прыехала.

— Памірай пасля гэтага, — паскардзіўся Адамавіч. — Дык ты выклікаў ці не?

— Клянуся, выклікаў! Але ж і вы таксама, Адамавіч... Вы не крыўдуйце, але вашыя жартачкі вам самому могуць бокам вылезці... А калі, не дай Бог, з вамі сапраўды здарыцца штосьці? Там паглядзяць, скажуць, а, гэта той самы дзед, які столькі разоў нас падманваў!.. І спозняцца...

— А табе-то што? Ну, спозняцца, памру — ты ж толькі гэтага і чакаеш.

— Ну, што вы кажаце!.. Якая карысць мне ад вашай смерці?

— Пакуль аніякай, гэта праўда. А ты хацеў бы карысці? — забіраючы каня, якога я знарок "празяваў", са звыклай гуллівасцю, якая заўсёды з'яўлялася ў яго голасе, калі ён пачынаў гаварыць пра сваё багацце, спытаў Адамавіч. — Вы ж, цяперашнія, з усяго карысці хочаце, нават з чужой смерці... Вось, дапусцім, скажу я табе, дзе ў мяне золата, так? Цяпер ты бегаеш за мною, як за дзеўкаю, у рот глядзіш і кожнае жаданне выконваеш... А як скажу — што будзе? Тады б ты мне такі ўкольчык зрабіў, што мала б не падалося. Хіба б ты бегаў тады, як куля, выклікаць "хуткую"? Ды ты б яшчэ і падушку мне на нос паклаў, ды прыціснуў бы яе так, лёгенька...

Халадзеючы ад прадчування блізкай удачы, ад таго, што я не памыляюся і Адамавіч нікому іншаму, а толькі мне ў перспектыве збіраецца перадаць багацце, здранцвелымі губамі я пралепятаў:

— Калі ў вас сапраўды многа золата, чаму б вам... самому не пажыць у радасць?

— У якую радасць? Падумай галавою, ты ж разумны хлопец: я — хворы, стары, баязлівы, мне ў

магазін цяжка выбрацца, вядро цяжка вынесці, а тут — прадаць золата! Дзе, і як, і каму я яго прадам? Панясу ў скупку? Ды мяне высачаць і кокнуць за адзін грам гэтага золата, не тое што за злітак! Папрасіць каго-небудзь? Таго свайго пустазвона я папрасіў ужо адзін раз, паверыў яму — больш не хачу.

— Мяне папрасіце, — нібы жартам прапанаваў я, а сам сцяўся.

Адамавіч моўчкі, пільна глядзеў на дошку з фігурамі. Маўчанне доўжылася.

— Дайце мне! — ужо сур'ёзна, кінуўшы ўсялякую асцярогу, прашаптаў я. — Паверце мне, я малады, я вучуся... Я ж не ваш Крывіцкі, вы ж бачыце, які ён і які я... Вы — такі разумны, назіральны чалавек, у шахматы так здорава гуляеце ў вашых гадах...

— Ты не Крывіцкі, гэта я ведаю, — перапыніў маю фальшывую, няўмелую ільсцівасць Адамавіч. — Той, хоць і пустазвон, але просты, звычайны, — а ты злы, хітры, учэпісты і ты даб'ешся свайго. Хіба я не бачу, што ты нават хады робіш машынальна, думаючы пра сваё, і ўсё адно ўмудраешся хоць калі-нікалі выйграваць у мяне?

—Так, я злы і хітры! Але грошы толькі такіх і любяць! Адамавіч, аддайце мне — умаляю паверыць! — ніколі я шчэя не быў так блізка ад удачы; я гатовы быў укленчыць зараз перад ім...

Магчыма, у той вечар усё і вырашылася б, і я б цяпер не пісаў Вам гэтую тлумачальную, грамадзянін следчы, каб не... пранізлівы званок у дзверы! Прыехала "хуткая дапамога" — і трох гадзін не прайшло!

Проста ўз'юшаны, я схапіў з вешалкі куртку і выбег з кватэры. Што я адчуваў? Тое ж самае параўнанне, грамадзянін следчы, аб якім згадваў раней: уявіце, што амаль месяц з дня ў дзень чалавек

марнаваў час, нервы, грошы, прыкідваўся, ліслівіў, падлізваўся, урэшце змог "угаварыць" жаданую непрыступную красуню, і вось яна ўжо гатова, яна перад табою ўжо... і раптам банальны, пранізлівы, ненавісны званок у дзверы і ўсё ляціць к д'ябалу!..

VIII

Тым не менш, з раніцы наступнага дня я, як штык, стаяў перад дзвярыма знаёмай кватэры і націскаў на кнопку званка. Цярпенне, калі хочаш нечага дабіцца. Не атрымалася адзін раз — пашэнціць у другі...

Адамавіч, нейкі прыгорблены, пастарэлы і, як мне падалося, спалоханы, быў дома, але збіраўся некуды. На тумбачцы ў пярэдняй, каля тэлефона, я заўважыў слюдзяны мяшэчак, у якім была зубная паста, шчотка, станок для галення і расчоска. Пры мне Адамавіч запіхнуў у другі такі ж мяшэчак свае стаптаныя пантофлі і трыко. Сам ён быў у старэнькіх, але чыстых і адпрасаваных штанах, а абуты ў тыя самыя чаравікі, што сохлі некалі пад батарэяю, калі Крывіцкі ўпершыню мяне сюды прывёў, толькі цяпер яны былі да таго начышчаныя, што смярдзелі ваксаю на ўсю кватэру. — Што здарылася?

— Прайдзі на кухню, — Адамавіч пратупаў уперадзе, прысеў на табурэтку, трымаючы ў руцэ мяшэчак з пантофлямі і трыко.

Такім я бачыў яго ўпершыню. Было ў яго твары, аблічы, у гэтых старэнькіх адпрасаваных штанах і наваксаваных чаравіках, у гэтых яго зборах — распіхванні рэчаў па мяшэчках— штосьці трагікамічнае і разам з тым вартае жалю.

— Чым скончылася ўчора? — спытаў я, маючы на ўвазе прыезд "хуткай".

— Чым? Абследавалі мяне, а потым накіраванне выпісалі... У Бараўляны, у анкалогію. Я ж не прыдурваўся ўчора.

Ён гаварыў сур'ёзна, пазіраў на мяне жаласліва, і было відаць, што для яго самога гэта неспадзяванка, ён не чакаў гэтага і не быў падрыхтаваны.

А я баяўся толькі аднаго — каб не сустрэцца з ім вачыма, бо ў маіх ён прачытаў бы дзікую радасць. Які ж я малайчына, што здагадаўся і прыйшоў раніцаю, і застаў яго пакуль яшчэ жывога і, як кажуць, пры памяці!.. — Як ты думаеш, гэта сур'ёзнае штосьці? — дапытваўся ў мяне, бы ў доктара, Адамавіч. — Я ж вярнуся скора? А? Як ты думаеш?

Мне здавалася, што калі б я толькі падняў на яго вочы, калі б абнадзеіў хоць адным ласкавым словам, ён кінуўся б да мяне, прыціснуўся б, як неразумнае дзіця да маткі, і плакаў бы ад страху, крыўды, болю, ад адчування немінучай блізкай смерці... Але я нават не зварухнуўся.

— Вось так яно... — голас у Адамавіча задрыжэў; здавалася, яшчэ крыху — і дзед заплача. Але ён справіўся, больш таго — на міг зрабіўся сабою ранейшым: — І не ўздумай тут шнырыць без мяне па кватэры! — сказаў строга. — Суседзі даўно цябе ведаюць, будуць пільнаваць, — і, панізіўшы голас: — Усё адно нічога не знойдзеш.

— А... ёсць? — па-дурному, не валодаючы сабой, прамямліў я.

— Ёсць, ёсць. Ты вось што: запішы свой тэлефон у кніжачку, там, у пярэдняй. Я, калі выйду з бальніцы, пазваню. Тады падумаем.

Ледзь перастаўляючы ногі, я выйшаў у пярэднюю, машынальна запісаў у зашмальцаваны нататнічак нумар тэлефона гаспадыні, у якой здымаў пакой, — і стаяў.

— Ну, давай развітвацца, — Адамавіч ізноў зірнуў на мяне жаласліва, нават неяк асуджана — як бык, якога вядуць пад абух. Ён усё яшчэ, відаць,

спадзяваўся, што зараз я кінуся яму на шыю і пачну суцяшаць.

Адвярнуўшыся, я холадна тыркнуў яму руку, і ён схапіў яе ў абедзве свае.

— Пачакай! — ён знік у пакоі, хутка вярнуўся і працягнуў мне нейкую брашурку. Сарамліва пакашляў: — Гэта табе, на памяць. Зборнік мініяцюраў. Ты добра гуляеш, але ў тэорыі ўсё ж слабаваты, — і, калі я ўзяў брашурку, пахваліўся: — Тут ёсць і мая двуххадоўка. Забаўляўся некалі, яшчэ ў твае гады... Ну, з Богам.

— Гэта... усё? — наіўна спытаў я.

— А што табе яшчэ? Кажу ж, выйду з бальніцы — пазваню, — і Адамавіч, злёгку падштурхоўваючы ў спіну, выпусціў мяне на калідор.

Я не разумеў анічога. З вокладкі брашуркі на мяне насмешліва касілі вялікімі вачыма-маслінамі два шахматныя кані — белы і чырвоны. Я выйшаў на двор.

Пракляты стары корч!.. Вось гэта фіяска!..

На міг мне падалося, што ўсё гэта сон, што не было нічога: ні дзеда, ні злітка золата, які я бачыў на ўласныя вочы, ні нашых адкрытых размоваў, нічога... "Калі вярнуся з бальніцы!.. Ды з гэтага аддзялення ў тваіх гадах не вяртаюцца — чаму не сказаў яму гэта?!"

Мяне ўсяго трэсла. Я пашкадаваў раптам, што не прыдушыў яго ўчора, калі яму зрабілася блага і ён валяўся ў ложку зусім бездапаможны (як бачыце, грамадзянін следчы, я шчыра прызнаюся, хоць мог бы і прамаўчаць аб гэтым!).

Ужо ў метро я разгарнуў брашурку, знайшоў сярод іншых двуххадовую задачу-мініяцюру Адамавіча: чорны кароль заціснуты белымі фігурамі ў кутку, але калі яму не паставіць у два хады мат — яму не будзе куды хадзіць, і атрымаецца, паводле шахматных правілаў, нічыя — пат. Пешка ў белых

зааходзіцца акурат за два хады да апошняй лініі... тут патлумачу крыху, калі Вы не ведаеце, грамадзянін следчы. Справа ў тым, што калі пешка ступіць на апошнюю лінію, яна мае права ператварыцца ў любую фігуру. Вядома, звычайна шахматысты выбіраюць самую моцную — ферзя. У гэтым і быў парадокс мініяцюры Адамавіча: пешка, дасягнуўшы апошняй лініі, ператваралася не ў моцную фігуру, а ў лёгкую — у каня, і чорныя аўтаматычна атрымлівалі мат.

Вывучыўшы за месяц характар гэтага чалавека, яго дзівацтвы, яго прымітыўна-дзіцячую хітрасць, я, як толькі глянуў на пазіцыю, адразу ўбачыў рашэнне — і ад гэтай лёгкасці разгадкі злосць падступіла да сэрца новым прыступам. Я ледзь не плакаў.

Мне здавалася, толькі я, і ніхто больш у свеце, заслужваў Адамавічава золата.

IX

Прайшло месяцы тры.

Пакрысе я супакоіўся, увайшоў у сваю каляіну, здагнаў вучобу. Я зрабіўся пануры, маўклівы, нетаварыскі, я не верыў больш у цуды, якія здараюцца толькі з іншымі, а не са мной. Я цвёрда ведаў цяпер, што магу разлічваць толькі на сябе, ведаў, што толькі сціснуўшы зубы, увесьчаснай працаю, упартасцю, напорам і акрамя ўсяго жорсткай эканоміяй я змагу прабіць сабе сцяжыну ў жыцці.

На першых часах пры адным успаміне пра Адамавіча мяне пачынала трэсці. Што з ім, дзе ён цяпер — мяне не цікавіла абсалютна. Вядома, я ні разу не з'ездзіў у тыя Бараўляны (дактары ці санітаркі могуць пацвердзіць, грамадзянін следчы).

Я рады быў, што зноў апынуўся ў рэальным свеце, што нарэшце мог нармальна паспаць, паесці; у

мяне з'явілася мора вольнага часу, які я мог цяпер цалкам аддаваць вучобе. Не трэба было нікому дагаджаць, ні перад кім ламацца, не трэба было жыць увесь час у гэтым ненармальным чаканні чагосьці.

Усё было б добра, каб аднойчы ў мяне не забалеў зуб — той самы, у якім даўно выкрышылася пломба і які раіў не запускаць Адамавіч. Ад зуба забалела і пачала пухнуць дзясна. Я запісаўся да стаматолага, сядзеў у калідоры і, чакаючы сваёй чаргі, абыякава глядзеў пад ногі, на лінолеум у сіне-белыя клеткі, што так нагадвалі шахматную дошку; у думках я машынальна пераастаўляў па гэтых клетках фігуры.

І раптам мяне нібы працяло токам. Я падскочыў, напалохаўшы людзей, якія сядзелі побач, схапіўся за шчаку і застагнаў, але зусім не ад зубнога болю.

Перад вачыма ў мяне паўстаў акурат такі ж, у сіне-белыя клеткі, лінолеум на Адамавічавай кухні, потым уміг узгадалася яго прымітыўная двуххадоўка-мініяцюра з шахматнай брашуркі, якую я тады ад злосці разарваў і выкінуў у сметніцу — адразу ж, як выйшаў з метро. Пешка павінна стаць на апошнюю лінію... Лінолеум на кухні — шахматная дошка... Трэба было ўсяго толькі спраектаваць задачку... Божа мой, які ж я ідыёт!

Цяпер я ў думках нават бачыў тую клетку, на якую становіцца пешка, каб ператварыцца ў каня, — брудная сіняя клетка ў самым кутку пад батарэяю, дзе Адамавіч сушыў свае чаравікі.

На мяне глядзелі са спагадаю. Хтосьці прапанаваў мне ісці без чаргі, але я замест падзякі толькі вылаяўся і пайшоў, амаль пабег прэч адтуль.

У метро мне ўвесь час хацелася неяк падагнаць вагон, каб хутчэй ехаў. Ах, ідыёт! Як можна было, ведаючы дурыкі гэтага звіхнутага дзеда, яго

характар, ведаючы гісторыю Крывіцкага пра "шыфроўку" кода камеры захоўвання, — як можна было ні аб чым не здагадацца! Божа, каб толькі не позна!.. Каб толькі ўпэўніцца, што кватэра замкнутая, каб толькі пачуць ад суседзяў, што дзед яшчэ жывы і ляжыць у бальніцы! Я накуплю бананаў, мандарынаў, вэнджанай каўбасы і ікры, я зараз жа схаплю таксоўку і паімчуся да яго, я кожны дзень буду матацца ў тыя праклятыя Бараўляны, буду даглядаць яго, хоць "судна" за ім выносіць, калі гэта спатрэбіцца!..

Я зайшоў у пад'езд, пачаў падымацца па лесвіцы, паціраючы сэрца, каб не калацілася так, — і раптам нос мой злавіў чужыя, незнаёмыя мне тут раней пахі: пахла фарбай, вапнаю, пабелам, свежым тынкам... як і заўсёды падчас кватэрнага рамонту або пры здачы новага дома. Ці то ад гэтых пахаў, якія я ўсё жыццё не мог пераносіць, ці то ад нядобрай падазронасці на душы зрабілася зусім трывожна.

Дзверы ў Адамавічаву кватэру былі прачыненыя. Пахі ішлі адсюль. Не кранаючы званка, я нагою расчыніў дзверы шырэй і ўварваўся ў пярэднюю.

Нічога нельга было пазнаць. На падлозе — смецце, друз, кавалкі тынку, абрыўкі старых шпалераў; няма ні знаёмай вешалкі, ні тумбачкі з тэлефонам. Справа на ўвесь прасценак — фоташпалеры з нейкім крымскім ці каўказскім краявідам: горы, мора, белы парус удалечыні, — і на імгненне краявід гэты так жыва нагадаў мне, што я мог бы мець (ці яшчэ магу?!), каб быў крыху разумнейшы...

Крывіцкі — босы, з анучай у руцэ, у трыко з падкасанай чамусьці толькі адной калашынай, у зробленай з газеты пілотцы на галаве — паказаўся ў дзвярах пакоя:

— А! — усклікнуў радасна, пераклаў анучу ў другую руку і працягнуў мне для вітання не мокрую далонь, а локаць.

Грэбліва адступіўшы, нават не кранаючы гэтага локця, я прасіпеў:

—Дзе… Адамавіч?

— Дык гэта… — Крывіцкі ўздыхнуў, — ужо месяцы тры як дуба ўрэзаў стары мой, Іван Адамавіч.. А ведаеш, — адразу ж ажывіўся, відаць, карцела пахваліцца радасцю, — дарэмна я наязджаў на яго! Харошы дзед быў — адпісаў-такі кватэру!..

Не слухаючы, адпіхнуўшы яго з дарогі, я падаўся на кухню.

— Э-э, куды ты?! Ты ж слядоў наробіш!..

У кутку пад батарэяю, дзе знаходзілася запаветная сіняя кдетка, стаяла і ляжала некалькі папяровых мяхоў, пачатых і нечапаных; столь была пабеленая, сцены — ашкрэбленыя, але мяне цікавіла толькі падлога — лінолеум, а лінолеум быў той самы!

Ад радасці я засмяяўся і пацёр рукі.

— Не хадзі! — цягнуў мяне за рукаво Крывіцкі. Я пакорліва вярнуўся следам за ім у пярэднюю. Мне захацелася раптам пацешыцца з гэтага тупога, нездагадлівага цельпука, пахваліць яго, нагаварыць яму розных прыемна-падлізлівых слоў; я быццам зноў перанёсся на колькі месяцаў назад, калі быў яшчэ жывы Адамавіч, пад якога трэба было ўвесь час падладжвацца, каб не насцярожыць, не спужнуць... — Малайчына! — я зазірнуў Крывіцкаму ў вочы і моцна паціснуў яго мокрую далонь. — Так здорава ўсё робіш, скора не пазнаць будзе кватэры! А дзе грошы на рамонт узяў?

— А, грошы? Бацькі далі, хто ж яшчэ! Дзед, Адамавіч мой, так і не сказаў, дзе золата, не паспеў, мабыць. Мне б, дурню, з'ездзіць да яго, але так і не сабраўся… А ён, дактары расказвалі, мучыўся вельмі, гаварыць не мог, прытомнасць часта губляў...

Сэрца ў мяне аж захлыналася. Вось яно — шчасце! Я апусціў галаву і прытворна, глыбока-глыбока ўздыхнуў... не, хлушу, грамадзянін следчы. Вядома, і ў мяне ў глыбіні душы варухнулася нешта падобнае на шкадобу. Бедны Адамавіч, так мучыўся... І мяне, чужога, любіў больш за Крывіцкага... Але варухнулася — і прайшло, я не даў гэтай шкадобе разрасціся, адразу прыдушыў яе. Жыццё працягваецца! Жывым, як кажуць, жывое, а мёртвым...

— Гэта што: пабачыш, калі ўсё гатова будзе! — узбуджана гаварыў Крывіцкі, ураз забыўшы на няшчаснага нябожчыка Адамавіча і пра яго пакуты перад смерцю. — Вядома, не еўрарамонт, але сам бачыш... Вось з кухняю толькі, — ён пачухаў локцем сабе бок. — Хацеў гэты лінолеум свінячы памяняць, паслаць драўляную падлогу — цяпер робяць такія, і даволі танна. Ну, патэлефанаваў у нейкую фірму па аб'яве, прыйшлі пазаўчора два, пачалі перасцілаць, потым кінулі ні з таго ні сяго, ледзь пачаўшы. Я прыходжу — ляжаць вось тут, на тумбачцы, усе грошы — аванс, які ім заплаціў. А саміх — ні слыху, ні дыху... Ды што з табою? Чаго ты збялеў?

Я рвануўся на кухню, падскочыў да мяхоў, нагамі і рукамі параскідваў, паадцягваў іх у бакі, упаў на коленцы. Плінтус пад батарэяй быў сарваны, край лінолеума карабаціўся. Я пацягнуў яго на сябе, ён паддаўся, адлупіўся кавалкам усяго ў які метр квадратны — больш яны і ададраць не паспелі! — і ў пліце перакрыцця адкрылася дзірка-"дупло", акурат як вавёрчынае, — невялікае, правільнай круглай формы. Я ўсунуў туды руку і, усё яшчэ не верачы сабе, абдзіраючы аб шурпаты бетон пазногці і пальцы, пачаў мацаць у пустым тайніку...

Крывіцкі стаяў у дзвярах і паглядаў на мяне, як на вар'ята.

Хістаючыся, я падняўся з кален, абцёр аб

штаны рукі. Не ведаю, грамадзянін следчы, што кіравала тады мною, чаму я зрабіў тое, што зрабіў... Можа, хоць крыху тлумачэннем паслужыць адна гісторыя (Вы павінны ведаць яе, грамадзянін следчы). Неяк яшчэ ў часы кампаніі супраць п'янства двое мужчын падбеглі да гарэлачнага аддзела, а ён закрыўся ў іх перад носам, і тады адзін, нядоўга думаючы, з усяе сілы засмаліў другому ў вуха. "За што?!" — заенчыў той. — "А што ж рабіць?! Ну вось што рабіць?!" — у роспачы адказаў другі. Гэта, грамадзянін следчы, як мне здаецца, вельмі тонкі, псіхалагічны анекдот, які перадае дзеянні чалавека ў становішчы афекту...

"Што рабіць?! Ну вось што рабіць?!"

Я падышоў да Крывіцкага і голасам, якога сам не пазнаў, папрасіў:

— Стукні мяне, калі ласка. Толькі моцна!

— Ты што? — адхіснуўся ён.

Вось тады, грамадзянін следчы, я і нанёс Крывіцкаму тыя самыя "лёгкія цялесныя пашкоджанні", што фігуруюць у маёй справе. Я ўдарыў яго ў пераносіцу, а калі ён, ускрыкнуўшы, сагнуўся, я ўзяў яго за валасы і пару разоў ударыў яму каленам у твар. Затым, пераступіўшы праз яго, скурчанага ў дзвярах кухні, выйшаў, нават не азірнуўшыся.

Усё далейшае Вы, грамадзянін следчы, ведаеце. Крывіцкі зняў пабоі і напісаў на мяне перш адну заяву, а потым, калі ўбачыў тайнік, здагадаўся, што золата ляжала ў яго пад носам; тады ад злосці, ад адчаю, што сам не дапетрыў, ён і накатаў на мяне заяву другую — хлуслівую ад першага да апошняга слова.

На Вашым месцы, грамадзянін следчы, я дапытаў бы самога пацярпелага — няхай успомніць, якіх майстроў ён выклікаў тады (хоць без сумнення, канцоў не знойдзеш, дурных мала)...

Зыходзячы з усяго вышэйнапісанага, прашу Вас, грамадзянін следчы, у абвінаваўчым заключэнні адзначыць наступнае:

1) маё чыстасардэчнае прызнанне і раскаянне;

2) што пабоі, нанесеныя Крывіцкаму, экспертызай прызнаныя "лёгкімі цялеснымі пашкоджаннямі, якія не пагражаюць здароўю пацярпелага";

3) што я знаходзіўся ў стане афекту;

і 4) што я і без таго пакараны маральна. Я ніяк не магу звыкціся з тым, што мог бы атрымаць усё, а па ўласнай дурасці застаўся ні з чым. У мяне ўвесь час баліць галава, я не магу есці і спаць. Няўжо ўсё гэта — недастатковая кара?..

На заканчэнне таксама вельмі прашу Вас, грамадзянін следчы, пахадайнічаць перад пракурорам, каб утрыманне ў КПЗ мне замянілі на "падпіску аб нявыездзе", — да суда, вядома.

1995 г.

## Дарожнае знаёмства

*Усе нашы выказванні маюць іншы сэнс,*
*які ўтойваецца і які пагэтаму больш значны;*
*неасцярожна і недастаткова задавальняцца*
*прамым сэнсам слоў, бо і сны нашы*
*сімвалічныя,*
*і творчасць — сімвалічная.*
*Б. Грыфцоў*

1

Празаіку Н., якога ў мінскім літаратурным асяроддзі адны называлі «маладым пісьменнікам», другія—«дзядзькам, якому пайшоў чацвёрты дзесятак» (напраўдзе яму было роўна трыццаць адзін год), прысніўся сон.

Сон падзяляўся на дзве часткі. Першая: снілася нейкая дзяўчына, трохі падобная на ягоную жонку, але зусім чужая і разам з тым вельмі свая, блізкая, і Н. чамусьці ўпрошвае яе быць з ім, каб потым ехаць некуды разам, і тады ён скажа ёй штосьці важнае, прызнаецца ў нечым. Дзяўчына вагаецца, раздумвае і ўрэшце згаджаецца ехаць, толькі не з Н., а з іншым. Н. едзе з імі ў цягніку, у суседнім купэ, чуе іхнія размовы, смех, яму сумна і горка... Раптам каля Бабруйска на цягнік налятаюць нямецкія самалёты, свіст бомбаў, выбухі, крыкі, кроў... Н. разумее, што трэба спыніць сон, і гэта ў яго ўладзе. Ён спыняе сон, і вось тая ж дзяўчына, ужо недзе ў Мінску, стаіць перад ім, вінавата цярэбіць яго за рукаў, просіць прабачэння. "Цяпер я разумею, — кажа яна, — што трэба было ехаць з табою, цябе паслухацца". Н., шчаслівы, адказвае:

"Давай так і зробім, я магу вярнуць усё да пачатку!"

І другая частка сну: яны з дзяўчынаю едуць у адным купэ, спакойна мінаюць Бабруйск і ніхто іх не бамбіць.

Прачнуўшыся, Н. успомніў сон да драбніцаў, да інтанацыі дзявочага голасу. Што гэта магло значыць?

Ну, з цягніком і з дарогаю ясна — сёння ўвечары Н. збіраўся ехаць у вёску да маці, і быў куплены білет. Нямецкія самалёты — з учарашняга фільма пра вайну. Але адкуль дзяўчына і, галоўнае, што за "вяртанне да пачатку"? Мабыць, гэта звязана з п'есаю. Справа ў тым, што Н. пісаў п'есу і тыдзень біўся над другой карцінаю, не мог псіхалагічна абгрунтаваць дзеянні галоўнай гераіні, дзяўчынкі. "Вярнуцца да пачатку" азначала, відаць, перарабіць гэтую карціну зусім па-новаму, замест сустрэчы галоўнай гераіні з яе жаніхом зрабіць яе сустрэчу з чалавекам другасным. Ну, вядома! Тады не будзе

"бамбёжкі", "крушэння цягніка", г.зн. не будзе правалу ў тым месцы п'есы.

Зрабіўшы такі псіхааналіз, Н. супакоіўся і адразу забыў пра сон. І без таго наперадзе хапала клопатаў. Найперш пазычыць у каго грошай, каб паказаць маці, што ён не жабрак (а потым прывезці тыя грошы назад у Мінск і аддаць), пабегаць па крамах...

2

Цягнік выязджае з Мінска позна ўвечары.

Самае цікавае — прыехаць на вакзал раней, тады адным з першых улезці ў вагон, заняць сваё месца ў купэ, законнае, пацверджанае строгімі лічбамі на жоўтым прыгожым квітку, і чакаць, угадваць, хто будзе тваімі спадарожнымі.

Самае нецікавае — калі гэтыя спадарожныя балбатуны, п'яніцы, храпуны, маладыя маці з піскунамі-немаўлятамі, карцёжнікі. Заплюшчваеш вочы і просіш Бога аб адной маленькай ласцы — не пасылаць такіх.

І Бог памагае. Насупраць, на ніжняй паліцы ўладкоўваецца ўкраінка гадоў за сорак ("кількі пасцель кашт аваціме?"), вясковая, з клункамі, абвязаная хусткаю — зубы баляць. Другі пасажыр — мужчына, цвярозы, сеў, дастаў газету. Вось і цудоўна.

Можна глядзецьу цёмнае акно на свой адбітак, можна прыціснуцца бліжэй да шкла і глядзець на мокры ад расталага снегу перон, на якім мітусяцца пасажыры. Можна перавесці вочы на жанчыну-гаротніцу і ў душы парадавацца, што ў цябе нічога не баліць. Можна паглядзець на мужчыну, хоць у яго знешнасці нічога цікавага — нос, рот, акуляры, сівыя вусы. Можна ўгадваць, хто зараз прыйдзе ў купэ чацвёртым.

А лепш проста заплюшчыць вочы і думаць.

Хоць бы пра п'есу: што, калі Наташу — галоўную гераінюі — рабіць не "крутой", не сучаснай, а выдуманай, набожнай красуняю, з чыстай светлай душою... І маналог: "Не думайце, што ўсё купляецца і прадаецца! Вашыя грошы для мяне не больш чым смецце!", — і пачак даляраў на дробныя шматкі... Лухтанейкая.

Можна думаць пра рэцэнзію (у адной газеце нядаўна выйшла рэцэнзія на другую кніжку Н.). А яшчэ лепш пра рэцэнзента, які каменя на камені не пакінуў ад яго прозы. Акрамя тупой злосці, якою дыхаў кожны радок рэцэнзіі. Н. было ясна, што рэцэнзент нават не чытаў яго кнігі, ён яе прагартаў у лепшым выпадку (напрыклад, адна аповесць пачыналася словамі "Стаяла лета", а рэцэнзент пісаў: "Асабліва брыдка ў пачатку аповесці паказана зіма"). Не, і гэта лухта.

Можна думаць пра трэцюю кнігу, што ляжыць у выдавецтве. Мастака трэба было б пашукаць... А, якая розніца, хай хоць зусім без афармлення, без вокладкі выдаюць, змест галоўнае. Выйдзе гэтая трэцяя кніжка — напішацца чарговая рэцэнзія, выйдзе чацвёртая...

Ага, вось ты, чацвёрты пасажыр. Пасажырка. Дзяўчына. Джынсікі, плашч белы. Сумку паставіць уніз? Калі ласка. "Глядзі, у нас сумкі аднолькавыя. Каб не пабльтаць... Табе дакуль ехаць?" — "Далёка". Вочы шэрыя, носік правільны, роўны. "Хочаш, займай маё ніжняе месца?" — "Не, не хачу".

"Дзякуй" яны, такія, чамусьці ніколі не кажуць.

Цягнік крануўся. Пайсці ў тамбур, пакурыць... І падумаць.

3

Калі Н. вярнуўся, у купэ было цёмна. Украінка спала. Мужчына слаў пасцель. Дзяўчына сядзела на голай лаўцы.

"Ты чаму не спіш?"

"Так".

Н. схадзіў, купіў пасцель, вярнуўся — дзяўчына сядзела як сядзела. Духата была невыносная.

"Хочаш, вазьмі маю пасцель?" — сказаў ён шэптам, бо і мужчына ўжо лёг.

"Не хачу", — і зірнула на яго недаверліва.

Ён здагадаўся, што яна студэнтка і проста шкадуе, або няма ў яе, грошай.

"Тады давай падзелімся. Я ўсё роўна не засну. Мне хопіць аднае прасціны", — сказаў ён.

Яна прамаўчала. Ён зняў зверху матрац, паклаў на яго прасціну і навалачку.

"Вазьміце мне тады і коўдру", — прашаптала дзяўчына (коўдры давалі толькі тым, хто купляў пасцель).

"У такую духату?"

"Уночы холадна будзе".

Н. прынёс коўдру; пакуль хадзіў, дзяўчына паспела заслаць яму сваю верхнюю паліцу. Яго кранула гэта.

"Дзякую. Цыгарэты скончыліся, дазволь..." — ён падняў ніжнюю лаўку і пачаў корпацца ў сумцы.

"Што вы робіце?! — смеючыся, прашаптала яна, хапаючы яго за руку. — Гэта ж мая сумка! І не сорамна?"

"Ды ў мяне ўсё тое ж самае, у маёй сумцы, — апраўдваўся ён. — Тыя ж дзве каробкі цукерак зверху..."

Яму расхацелася курыць, ён забраўся на паліцу, лёг на спіну. Не спалася. Пачаў думаць пра гэтую дзяўчыну, а потым — пра жонку, як яму пашэнціла з ёю.

У Н. былі любоўныя гісторыі, і амаль усе няўдалыя. Яго чамусьці заўсёды цягнула да дзяўчат, якія, як высвятлялася праз пэўны час, яго цярпець не маглі. Ён камплексаваў, чытаў Фрэйда і прыдумваў

розныя тэорыі, паводле якіх выходзіла, што пражыць яму век адзінокім. Але на апошнім курсе яго нечакана пакахала дзяўчына, з тых, да якіх яго заўсёды цягнула, — красуня, утульная, а пасля выйшла, што і "хатняя", адданая. Яны ажаніліся, жылі добра, чакалі цяпер дзіця, дзяўчынку, ужо нават прыдумалі імя. Маючы такія тылы, Н. перастаў камплексаваць. Жанчыны, акрамя жонкі, калі і цікавілі яго, дык у якасці аб'ектаў для мастацкай прозы.

Не могучы заснуць у духаце, Н. круціўся да паўночы, тады задрамаў і прачнуўся ўранні, калі цягнік стаяў у горадзе. Н. трэба было праехаць яшчэ адну станцыю. Дзяўчына выходзіла. Яна азірнулася, вочы іх сустрэліся, але яна адвяла свае і хутка выйшла.

"Да пабачэння" ці "дзякуй" яны, такія, чамусьці ніколі не кажуць.

4

Н. ішоў дамоў ад станцыі лесам. Пахла вясною. Снегу нават тут, пад дрэвамі, амаль не было. Зыркае, непрыемнае, ненатуральнае ў лютым месяцы сонца свяціла ў вочы.

Н. дастаў цыгарэту і, прыкурваючы, заўважыў, што ў яго дрыжаць пальцы. Не верачы яшчэ, стараючыся не думаць ні пра што, ён пайшоў хутчэй; не, хада не памагла, а з кожным крокам невядомая трывога толькі нарастала і нарастала. І вось ужо не трывога, а страх, паскудны, ліпкі, той самы, сімптомы якога тысячы разоў прасочаныя ў мастацкіх творах і раскладзеныя да драбнюткай драбязы ў медыцынскіх даведніках... Знешніх прычын для гэтага страху ніякіх, але на што ні паглядзі, пра што ні падумай — усё страшна... Чаго я тут, у лесе, адзін? Куды я йду? Што буду рабіць двое сутак выхадных? Не дзён, а менавіта сутак, бо ведаю,

што не засну... Гэтыя хвоі, бярозы, сонца — нашто яны?..

"Значыць, вярнуўся? — задыхаючыся, спытаў, як у старога знаёмага, у гэтага страху Н. — А я ж быў думаў, назаўсёды знішчыў цябе! Столькі часу ты не падаваў нават знаку!"

Ён спыніўся, заплюшчыў вочы, паклаў далонь на левую грудзіну. Сэрца барабаніла часта-часта. Было адчуванне, што з кожным яго ўдарам патыліца і шыя наліваюцца свінцом, і вось-вось — і Н. не зможа нават павярнуць галавы.

"Я амаль не спаў у душным вагоне. Мозг стаміўся. Я еду да маці, да Жанчыны. Жанчына-прыцягненне і адначасова небяспека, страх. Стомлены мозг згубіў на хвілю кантроль над падсвядомасцю і мозг разладзіўся. Арганізм рэагуе па-свойму: сустрэча з Жанчынаю — небяспека, вяртайся назад. Не, к чорту Фрэйда. Калі б гэта было так, тады было б кожны раз, падчас кожнага майго прыезду. А гэта не кожны раз".

"Неўрастэнія. Самая звычайная, як ва ўсіх творчых людзей. Я амаль год пісаў аповесць, увесь час думаў пра яе. І на працы, і дома, і ў сне. Пракручваў варыянты. Тое, што надрукуецца, будзе адзін з дзесяці амаль розных варыянтаў. Выходзіць, за год я напісаў дзесяць аповесцей! Вось адкуль стомленасць галавы, а не ад душнага вагона. Вось цяпер можна прышпільваць і Фрэйда... Ну, а далей? Я ведаю гэта, а мне не лягчэй, а яшчэ страшней. Мозг больш не кантралюе работу арганізма".

"Хочаш быць шчаслівым — будзь ім", — згадаў Н. вядомае выслоўе і адчуў да яго проста агіду. Які тупагаловы, таўстаскуры дурань мог выдумаць такое? "А я вось хачу быць шчаслівым — і што? Ды палец дзвярыма прыцісні і паспрабуй быць шчаслівым! А тут душа прышчэмленая..."

Цэлы дзень наперадзе, а потым бяссонная ноч,

а потым яшчэ дзень... Тады, праўда, цягнік" — і Мінск.

Мінск! Вось што яго выратавала б! Калі думаеш пра Мінск, тады і страх неяк меншае... Вярнуцца, сесці за стол, закапацца ў свае паперы, прытуліцца да жонкі, пазваніць сябрам, гарэлкі, урэшце, выпіць. Расслабіцца, забыцца любым чынам, каб толькі ацалець, каб толькі не было ГЭТАГА.

"Я паеду сёння ўвечары", — падумаў Н. і адчуў дзікую палёгку.

Ён працягнуў перад сабою далонь — ніводзін палец не ўздрыгнуў. Сэрца застукала роўна і спакойна. Моцным рабілася цела, лёгкаю — галава. Здалося, каб да яго былі падключаны датчыкі медыцынскай апаратуры, што кантралявалі б яго фізічны стан хвіліну назад і цяпер, датчыкі, відаць, зашкалілі б. Яны паказалі б, што былі два зусім розныя чалавекі: першы — разваліна на парозе смерці, другі — малады, звычайны, трохі, можа, узбуджана-радасны хлопец.

Н. хацелася павярнуцца і зараз жа, пехам ісці да Мінска.

5

Пад вечар сабраліся чорныя хмары, лінуў дождж. Ён ліў усю дарогу, пакуль Н. з маці, закручаныя ў слюдзяныя накідкі, дабіраліся на станцыю. Н. гаварыў безупынку, смяяўся, жартаваў. Узбуджаны настрой не пакідаў яго, але ўспаміны пра страх жылі і Н., размаўляючы з маці, у думках не пераставаў аналізаваць ранішні прыступ. Карцела да канца разабрацца, разгадаць зброю ворага, каб потым не падпускаць яго да сябе.

"Можа, у мяне проста павышаны ці паніжаны ціск, перад такім зімовым дажджом? Адсюль і пальцы пачынаюць трымцець, і галава наліваецца свінцом... А я "прышпільваю" Фрэйда ды стомленасць мозга..."

Цягніка доўга не чакалі.

І вось цёплае, сухое, светлае купэ. Дождж у акно. А тут так утульна. Адзін. Паспаць бы... Не, тузанулі дзверы. Малады, высокі, п'яны, з кіёчкам. "Выпі са мною". — "Дзякую, не хачу". — "А я вып'ю! Заслужанае! Ты служыў?!" Ага, вось яно — вядома, "афганец". Зараз пачнецца: кішлакі, душманы, засады... Не, новая мода --"чачэнец".

"Рота, целая рота легла под Моздоком!", і п'яныя слёзы і ўсхліпванні.

Адзіны ратунак — сядзець і ківаць моўчкі, пакуль не зойдзе новы пасажыр і "чачэнец" на яго не пераключыцца. Прыпынак, пасажыры — маладая маці з маленькай дачкою. Гуд бай, "чачэнец", пераключайся. І прабачце, жанчына. Я вам не зайздрошчу. Падсядае: "Как это вы одна, без мужа? А я в Чечне роту в бой водил..." Не адказвай, дурнічка. Адказала, усміхнулася. Прапала... "Мужу нельзя таких жен одних отпускать... Вот у нас в Чечне тоже был случай..."

Другі прыпынак. Не, так жа не бывае!.. Знаёмы плашч белы, вочы шэрыя, знаёмая сумка... І дзяўчына яго пазнала; здзіўлена, нават радасна:

"Привет!"

Усё, "чачэнцу" ні ў якім разе яе не аддаваць... Сядае побач.

"Так, зараз я табе зноў куплю пасцель і зноў аддаю сваю ніжнюю лаўку".

"Праўда?"

"І так будзе кожны раз. Мы цяпер заўсёды з Мінска і ў Мінск будзем ездзіць у адным купэ".

Засмяялася.

"Чачэнец" нагаварыўся, упаў на рукі на столік, заснуў. Потым прачнуўся, залез у адзенні на верхнюю паліцу і адразу ж захроп. Жанчына ўкладала дачку спаць. Святло прытушылі і ў паўзмроку свяціліся добрыя шэрыя вочы.

"Як цябе завуць?"

"Наташа".

"Сур'ёзна?"

"А што, такое рэдкае імя?"

"Ты не першакурсніца "ін'язу?"

"Не, першакурсніца медінстытута".

"Проста я якраз пішу п'есу, там галоўная гераіня — першакурсніца Наташа".

Яна не зразумела, аж прыадкрыла роцік. Н. паўтарыў па-руску.

"А чаму вы пішаце... гэтую... п'есу?"

Н., упершыню за ўсё жыццё, сказаў незнаёмаму чалавеку, што ён — пісьменнік. А што гэта такое? Ну, проста, друкуецца ў часопісах і піша кніжкі.

Яна памаўчала з ветлівасці. Ён пачаў асцярожна распытваць і хутка зразумеў, што яна не ведае нічагуткі: ні таго, што людзі могуць гаварыць па-беларуску, ні таго, што нехта нешта піша, а хтосьці чытае; яна не ведала ніводнай назвы беларускага часопіса.

"Чым вы там займаецеся, у сваім інстытуце?"

"Зубрым... А пра што вы пішаце?"

"А чаму ты завеш мяне на вы? Колькі мне гадоў, як ты думаеш?"

"Павярніцеся да святла..."

Доўга, уважліва разглядала, ўрэшце сказала ўпэўнена:

"Дваццаць пяць".

"Трыццаць адзін, — з гонарам адказаў Н., прыгадаўшы выказванні мінскіх літаратараў (гл. пачатак аповесці). — Чацвёрты дзесятак!"

"Ніколі не дасі. Тады тым больш трэба на вы, — і адразу ж: — Дык пра што **ты** пішаш?"

"Не, я пра сваё не ўмею. Я чужое люблю расказваць. Вось, паслухай, якую навелу напісаў мой сябра..."

Сюжэт навелы быў такі: галоўны герой, студэнт, блізарукі, падчас сяброўскай выпіўкі знянацку разбівае свае акуляры. Яго знаёмяць з дзяўчынаю. Яна бачыцца яму, бы ў тумане, уся размытая, але ў яе цудоўны голас. Дзякуючы голасу, уяўленне малюе гэтаму студэнту яе як дзяўчыну незвычайнай прыгажосці. Ён праводзіць яе дамоў, закаханы, шчаслівы. І на другі дзень ідзе на спатканне з ёю, — у акулярах, вядома. І вось ён бачыць перад сабою звычайнае, шэрае, невыразнае дзяўчо. Толькі голас яе — той самы, начны, мілагучны — не дае яму адразу павярнуцца і ўцячы. Дзяўчына між тым усё разумее. Ёй сорамна. Яна яшчэ больш сцінаецца. І тады хлопец — які цудоўны, нечаканы паварот! — нібыта выпадкова зноў разбівае свае акуляры, і ўсё вяртаецца: зноў каханне, зноў дзяўчына ператвараецца ў фею.

Н. расказваў з інтанацыяй, падрабязнасцямі, жэстыкулюючы і робячы паўзы ў патрэбных месцах, стараючыся не прапусціць драбнюткіх дэталяў, дадаючы сёе-тое (па праву пісьменніка) і ад сябе.

Яна была ўражаная:

"Трэба ж!.. Няўжо цяпер такое пішуць?"

6

Пастуквалі колы. Час ад часу за акном праплывалі асветленыя пероны невялікіх станцый, на якіх цягнік не спыняўся, — тады і ў купэ святлела. А потым — зноў ноч і перастук колаў.

"Пра што ты думаеш? — спытала дзяўчына. — Мне здаецца, ты гаворыш і думаеш пра штосьці сваё".

"Звычка такая... Прафесійная!" (Чорт бы яе, гэтую звычку, пабраў.)

"Дык пра што?"

"Табе цікава будзе?"

"Цікава".

"Я гавару з табою, а сам мару. Мне хочацца "білецік на другі сеанс". Каб зноў апынуцца ў дзяцінстве, пайсці зноў у школу, тады твае гады зноў перажыць, студэнцкія... Усё-ўсё па-нову, разумееш? Колькі памылак можна было б пазбегнуць!"

Яна не зразумела. Ён сказаў:

"Кладзіся спаць, Наташа", — і пайшоў курыць у тамбур.

Вярнуўся — яна ляжала, прыкрытая коўдраю, і не спала.

"Пасядзі са мною", — сказала яна раптам.

Ён прысеў, паправіў ссунутую коўдру, падаткнуў ёй пад ногі.

"Мне так пашэнціла, што я з табою еду", — прашаптала яна.

"З-за таго, што купіў табе пасцель?"

"Раскажы яшчэ што-небудзь", — папрасіла яна, не адказаўшы.

"Ну, слухай. Бог стварыў Зямлю. І ўсё жывое на ёй. І гэтае жывое жыло і развівалася, а потым памірала, мільёны гадоў. Нараджаліся і паміралі розныя мудрацы, розныя рэлігіі, розныя грамадскія лады, вяліся войны, адбываліся рэвалюцыі, ірваліся атамныя бомбы... і ўсё гэта рабілася дзеля таго, каб у канцы дваццатага стагоддзя два чалавекі сустрэліся ў адным купэ цягніка. Смешна, праўда? Вось вынік усяго развіцця чалавецтва — каб мы з табою сустрэліся! А раніцаю развіталіся назаўсёды".

"Не, — хутка сказала яна. — Ты пакажаш мне Мінск".

"Што менавіта ў Мінску?"

"Усё. Я амаль нічога там не ведаю. Не ведаю нават, дзе цырк, не была ў ім ні разу, не ведаю, дзе плошча Перамогі..."

"Ты не перастаеш мяне здзіўляць. Ты ж нармальная сімпатычная дзяўчына — табе няма каму паказваць Мінск? Як жа ты жывеш, чым?"

"Колькі я там жыву — менш чым паўгода. Інтэрнат не даюць, гаспадыня кватэры сварыцца, каб не гуляла позна. Лекцыі, семінары, а ўвечары зноў вучу і тэлевізар гляджу. Ведаеш, як цяжка ў медыцынскім?"

"Здагадваюся. Усё, Наташа, заўтра ўставаць рана".

"Пачакай, нагніся... — сказала яна, прыўзнялася і пацалавала яго ў вусны. — Добрай ночы!"

7

Н. драмаў. Ён чуў, як гадзіны ў тры пастукалі ў дзверы, правадніца крыкнула:

"Жлобін!", і "чачэнец" падхапіўся, пачаў збірацца. У чатыры гадзіны зноў стук і крык:

"Беразіно!", і маладая маці з дачкою выйшлі. Нарэшце а палове шостай уключылася святло, зайшла правадніца і аб'віла: "Мінск".

Н. паляжаў трохі, каб не перашкаджаць дзяўчыне збірацца. Потым зірнуў уніз, павітаўся. Яна сядзела апранутая, трохі прыпухлая пасля сну і ад таго яшчэ больш па-дзіцячы прыгожая. Яна разглядала білеты.

"Вось, аддалі, — сказала яна, убачыўшы яго. — На, на памяць".

Ён узяў два білеты, запіхнуў у кішэню кашулі.

Вакзал сустрэў іх ранішнім рэзкім шумам, лютаўскім, адліжным, прапахлым дымам паветрам.

Яны спусціліся ў светлы пераход, да метро.

"Ну, шчасліва", — сказала дзяўчына, забіраючы сумку, якую ён падносіў.

"Ты паедзеш?"

"Паеду, метро працуе ж".

"Можа, запішы тэлефон?"

"Навошта?" — яна няўцямна зірнула на яго, усміхнулася чамусьці.

Белы плашч мільгануўся апошні раз, змяшаўся, раствырыўся сярод людзей.

Н. выйшаў на другім баку вуліцы. Першы тралейбус будзе толькі праз паўгадзіны.

На прыпынку курылі, і гэты цыгарэтны ранішні смурод раздражняў. Праехала прыбіральная машына, са скрыгатам здзіраючы сваім касым "нажом" бруд з асфальту, а жорсткі "венік"-круцёлка падхопліваў ззаду гэты бруд, не так падмятаючы, як раскідваючы яго ва ўсе бакі. Людзі хапалі сумкі, ціснуліся да сцен, далей ад краю тратуара, на які ляцела гразь.

О, праклятце! Гэтыя галасы, мацюкі, бледныя ў паўзмроку твары, сумкі, цыгарэтны дым, гэты скрыгат "нажа" аб асфальт!.. Таксоўку ўзяць? І прыперціся дамоў у шэсць раніцы? І дома будзе тое ж самае!

Н. было страшна.

"Ну, выратаваў Мінск?" — папытаў ён у сябе.

8

Ён сабраўся і хутка пайшоў Ленінградскай вуліцай у бок "Дынама", завярнуў улева і ў скверыку прысеў на крайнюю лаўку. Святлела. У Мінску зусім не было дажджу. Сёння будзе сонечны, цёплы, харошы дзень. Жыць бы і радавацца.

Што ж адбылося?

Тое, што яму зноў стала страшна. Да моташнасці. Да істэрыкі. Да немагчымасці не тое што радавацца, а жыць.

Учора яго выратавала ад гэтага страху думка хутчэй вярнуцца ў Мінск. Што цяпер? Чым цяпер гэты страх мог бы быць зняты?

Адным: калі б гэтая абсалютна чужая яму дзяўчына не развіталася так абыякава. Калі б яна пакінула адрас, ці запісала нумар яго тэлефона. Навошта? Няважна, ён больш чым упэўнены, што

ніколі не шукаў бы яе.

"Пакуль не разбяруся, нікуды не паеду! Буду сядзець тут хоць да вечара!"

"Пачнём з прасцейшага: што мяне спалохала? Для гэтага трэба ўспомніць, калі ТАКОЕ было апошні раз. Даўно, да жаніцьбы. Я пісаў тады сваю першую аповесць..."

І Н. прыгадаў сюжэт той аповесці (ён увогуле помніў кожную старонку трох сваіх кніжак). Галоўны герой ведаў, што яго сяброўка спіць з іншымі. А з ім — не. Разам з тым яна кахала яго, несумненна. Яна, голая, выходзіла з ванны, выціралася перад ім, прасіла зашпіліць на спіне станік, цалавала, запаляла яго — і далей ніяк. Яна смяялася з яго, нібы помсціла за тое, што ён кахае яе **такую.** А ён не столькі кахаў, колькі хацеў разабрацца. Было не каханне, а паталогія кахання, хвароба. Яе паводзіны і словы былі алагічныя. І сваёй непаслядоўнасцю, невытлумачальнасцю дзяўчына даводзіла галоўнага героя да адчування страху перад жыццём.

"Дык што — сексуальныя матывы? — думаў Н., седзячы ў ранішнім скверыку на лаўцы. — Глупства, гэтая дзяўчына з невялікай нацяжкаю годная мне ў дочкі! Не, могуць быць, вядома, і сексуальныя, але не гэта галоўнае..."

Ён успомніў жанчыну, з якой пазнаёміўся ў тых жа гадах, студэнтам, у "Кнігарні пісьменніка". Ён выйшаў з дзвярэй "Закрытага фонду", тады яшчэ быў такі, толькі для пісьменнікаў; жанчына падышла і папрасіла купіць ёй у тым "Фондзе" нейкую кнігу па псіхалогіі. Ён вярнуўся, купіў. Яны пазнаёміліся. Жанчына аказалася дзіцячым псіхіятрам. Н. падараваў ёй сваю кніжку з той першай аповесцю. Потым разоў колькі хадзіў да жанчыны ў госці (яна была ўдава); яны гулялі ўвечары па вуліцах і размаўлялі.

"Ты ведаеш, што ты "прирожденный"

пісьменнік? — казала жанчына. — Проста дзіўна: нарадзіцца сярод нейкіх палескіх балот — і такое абвостранае адчуванне ўсяго! Твая аповесць — беларускі варыянт "Крэйцэравай санаты", я называю гэта "мардабой" — калі жанчына і мужчына, кахаючы адно аднаго, абое люта мучацца. Але бачыш, дарагі Н., **п...страдание** заўсёды было і будзе асновай любой творчасці..."

Не таму шарахнула яго тое слова, што і да яго адносілася, не таму, што так будзённа вылецела з вуснаў старэйшай за яго, сімпатычнай інтэлігентнай жанчыны, дзіцячага доктара, — а таму, што няпраўдай было. У гэтым ён гатовы быў паклясціся. Ды Божа мой, калі б толькі гэтае — мала ў інстытуце дзевак, якія клаліся ў ложак за пачак цыгарэт!..

Н. успомніў іншыя свае творы на тэму "каханне". Несумненна, творы тыя звязвала адно — адчуванне героямі АЛАГІЗМУ, СУПЯРЭЧНАСЦІ.

Чалавек зацыкліваўся на пункце: чаму сказаўшы "а", жанчына не гаворыць "б"? Чаму, абяцаючы чакаць з войска, не чакае? Чаму голая выходзіць з ванны, прыхінаецца, запаляе — і на гэтым усё канчаецца? Чаму цалуе першая ў цягніку, просіць паказаць Мінск, а раніцай абыякава кідае: "Шчасліва"?..

Матывам тых твораў быў не секс, а жаданне звесці канцы з канцамі, адшукаць логіку, нават гармонію. То былі пакутныя пошукі нейкай формулы, якая давала б магчымасць разгадваць такі тып жанчын.

І ў творах гэта больш-менш удавалася. Гармонія знаходзілася, супярэчнасці знікалі. Гераіні каяліся, прасілі прабачэння... Гэта значыць, калі б Н. захацеў напісаць мастацкі твор пад назваю "Банальнае дарожнае знаёмства", дык для вырашэння супярэчнасцяў ён скончыў бы яго тым, што дзяўчына адшуквала б Н. — галоўнага героя — і

ўсё выйшла б цудоўна і гарманічна.

Зусім інакш было ў рэальным жыцці.

9

Н. падумалася, колькі заходніх фільмаў ён перагледзеў за апошнія гады. Як там усё лёгка і проста! Знайшоў праблему — пазнаёміўся ў цягніку з дзяўчынаю, якая не пакінула свой тэлефон! Ды выйдзі з цягніка, заходзь у любую кавярню — і знойдзеш дванаццаць яшчэ лепшых, якія дадуць не толькі тэлефон!..

"Чаму ж я капаюся ў гэтым?

Таму, што веру адзіна сваёй інтуіцыі.

Таму, што мяне палохае гэта, мне гэта найбольш цікава; а каму не цікава і каго не палохае гэта — тым горш (ці лепш) для яго..."

І так, паехалі. Секс-матывы калі і ёсць, дык не галоўныя. Вырашэнне супярэчнасцяў — важнае, але недастатковае (мала што можа абяцаць жанчына, а потым не выконваць! Не трэба спадзявацца, тады не будзе і расчаравання).

Адкінем яе абяцанні, словы і магчымыя думкі. Возьмем канкрэтнае дзеянне. Учора раніцаю што зрабіла дзяўчына? Яна пайшла. І сёння пайшла. Узнік страх. І ўчора, і сёння.

Значыць, яму не хочацца, каб яго кідалі? Хочацца быць побач? Што ён хацеў узяць ад яе? Выгаварыцца? З такім жа поспехам можна было выгаварыцца і "чачэнцу", і сябрам, і маці, і жонцы...

Н. здавалася, што ён круціцца недзе блізка-блізка ад разгадкі. Нешта казала яму, падавала сігналы — "цяплей, цяплей!", калі ён пачынаў шукаць гэтай разгадкі не ў сваім жыцці, а ў сваіх ранейшых творах. Ён зноў паклікаў на дапамогу памяць, і ўсплылі перад вачыма старонкі, раздзелы... Што хацелі яго героі ад жанчын? Ад адной — сексу, ад другой — пакаяння, ад трэцяй — усяго толькі тэлефоннага

нумара... І побач з гэтым хаценнем заўсёды ішоў страх. Што кепскага рабілі, ці маглі зрабіць, яго героям тыя жанчыны? Маглі сысці, кінуць іх.

"І тады я пайшоў да Тані, — успамінаў Н. свае цытаты, — і бажуся, як толькі пастукаў у дзверы, зайшоў, сеў, павітаўся — уся мая трывога некуды знікла".

"Страшна і незразумела, калі думаеш, што яна бавіць час са мною і цалуе на **развітанне...**"

"Галоўнае, я падышоў, сеў насупраць — і ўсе страхі мінулі без следу. Як гіпноз. Як п'яніцу з пахмелля трэба гарэлка, так мне трэба яе бачыць увесь час".

"Ён заўсёды панічна баяўся расстанняў..."

10

Разгадка аж закружыла галаву.

А любімыя песні, якія ён заўсёды мурлыкае пра сябе, едучы на працу ці з працы, або напявае ўголас, калі застаецца адзін?

"Не говорите мне прощай — я это слово ненавижу..."

"Не уходи, побудь со мною..."

"Ён яшчэ вернецца!.."

"Бывай, абуджаная сэрцам дарагая, чаму так горка? — не магу я зразумець..."

"Я так устала с тобой расставаться, что ненавидеть стала дороги..."

"Давай пожмем друг другу руки — и в дальний путь на долгие года..."

"Самая нелепая ошибка — то, что ты уходишь от меня..."

Яшчэ раней Н. усё распытваў маці, які ён быў малы. "Ціхі быў, спаў усё, — адказвала маці неахвотна. — Я з раніцы пайду ў калгас, а ты ляжыш у калысцы, спіш, чакаеш, пакуль прыйду і пакармлю". — "Я заставаўся цэлы дзень галодны?" —

"Ну, бацька карміў трохі... Нажуе якога хлеба ў суслу... А то раз баршчом цябе накарміў, у паўгода, ледзь адратавалі. Цэлы месяц у бальніцы з табою ляжала. Уколы табе ў галаву давалі". — "А я плакаў, калі ты раніцаю сыходзіла?" — "Гм, яшчэ як! Як і ўсе дзеці".

Адзін з нямногіх яркіх успамінаў да двух гадоў: калыска, з якой трэба выбрацца. Трэба знайсці чалавека, які ўратуе ад голаду, ад адзіноты. Палачкі з аднаго боку калыскі, аказваецца, можна рассунуць. Можна пралезці ў гэтую дзірку, вываліцца неяк. Удар аб падлогу. Боль, кроў. Прыбягаюць нейкія людзі (бацька?), сварацца, выціраюць кроў, кладуць назад у калыску. На гэты раз палачкі папраўленыя, сядзяць моцна, не рассунеш...

Ежу, ласку, супакой — усё можа даць адзін чалавек, Жанчына. І раптам яна сыходзіць. І дзіця не ведае, на колькі — на гадзіну, на дзень ці назаўсёды?

Дык што: кожнае расстанне з любой жанчынаю — закамплексаваны ў падсвядомасці тых гадоў страх? Не, не кожнае і не з любою. Гэта зусім проста. Страх ад развітання з жанчынамі такога тыпу, якія нагадваюць Н. маці. Якія словамі ці дзеяннямі пачынаюць клапаціцца пра яго, выказваць сваю прыхільнасць, любоў да яго.

Ён патрапляе ў залежнасць ад іх. Пакуль яны побач, яму спакойна. Пакуль яны побач, ад іх можна ўзяць штосьці.

Тыповы комплекс!..

11

Н. закурыў, падняў сумку і пайшоў назад на прыпынак. Шумны горад пасвятлеў і даўно ўжо жыў сваім — чужым, незразумелым жыццём.

Н. не спяшаўся.

"Добра, комплекс. Але разгадка комплексу нічога не дае. Псіхааналізам вылечыцца немагчыма.

Даўно і не мною даказана. Ёсць толькі два — у ідэале — варыянты.

Першы — "адпусціць" свае жаданні, "развязаць" іх, даць ім волю, не заганяць іх у глыбіні свядомасці. Вызваліць сябе ад прыдуманай людзьмі маральнасці. Мапасан, за шэсць гадоў да свайго вар'цтва і смерці, марыў: раскошны палац недзе ў Егіпце, чарнаскурыя рабы, мармуровыя басейны, мяккія, абцягнутыя скураю сцены, пяць жонак — з пяці кантынентаў Зямлі... Гэтым ён хацеў "развязацца", "адпусціць" інстынкты.

Другі варыянт — рэзка адваротны першаму. Скруціць сябе, свае хаценні, комплексы, падпарадкавацца маральнаму закону. Гэта значыць, прызнаць... Бога над сабою".

І Н. жыва, ярка прыгадаўся ягоны сон перад гэтай паездкаю. Цягнік, бамбёжка, самалёты... "Вяртанне да пачатку". А што, калі... Вось ён сядзіць у купэ, заходзіць дзяўчына. Хто яго, жанатага чалавека, цягне за язык? Навошта ён купляе ёй пасцель? Чаму не лягае моўчкі спаць?

"Праўду, праўду кажу: гора таму, хто зірне на жанчыну з пажадлівасцю!"

Не было б той пяшчоты, што варухнулася ў ім, калі ён папраўляў дзяўчыне коўдру, не было б пацалунка яе. Падумаеш, страта! Затое і гэтага раздзірання не было б. Не было б адной супярэчнасці.

"І не толькі адной, — думаў Н. — Вера, хрысціянства здымаюць УСЕ супярэчнасці. Але якім чынам? Смерцю. Калі ісці да канца, атрымаецца: хрысціянства — смерць. Мне, напрыклад, з маім максімалізмам, з жаданнем дабірацца ва ўсім да канца, прыняўшы сапраўднае хрысціянства, трэба ісці зараз у той вунь пераход каля вакзала, аддаць жабракам і бомжам усе грошы, распрануцца, аддаць куртку, кашулю, чаравікі... Калі мяне ўдараць нажом у бок, трэба павярнуцца і падставіць другі бок.

Сапраўдны хрысціянін не павінен баяцца смерці. А я — я не тое, што баюся, а проста не люблю і не хачу яе. Я малады. Я яшчэ не прайшоў таго, можа быць, наканаванага мне шляху, які падвёў бы мяне і тыркнуў, як ілбом у сцяну, у непазбежнасць: збавенне — смерць. Адна яна вырашае ўсе супярэчнасці".

12

Тралейбусы спыняліся, забіралі пасажыраў і ад'звджалі, а Н. стаяў на прыпынку, каля таксафона, і не кранаўся з месца.

Заставалася адно: цярпець. Змірыцца. Цягаць на сабе свой крыж. "Такі ўрадзіўся", людзі кажуць. Ехаць дамоў, сядаць і атупела глядзець у адну кропку. Хай будзе што будзе.

Нехта, праходзячы блізка, штурхнуў Н. плячом. Нехта, цягнучы за сабою калясачку, брудным колам церануў мыс чаравіка. Усе спяшаліся некуды, гучна размаўлялі.

"І чаму **мне** гэта? — думаў Н. — Чаму я такі ўрадзіўся?"

Ён ведаў пра сябе, ды і блізкія людзі не раз казалі, што ён па натуры, па характары — добры, цярплівы, "кісель". Але цяпер ён ненавідзеў, ненавідзеў сур'ёзна. Ненавідзеў жыццё за яго супярэчнасці. Сябе — за тое, што гэтыя супярэчнасці так адчувае. Людзей — за тое, што жывуць сярод гэтых супярэчнасцей і радуюцца.

"Вось яны штурхаюць мяне, пэцкаюць чаравікі, а іншыя, ім падобныя, як сланы ў пасуднай лаўцы топчуцца ў маёй душы, у маёй творчасці, — нічога самі не адчуўшы, не перажыўшы! Не разумеючы, што трэба **права мець,** каб выказаць нават самую банальную, самую агульную ісціну, крывёю і нервамі заплаціць за гэтае права!" — думаў ён, не маючы на ўвазе нікога канкрэтна.

Яму здавалася, само жыццё супраць яго — **такога.**

13

..........

..........

.........

14

Нейкі мужчына папрасіў закурыць.

Н. паглядзеў на яго, падумаў і палез ва ўнутраную кішэню курткі. Дастаючы пачак, адчуў, як пад світэрам, у кашулі, зашамацелі білеты. Адзінае, што засталося пасля яе...

І раптам ён аж скалануўся.

Спрактыкаваная "пісьменніцкая" памяць хуценька вярнула яго ў сённяшнюю раніцу, у купэ. Вось прыпухлая пасля сну дзяўчына разглядае білеты. Чаго іх разглядаць? "На, на памяць... Ну, шчаслівa!" — "Можа, запішы тэлефон?" — "Навошта?" Няўцямны позірк, усмешка... Дурань, значыла гэтая ўсмешка, навошта мне твой нумар, калі я табе **свой** запісала?!

Няўжо такая карусель раскруцілася на пустым месцы?!

Ён, знарок няспешна і разам з тым ужо амаль не сумняваючыся, дастаў білеты, разгарнуў, і на адным, з таго боку, дзе ўказваюцца тарыфныя паясы, прачытаў зверху:

"Ты милый. Вот только я твоей жены боюсь..." І ўнізе ўбачыў шэсць лічбаў.

Ён адвёў ад білета вочы, каб выпадкова не запомніць гэтыя лічбы, ведаючы, што такое — выпадковае — запамінанне бывае самае моцнае. Тады чыркнуў запальнічкай, падпаліў білет, даў яму добра схапіцца агнём і кінуў у пустую сметніцу.

Потым ён ехаў у тралейбусе. Яму было радасна.

Смешна. Лёгка. Як бывае, калі прачнешся пасля цяжкага, дурнога сну і адчуеш сябе ў рэальным, знаёмым свеце.

*Люты 95-га.*

## РАТАН

Гэта штосьці сярэдняе паміж акунём і яршом, з вялікай прадаўгаватай галавою, якая займае прыблізна адну трэць цела. Драпежная, страшэнна пражорлівая рыба — нават малёк памерам з фільтр ад цыгарэты лёгка заглытвае кручок і дае рады пацягнуць ці прытапіць паплавок. Увогуле, лавіць іх — адна асалода: бяруцца ў любое надвор'е, у любы час, не трэба ні асаблівай снасці, ні падкормкі, ні выбару месца — знай закідвай вуду ці донку і выцягвай. У параўнанні з тым жа акунём, асабліва яршом, якіх намучышся пакуль пачысціш, у ратана амаль няма лускі. Мяса ў іх белае, на смак нагадвае шчупаковае, і юшка атрымліваецца — пальчыкі абліжаш, не кожная «сапраўдная» рыба дакажа.

У Беларусі ратан водзіцца не паўсюль. Асабіста я, напрыклад, да мінулага года нават не чуў, што за ён, і ні разу яго не бачыў. Ажно раз акурат насупраць нашага дома ў мінскім раёне Кунцаўшчына, на пустцы, бралі экскаватарамі зямлю для будоўлі, парабілі ямаў, якія запоўніліся вадой, злучыліся — і ўтварылася, на радасць жыхарам блізкіх дамоў, даволі прыстойная, хоць і неглыбокая, сажалка-копанка. Месца там нізкае, лугавое; вельмі хутка яна зарасла паўз берагі травою, сітняком, аерам. Неўзабаве на ёй пасяліліся некалькі сямеек качак-чыранак, якія хутчэй за ўсё і перанеслі з іншых сажалак рыбіную ікру. Само сабою, дзе вада, ды яшчэ, лічы, у самым горадзе, пад бокам, там абавязкова з'явяцца і людзі з вудкамі —

«ціхапамешаныя», як называюць іх тыя, хто не любіць і не разумее рыбнай лоўлі.

З вакон майго дома ўся гэтая сажалка-копанка была відаць як на далоні. Зацікавіўшыся, што ж там такое яны ловяць, пайшоў я неяк паглядзець.

Спыніўся каля дзядзькі — сур'ёзнага, спаважнага, ва ўсёй рыбацкай амуніцыі, зусім не падобнага на «ціхапамешанага», — які акурат здымаў з кручка нешта.

— Што вы злавілі?

— А-а, гібрыды нейкія, — махнуў ён рукою, не гледзячы на мяне, нібы яму было крыху сорамна за свой занятак. — Ратанамі мы іх называем, помесь бульдога з насарогам... — І дадаў, апраўдваючыся: — Я іх так лаўлю, для фіззарадкі. А заўтра на Вячу паеду, ці на Мінскае мора — па сапраўдную рыбу!

А вось і памыліўся дзядзька, і я разам з ім, яго паслухаўшы. Не такі гэты ратан просты, як нам здавалася. Напрыклад, у найноўшым, 1997 года выдання Вялікім Акадэмічным Слоўніку можна прачытаць: «Ратан (галавешка) — рыба атрада акунепадобных, даўжыня да 25 сантыметраў. Водзіцца ў басейне Амура і рэках Прыамур'я, завезены выпадкова ў некаторыя вадаёмы Еўропы, часткі Расіі і Сярэдняй Азіі. Аб'ект спартыўнага рыбалоўства».

Яшчэ больш падрабязна ў Вялікай Савецкай Энцыклапедыі: «Галавешка, бычок, травянка, ратан — прэснаводная рыбка сямейства галавешкавых, даўжыня цела да 20 сантыметраў. Афарбоўка вар'іруецца ад светлай да цёмнай; падчас шлюбнага перыяду амаль чорная (адсюль назва — галавешка). Па баках цела цёмна-бурыя плямы няправільнай формы. Распаўсюджаны ў басейнах Сярэдняга і Ніжняга Амура, у вадаёмах паўночна-заходняга Сахаліна і на паўночным усходзе Карэі; сустракаецца ў вадаёмах пад Масквой і Ленінградам, куды была

завезена акварыумістамі-аматарамі; аддае перавагу стаячым вадаёмам, корміцца моладдзю рыб, малюскамі, лічынкамі насякомых. Нерастуе ў траўні-ліпені. Ікру адкладае на тонкія сцяблінкі раслінаў, самец аберагае ікру».

Але нават не ўлічваючы такога багатага і цікавага радаводу гэтай рыбкі, не ўлічваючы, што вунь якая яна падарожніца-чужаземка! — ужо за адно тое, колькі радасці ловы яе прыносяць нам, дарослым, а асабліва дзецям, не вартая яна, вядома, нейкай пагарды, не заслугоўвае, каб яе лічылі «несапраўднай», «непаўнацэннай»...

Наступнай раніцаю і я выправіўся на ратанаў.

Стаяла лета, жнівень-месяц, у мяне быў адпачынак, на балконе пылілася двухкаленная прымітыўная бамбукавая вудка, сажалка, паўтаруся, была на пустцы каля самага дома... Чаму б і не выбрацца на ратанаў?

Нягледзячы на ранні час і будні дзень, чалавек колькі ўжо вудзілі. Сярод іх я пазнаў учарашняга дзядзьку, які замест Вячы і Мінскага мора, дзе «сапраўдная» рыба, ізноў апрануты ва ўсё рыбацкае стаяў на тым жа месцы. На маё прывітанне ён не адказаў чамусьці.

Я пайшоў у самы закуток сажалкі, хоць і ведаў, што там мелка і шансаў злавіць штосьці людскае ў мяне мала; затое далей ад усіх. «Прыкарміў» месца размочаным у вадзе батонам, насадзіў самага тлустага чарвяка, закінуў... Паслаў на мокрую ад расы купіну сітняку брызентавую куртку, прысеў... І так дзіўна на душы зрабілася. Вунь мой мінскі дванаццаціпавярховы дом, відаць мае вокны; вунь, збоку, шаша, па якой носяцца машыны, аўтобусны і тралейбусны прыпынкі. А тут, за якіх дзвесці метраў ад шашы — акраец лесу, вада, птушкі цвіркочуць, конікі — не зусім яшчэ прачнуўшыся — пастрыкваюць, трава пасля ночы пахне па-

вясковаму, па-жнівеньску востра...

Паплавок, да якога прыляпілася абсушыцца сіняя тоненькая страказа, не варушыўся. Дзіўна, але і не хацелася, каб ён раптам заварушыўся, не хацелася, каб штосьці — нават такое жаданае кожным рыбаловам імгненне, як нырок паплаўка — парушылі гэты лены настрой, гэтую ілюзію зліцця з прыродаю. Міжволі паверыш, што час, праведзены з вудаю, не залічваецца жыццё, інакш калі чалавек, скажам, правёў на рыбалцы гадоў пяць, а пражыць яму наканавана семдзесят, дык пражыве ён на пяць гадоў болей.

У дзевяць гадзін раніцы — я акурат зірнуў на гадзіннік, — калі ўжо сонца паднялося даволі высока, калі трава перастала так востра пахнуць і конікі, абагрэўшыся, сваім стракатаннем, здавалася, заглушылі ўсе іншыя гукі, калі я сцягваў з сябе кашулю, каб загараць, — нарэшце клюнула, паплавок марудна, не даючы нырца, паплыў убок. Я схапіўся за вудзільна... карась. Далібог — вось ён трапечацца на беразе ў траве. Крыху меншы за далонь, ладны, тоўсты — «пятак», як называюць такіх рыбакі. Закідваю ізноў — ізноў карась. Мяняю чарвяка, закідваю — яшчэ карась... А дзе ж славутыя ратаны? Хоць усё правільна. Прыгрэла сонца і гультаяватыя карасі выйшлі на мелкае, дзе я і выбраў месца, а тут акурат батон на дне, і проста перад носам апетытны чарвяк варушыцца...

З таго — супрацьлеглага — берага на мяне пазірквалі. На такой маленькай сажалцы не схаваешся, заўсёды высачаць, у каго лепш клюе, кожны за кожным цікуе. Хай — нават прыемна, што я не адзін, а ёсць яшчэ сведкі маёй удачы. Яна ўзнагарода мне за цярпенне.

Закідваю. Паклёўка, падсечка... І вось ён, гэты кароценькі, на долю секунды, міг супраціўлення! Прычым на гэты раз супраціўленне такое, нібы, як у

тым дзіцячым вершыку, цягну «карася з парася»... Што такое? Разглядаю злоўленую рыбіну. Шчупачок не шчупачок, акунь не акунь, за ярша — большы... Ратан. Дык вось ты якая, рыба-азіятка!

Каля кусціка травы ў вадзе, у «прыкормленым» батонам месцы, убачыў некалькі чорных спінаў. Усё зразумела — ратаны прыйшлі прагнаць карасёў. Што ж, таксама някепска.

Калі яны ўсе такія, як гэты злоўлены, дык мне проста пашэнціла.

Я закінуў, адвярнуўся на міг, каб пакласці ратана ў мяшэчак да карасёў. Падняў вочы — паплаўка не было. Я шморгнуў вудзільна, чакаючы знаёмай цяжкасці, чакаючы супраціўлення і выцягнуў пустату. Унізе на лёсцы адно сіратліва віселі грузік і падцягнуты да самага яго паплавок. Кручок быў зрэзаны, як брытвою. Магчыма, патрапіўся такі вялікі ратан (заўсёды зрываюцца «самыя большыя»), а лёска была старая. Магчыма, няправільна быў прывязаны кручок (я прывязваю іх «па-піянерску» — чым больш вузельчыкаў, тым лепш). Магчыма (тут ужо аб шкодзе курэння наогул і на рыбалцы ў прыватнасці), ад таго, што ў мяне ў зубах дымілася цыгарэта, і калі я чапляў чарвяка, дык сагнуўся над лёскаю — вось яна крышачку і падплавілася.

Зрэшты, кожная з гэтых прычынаў суцяшала слаба. Я разумеў, што выбраў харошае месца, бачыў, што клёў толькі-толькі пачынаецца, — і стаяў, таптаўся на беразе, не ведаючы, што рабіць.

Ззаду пачуліся крокі. Учарашні знаёмы дзядзька, убачыўшы, што я больш не закідваю вуду, падбіраўся бліжэй сюды. Ён перш зірнуў на мяшэчак з рыбаю — і твар яго спахмурнеў, тады перавёў вочы на пустую лёску ў маёй руцэ — і наадварот, адразу ж пасвятлеў увесь.

— У вас часам няма запаснога кручка? —

наіўна спытаў я — пытаць такое на рыбалцы тое ж самае, напрыклад, што ў лесе нож у грыбніка.

Дзядзька прамармытаў штосьці тыпу «свае трэба мець», нават не зірнуўшы больш на мяне, спрытна махнуў доўгім вудзільным-«тэлескопам» — паплавок лёг акурат каля майго «прыкормленага» кусціка. А я забраў рыбу і пайшоў да свайго дому, дзівячыся: чаму гэта на душы, хоць і здарылася такая прыкрасць, усё ж больш радасці? Прычым нашмат больш. Вось нібы выпадкова, у самым нечаканым месцы, пасля доўгага растання сустрэў блізкага з маленства сябра, пагаварыў з ім, разаўспамінаўся, адвёў душу — і прыкра крыху, што зноў трэба развітвацца, але ведаеш, што гэтым разам не надоўга, цяпер мы ўжо часта будзем разам…

Увечары таго ж дня я паехаў у вёску, памагаць маці капаць бульбу. А калі — у верасні — вярнуўся, ад сажалкі не засталося і следу. Замест таго, каб прыбраць вакол, можа, высыпаць гравіем каля берагоў дарожкі, пабудаваць паблізу альтанкі ці лавачкі, паставіць сметніцы... словам, замест таго, каб акультурыць гэты маленькі аазіс сярод суцэльных новабудоўляў, прыехалі бульдозеры, засыпалі сажалку зямлёю і ўтрамбавалі гусеніцамі, пахаваўшы, бы ў магіле, і карасёў, і ратанаў, і аер з сітняком, і, здаецца, нават тых самых конікаў, якія жнівеньскімі раніцамі, радуючыся жыццю і сонцу, стракаталі так звонка і весела, што заглушалі гукі блізкага вялізнага горада…

## ЧАБОР

Пражыўшы трыццаць два гады, я, беларус, вясковы чалавек, не ведаў, як выглядае чабор.

Што ж, нічога страшнага. Мне нават не сорамна. Напрыклад, вядомы ў XIX стагоддзі крытык

і літаратуразнаўца А. Скабічэўскі, паводле яго ж слоў, “ніколі не бачыў, як расце жыта”. Вялікі рускі паэт А. Някрасаў называў авадня чмялём (над статкам ўецца “шмелей неугомонный рой”). Кандыдат на атрыманне Нобелеўскай прэміі пісьменнік Д. Мераджкоўскі блытаў пілу з напільнікам. Яшчэ адзін пісьменнік — савецкі — Ю. Алеша, прызнаваўся: “Я ні разу, ні ў дзяцінстве, ні ў юнацтве, ні пазней, у дарослыя гады, — словам, ні разу за ўсё жыццё не чуў спеву салаўя. Для мяне гэта было хлуснёй, умоўнасцю — калі я сам гаварыў пра салаўя ці чытаў у іншых”...

Відаць, няведанне само па сабе не загана. Загана, гэта калі не ведаеш — і ведаць не хочаш. Саромеешся прызнацца, спытаць у людзей. А хто пытае, той, як вядома, не заблукае.

Пайшлі неяк з маткаю на соткі збіраць каларадскіх жукоў. Ліпеньскі сонечны дзень, але сонечны толькі з нашага боку, дзе соткі. А з другога, над лесам — хмара, чамусьці не чорная, не свінцова-сіняя, як яны бываюць, а чырвоная. З таго боку штораз грыміць гром.

І тут на мяжы я ўбачыў сінюю плямку, над якой таўкліся пчолы. Яшчэ не ведаючы, што гэта, спытаў у маці:

— Чабор?

— І праўда, ***чэбрык***, — сама здзівілася маці. — Трэба ж, дзе вырас!

— Хіба гэта рэдкасць?

— Рэдкасць, абы-дзе ён расці не будзе.

Вось і яшчэ адно апраўданне для мяне. Нашае мазырскае нізіннае Палессе чабор, аказваецца, не дужа любіць, расце, як я пазней прачытаў, у сухіх высокіх мясцінах, рэдкіх светлых сасновых барах.

Прысеўшы, я з цікавасцю пачаў разглядаць, мацаць і нюхаць гэтую несамавітую на выгляд расліну, пра якую напісаны вершы і складзены песні,

якая з”яўляецца ледзь не сімвалам Беларусі поруч з васільком і шыпшынаю.

Чабор падобны на малады верас, з такімі ж сінімі кветкамі, толькі яшчэ драбнейшымі. Верас нават, як мне падалося, пахне мацней, саладчэй. Што ж так прываблівала да гэтага чабору пчол? Іх было мо штук дваццаць на невялічкую плямку. Я нарваў букецік, нюхаў, яшчэ і яшчэ, проста сілком уцягваў у сябе ягоны своеасаблівы водар.

І тады зразумеў — сапраўды, чаборам трэба надыхацца. Трэба. каб яго было многа, каб паветра настаялася на ім.

Так пахне воск, калі гарыць свечка. Так пахнуць старыя любімыя рэчы, на якія забыўся, а потым выпадкова натыкаешся на іх у шафе.

Так пахне штосьці далёкае, дарагое, страчанае калісьці даўно-даўно, але пах гэты дае надзею, што страчана не назусім...

Пакуль я разглядаў і нюхаў чабор, хмара падабралася бліжэй. Раптам з яе бліснула крывая маланка, затым рэзка і звонка стрэліла громам. Пайшоў “цыганскі” дождж. Бульбоўнік і трава ажылі пад буйнымі кроплямі, нібы хто кідаў гарох з неба: шлоп!-шпок!-шлоп!

Трэба было вяртацца дамоў.

Свяціла сонца, вісела над галавою дзівосная чырвоная хмара, сінеў у руцэ букецік чабору, на якім ехала вялікая пухнатая пчала, — не зважаючы ні на дождж, ні на чалавека, як ап”янелая, яна тыркалася і тыркалася ў сінія кветачкі, стараючыся не прапусціць аніводнае.

Змест

Афганская шкатулка. Аповесць.

АПАВЯДАННІ
Цугцванг
Дарожнае знаёмства
Ратан.
Чабор

© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2010 год
© PDF: Камунікат.org, 2010 год